Ягор Новікаў

# ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ

## беларускіх земляў

да канца XII ст.

Том 1

МІНСК
2006

# ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯЎ

Λ

GEORGIVS NOVICIANVS

# RES GESTÆ MILITARES RVTHENIÆ ALBÆ

MINSK
MMVII

Ягор Новікаў

# ВАЕННАЯ ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯЎ

(ДА КАНЦА XII СТ.)

Том 1

МІНСК
Выд. І. П. Логвінаў
2007

УДК 930
ББК 63.3
Н 73

*Рэцэнзенты*
**Бохан Ю. М.**, доктар гістарычных навук, загадчык кафедры эканамічнай гісторыі БДЭУ
**Трусаў А. А.**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

*Навуковы рэдактар*
**Кананoвіч У. І.**, кандыдат гістарычных навук

**Новікаў, Я. У.**
Н 73 Ваенная гісторыя беларускіх земляў (да канца XII ст.). Том. 1 / Ягор Новікаў. – Мн.: Логвінаў, 2007. – 208 с.

ISBN 985-6800-14-5.

Даследванне разглядае з'яву вайны ў палітычным кантэксце і прасочвае яе эвалюцыю ад інструмента ў барацьбе за магутнасць да самадастатковага фактару гісторыі. Аўтар узнаўляе ходу падзей беларускай ваеннай гісторыі, паказвае ўплыў вайны на эвалюцыю грамадства і аналізуе развіццё ваеннага майстэрства.

Першы том даследвання вабіць чытача ў "цёмныя" стагоддзі беларускай гісторыі, адзначаныя прыходам славян на беларускія землі. На думку аўтара, мірнае і ваеннае ўзаемадзеянне прышлых славян з мясцовымі балцкімі грамадствамі заклала падставы ўзнікнення беларускага народу. Далей аўтар разглядае ваенную дзейнасць нарманаў, якая аказала ўплыў на ўзнікненне і развіццё дзяржаўнасці на беларускіх землях.

Прызначаецца для даследчыкаў і шырокага кола чытачоў.

**УДК 930**
**ББК 63.3**

**ISBN 985-6800-14-5**
© Новікаў Я. У., 2007
© Логвінаў І. П., выдавец, 2007

# ЗМЕСТ

## Уводзіны

1. Гісторыя як досвед мінулага ........................................ 7
2. Вайна як прадмет гістарычнага даследавання ........... 7
3. Што такое вайна? ............................................................ 9
4. Тыпалогія войнаў ........................................................ 13
5. Міждысцыплінарны падыход да даследавання ......... 16
*А) Гісторыя* ................................................................... 17
*Б) Ваенная навука* ........................................................ 18
*В) Палітычная навука і міжнародныя адносіны* ........ 20
6. Нацыянальны і геаграфічны абсяг даследавання ..... 21
7. Тэрміналогія ................................................................ 23
8. Перыядызацыя ............................................................ 25
9. Кампазіцыя ................................................................. 29

*Кніга I.*
**Дадзяржаўны перыяд**
**(канец V – пачатак IX ст.)**

**Раздзел 1. Гісторыя войнаў ......................................... 33**

**Раздзел 2. Уплыў вайны на развіццё грамадства ........... 44**
А) Ваенны фактар у палітычным
і эканамічным развіцці грамадства ............................ 44
Б) Уплыў вайны на этнакультурныя працэсы
на беларускіх землях ................................................... 56

**Раздзел 3. Ваеннае майстэрства славян і**
**балтаў у канцы V – пачатку IX стст. ........................... 59**
А) Вайсковая арганізацыя ............................................ 60
Б) Зброя ......................................................................... 63
В) Умацаванні і аблога ................................................. 66
Г) Стратэгія і тактыка ................................................... 72

*Кніга II.*

**Нарманскі перыяд (820−970-я гг.)**

**Раздзел 1. Гісторыя войнаў ........................................ 85**

**Раздзел 2. Уплыў вайны на развіццё грамадства .......... 131**

А) Ваенны фактар
у палітычным развіцці грамадства ......................... 131

Б) Ваенны фактар
у эканамічным развіцці грамадства ......................... 142

В) Уплыў вайны
на развіццё духоўнай культуры ............................... 146

**Раздзел 3. Ваєннае майстэрства нарманаў,**
**славян і балтаў у 820−970-я гг. ................................ 152**

А) Вайсковая арганізацыя ........................................ 152

Б) Зброя ....................................................................... 167

В) Умацаванні і аблога .............................................. 179

Г) Стратэгія і тактыка ................................................ 184

**Summary ......................................................................... 196**

*Але самае важнае з таго, што створана розумам, гэта — гісторыя: слыху дае яна разнастайнае задавальненне, для душы ж яна з'яўляецца найлепшай школай і выхаваннем; для людзей бо дапытлівых няма нічога прывабнейшага за гісторыю.*

Феафілакт Сімаката

# Уводзіны

### 1. Гісторыя як досвед мінулага

Любы аповед аб гістарычных падзеях альбо іх даследаванне мае перад сабой усё тую ж адвечную мэту — данясенне да сучаснікаў ведаў аб мінулым, якія дапамагаюць разумець цяперашні час і прадбачыць будучыню. У той час як іншыя навукі здабываюць веды шляхам практычных доследаў і абстрактных абагульненняў, гісторыя ўяўляе сабой збор досведу мінулага, дзе ў канцэнтраваным выглядзе адлюстроўваюцца вечныя законы, якія нязменна прадвызначаюць ход падзей ва ўсе часы. Гісторыя лучыць людзей з іх мінулым і паказвае ім шляхі ў будучыню. Менавіта таму гістарычныя даследаванні маюць не толькі вузкае акадэмічнае значэнне. На высокім узроўні гісторыя дапамагае наблізіцца да найскладанейшых таямніц быцця. У сваіх менш складаных, больш папулярных праявах гісторыя можа быць цікавым і прыемным заняткам. Яна можа зачароўваць займальным аповедам аб разнастайных краінах, з'явах, падзеях і людзях, пры гэтым не губляючы сваёй павучальнасці і прапануючы мудрыя парады дзеля розных выпадкаў.

### 2. Вайна як прадмет гістарычнага даследавання

Па гэтых прычынах сярэднявечная ваенная гісторыя беларускіх земляў вартая не толькі вузкага акадэмічнага погляду. Яе вывучэнне асвятляе многія пытанні ўзнікнення і развіцця беларускага народу і беларускай дзяржаўнасці,

актуальныя да сённяшняга часу. Зрэшты, нават сама з'ява вайны ўжо выклікае інтарэс да вывучэння сваёй супярэчлівасцю.

Паводле традыцыйнага погляду, яна з'яўляецца найвялікшым злом, параўнальным з пошасцямі альбо вялізнымі прыроднымі катастрофамі. У гістарычнай памяці асобных людзей і цэлай нацыі войны становяцца рубяжамі, якія адзначаюць незваротнае знішчэнне традыцыйнага ладу жыцця і багатых слаёў культуры. Войны абрываюць жыцці асобных людзей і перарываюць галіны родаў. Людзі смуткуюць аб сваіх родных і блізкіх і жадаюць сваім нашчадкам, каб войны даўніх часоў больш не паўтараліся.

Але існуе шмат нагод, калі гэтыя ж самыя людзі ахвотна адзначаюць станоўчыя вынікі тых самых войнаў. Некаторыя нацыянальныя святы Беларусі прысвечаны дням перамог у войнах мінулага. Пры гэтым націск робіцца не так на факт дасягнення міру, як на грымотныя поспехі ўласнай зброі. Дні ваенных перамог святкуюцца як ключавыя даты ўзнікнення і развіцця беларускай дзяржаўнасці.

Войны таксама выяўляюць найбольш яркія і выдатныя якасці чалавечага духу. Людзі захапляюцца подзвігамі герояў і лічаць іх вартымі пераймання прыкладамі, не зважаючы на тое, пры якіх крывавых ці несправядлівых абставінах гэтыя подзвігі былі здзейснены. Усё гэта надае з'яве вайны нашмат больш складанае, не адназначна адмоўнае вымярэнне.

Калі традыцыйная свядомасць з не самым глыбокім разуменнем быццам адлюстроўвае важкасць, складанасць і супярэчлівасць вайны, тым больш гэтая з'ява заслугоўвае грунтоўнага даследавання з боку навукі. Сапраўды, нават беглы позірк на гісторыю беларускіх земляў паказвае як змрочны, разбуральны, так і гераічны, слаўны імпэт войнаў, якія вяліся нашымі продкамі. Адны войны прыводзілі за сабой іншаземных захопнікаў і ставілі само існаванне нашага краю пад пагрозу. Іншыя ж клікалі да дзеяння мужных ваяроў і выдатных дзеячоў, якія з дапамогай сваёй сілы і магутнасці стваралі само паняцце ўлады і закладалі падмурак першых дзяржаў на гэтых землях. Адны войны прыносілі розрух і спусташэнні, пакідалі за сабой след пажараў і рабункаў. Іншыя дазвалялі праклаcці і апа-

наваць новыя гандлёвыя шляхі, сабраць і памножыць дабрабыт і багацце, якое адлюстроўвалася ў квітнеючых гарадах і замках. Адны выклікалі варожасць і нянавісць паміж людзьмі, якія размаўлялі на розных мовах і мелі адрозныя звычаі. Іншыя ж дапамагалі ўчарашнім ворагам лепей спазнаць адзін аднаго і ўзаемна пераняць найлепшыя рысы, каб у будучыні скласці люд аднаго краю. Вось гэтыя супрацьлегласці, якія складаюць адзінае цэлае, і могуць стаць цікавым прадметам даследавання з боку навукі. Гэтае даследаванне мусіць імкнуцца, але не зводзіцца выключна да збору, упарадкавання, праверкі і аналізу фактаў. Яшчэ важней, яно павінна даць сутнаснае разуменне з'явы вайны як асобнай катэгорыі палітычнага жыцця грамадства і быцця ў цэлым, дзейснай не толькі ў асобную эпоху, але ва ўсе часы. Асэнсаванне гэтай з'явы мусіць весці як да дакладнага і поўнага ведання сваёй мінуўшчыны, так і ўмення разбірацца ў цяперашчыне і да пэўнай ступені прадказваць будучыню.

Адным з найбольш праніклівых і дасведчаных навуковых поглядаў на вайну мусіць стаць погляд ваеннай гісторыі, якая трымае ў полі свайго зроку шматлікія войны даўніх часоў. Менавіта ваенная гісторыя, што стаіць на раздарожжы ваеннай і гістарычнай навук, абапіраючыся на досвед мінулага, мае добры шанц адказаць на найбольш важкія пытанні: якую агульную ролю адыгралі войны ў гісторыі Беларусі; якім чынам яны ўплывалі на ўзнікненне і развіццё дзяржаўнасці на беларускіх землях; якое значэнне войны мелі для палітычнай гісторыі беларускіх земляў; які станоўчы і адмоўны ўплыў яны мелі на эканоміку краю; і, нарэшце, які ўплыў яны аказалі на духоўнае жыццё Беларусі і ўспрыманне сучаснымі беларусамі і іх продкамі навакольнага свету і сябе саміх у гэтым свеце.

### 3. Што такое вайна?

Для таго каб дакладна і абгрунтавана адказаць на пастаўленыя пытанні, найперш неабходна акрэсліць сутнасць самой з'явы вайны.

Першым неад'емным элементам, з якіх складаецца гэтая з'ява, безумоўна, з'яўляецца гвалт аднаго чалавека

над іншым. Элемент гвалту мае настолькі значную прысутнасць на вайне, што масавае ўспрыманне падсвядома і эмацыйна імкнецца атаясаміць гэтыя два паняцці. Навуковая ж думка нязменна ўключае паняцце гвалту ў любыя азначэнні вайны. У адпаведнасці з думкай славутага нямецкага ваеннага тэарэтыка Клаўзевіца, «вайна – гэта акт гвалту, які мае на мэце прымусіць непрыяцеля выканаць нашу волю»[1].

У сувязі з такім важкім значэннем з'явы гвалту цалкам натуральна было б задацца пытаннем аб яе прыродзе і хаця б коратка даследаваць яе ўласцівасці. Па-першае, можна ўпэўнена сцвярджаць, што пад дыялектычным поглядам гвалт ёсць непазбежнае следства адвечнага падзелу існуючага свету на спрадвечна варожыя адна адной супрацьлегласці, якія, аднак, не могуць існаваць адна без адной. Такім чынам, гвалт — гэта натуральная супрацьлегласць міру і прыязнасці. Натуральнае становішча гвалту і агрэсіі як намеру ўчыніць гвалт у прыродзе існуючага свету цалкам адлюстроўваецца ў біялагічнай будове чалавека і іншых жывых істот. Паводле сцверджання знакамітага французскага тэарэтыка міжнародных адносін Рэймона Арона, «пазваночныя ўсіх класаў – рыбы, земнаводныя, паўзуны, птушкі, сысуны – змагаюцца... Чалавечая раса знаходзіцца ў верхняй частцы шкалы агрэсіўнасці сярод прыматаў»[2]. Больш за тое, амерыканскі даследчык міжнародных адносін нямецкага паходжання Ханс Маргентау гаворыць аб «аўтаноміі цёмных і злых сіл, якія ў якасці праяваў падсвядомага вызначаюць лёс чалавека»[3].

Па-другое, можна меркаваць, што карані гвалту і агрэсіі паходзяць ад самога спосабу мыслення і пазнання ў чалавека. Рэчаіснасць, успрымаемая чалавечым мысленнем, складаецца з сябе (суб'екту) і ўсяго іншага свету (аб'екту), што непазбежна прымушае праводзіць паміж імі падзел. У недасканалым свеце мяжа падзелу пастаянна вагаецца ад простага ўсведамлення адрознасці паміж

---

[1] Клаузевиц К. *О войне.* Москва, 1997. С. 35.

[2] Aron, Raymon, *Peace and War: A Theory of International Relations* (Malabar, Fla.: Krieger, 1981), 340.

[3] Morgenthau, Hans J., *Scientific Man vs. Power Politics* (Chicago: University of Chicago Press, 1946), 205.

суб'ектам і аб'ектам да адкрытай варожасці паміж імі, якая і можа прывесці да гвалту.

Гэтая ўласцівасць гвалту прама вядзе да адкрыцця другога асноўнага элементу вайны: наяўнасці супрацьстаяння двух ці больш суб'ектаў. Імкненне да гвалту ніколі не ўзнікае ў чалавеку само па сабе, але з'яўляецца ў адказ на супрацьстаянне з другім чалавекам ці іншым аб'ектам існуючага свету. Па словах Арона, чалавек «не адчувае патрэбнасці да змагання гэткім чынам, як ён адчувае патрэбнасць у ежы ці сексуальным задавальненні. Ланцуг прычын, які вядзе да эмоцый ці актаў агрэсіўнасці, заўсёды можа быць прасочаны да знешняй з'явы. Не існуе фізіялагічнага доказу спантаннага імкнення да змагання, якое б паходзіла з самога цела»[4].

Але ні адрозненне сябе чалавекам ад навакольнага свету, ні нават наяўнасць супрацьстаяння з іншымі аб'ектамі гэтага свету яшчэ не з'яўляюцца самадастатковымі прычынамі для ажыццяўлення чыну гвалту. Чалавек, які збіраецца яго ажыццявіць, мусіць разумець, што ў большасці выпадкаў ён сустрэне адпаведны адказ і мусіць быць падрыхтаваны да пэўных страт і нават магчымасці паражэння ў змаганні. Такім чынам, ягоны намер да гвалту павінен быць матываваны пэўным інтарэсам, выгады ад дасягнення якога будуць пераважаць над магчымай рызыкай страт і паражэння. Пры гэтым супрацьлеглы бок будзе перашкаджаць дасягненню гэтага інтарэсу, пераследуючы свой уласны інтарэс. Гэта дазваляе зрабіць выснову, што разам з актам гвалту і супрацьстаяннем двух ці больш суб'ектаў канфлікт інтарэсаў гэтых суб'ектаў складае трэці асноўны элемент вайны. Як адзначае Клаўзевіц, «нельга ўявіць нават самага першабытнага, блізкага да інстынкту пачуцця нянавісці без якогасьці варожага намеру... У дзікіх народаў пануюць намеры, якія ўзнікаюць з эмоцый, а ў цывілізаваных народаў – намеры, абумоўленыя розумам»[5]. Вайна ў гэтым выпадку з'яўляецца праявай канфлікту інтарэсаў і сродкам яго вырашэння.

---

[4] Aron, Raymon, *Peace and War: A Theory of International Relations*, 344.

[5] Клаузевиц К. *О войне*. С. 36.

Пры гэтым вайна не можа абсалютным чынам адпавядаць толькі рацыянальнаму матыву вырашэння канфлікту інтарэсаў. Яна можа перарастаць рацыянальныя матывы, станавіцца самадастатковай і знаходзіць паліва для свайго полымя ў ірацыянальных матывах помсты і ярасці. У гэтым выпадку хаатычная і ірацыянальная самадастатковасць вайны блытае ход падзей, разбурае намеры яе завадатараў і прыводзіць да вынікаў, далёкіх ад меркаваных.

Але не кожны гвалтоўны чын, з дапамогай якога вырашаецца канфлікт паміж супрацьлеглымі бакамі, можа лічыцца вайной. Паводле Клаўзевіца, вайной можна назваць пашыранае адзінаборства[6]. Безумоўна, у гісторыі вядомыя выпадкі, калі вынік вайны вырашаўся адзінаборствам. Але, з іншага боку, канфлікт паміж суседнімі паселішчамі, напрыклад, з-за ворнай зямлі, не можа лічыцца сапраўднай вайной, нягледзячы на тое, што ён уцягвае шмат людзей і дасягае вялікай ступені жорсткасці. Ключавой умовай тут можна лічыць не столькі колькасць уцягнутых людзей і рэсурсаў, колькі іх арганізацыю.

Па словах таго самага Клаўзевіца, вайна – гэта «крайняя ступень выкарыстання гвалту»[7]. Лагічна будзе зрабіць выснову, што крайняй ступені выкарыстання гвалту адпавядае найвышэйшая ступень арганізацыі людзей, якія гэты гвалт чыняць. Такой ступенню арганізацыі з'яўляецца палітычная, ці дзяржаўная арганізацыя. Гэта можа быць як дзяржава цалкам, так і яе тэрытарыяльная частка альбо сацыяльная група, якія змагаюцца за ўладу ў гэтай дзяржаве. Таксама гэта можа быць народ, які наблізіўся да стварэння сваёй дзяржавы ці змагаецца за незалежнасць. Такім чынам, вайна вядзецца паміж супольнасцямі, якія валодаюць дзяржаўнай уладай альбо дамагаюцца яе. Пры гэтым, паводле сцверджання Маргентау, «палітыка, як і грамадства ў цэлым, кіруецца аб'ектыўнымі законамі, якія маюць свае карані ў чалавечай прыродзе»[8]. Адпаведна, дзяржавы і іншыя палітычныя супольнасці непазбежна ўжываюць неад'емную частку чалавечай прыроды –

---

6 Клаузевиц К. *О войне.* С. 34.

7 Тамсама. С. 35.

8 Morgenthau, Hans J., *Politics Among Nations* (New York: McGraw-Hill, Inc., 1992), 4.

гвалт – пры вырашэнні канфліктаў. Апошні элемент вайны – палітыка – злучаецца з першым – гвалтам. Уся чацвярыца элементаў замыкаецца.

Падсумоўваючы ўсё сказанае, вайна – гэта чын гвалту, ужыты для вырашэння канфлікту інтарэсаў паміж дзвюма ці больш дзяржавамі ці іншымі палітычнымі супольнасцямі. Таму вайну мы будзем разглядаць як складную частку палітыкі і на працягу ўсяго даследавання прасочваць іх непарыўную сувязь.

## 4. Тыпалогія войнаў

Зыходзячы з гэтай сувязі, мы вылучым некалькі тыпаў вайны. Паводле важнасці першае месца будуць займаць войны, выкліканыя менавіта палітычнымі прычынамі – войны магутнасці. Вызначыўшы вайну як адзін са спосабаў вырашэння канфлікту інтарэсаў, мы мусім вызначыць магутнасць як універсальны інтарэс, уласцівы менавіта дзяржаве як асноўнай адзінцы палітычнай сферы. Магутнасць як магчымасць ці прамы намер навязаць сваю волю з'яўляецца асноўнай мерай інтарэсу ў палітычнай сферы, таксама як прыбытак у сферы эканамічнай. У хаатычным і кепска рэгуляваным свеце, дзе роўныя паводле свайго статусу дзяржавы адстойваюць толькі ўласную выгаду, магутнасць з'яўляецца асноўным спосабам дзяржавы дасягнуць дабрабыту і росквіту або проста захавацца і выжыць.

Следам за Марцінам Уайтам мы можам вылучыць з палітычных войнаў, выкліканых імкненнем да магутнасці, войны выгады і страху[9]. Войны выгады звычайна пачынаюцца з мэтай дасягнення абсалютнай магутнасці і знішчэння сваіх праціўнікаў, тады як войны страху пачынаюцца з-за намеру здабыць адносную магутнасць і пазбегнуць варожага нападу. У такім выпадку дзяржава імкнецца супрацьдзейнічаць росту магутнасці праціўніка з дапамогай прэвентыўнага ўдару ад страху, што вайна, якая можа быць выйграная сёння, будзе непазбежна прайграная заўтра. Такім чынам, дзяржава падтрымлівае сваю адносную магутнасць прыніжэннем магутнасці іншых дзяржаў.

---

[9] Wight, Martin, *Wars of Gain, Fear and Doctrine*, in Lawrence Freedman ed., *War* (Oxford: Oxford University Press, 1994), 90–94.

Паколькі войны вядуцца дзяржавамі ці іншымі палітычнымі супольнасцямі, палітычны матыў магутнасці непазбежна з'яўляецца універсальным, самадастатковым і абавязкова прысутнічае ў любой вайне. Дзяржава можа весці вайну магутнасці нават у выпадках, калі гэта не адпавядае яе эканамічным альбо іншым інтарэсам. Калі асноўнай прычынай вайны становіцца барацьба за эканамічны прыбытак ці ідэю, матыў магутнасці будзе ўсё роўна адыгрываць пэўную ролю. Ніводны іншы матыў ці прычына не могуць прэтэндаваць на падобную універсальнасць, хоць і набываючы ў асобных выпадках першаступеннае значэнне.

Пры гэтым неабходна сказаць, што вайна – гэта з'ява не толькі палітычная. Як любая палітычная супольнасць засноўваецца на шматлікіх эканамічных, грамадзянскіх, роднасных і духоўных сувязях паміж яе ўдзельнікамі ў дадатак да непасрэдна палітычных сувязяў, гэтак жа сама вайна можа браць пачатак у самых розных прычынах.

Наступны паводле свайго значэння і месца ў гісторыі від войнаў, выкліканых эканамічнымі прычынамі, – войны прыбытку. Такія войны могуць прымаць самыя разнастайныя формы. Вайна можа весціся: з мэтай самага звычайнага рабаўніцтва (адна з найпрасцейшых і найстаражытнейшых формаў вайны), дзеля захопу новых тэрыторый з мэтай іх засялення альбо атрымання дадатковых падаткаў, дзеля валодання багатымі прыроднымі рэсурсамі, нарэшце, дзеля кантролю над важнымі гандлёвымі шляхамі, якія можна перанакіраваць у сваіх інтарэсах альбо абкласці падаткамі на сваю карысць.

Нягледзячы на сваю ўяўную рацыянальнасць і прагматычнасць, матыў прыбытку на самой справе ўтрымлівае ў сабе прыхаваную небяспеку і можа прынесці шмат шкоды таму, хто распачынае вайну з гэтай прычыны. Па-першае, нават самы цвярозы разлік прыбытку, запланаванага ў выніку перамогі ў вайне, не можа ўлічыць знішчальнай прыроды вайны, якая вельмі лёгка выходзіць з-пад кантролю яе завадатараў. Такая вайна можа прынесці незлічоныя страты, якія нашмат пераўзыдуць любы запланаваны прыбытак. Па-другое, побач з цалкам рацыянальным разлікам, які лёгка выражаецца ў пэўных колькасных адзін-

ках, матыў прыбытку таксама ўключае такі цёмны і ірацыянальны бок чалавечай прыроды, як хцівасць. Хцівасць злой сілай можа ўмяшацца ва ўсе разлікі і прымусіць падзеі і іх удзельнікаў у пагоні за прыбыткам зайсці далей за дазволеную мяжу. Хцівасць можа пераважыць нават матыў магутнасці, паставіўшы пад пагрозу выжыванне цэлай дзяржавы. Па-трэцяе, калі войны магутнасці вядуцца, прынамсі фармальна, у інтарэсах усёй дзяржавы, войны прыбытку звычайна вядуцца ўсёй дзяржавай, але ў інтарэсах асобных сацыяльных груп. У большасці выпадкаў гэта вярхі грамадства, якія і атрымліваюць асноўную выгаду, тады як прыкладаць намаганні і ахвяраваць сабой вымушанае ўсё насельніцтва. Гэта вядзе да ўнутранага разладу і нязгоды ў дзяржаве. У выніку гэтых прычын многія войны прыбытку пры знешняй рацыянальнасці і шанцах на поспех канчаюцца сумна.

Апошнім значным відам вайны з'яўляюцца войны, выкліканыя намерам прывесці сябе і навакольны свет у адпаведнасць са сваімі ўяўленнямі і ідэаламі – войны ідэі. Звычайна пад такімі войнамі разумеюцца войны з намерам распаўсюдзіць і навязаць сваю дактрыну, ідэалогію альбо рэлігію. Марцін Уайт называе іх войнамі дактрыны і вызначае іх як «місіянерскую, альбо крыжовую вайну, вайну для зацверджання прынцыпу ці прасоўвання справы»[10]. Мы можам пагадзіцца з гэтым вызначэннем, зазначыўшы толькі, што дактрына можа быць завузкім паняццем у гэтым выпадку. Яна прадугледжвае больш ці менш развітую сістэму поглядаў, якая можа быць навязаная асобным людзям ці цэлым супольнасцям. Але войны могуць весціся і ў імя ідэі, якая выразна адрозніваецца ад іншых матываў вайны, вядзе да змянення навакольнага свету ў адпаведнасці з ёй, але не выражае развітай сістэмы поглядаў і не імкнецца быць навязанай каму-небудзь. Такой ідэяй можа быць, напрыклад, помста. Вайна з мэтай помсты вядзецца з намерам прычыніць шкоду альбо знішчыць людзей ці дзяржаву ў адказ на варожы ці абразлівы ўчынак з іх боку. Помста далёка адстаіць ад матываў магутнасці і прыбытку. Яна можа прама ім супярэчыць і як ідэя не можа быць навязаная таму, супраць каго яна накіраваная.

[10] Wight, Martin, *Wars of Gain, Fear and Doctrine,* 92.

Другой ідэяй такога кшталту можа быць славалюбства, якое імкнецца да сцверджання ўласнай асобы праз здзяйсненне грымотных ваенных подзвігаў. Нязменна ўласцівае чалавечай прыродзе, у некаторых культурах яно можа быць узнесеным да ўзроўню агульнапрынятага ўзору ці ўхвальнай рысы паводзін. У найбольшай ступені культура ваеннай славы квітнела сярод вайсковай арыстакратыі на дадзяржаўным і раннедзяржаўным этапах развіцця грамадства. Добрае адлюстраванне гэтай з'явы – такія эпічныя творы, як «Іліяда», «Песня аб Нібелунгах» ці скандынаўскія сагі.

### 5. Міждысцыплінарны падыход да даследавання

Вызначыўшыся з вайной як прадметам нашага даследавання і яе тыпалогіяй, мы мусім выпрацаваць слушны тэарэтычны падыход дзеля таго, каб поўна і дакладна высветліць яе сутнасць і ролю ў жыцці асобных людзей і грамадства ў цэлым. Дакладны і абгрунтаваны падыход мусіць засцерагчы нас ад стварэння і капіравання міфаў, якія адлюстроўваюць пажаданую карціну ў адрозненне ад сапраўднай і з'яўляюцца вынікам скажэння ісціны пад уплывам канкрэтных палітычных ці ідэалагічных абставін. Выкарыстанне адпаведных інструментаў для збору і аналізу фактаў дазволіць нам прапанаваць канцэпцыю разумення вайны, якая пры ўсёй недасканаласці чалавечага пазнання найбольш адэкватна і ўсебакова адлюстроўвае сэнс гэтай з'явы ў гісторыі Беларусі, не выдзяляючы празмерна яе яркія бакі і не хаваючы ў цень адмоўныя.

Найважнейшай рысай нашага падыходу мусіць стаць здольнасць да шматмернага сінтэтычнага аналізу прадмету даследавання. На жаль, у сучаснай акадэмічнай практыцы ў розных галінах гуманітарных і дакладных навук пераважае вузкі падыход, засяроджаны на вывучэнні асобных феноменаў з пункту гледжання адной навуковай дысцыпліны. Такі падыход вядзе да аднамернага і спрошчанага ўспрымання рэчаіснасці. Найлепшым яго вынікам можа быць сцверджанне асобных, адарваных адзін ад аднаго і ад агульнай плыні жыцця фактаў, якія ніякім чынам не дапамагаюць разуменню агульных заканамернасцяў быцця. Збор ведаў замяняецца назапашваннем

факталагічнай інфармацыі, якая належным чынам не асэнсоўваецца і не дае адказаў на важнейшыя пытанні, што і складае прадмет навукі. Вядома, можна запярэчыць, што, як тое было дасціпна заўважана, колькасць назапашанай інфармацыі ўжо ў часы Арыстоцеля перасягнула велічыню, якая дазваляла абмежаванай чалавечай натуры ў поўным аб'ёме валодаць дасягненнямі ўсіх ці большасці навук. Аднак анекдатычны дылетантызм самога Арыстоцеля ў многіх пытаннях прымушае думаць, што чалавек увогуле ніколі не дацягваўся да ўзроўню больш ці менш поўнага ведання. Больш за тое, безнадзейная спроба механічнай акумуляцыі фактаў у супрацьвагу якаснаму іх асэнсаванню часта якраз і зацямняе тыя бакі ісціны, якія могуць быць адкрытыя абмежаванаму чалавечаму пазнанню. Наадварот, прыняцце якаснай прыроды пазнання дазваляе замяніць аднамерны разгляд хаатычнай процьмы фактаў шматмерным поглядам на найбольш значныя з'явы, узятыя ў найважнейшыя моманты іх існавання ў прасторы і часе. У дачыненні да нашага даследавання гэта будзе значыць выкарыстанне сінтэтычнага падыходу, які спалучае погляды і метадалагічныя спосабы розных гуманітарных навук, што дазваляе нам перайсці ад пераказу фактаў і іх аднамернага вытлумачэння да шматбаковага аналізу і якаснага і сутнаснага разумення.

*А) Гісторыя*

Першай навуковай дысцыплінай, да якой мы звернем погляд, будзе ўласна гісторыя. Як навука, якая вывучае свет, звяртаючыся да досведу падзей мінулага, яна прадастаўляе нам фактычны матэрыял, з якога складаецца тканіна нашага даследавання. Погляд на гісторыю з вышыні гадоў дапамагае нам зразумець агульны ход развіцця чалавечага грамадства, які характарызуецца складаным спалучэннем уплыву шматлікіх аб'ектыўных палітычных, эканамічных і духоўных фактараў. Збег аб'ектыўных фактараў дапаўняецца фактарамі суб'ектыўнымі, такімі, як уплыў выдатных асоб альбо непрадказальнасць масавай псіхалогіі. Нарэшце, значнае месца ў гісторыі займаюць ірацыянальныя альбо непадкантрольныя чалавеку абставіны. Тым не менш, нягледзячы на такую складанасць,

гісторыя ў цэлым ідзе шляхам цыклічнага паўтарэння, пры якім тыя самыя агульныя заканамернасці застаюцца дзейснымі ва ўсе часы. З гэтай прычыны найважнейшае дасягненне гісторыі ёсць яе здольнасць да збору і аналізу ключавых фактаў і выкарыстання вынікаў аналізу для выявдзення гэтых заканамернасцяў.

У працы з гістарычнымі фактамі мы будзем імкнуцца пазбегнуць занадта «сучаснага» іх разумення, бо мадэрнізацыя гісторыі скажае яе з-за спроб ужыць сённяшні пункт гледжання ў адносінах да мінуўшчыны. Бясспрэчна, дзякуючы сваёй паўтаральнасці і цыклічнасці, гісторыя вывучаецца дзеля таго, каб высветліць значэнне падзей мінулага і прасачыць іх уплыў на дзень сённяшні. Больш за тое, усвядоміць гэтае значэнне можна толькі поглядам з вышыні сённяшняга дня на вялікую панараму гісторыі, універсальныя заканамернасці якой дзейсныя для ўсіх часоў. Але ў той самы час кожная эпоха прымае розныя формы, мае свае асаблівасці, свой узровень развіцця палітычных інстытутаў і эканамічнага ладу, свае пануючыя ідэі і свае людскія характары. Таму было б вялікай памылкай спрабаваць вытлумачыць прычыны тагачасных падзей, іх ходу і матывы ўдзельнікаў сённяшняй логікай. Перад намі стаіць няпростая задача паспрабаваць прасякнуцца атмасферай мінулага часу, каб даследаваць яго знутры і адначасова ацаніць яго значэнне з сённяшняй перспектывы.

*Б) Ваенная навука*

Калі гісторыя дазваляе нам убачыць і асэнсаваць агульную плынь падзей, то ваенная навука дапаможа нам вылучыць з яе тыя факты, якія датычацца вайны як з'явы чалавечага быцця і засяродзіцца на заканамернасцях, уласцівых менавіта ёй. Таму, знаходзячыся на скрыжаванні гісторыі і ваеннай навукі, наша даследаванне можа быць аднесенае да галіны ваеннай гісторыі. Паводле словаў буйнога расійскага савецкага ваеннага гісторыка Яўгена Разіна[11], «ваенная гісторыя, з'яўляючыся адгаліна-

[11] Цікава адзначыць, што Яўген Андрэевіч Разін (1898–1964, прозвішча да 1924 г. – Некляпаеў) нарадзіўся ў вёсцы Пакінічы Рослаўскага павета Смаленскай губерні, на этнічных беларускіх землях, што, аднак, яшчэ не дае падстаў залічваць яго да бела-

ваннем ведаў ваеннай навукі, ...вывучае і абагульняе гістарычны і сучасны баявы досвед і досвед будаўніцтва ўзброеных сіл»[12]. Мы, прытрымліваючыся сінтэтычнага падыходу, можам пагадзіцца з гэтым азначэннем толькі ў вузкім сэнсе і будзем працягваць вызначаць ваенную гісторыю як навуку, якая даследуе агульнае значэнне з'явы вайны ў жыцці грамадства і асобных індывідаў у гістарычнай перспектыве. У сувязі з гэтым мы будзем надаваць увагу як тэарэтычным абагульненням ведаў аб вайне, так і больш вузкаспецыяльным момантам.

Абагульнены погляд на з'яву вайны мы можам здабыць з вывучэння гісторыі войнаў у цэлым, якая, паводле Разіна, з'яўляецца першым складнікам ваеннай гісторыі і «даследуе ў магчымых і неабходных падрабязнасцях кожную вайну паасобку. (...) Пры даследаванні той ці іншай вайны найперш выяўляецца яе характар і рухаючыя сілы, а затым раскрываецца стратэгічны змест асноўных перыядаў вайны; далей даследуецца ход вайны – засяроджанне і разгортванне войскаў, баі, аперацыі і бітвы; вывучаецца развіццё ўзбраення і баявой тэхнікі ў ходзе дадзенай вайны і змены формаў арганізацыі арміі, выяўляюцца асаблівасці стратэгіі, аператыўнага майстэрства і тактыкі; ускрываюцца прычыны перамог і паражэнняў; паказваецца роля дадзенай вайны ў развіцці ваеннага майстэрства»[13]. Ізноў жа можна дадаць, што, адыходзячы ад вузкага азначэння гісторыі войнаў, мы будзем імкнуцца паказаць не толькі характар і рухаючыя сілы войнаў, але і іхні складаны і шматмерны ўплыў на палітычнае, эканамічнае і духоўнае развіццё грамадства.

З больш вузкаспецыяльных момантаў ваеннай гісторыі мы звернем найбольшую ўвагу на гісторыю ваеннага майстэрства, якая «вывучае заканамерны гістарычны працэс развіцця ўзброеных сіл і спосабаў вядзення вайны, аперацыі і бою, ускрывае іх сацыяльна-эканамічныя, палітычныя і тэхнічныя асновы і выяўляе перспектывы развіцця

---

рускіх навукоўцаў. Большая Советская Энциклопедия. Москва, 1975. Т. 21. С. 418.

[12] Разин Е. А. *История военного искусства.* Т. 1. Москва, 1955. С. LXVII.

[13] Тамсама.

ваеннага майстэрства. Яна паказвае агульныя і асобныя рысы ваеннага майстэрства кожнай гістарычнай ступені і працэс ягонага развіцця ў розных народаў. Гісторыя ваеннага майстэрства вывучае не любыя перамены ў складзе арміі і ўзбраення, а толькі тыя, якія ўнеслі істотныя змяненні ў арганізацыю арміі і ў спосабы вядзення вайны»[14].

У якасці яшчэ аднаго важнага складніку ваеннай гісторыі Я. А. Разін вылучае гісторыю родаў войскаў, якой мы закранаць не будзем. Паводле нашага меркавання, яна з'яўляецца занадта спецыфічным прадметам, які цікавы збольшага для вузкіх спецыялістаў і не так паказальны для разумення агульнай ролі вайны ў гісторыі. Тым не менш, мы не адмаўляем важнасці гісторыі родаў войскаў непасрэдна для ваеннай навукі.

*В) Палітычная навука і міжнародныя адносіны*

Вылучаючы ваенныя падзеі з агульнай плыні гісторыі, мы не павінны забывацца, што вайна, паводле нашага азначэння, ёсць з'ява палітычная, якая ўзнікае ў адказ на палітычныя зрухі, выкарыстоўваецца ў якасці спосабу вырашэння палітычных праблем і ў сваю чаргу ўплывае на палітычныя падзеі як самадастатковы фактар. Таму, калі гісторыя пастаўляе нам фактычны матэрыял і дапамагае глыбока яго асэнсаваць, а ваенная навука факусіруе нашае асэнсаванне на канкрэтных падзеях і іх заканамернасцях, палітычная навука з'яўляецца прамежкавым звяном у нашым ланцужку пазнання і ўпісвае гэтыя падзеі ў палітычны кантэкст. Гэты кантэкст з'яўляецца асноўным вымярэннем, у якім адбываецца развіццё чалавечага грамадства, і таму палітычная навука, накіраваная на яго вывучэнне, служыць найважнейшым інструментам разумення ролі вайны ў жыцці людзей. Паколькі вайна – гэта элемент больш знешняй, чым унутранай палітыкі, нашыя акцэнты будуць змяшчацца да міжнародных адносін, аўтаномнай, але памежнай з палітычнай навукай дысцыпліны, якая даследуе адносіны палітычных суб'ектаў на міжнароднай арэне. Тэарэтычнай асновай для нас будуць служыць пастулаты *палітычнага рэалізму*, сфармуляваныя

---

[14] Разин Е. А. *История военного искусства.* С. LXVII.

ўжо згаданымі Аронам, Маргентау, Уайтам і іншымі даследчыкамі.

Палітычны рэалізм вызначае палітыку як «аўтаномную сферу дзеяння і разумення ў адрозненне ад іншых сфер, такіх, як эканоміка, этыка, эстэтыка ці рэлігія»[15]. Асноўным паняццем, якое адмяжоўвае палітыку ад іншых сфер жыцця, з'яўляецца *інтарэс*, вызначаны ў сэнсе ўжо згаданай вышэй *магутнасці*[16]. Адпаведна, кожная дзяржава як суб'ект міжнароднай палітыкі імкнецца дабіцца як мага большай абсалютнай ці адноснай магутнасці. Але карэннае адрозненне палітыкі знешняй ад палітыкі ўнутранай палягае ў тым, што ў першай адсутнічае адзіны цэнтр улады, што пры фармальнай роўнасці ўсіх дзяржаў прыводзіць да стану, блізкага да анархіі. Па словах Кенэта Уолца, «кожная дзяржава пераследуе свае ўласныя інтарэсы, як бы яны ні вызначаліся, так, як яна лічыць найлепшым. Сіла служыць сродкам дасягнення знешніх мэтаў дзяржавы, паколькі не існуе стабільнага, надзейнага працэсу прымірэння канфліктаў інтарэсаў, якія непазбежна ўзнікаюць сярод падобных адзінак у стане анархіі»[17]. Таму «канфлікт, які часам вядзе да вайны, непазбежна здараецца. Каб дасягнуць спрыяльнага выніку такога канфлікту, дзяржава мусіць разлічваць на свае ўласныя сродкі»[18], якімі, дадамо, часта бывае выкарыстанне збройнай сілы. «Знешняя палітыка, заснаваная на такой карціне міжнародных адносін, не з'яўляецца маральнай ці амаральнай, але ўвасабляе ўсяго толькі абумоўленую рэакцыю на навакольны свет»[19]. З гэтых цвярозых пастулатаў мы і будзем зыходзіць пры разуменні месца вайны ў палітычнай сферы і быцці ў цэлым.

### 6. Нацыянальны і геаграфічны абсяг даследавання

Пры выкарыстанні палітычнай гісторыі як асноўнай, так бы мовіць, дарожнай карты для нашага даследавання

---

15 Morgenthau, Hans J., *Politics Among Nations.* 5.

16 Ibid.

17 Waltz, Kenneth N., *Man, the State and War: A Theoretical Analysis.* (New York: Columbia University Press, 1959). 238.

18 Ibid. 159.

19 Ibid. 238.

непазбежна паўстае пытанне: на якую менавіта палітычную гісторыю мы мусім арыентавацца? Беларусь мае надзвычай багатую і даўнюю гісторыю, але ў даўнія часы гэты край быў падзелены паміж рознымі народамі і плямёнамі, якія не мелі паміж сабой ні палітычнага, ні этнічнага адзінства. Каго з іх можна вылучыць у якасці прамога продка цяперашняй беларускай нацыі і дзяржавы?

Беларуская і расійская савецкая гістарыяграфія давала адназначны і спрошчаны адказ на гэтыя пытанні. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці пачыналася толькі ад утварэння БССР у 1919 годзе. За этнічных продкаў сучаснай беларускай нацыі ўважалася *выключна* ўсходнеславянскае праваслаўнае насельніцтва Полацкага і Тураўскага княстваў. Нават беларуская нацыянальная гістарыяграфія не здолела пераадолець аднабаковасць гэтага погляду. Некаторыя гісторыкі, скарыстоўваючы супрацьпастаўленні кшталту «Русь/Літва» ці «Русь/скандынавы», свядома ці падсвядома даводзілі, што гэты край настолькі стаў беларускім, наколькі ён быў усходнеславянскім.

Нам такі погляд здаецца абмежаваным і няздольным адлюстраваць паўнату гісторыі беларускіх земляў. Бясспрэчна, асобныя народы і плямёны ўнеслі ў гэтую гісторыю больш за іншыя. Але, улічыўшы складанасць і непрамалінейнасць фармавання беларускай нацыі і дзяржавы, мы перакананыя, што кожны народ, які стала жыў на беларускіх землях, мусіць заняць годнае месца на старонках беларускай палітычнай і ваеннай гісторыі. Таму ў супрацьвагу ранейшым *выключным* падыходам да гісторыі беларускіх земляў мы прапануем *уключны* падыход. Адпаведна з ім як частка агульнагістарычнага працэсу, які прывёў да ўтварэння сучаснай Беларусі, будуць разглядацца падзеі, звязаныя: са славянскімі і балцкімі плямёнамі V–IX стст., узаемадзеянне якіх дало пачатак утварэнню беларускага народу; з племяннымі княжаннямі крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў; Полацкім, Тураўскім і Смаленскім княствамі; з балцкімі плямёнамі літвы і яцвягаў; а таксама са скандынавамі, якія вялі сваю ваенную і гандлёвую дзейнасць на беларускіх землях і мелі тут сталыя паселішчы. У сувязі з гэтым у геаграфічны фокус нашага даследавання трапіць найперш тэрыторыя сучас-

най Рэспубліцы Беларусь і сумежныя землі, якія былі населеныя продкамі сучасных беларусаў альбо на якіх ішлі працэсы, істотныя для гістарычнага развіцця ці этнічнага фармавання беларускага народу: Смаленшчына, Паўднёвая Пскоўшчына, Віленшчына і Падляшша. Таксама мы будзем адзначаць падзеі, якія адбываліся ўдалечыні ад беларускіх земляў, але ў якіх бралі чынны ўдзел продкі беларусаў. Такой падзеяй быў, напрыклад, паход кіеўскага князя Алега на Канстанцінопаль, у якім удзельнічалі полацкія ваяры.

## 7. Тэрміналогія

Закранаючы геаграфічныя і нацыянальныя межы, мы мусім быць уважлівымі з тэрміналогіяй. Асабліва мы будзем пазбягаць мадэрнізацыі апарату паняццяў. У прыватнасці, каб не ўвесці чытача ў зман, мы не будзем злоўжываць тэрмінам «Беларусь». Паколькі Беларусь як азначэнне нацыянальнай дзяржавы ці этнічны і геаграфічны тэрмін – з'ява пазнейшага часу, ужываць яго пры апісанні падзей нашага даследавання было б скажэннем тагачаснай рэчаіснасці. Аднак, зважаючы на тое, што гэтыя падзеі прадвызначылі ўзнікненне будучай Беларусі, а народы і дзяржавы, якія ўдзельнічалі ў іх, склалі яе аснову, мы будзем карыстацца тэрмінам «беларускія землі», гэта значыць тэрыторыі, якія адыгралі ролю ва ўтварэнні беларускага народу і беларускай дзяржавы.

Асобнага тлумачэння патрабуе і тэрмін «Русь», які вельмі часта ўжываецца ў дачыненні да земляў будучай Беларусі ў той час і ад якога, зрэшты, і паходзіць сама назва «Беларусь». Адпаведна нашай свядомай і паслядоўнай адмове ад мадэрнізацыі мы ніяк не можам атаясаміць тэрмін «Русь» пры апісанні даследаванага часу з яго пазнейшай мутацыяй «Расія» ці надаваць яму пазнейшае палітычнае і этнічнае значэнне. Мы будзем імкнуцца ўжываць гэты тэрмін гранічна блізка да яго значэння ў тыя часы і прытрымлівацца найбольш абгрунтаваных версій аб яго скандынаўскім паходжанні. Згодна з найбольш верагоднай версіяй, назва «Русь» была ўтворана ад стараісландскага слова «roÞs», якое даслоўна значыла «грабцы» і ўжывалася для азначэння дружыны ці войска, якія ў скан-

дынаваў рухаліся ў асноўным на караблях па водных шляхах зносін[20]. Фанетычнае змяненне тэрміну тлумачыцца фактам запазычання яго славянскімі мовамі праз фінаугорскія з адпаведнымі фанетычнымі асаблівасцямі. Скандынавы вялі актыўную ваенную і гандлёвую дзейнасць на прасторах паміж Балтыйскім і Чорным морамі і адыгралі значную ролю ва ўзнікненні і развіцці дзяржаўнасці на гэтых землях, што прывяло да двух сустрэчных працэсаў. Наколькі хутка скандынаўскія дружыны займалі становішча ваенна-палітычных вярхоў у славянскіх, балцкіх, фінаугорскіх і іншых абшчынах, настолькі ж хутка яны інкарпаравалі ў свой склад мясцовых жыхароў, перадаючы ім сваю назву. Таму «Русь» напачатку мела рачэй сацыяльны змест і азначала дружыннікаў і прадстаўнікоў княскай улады[21]. Пастурова назва пачала ахопліваць шырокія масы насельніцтва і ўжывацца як найменне тэрыторыі. Працэс гэты расцягнуўся ў часе з першай паловы IX ст. да канца X ст. Вынікам стала ўжыванне тэрміну «Русь» у яго палітычным значэнні да дзяржаў на балтыйска-чарнаморскім міжмор'і пад уладай гаспадароў нарманскага паходжання, а ў этнічным — да поліэтнічнага насельніцтва гэтых дзяржаў, якое складалася са славянскіх, балцкіх, фінаугорскіх, скандынаўскіх і іншых элементаў з перавагай славянскай моўнай стыхіі. Вельмі важным было і культурнае вымярэнне тэрміну. Паколькі рэлігійны фактар адыгрываў агромністую ролю ў свядомасці людзей ранняга сярэднявечча, а прыняцце і распаўсюджанне хрысціянства ў форме праваслаўя ажыццяўлялася ўладнымі вярхамі «Русі», гэтая назва часта ўжывалася і для азначэння хрысціянізаванага насельніцтва ў супрацьвагу суседнім неправаслаўным народам.

Палітычна гэтыя дзяржавы не выяўлялі ўстойлівасці ці адзінства. У IX стагоддзі Русь мела два цэнтры ўлады: у Ладазе і Ноўгарадзе на поўначы; і ў Кіеве на поўдні. У другой палове X стагоддзя існавалі асобныя дзяржавы з нар-

---

[20] Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков (IX–XII вв.).* Москва, 2001. С. 59–61.

[21] Мельникова Е. А. Петрухин В. Я. *Название «Русь» в этнокультурной истории древнерусского государства (IX–X вв.)* // Вопросы истории. № 8. Москва, 1989. С. 24–38.

манскімі дынастыямі ў Полацку, Тураве і Кіеве. Крывавыя войны за ўладу ў Кіеве ў канцы X – першай палове XI стагоддзя прывялі да часовага падпарадкавання, а затым поўнага адасаблення Полацка і частых супрацьстаянняў Кіева і Ноўгарада. Нарэшце і Кіеўская дзяржава распалася ў XII стагоддзі на некалькі драбнейшых княстваў і земляў. Этнічныя працэсы на гэтых землях былі яшчэ больш складанымі і ішлі ў рэчышчы ўтварэння протанароднасцяў з розным племянным і моўным складам.

Такім чынам, ужыванне тэрміну «Русь» для азначэння прыналежнасці да адной дзяржавы, народу ці культуры было б досыць зманлівым і недакладным. Думаецца, што нашмат больш апраўданым і правамерным будзе ўжываць гэты тэрмін як адзнаку прыналежнасці да праваслаўнага насельніцтва рэгіёна паміж Балтыйскім і Чорным морамі, на раннім этапе адзнаку прыналежнасці да княска-дружыннага слою грамадства, затым адзнаку палітычнай прыналежнасці да *групы* дзяржаў пад уладай дынастый нарманскага паходжання і няпэўную адзнаку прыналежнасці да *групы* протанароднасцяў з розным племянным і моўным складам пры пераваэе славянскай моўнай стыхіі. Менавіта да такой Русі мы і будзем залічваць Полацкае, Тураўскае і Смаленскае княствы і іх насельніцтва. Падобным чынам мы будзем ужываць і іншыя паняцці і тэрміны максімальна блізка да іх тагачаснага значэння.

## 8. Перыядызацыя

Мы будзем весці аповед, надаючы большую ўвагу тым народам і дзяржавам, якія адыгралі больш значную ролю ў фармаванні сучаснай Беларусі. Гэта неабходна зрабіць хаця б дзеля уніфікаванай перыядызацыі даследавання. У большасці выпадкаў такім лідэрам для нас будзе Полацкае княства. Тым не менш, паўторым, што адной з асноўных мэтаў гэтага даследавання будзе *шырокі* паказ ваеннай гісторыі беларускіх земляў і ўнёску ў яе розных народаў і дзяржаў.

Згодна з арыентацыяй на падзеі палітычнай гісторыі і ўключным падыходам да гісторыі беларускіх земляў мы прапануем і адпаведную перыядызацыю нашага даследавання. Сам абсяг даследавання да канца XII ст. ахоплівае так званую «далітоўскую» эпоху ў гісторыі Беларусі, гэта

значыць эпоху, якая папярэднічала ўзнікненню Вялікага Княства Літоўскага і яго дамінаванню ў палітычным жыцці рэгіёна. Мы засяроджваемся менавіта на гэтай эпосе па дзвюх прычынах. Па-першае, разгляд любой з'явы ў гістарычнай перспектыве вымагае прасачыць яе развіццё ў часовым вымярэнні. Натуральна, што найбольш поўна і дакладна гэтую з'яву можна зразумець, адсачыўшы яе развіццё ад самага зараджэння і адкрыўшы тыя прычыны, якія прывялі да яе ўзнікнення і існавання. Даследаваная намі эпоха і ёсць той час, які даў пачатак ваеннай і палітычнай гісторыі беларускіх земляў і прадвызначыў далейшыя яе кірункі. Па-другое, простая палітычная, эканамічная і вайсковая арганізацыя грамадства таго часу дае нашмат больш яснае і чыстае ўяўленне аб агульных заканамернасцях ваеннай гісторыі, чым пазнейшыя часы, дзе заканамернасці хаваюцца пад нагрувашчаннем вялізнай колькасці важных і другасных падзей, дзеючых асоб і іншых фактараў.

Традыцыйна гэты перыяд вывучаецца ў рэчышчы гісторыі Полацкага, Тураўскага і Смаленскага княстваў. Яго заканчэннем прынята лічыць сярэдзіну XIII ст., калі экспансія крыжакоў ва Усходняй Прыбалтыцы і заняпад астатніх земляў Русі, разгромленых манголамі, прывялі да аслаблення гэтых княстваў. Адпаведна, цэнтр палітычнага жыцця перамясціўся ў Панямонне, дзе былы полацкі васал Літва і мясцовыя рускія княствы ўтварылі Вялікае Княства Літоўскае, якое з цягам часу ўключыла ў сябе ўсе сучасныя беларускія землі.

З нашага пункту гледжання, змены, якія адбыліся ў палітычным ландшафце ў першай палове XIII ст., больш шчыльна злучаюць гэты час з наступнымі, як і з папярэднімі падзеямі. У XII, як і ў XI ст., Полацкае княства цвёрда трымала пад сваёй уладай літоўскія землі і Ніжняе Падзвінне і засяроджвала сваю палітыку на барацьбе з іншымі княствамі і землямі Русі. У XIII ст. Полацк ужо не мае былой улады над літоўскімі плямёнамі. Больш за тое, яны самі набываюць усё большую вагу ў палітычным жыцці як Панямоння, так і Падзвіння і нават скарыстоўваюць полацкую тэрыторыю для нападаў на пскоўскія, наўгародскія і смаленскія землі. Полацк таксама страчвае Ніжняе Падзвінне на карысць крыжакоў, далейшае змаганне з якімі

стане адным з вызначальных чыннікаў у стварэнні Вялікага Княства Літоўскага і асноўным кірункам ягонай знешняй палітыкі ў першыя стагоддзі існавання. Цяжка сказаць аб гэтым лепей за Мітрафана Доўнар-Запольскага, які таксама абраў верхняй мяжой свайго капітальнага даследавання па гісторыі Крывіцкай і Дрыгавіцкай земляў канец XII ст. «Мы сканчаем гісторыю Крывічоў і Дрыгавічоў якраз на тым перыядзе, калі ў ім заўважаецца пералом. Незалежнасць Смаленскага княжання зусім усталявалася, і яно імкнецца стварыць з сябе цэнтр на захадзе, падобны да Уладзімірскага княства на ўсходзе; інтарэсы Полацкага княства звяртаюцца на захад, да Немцаў і Літоўцаў; апошні элемент, відавочна, пачынае займаць тут заўважнае месца, уваходзіць у больш цесныя стасункі з Палачанамі, пачынаецца ў ім абуджэнне, заўважнае ў апошняй чвэрці XII стагоддзя, якое цяжка прасачыць па наяўных крыніцах, але сляды якога рэльефна сказаліся толькі да паловы наступнага стагоддзя. Нарэшце, Турава-Пінская вобласць атрымлівае пэўную самастойнасць, сваю лінію князёў, яе інтарэсы таксама звяртаюцца, з-за падзення Кіева, на захадзе, да Галіча, цэнтр зямлі са старажытнага Турава пераходзіць у Пінск»[22]. Па гэтых прычынах канец XII ст. і стане верхнім рубяжом нашага даследавання.

Ніжні храналагічны рубеж нашага даследавання вызначыць нашмат больш складана. Па-першае, вызначыўшы вайну як з'яву палітычную і непасрэдна звязаную з дзяржаўным жыццём, мы мусім пакінуць па-за межамі ваеннай гісторыі хаатычныя ўзброеныя сутыкненні першабытных плямёнаў. Мы можам вывучаць ваенныя канфлікты дадзяржаўнага перыяду толькі як *перад*гісторыю, толькі ў той ступені, у якой яны зрабілі ўнёсак у працэс дзяржаватварэння, і толькі ў перыяд, які непасрэдна папярэднічаў гэтаму працэсу. Такой перадгісторыяй мы можам лічыць рассяленне славянскіх плямёнаў на беларускіх землях і іх узаемадзеянне з аўтахтоннымі балцкімі плямёнамі. Менавіта масавыя перамяшчэнні народаў прывялі да ўздыму ўзброеных сутыкненняў, павелічэння колькасці ўцягнутых у іх людзей і выкліканага гэтымі факта-

[22] Довнар-Запольский М. *Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель до конца XII столетия.* Киев, 1891. С. VI.

рамі закладання перадумоў дзяржаўнасці.

Па-другое, нават вызначыўшыся з сутнасцю таго моманту, ад якога пачынаецца адлік ваеннай гісторыі, мы непазбежна сутыкаемся з цяжкасцямі, калі спрабуем храналагічна прывязаць яго да пэўных дат. Дакладных пісьмовых крыніц па дадзяржаўным перыядзе гісторыі беларускіх земляў амаль не існуе, а беларуская эпічная традыцыя захавала пра той час мала звестак. Таму даводзіцца ў асноўным спадзявацца на археалагічныя крыніцы і ўскосныя дадзеныя пісьмовых, што дазваляе нам рабіць вельмі прыкладныя датоўкі. На гэтых падставах ніжні рубеж гэтага даследавання можна аднесці да канца V ст., калі пачалася міграцыя славянскіх плямёнаў на асноўную частку тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Ваенная гісторыя беларускіх земляў у вызначаных часовых рубяжах будзе падзеленая на чатыры драбнейшыя перыяды.

Першы перыяд ахоплівае час ад V да пачатку IX стст. і можа быць названы дадзяржаўным. Як мы ўжо зазначалі, сутнасць гэтага перыяду заключаецца ў рассяленні славянскіх плямёнаў на беларускіх землях, іх узаемадзеянні з мясцовымі балцкімі плямёнамі і паступовым выспяванні перадумоў для пераўтварэння грамадскага ладу гэтых плямёнаў з ваеннай дэмакратыі ў раннюю дзяржаву.

Другі перыяд закранае час з 820-х да 970-х гг. Ён звязаны з уваходжаннем большасці беларускіх земляў у склад Кіеўскай дзяржавы, а таксама ўзнікненнем і развіццём самастойных дзяржаў у Полацку і Тураве. Гэты перыяд можа быць умоўна названы нарманскім, паколькі названыя дзяржавы, захоўваючы свой мясцовы характар, кіраваліся, аднак, прышлымі нарманскімі валадарамі. Перыяд завяршаецца захопам Полацка наўгародскім (пазней кіеўскім) князем Уладзімірам і гібеллю апошняга нарманскага гаспадара Полацка Рагвалода.

Трэці перыяд, альбо перыяд магутнасці, характарызуецца паступовым выхадам Полацка з-пад улады Кіева, росквітам яго палітычнай сілы, войнамі з Кіеўскай дзяржавай і падпарадкаваннем Літвы і Ніжняга Падзвіння. Ён працягваецца ад 970-х гг. да 1101 г., году смерці Усяслава Чарадзея.

Чацвёрты і апошні перыяд даследаванага часу, перыяд міжусобных войнаў, працягваецца ад 1102 г. да канца XII ст. Ён уключае такія з'явы, як: распад Полацкай зямлі на асобныя княствы і ўнутраную барацьбу ў ёй, працяг барацьбы з Кіеўскай дзяржавай і яе асобнымі княствамі, значны ўплыў Смаленскага княства на падзеі ў краі, узрастаючую ролю Літвы ў палітычным жыцці беларускіх земляў.

Дадзеная перыядызацыя з'яўляецца ўмоўнай, як і любая перыядызацыя, якая адвольна падзяляе бесперапынную плынь гісторыі на асобныя часткі. Але мы думаем, што яна да пэўнай ступені адлюстроўвае тыя змены, якія адбываліся цягам часу з роляй вайны ў жыцці грамадства, развіццём вайсковай арганізацыі, зброі і спосабаў бою. Гэта мы і паспрабуем паказаць у нашым даследаванні.

## 9. Кампазіцыя

Цяпер, прайшоўшы ўвесь шлях распрацоўкі тэарэтычных асноў нашага даследавання, мы мусім сказаць некалькі слоў пра тое, якім чынам яны будуць упісвацца ў наш аповед. Асновай яго стане храналагічная плынь гісторыі, у адпаведнасці з нашай перыядызацыяй падзеленая на чатыры перыяды. Кожная з іх будзе ўтрымліваць тры раздзелы: гісторыі непасрэдна войнаў, уплыву вайны на развіццё грамадства і гісторыі ваеннага майстэрства. Першыя два раздзелы будуць адпавядаць двум узроўням асэнсавання ваеннай гісторыі. Першы ўзровень мае збольшага фактаалагічны характар і датычыцца аналізу і збору фактаў, якія дапамагаюць аднавіць агульную плынь гісторыі[23]. Другі ўзровень вядзе нас да тэарэтычнага абагульнення фактаў. Да пэўнай ступені ён замяняе канкрэтныя гістарычныя рэаліі абстрактнымі катэгорыямі. Ён тлумачыць сутнасць гэтых катэгорый і агульныя правілы і заканамернасці, якім гэтыя катэгорыі падпарадкоўваюцца, а таксама вызначае ўзоры іх паводзін[24]. Таму першы раздзел будзе падаваць агульную інфармацыю па гісторыі войнаў на беларускіх землях у адпаведны перыяд часу, характэрныя асаблівасці войнаў таго перыяду, іх прычы-

---

23 Aron, Raymon, *Peace and War: A Theory of International Relations,* 2.
24 Ibid. 14, 17.

ны, ходу і вынікі. Другі раздзел засяродзіцца на сувязі вайны з палітычнай гісторыяй, эканамічным і культурным развіццём беларускіх земляў і яе агульным значэнні для гісторыі краю. Трэці раздзел будзе прысвечаны больш вузкаспецыяльнай тэме гісторыі ваеннага майстэрства ў ходзе войнаў, а менавіта: развіццю вайсковай арганізацыі, развіццю зброі і ваеннай тэхнікі, аблозе і абароне крэпасцяў і развіццю стратэгічных і тактычных спосабаў вядзення вайны. Магчыма, такая кампазіцыя даследавання будзе не самай захапляльнай для чытача. Аднак, на наш погляд, яна дазволіць даць найбольш яснае і лагічнае ўяўленне аб прадмеце даследавання: вайне ў гісторыі беларускіх земляў.

На заканчэнне гэтых працяглых уводзін хацелася б сказаць некалькі слоў у апалогію нашага даследавання. Яно не ёсць і не можа быць дасканалым. Можна ўпэўнена прадказаць, што яно непазбежна выкліча крытыку з розных бакоў. Па-першае, яно прыцягне ўвагу знаўцаў пэўных перыядаў гісторыі і спецыялістаў у асобных адгалінаваннях навукі, якія могуць слушна заўважыць, што не ўсе падыходы распрацаваныя аднолькава добра, не ўсе крыніцы ўзятыя пад увагу, не ўсе факты згаданыя ці асветленыя належным чынам. Па-другое, камусьці абавязкова кінуцца ў вочы канцэптуальныя недахопы. У адказ на гэта можна зазначыць, што недакладнасці ў асвятленні «вузкіх» момантаў амаль што запраграмаваныя для даследаванняў такога кшталту, якія стаяць на раздарожжы некалькіх галін навукі і закранаюць вялікія перыяды часу. У такіх выпадках дэталі з'яўляюцца верагоднай ахвярай спробы ўбачыць агульную карціну падзей. Тым не менш, мы будзем імкнуцца ставіцца да асобных дэталяў як можна больш уважліва. Што ж датычыцца канцэптуальных недахопаў, то наша даследаванне з'яўляецца толькі адной з першых спроб закласці тэарэтычныя асновы ваеннай гісторыі Беларусі і вывучыць, прынамсі, яе першы перыяд. Калі ж нехта возьмецца дапоўніць гэтае даследаванне, паправіць ці абвергнуць яго, то аўтар будзе толькі вітаць гэта як яшчэ адзін крок па дарозе ведаў у кірунку ісціны.

Кніга I.

# Дадзяржаўны перыяд
## (канец V – пачатак IX стст.)

# *Раздзел 1.*
# Гісторыя войнаў

«І вось, як сказана, у біскупства набожнай памяці біскупа Іаана здарылася, што ўзняўся народ славян, незлічоная гурма, што складалася з *драгувітаў*, сагудатаў, велегезітаў, ваюнітаў, верзітаў і іншых народаў. Найперш яны вырашылі зрабіць чоўны з аднаго дрэва і, узброіўшыся на моры, спустошыць усю Фесалію і астравы вакол яе і Элады, а таксама і Кікладскія астравы і ўсю Ахаю, Эпір і [большую] частку Ілірыка і частку Асіі, зрабіць бязлюднымі мноства гарадоў і правінцый»[1]. Такімі словамі расказваў аб падзеях пачатку VII стагоддзя на Балканах і ў Малой Азіі візантыйскі аўтар «Цудаў святога Дзімітрыя Солунскага». Праз вякі, у IX ст. славуты англасаксонскі падарожнік Вульфстан, наведаўшы гандлёвы горад Труза ў зямлі эстыяў на ўсход ад Віслы (магчыма, на месцы сучаснага Эльблёнгу ў Польшчы), распавёў англійскаму каралю Альфрэду: «Эстланд вельмі вялікі і там вельмі шмат гарадоў і ў кожным горадзе ёсць кароль... І паміж імі пануе вялікая варожасць»[2].

Гэтыя два паведамленні прыблізна акрэсліваюць часовыя, этнічныя і грамадскія межы першага, альбо дадзяржаўнага, перыяду нашага даследавання. Першы ўрывак датычыцца часоў Вялікага перасялення народаў, калі нашэсці гунаў і авараў з усходу і заняпад багатай Рымскай імперыі прывялі ў рух народы амаль на ўсёй прасторы Еўразійскага кантыненту. Адны з іх ратаваліся ад націску больш магутных суседзяў. Іншыя спадзяваліся здабыць

---

[1] Чудеса св. Димитрия Солунского. Гл. 179. (Далей: Miracul. Demetr.) // Свод древнейших письменных известий о славянах. Т. II. Москва, 1995. С. 125—127. (Далей: Свод...).

[2] Орозий короля Альфреда. (King Alfred's Orosius) // Матузова В. И. Английские средневековые источники IX—XIII вв. Москва, 1979. С. 26.

багатыя скарбы старых цывілізацый Міжземнамор'я ці проста знайсці для сябе больш урадлівыя глебы. Другі ўрывак распавядае пра часы, калі вялікія міграцыйныя рухі саступілі месца паступовай стабілізацыі палітычнай і этнічнай карты Еўропы і складаным працэсам утварэння новых устойлівых дзяржаў і народнасцяў. Адзін фрагмент апавядае пра адносіны Візантыйскай імперыі і славян, сярод якіх згадваюцца *драгувіты,* якія ў той час пачыналі сваё рассяленне па Цэнтральнай і Усходняй Еўропе. Другі, ужываючы, паводле старой лацінскай традыцыі, найменне эстыяў, на самой справе апісвае балтаў, якія тады займалі не толькі паўднёва-ўсходняе ўзбярэжжа Балтыйскага мора, але і большую частку сучаснай тэрыторыі Беларусі. Менавіта шматвяковае ўзаемадзеянне гэтых дзвюх груп плямёнаў на досвітку гісторыі Беларусі і паклала пачатак утварэнню беларускага этнасу. Калі першы аўтар занатоўвае падзеі тых часоў, калі славяне жылі ў народаўладдзі[3], то другі, згадаўшы пра каралёў, адкрывае перад намі перыяд, калі ў балтаў і іншых плямёнаў традыцыйныя інстытуты патрыярхальнага грамадства пачыналі адступаць перад узніклымі дружынамі ваяроў на чале з вайсковымі правадырамі, якія прэтэндавалі не толькі на традыцыйны аўтарытэт, але і на *ўладу*, ведучы да ператварэння патрыярхальнага грамадства ў дзяржаву. Нарэшце, абодва аўтары апісваюць з'яву, якая адыгрывала агромністую ролю ў жыцці і славян, і балтаў: вайну.

Нягледзячы на існаванне асобных пісьмовых крыніц, мы вымушаны для даследавання гэтага перыяду карыстацца збольшага дадзенымі археалогіі, якія даюць пэўнае і часам досыць добрае ўяўленне аб матэрыяльнай культуры тагачасных насельнікаў беларускіх земляў і іх грамадскім ладзе, але мала дапамагаюць высветліць канкрэтыку падзей.

Эпоха Вялікага перасялення народаў на беларускіх землях вызначылася складанымі міграцыямі насельніцтва і этнакультурнымі працэсамі, якія прывялі да знікнення старых і ўзнікнення новых племянных супольнасцяў,

---

[3] Прокопий Кесарийский. *Война с готами.* VII, 14. Москва, 1996. С. 249. (Далей: Procop. Bell. Goth.).

воблік якіх можа быць найлепш адлюстраваны праз паняцце археалагічных культур. З V ст. большую частку беларускіх земляў займалі плямёны банцараўскай культуры, названай так паводле гарадзішча Банцараўшчына пад Мінскам. Помнікі гэтай культуры прасочваюцца да VIII ст. і займаюць большую частку Цэнтральнай Беларусі паміж Верхнім Панямоннем і Бярэзінай, беларускае Падзвінне і заходзяць на поўнач ад межаў Беларусі[4]. Банцараўскае насельніцтва ў асноўным жыло ў неўмацаваных паселішчах, якія знаходзіліся побач з гарадзішчамі-сховішчамі, акружанымі магутнымі ўмацаваннямі. Раскопкі тыповага банцараўскага гарадзішча ў аднайменнай вёсцы Мядзельскага раёну выявілі рэшткі вала, рова і абарончай сцяны[5].

На ўсходзе банцараўскія плямёны суседзілі з роднаснымі і падобнымі ім па культуры плямёнамі тушамлінскай культуры (ад назвы гарадзішча Тушамля пад Смаленскам), якія займалі верхняе цячэнне Дняпра[6]. На тэрыторыі, занятай тушамлінскімі плямёнамі, неўмацаваныя паселішчы гэтаксама суседзілі з гарадзішчамі-сховішчамі, якія выконвалі і функцыі рэлігійных цэнтраў для навакольных жыхароў[7].

Тэрыторыі на паўднёвы захад ад тушамлінскай культуры былі занятыя плямёнамі калочынскай культуры (ад назвы гарадзішча Калочын на Дняпры ў Гомельскай вобласці). Калочынская культура распаўсюджвалася на Беларускае Падняпроўе і Пасожжа, левы бераг ніжняга цячэння Прыпяці, Падзясенне і частку басейнаў Сулы і Сейма[8] і праіснавала з V да пачатку VIII стст. Паселішчы калочынцаў размяшчаліся купкамі недалёка адно ад аднаго і ўтваралі своеасаблівыя акругі вакол гарадзішчаў-сховішчаў[9].

Вельмі складаным пытаннем з'яўляецца этнічная прыналежнасць гэтых трох блізкіх адна адной культур. Пры-

---

[4] Гісторыя Беларусі. Т. 1. Мн., 2000. С. 125–127.
[5] Археалогія Беларусі. Т. 2. Мн., 1999. С. 361–362.
[6] Тамсама. С. 374.
[7] Седов В. В. *Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья* // Материалы и исследования по археологии СССР. Москва, 1970. № 163. С. 49–50.
[8] Археалогія Беларусі. Т. 2. С. 348. Гісторыя Беларусі. Т. 1. С. 128.
[9] Гісторыя Беларусі. Т. 1. С. 128.

намсі, меркаванні даследчыкаў на гэты конт значна разыходзяцца. Некаторыя з іх выказваюцца на карысць прыналежнасці плямёнаў банцараўскай, тушамлінскай і калочынскай культур да балтаў[10]. Іншыя аддаюць перавагу славянам[11]. У кожным выпадку адзначаецца, што пэўная частка старажытнасцяў, знойдзеных на тэрыторыі распаўсюджання гэтых культур, мае падабенства да пазнейшых славянскіх узораў і з'явілася, хутчэй за ўсё, пад славянскім уплывам[12]. Можна меркаваць, што ў дадзены час адбываўся працэс маруднага перасялення славянскіх плямёнаў на тэрыторыі банцараўскай, тушамлінскай і калочынскай культур. У ходзе міграцыі славяне прыўносілі свой уплыў у матэрыяльную і духоўную культуру балтаў і, знаходзячыся ў атачэнні больш шматлікага балцкага насельніцтва, часткова асіміляваліся самі[13]. У выніку мясцовыя культуры набылі заўважны двуэтнічны характар з перавагай балцкіх элементаў у банцараўскай і тушамлінскай культурах[14] і выразным славянскім уплывам у культуры калочынскай[15].

Якімі бы ні былі суадносіны балцкага і славянскага пачаткаў у згаданых культурах, ні цяперашні стан археалагічных дадзеных, ні сама іх прырода не дазваляюць дакладна адказаць на гэтае пытанне. Нават вызначыўшыся з моўнай атрыбуцыяй дадзеных культур, мы не ў стане вызначыць іх этнічную самасвядомасць[16]. Але так ці інакш, для нас пытанне этнічнай прыналежнасці згаданых культур з'яўляецца другасным. Калі мы звязваем ваенную гісторыю з гісторыяй палітычнай, нас найперш цікавяць адносіны паміж грамадствамі, а не этнасамі. Ніжэйзгаданыя падзеі пакажуць чаму.

---

10 Гісторыя Беларусі. Т. 1. С. 125, 130; Седов В. В. *Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья*. С. 48–49; Археалогія Беларусі. Т. 2. С. 376.

11 Калочынская культура // Археалогія і нумізматыка Беларусі. Энцыклапедыя. Мн., 1993. С. 297.

12 Археалогія Беларусі. Т. 2. С. 358.

13 Гісторыя Беларусі. Т. 1. С. 127–128.

14 Штыхаў Г. В. *Крывічы*. Мн., 1992. С. 95.

15 Гісторыя Беларусі. Т. 1. С. 130.

16 Рассадзін С. Я. *Этнас поўдня Беларусі ў далетапісны час* // Старонкі гісторыі Беларусі. Мн., 1992. С. 22.

Пакуль што самы важны для нас факт, што на гэтым этапе ўзаемаадносіны славянскіх і балцкіх плямёнаў мелі збольшага мірную прыроду, аб чым сведчыць распаўсюджанасць балцкіх гідронімаў (назваў вадаёмаў) на ўсіх беларускіх землях і прылеглых тэрыторыях. Гэта магло адбыцца толькі ў выпадку доўгага мірнага суіснавання балтаў і славян і, адпаведна, іх моўнага ўзаемадзеяння [17].

Пранікненне славян на землі ўсходніх балтаў адбывалася з розных напрамкаў, сярод якіх адным з найважнейшых быў паўднёвы. Тэрыторыя на поўдзень ад Прыпяці з'яўляецца тым месцам, дзе былі знойдзеныя найстаражытнейшыя славянскія помнікі на беларускіх землях. Гэтыя помнікі адносіліся да пражскай культуры (помнікі тыпу Прага – Карчак), якая існавала ў V–VII стст., і культуры тыпу Лукі-Райкавецкай, якая змяніла пражскую ў VIII ст. і праіснавала да X ст.[18] Як і прадстаўнікі іншых плямёнаў на тагачасных беларускіх землях, плямёны пражскай культуры перажывалі працэс распаду патрыярхальнага грамадства і паступовага сацыяльнага расслаення. Аб гэтым сведчаць раскопкі гарадзішча VII–IX стст. на Століншчыне каля вёскі Хотамель, якое служыла месцам знаходжання племяннай вярхушкі, у той час як суседнія паселішчы былі населеныя простымі абшчыннікамі-земляробамі [19]. Носьбіты культур тыпу Прага – Карчак і Лука-Райкавецкая ўключалі і адгалінаванне славянскага племені, якое карысталася назвай дрыгавічоў ужо ў гэты перыяд і пазней увайшло ў склад аднайменнага племяннога саюзу [20]. Існуе верагоднасць таго, што вядомыя па «Цудах святога Дзімітрыя Солунскага»[21] і іншых візантыйскіх крыніцах *драгувіты,* якія ў выніку перасяленняў узялі чынны ўдзел у экспансіі славян на Балканах, былі паўднёвабеларускім дрыгавічам роднасныя. Яны згадваліся ў крыніцах яшчэ ў канцы IX ст. як жыхары Фракіі і ваколіц Солуня (Фесалонікі) у Македоніі [22].

---

17 Алексеев Л. В. *Полоцкая земля. Очерки истории Северной Белоруссии в IX–XIII вв.* Москва, 1966. С. 31–32.

18 Археалогія Беларусі. Т. 2. С. 317–348.

19 Гісторыя Беларусі. Т. 1. С. 131–132.

20 Лысенко П. Ф. *Туровская земля IX–XIII вв.* Мн., 2001. С. 67–68; Седов В. В. *Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья.* С. 83.

21 Miracul. Demetr. 179 // Свод... II. С. 125.

22 Лысенко П. Ф. *Туровская земля IX–XIII вв.* С. 35.

Побач з рассяленнем славян на правабярэжжы Прыпяці ішло і іх пранікненне ў Беларускае Пабужжа. Вынікі археалагічных раскопак неўмацаваных паселішчаў каля вёскі Блювінічы Брэсцкага раёна сведчаць аб прысутнасці славян у Пабужжы ўжо ў VI–VII стст.[23] Не выключана, што са славянамі ў Пабужжы суседзілі яцвягі, потым імі асіміляваныя. Яцвягі пакінулі пасля сябе каменныя курганы[24].

Працэс перасялення славян на пераважна балцкія землі адбываўся таксама на поўначы і быў звязаны з культурай доўгіх курганоў у Беларускім Падзвінні. Носьбіты гэтай культуры з'явіліся на беларускіх землях у канцы V – пачатку VI ст.[25] (па іншых дадзеных — у VI–VII стст.). Доўгі час славянскія перасяленцы складалі тут меншасць сярод балцкага насельніцтва[26]. У пазнейшы час абедзве этнічныя групы ўзялі ўдзел у стварэнні племяннога саюзу крывічоў[27].

Не закранутымі славянскай каланізацыяй засталіся землі Беларускага Панямоння і Віленшчыны. Гісторыя земляў па левым беразе Нёмана ў гэты перыяд прасочваецца даволі цьмяна, але археалагічныя дадзеныя дазваляюць меркаваць аб іх засяленні яцвягамі – носьбітамі культуры каменных курганоў[28]. Правабярэжжа Нёмана і верхняе цячэнне Віллі былі месцам распаўсюджання культуры ўсходнелітоўскіх курганоў, якая дала пачатак узнікненню і развіццю літоўскай народнасці[29]. Найбольшая колькасць даследаваных помнікаў усходнелітоўскай культуры знаходзіцца каля возера Свір[30]. Падобныя знаходкі былі таксама распаўсюджаныя на ўсходзе сучаснай Літвы[31].

---

[23] Каробушкіна Т. М. *Насельніцтва Беларускага Пабужжа, X–XIII стст.* Мн., 1999. С. 11–12.

[24] Седов В. В. *Курганы ятвягов* // Советская археология. Москва, 1964. № 4. С. 36, 51.

[25] Штыхаў Г. В. *Крывічы.* Мн., 1992. С. 94–95.

[26] Алексеев С. В. *Славянская Европа V–VI веков.* М., 2005. С. 168.

[27] Седов В. В. *Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья.* С. 104–105.

[28] Зверуго Я. Г. *Верхнее Понеманье в IX–XIII вв.* Мн., 1989. С. 30–31; Финно-угры и балты в эпоху средневековья. Москва, 1987. С. 411–414.

[29] Археалогія Беларусі. Т. 2. С. 384–391.

[30] Тамсама. С. 385.

[31] Казакявичюс В. К. *Оружие балтских племен II–VII веков на территории Литвы.* Вильнюс, 1988. С. 56–57.

Характэрнай рысай дадзенай культуры з'яўляецца вялікая колькасць прадметаў узбраення ў пахаваннях, што сведчыць аб вялікай колькасці ўзброеных канфліктаў паміж балцкімі плямёнамі ў той час і няўхільным вылучэнні ўзброеных дружыннікаў з агульнай масы абшчыннікаў[32].

Такім чынам, у V–VII стст. славянскае насельніцтва пераважала на поўдзень ад Прыпяці. У цэнтры, на ўсходзе і поўначы беларускіх земляў славяне ўзялі ўдзел у фарміраванні і развіцці банцараўскай, тушамлінскай і калочынскай культур. Іх прасоўванне ў глыбіню заселеных балтамі земляў на першым этапе насіла збольшага мірны характар. Беларускае Панямонне цалкам засталося ўбаку ад славянскае каланізацыі.

Канец VII ст. адзначыў пачатак новага вялікага этапу падзей у гісторыі беларускіх земляў. Працяг вялікіх перасяленняў народаў ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе ізноў узрушыў славянскія плямёны, якія непасрэдна межавалі з балтамі, і падштурхнуў іх да далейшых перасяленняў у глыбіню балцкіх земляў. Адной з прычын, якія выклікалі гэтыя перасяленні, была натуральная патрэба ў асваенні новых тэрыторый для ляднага земляробства[33]. Другой прычынай актывізацыі славянскіх перасяленняў была ваенная дзейнасць у Еўропе цюркскіх качэўнікаў – авараў[34].

Ціск качэўнікаў быў адной з прычын Вялікага перасялення народаў увогуле і ягоных водгукаў на беларускіх землях у прыватнасці[35]. Даследчыкі адзначаюць, што ўжо рух крывічоў на поўнач мог быць выкліканы з'яўленнем у IV–V стст. у Еўропе гунаў[36]. У VI ст. гунаў на прасторах Усходняй Еўропы заступілі авары, панаванне якіх цягнулася да VIII ст. Той жа факт, што яшчэ ў канцы IX ст. радзімічы ў Падняпроўі плацілі даніну хазарам, робіць уплыў качэўнікаў-стэпавікоў на беларускія землі адной з найбольш цікавых, але мала вывучаных тэм раннесярэднявечнай гісторыі.

---

32 Тамсама. С. 135.

33 Археалогія Беларусі. Т. 2. С. 362.

34 Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков.* С. 33.

35 Чарняўскі М. М. *Ілюстраваная гісторыя старадаўняй Беларусі: Першабытны перыяд.* Мн., 2003. С. 120–121.

36 Алексеев С. В. *Славянская Европа V–VI веков.* С. 167.

Узаемадзеянне авараў са славянамі і балтамі было складаным. З аднаго боку, аварскі прыгнёт прымаў невыносныя для славян формы, што фіксуе ўжо «Повесть временных лет» у апавяданні аб гвалце авараў над дулебамі [37]. Славяне вымушаны былі пакідаць абжытыя тэрыторыі і ў пошуках паратунку рухацца на паўночныя балцкія землі. З іншага боку, некаторыя славянскія плямёны знаходзілі падпарадкаванне аварам вельмі зручным. Аварская магутнасць давала славянам магчымасць прымаць удзел у рабаўніцкіх войнах авараў з добрымі шанцамі на здабычу і заняцце новых земляў. Як красамоўна апавядае «Хроніка Фрэдэгара», у заходнееўрапейскіх кампаніях славяне ўтваралі дзве пярэднія баявыя лініі аварскага войска [38]. Таму авары маглі прадпрымаць рабаўніцкія рэйды на балцкія землі незалежна ад славян альбо, наадварот, ведучы іх у бой і выкарыстоўваючы іх як свой авангард. Знаходкі аварскай зброі на пажарышчах балцкіх гарадзішчаў сведчаць аб іх непасрэдным удзеле ва ўзброеных канфліктах на беларускіх землях у гэты час. Але калі аварская прысутнасць на беларускіх землях была не вельмі заўважнай і доўгай, то славяне прыйшлі, каб застацца.

Другая хваля славянскіх перасяленняў адбывалася ў асноўным па ранейшых напрамках. Носьбіты культуры доўгіх курганоў, продкі крывічоў, працягвалі сваю каланізацыйную дзейнасць на поўначы беларускіх земляў, у Падзвінні і Верхнім Падняпроўі [39]. Прадстаўнікі культуры тыпу Лукі-Райкавецкай рухаліся з поўдня на поўнач уверх па цячэнні Бярэзіны і правабярэжжы Дняпра, а таксама, перайшоўшы Прыпяць, пачыналі засяляць яе левабярэжжа. У перасяленні ўзялі ўдзел і прадстаўнікі яшчэ адной славянскай культуры – раменскай. Іх рух на поўнач ішоў у левабярэжжы Дняпра ўздоўж басейна Сажа [40].

Гэтым разам рух славян меў ужо іншы характар. Яго масавасць непазбежна правакавала ўзброеныя сутыкненні паміж тубыльцамі і прыхаднямі з-за ворнай зямлі і матэ-

---

37 Лаврентьевская летопись. Москва, 2001. Ст. 11–12.

38 Хроника Фредегара. III, 68. (Далей: Fred.) // Свод... Т. II. С. 369–370.

39 Штыхаў Г. В. *Крывічы*. С. 95.

40 Гісторыя Беларусі. Т. 1. С. 127.

рыяльных каштоўнасцяў, якія паступова пачыналі з'яўляцца з прычыны росту вытворчасці і абмену і збірацца ў гарадзішчах-сховішчах. Нават велізарныя плошчы рэдказаселеных земляў не маглі развесці славян і балтаў, што прыводзіла да шматлікіх сутычак. Найбольшы націск славян зазналі плямёны, якія жылі ў басейне Дняпра. Калі лясісты забалочаны ландшафт і адсутнасць вялікіх левых прытокаў у Прыпяці маглі стрымліваць славян на поўдні беларускіх земляў, то Падняпроўе з яго шырокімі далінамі рэк уяўляла сабой добрую мясцовасць для руху вялікіх колькасцяў людзей. Таму лёс падняпроўскіх калочынскай і тушамлінскай культур склаўся незайздросна.

Паводле археалагічных дадзеных, на мяжы VII і VIII стст. падняпроўскія гарадзішчы Калочын, Нікадзімава, Вежкі, Тушамля і іншыя загінулі ў полымі ў выніку нападаў чужынцаў[41]. У некаторых выпадках гэта было справай рук славян. Апошнія знаходкі наканечнікаў аварскіх стрэл у Нікадзімаве даводзяць і актыўны ўдзел авараў у трагедыі балцкіх культур[42]. Калочынцы і тушамлінцы часткова загінулі ў змаганні з заваёўнікамі, часткова былі вымушаныя адступіць у цэнтральныя і паўночныя беларускія землі, а часткова зліліся з прышэльцамі[43]. Прасоўванне слав'ян на землі, занятыя плямёнамі банцараўскай культуры, было больш мірным. Аднак і тут тубыльцы зведалі сваю долю канфліктаў з прышэльцамі. Аб гэтым сведчаць, у прыватнасці, сляды пажару абарончай сцяны банцараўскага гарадзішча ў вёсцы Гарадзішча Мядзельскага раёну[44].

Існуе вялікая спакуса па гэтых слядах абвясціць працэс перасялення сутыкненнем этнасаў і культур, дзе адзін бок застаўся пераможцам, другі – пераможаным. Між тым лініі размежавання, якая б сведчыла аб такім сутыкненні, не існуе. Па-першае, у многіх выпадках адносіны паміж славянскімі і балцкімі плямёнамі былі мірнымі. Па-дру-

---

41 Седин А. *Никодимово – городище третьей четверти I-го тысячелетия н. э. в Восточной Беларуси* // Край=Kraj. Polonica – Albaruthenica – Lithuanica. Магілёў, 2000. С. 32.

42 Бацюкоў А. *Самы старадаўні меч* // Наша Ніва. № 36 (394), 1 кастрычніка 2004. Мінск. С. 5.

43 Тамсама. С. 130.

44 Археалогія Беларусі. Т. 2. С. 362.

гое, цяжка сумнявацца ў тым, што і паміж самімі каланістамі-славянамі адбываліся сутычкі з-за здабычы і земляў. Па-трэцяе, паколькі калочынская, тушамлінская і банцараўская культуры ўжо ўтрымлівалі ў сабе славянскі элемент, то можна дапусціць, што здаўна аселыя на беларускіх землях славяне першай хвалі маглі аказваць супраціўленне славянскім каланістам другой хвалі. Нарэшце, і балцкія плямёны не былі застрахаваныя ад канфліктаў паміж сабой. Можна зрабіць выснову, што ў выпадку ўзброеных канфліктаў мяжа варожасці праходзіла не паміж славянамі і балтамі, а паміж дзвюма і больш асобна ўзятымі абшчынамі, незалежна ад таго, да якога этнасу яны належалі. Канфлікты таго часу на беларускіх землях мелі не этнічны, а міжабшчынны і, значыць, грамадска-палітычны характар. Этнічныя працэсы ішлі паралельна з грамадскімі, залежалі ад іх, у сваю чаргу ўплывалі на іх, але дакладна ім не адпавядалі.

Другі этап перасялення славян на беларускія землі ў канцы VII – пачатку IX стст. прывёў да ўтварэння супольнасцяў на зусім новай аснове. У сацыяльным вымярэнні натуральны працэс распаду родавых сувязяў у грамадствах славян і балтаў і іх замены тэрытарыяльнымі быў узмоцнены, прынамсі ў славян, перамяшчэннем насельніцтва на вялікія адлегласці і ў абедзвюх груп народнасцяў узаемнай асіміляцыяй. З'явілася імкненне да аб'яднання пасобных плямёнаў у шырэйшыя тэрытарыяльныя супольнасці, якія ў меншай ступені былі прасякнутыя сваяцкімі сувязямі і этнічнай роднасцю. Яны ўяўлялі сабой саюзы плямёнаў – княжанні пад кіраўніцтвам новай вайскова-дружыннай знаці, што вылучылася ва ўзброеных канфліктах часоў перасялення. У адпаведнасці з летапіснымі звесткамі, на беларускіх землях былі вядомыя княжанні крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў[45]. Паколькі кіраванне ў княжаннях яшчэ не насіла дзяржаўнага характару, яны могуць быць вызначаныя як протадзяржаўныя.

У этнічным вымярэнні княжанні былі вынікам шматвяковага як мірнага, так і ваеннага ўзаемадзеяння паміж славянамі і балтамі. Маючы славянамоўны характар, яны

---

[45] Гісторыя Беларусі. Т. 1. С. 136.

арганічна спалучалі элементы духоўнай і матэрыяльнай культуры славян і балтаў[46]. Адзінства мовы, культуры, грамадскай структуры і тэрыторыі дазваляе ў этнічным сэнсе вызначыць крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў як протанароднасці[47]. Да сярэдзіны IX ст. крывічы засялілі Сярэдняе Падзвінне і Верхняе Падняпроўе і пачалі рух уніз па Бярэзіне[48]. Дрыгавічы занялі левабярэжжа Прыпяці да самага Дняпра на ўсходзе[49], але яшчэ не дасягнулі вытокаў Лані і Случы на поўначы[50]. Радзімічы аселі ў Пасожжы да Гарадка, Мсціслава, Чавус і Новага Быхава на поўначы, мяжуючы на захадзе з дрыгавічамі па Дняпры і на ўсходзе з вяцічамі па рацэ Судасці[51]. Разам з Панямоннем цэнтральная і паўночна-заходняя часткі беларускіх земляў засталіся балцкімі.

Утварэнне і развіццё княжанняў крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў адзначыла апошні этап дадзяржаўнага перыяду гісторыі беларускіх земляў.

---

46 Штыхаў Г. В. *Крывічы*. С. 106–107.
47 Гісторыя Беларусі. Т. 1. С. 136.
48 Алексеев Л. В. *Полоцкая земля*. С. 51.
49 Лысенко П. Ф. *Дреговичи*. Мн., 1991. С. 94–97.
50 Алексеев Л. В. *Полоцкая земля*. С. 51.
51 Гісторыя Беларусі. Т. 1. С. 143–144.

*Раздзел 2.*

# Уплыў вайны на развіццё грамадства

## А) Ваенны фактар у палітычным і эканамічным развіцці грамадства

Перыяд V — першай паловы IX ст. быў часам, калі і славянскія, і балцкія плямёны жылі ва ўмовах грамадскага ладу, традыцыйна вызначанага як *ваенная дэмакратыя*[52]. Сутнасць ваеннай дэмакратыі палягала ў народаўладдзі, пры якім усе мужчыны племені[53], якія насілі зброю і бралі ўдзел ва ўзброеных сутыкненнях, мелі права голасу пры прыняцці грамадска значных рашэнняў. Асаблівая роля належала родавай арыстакратыі, якая традыцыйна валодала значным маральным аўтарытэтам і, такім чынам, магла актыўна ўплываць на ход падзей. Але такі лад цягам часу перажываў вялікія змены ў будове грамадства і эканомікі. Рост насельніцтва і развіццё спосабаў вытворчасці прывялі да далейшага прагрэсу сельскай гаспадаркі і рамесніцтва. Пачалося перасяленне ранейшага насельніцтва ўмацаваных родавых гарадзішчаў на адкрытыя селішчы, якія забяспечвалі лепшыя магчымасці для вядзення гаспадаркі. Старыя гарадзішчы перастаюць выконваць функцыі родавых гнёздаў, яны часткова знікаюць, а часткова пераўтвараюцца ў часовыя сховішчы на прыгоду небяспекі[54]. Некаторыя ж з іх становяцца цэнтрамі грамадскага

---

52 Разин Е. А. Т. 2. *История военного искусства.* 1957. С. 36.

53 Канстанцінопальскі патрыярх Нікіфар занатаваў цікавы факт, які патрабуе асобнага даследавання. Пасля няўдалага штурму ў 626 г. Канстанцінопаля славянамі з мора былі знойдзеныя трупы жанчын, якія нароўні з мужчынамі прымалі ўдзел у марскім баі. Патриарх Никифор. *Иже во святых отца нашего Никифора, патриарха Константинопольского, сокращенная история, начинающаяся с царствования Маврикия.* (Patr. Nic. Hist.). I // Свод... Т. II. С. 227.

54 Археалогія Беларусі. Т. 2. С. 360—361.

жыцця і рамесніцтва, працуючы на патрэбы цэлай акругі замест асобнай родавай абшчыны. Такая з'ява, напрыклад, з'яўляецца характэрнай для гарадзішча калочынскай культуры ў вёсцы Нікадзімава Горацкага раёну і іншых калочынскіх гарадзішчаў, якія аб'ядноўвалі вакол сябе ладную колькасць неўмацаваных селішчаў[55]. Гэтыя працэсы мелі сваім агульным вынікам паступовую змену родавага ўладкавання славянскіх і балцкіх плямён на тэрытарыяльнае. У выпадку славян такія працэсы паскараліся іх перамяшчэннем на вялікія адлегласці ў ходзе міграцый і актыўным асваеннем новых тэрыторый. Такія маштабныя перамяшчэнні яшчэ больш разбуралі стары грамадскі лад плямёнаў і паслаблялі родавыя сувязі.

Адначасова з паступовым распадам старога грамадскага ладу плямёнаў адбываўся пакутлівы і крывавы працэс нараджэння новага ладу і ўсталявання новай структуры грамадства, адным з наймацнейшых каталізатараў якога была вайна. Спарадычнае перамяшчэнне славянскіх плямёнаў у глыб земляў, населеных балтамі, не мела характару арганізаванага заваявання. У кожным асобным выпадку супярэчнасці паміж прышэльцамі і аўтахтонамі маглі вырашацца мірным альбо ўзброеным чынам, пра што нам расказваюць сляды пажараў на калочынскіх і тушамлінскіх гарадзішчах. Такое становішча не магло не весці да росту значэння ваеннай справы ў жыцці славянскіх і балцкіх плямёнаў і аўтарытэту тых асобных родзічаў, якія найбольш вызначаліся ў сутыкненнях з чужынцамі.

Узброеныя канфлікты ў гэты час маглі таксама адбывацца не толькі паміж славянамі і балтамі ў працэсе міграцыі насельніцтва. Шмат з іх мела міжабшчынны характар, аб чым выразна сведчаць шматлікія знаходкі зброі ў пахаваннях культуры ўсходнелітоўскіх курганоў, дакуль у гэтыя часы хваля славянскай каланізацыі яшчэ не дайшла[56]. Эканамічны прагрэс і развіццё вытворчасці прывялі да з'яўлення заўважнага, калі яшчэ не вельмі вялікага, аб'ёму матэрыяльных каштоўнасцяў. Такая акалічнасць рабіла каштоўнасці прывабнай мэтай для тых, хто мог і

---

[55] Гісторыя Беларусі. Т. 1. С. 129.

[56] Казакявичюс В. К. *Оружие балтских племен II–VII веков на территории Литвы.* С. 135.

хацеў узяць іх сілай. Узброенае рабаўніцтва рабілася адным са спосабаў набыцця матэрыяльных каштоўнасцяў побач з вытворчасцю і абменам. Асабліва жорсткі і масавы характар узброеныя рабаўніцкія напады набылі каля межаў Рымскай, а затым Візантыйскай імперый. Але можна меркаваць, што прага здабычы, уласцівая драгувітам, якія беспаспяхова спрабавалі ўзяць Солунь, была не чужой і дрыгавічам, якія паволі рухаліся на поўнач ад Прыпяці, ды іншым суседнім плямёнам і саюзам плямёнаў. Хаця тагачасныя жыхары беларускіх земляў ніяк не маглі параўнацца багаццем з заможнымі міжземнаморскімі цывілізацыямі, але ў складаных кліматычных умовах і пры абмежаванай прадукцыйнасці працы рабаўніцтва было эканамічна выгаднейшым за вытворчасць. Таму нават невялікая колькасць матэрыяльных каштоўнасцяў рабіла паселішчы спакуслівай мэтай рабаўніцкіх нападаў незалежна ад таго, размаўлялі людзі на тых паселішчах на рознай мове з нападнікамі альбо не. Мэтай таксама маглі быць добрыя гаспадарчыя ўгоддзі альбо людзі, захапіўшы якіх можна было прадаваць у рабства ці самім скарыстоўваць для нявольнай працы[57]. Можна меркаваць, што агульная колькасць рабаўніцкіх нападаў на беларускіх землях у той час была вялікай. Пастаянная пагроза жыццю і маёмасці вымушала людзей адчуваць сябе прыступнымі.

Такое змяненне штодзённых варункаў жыцця, адкрыццё новых земляў, пашырэнне межаў знаёмага свету і кантакты з людзьмі, якія належалі да іншых культур і маглі быць адкрыта варожымі, парушалі традыцыйны светапогляд і традыцыйны этас як духоўную аснову жыцця і цэльнае ўяўленне аб навакольным свеце. У гэтых умовах зніжалася і роля родавых старэйшын, якія ўжо не маглі падтрымліваць бяспеку, ажыццяўляць штодзённае кіраўніцтва племенем, прымаць рашэнні сілай свайго аўтарытэту ў адпаведнасці з гэтым этасам. Такім чынам, славянін ці балт гэтага перыяду адчуваў калі не разбурэнне традыцыйнай будовы свету, то, прынамсі, неадпаведнасць старога патрыярхальнага ладу плямені і яго кіраўніцтва перад новымі небяспечнымі абставінамі. Адпаведна, ён пачуваўся ўразлівым у такім становішчы і шукаў з яго выйсця.

[57] Ochmański, Jerzy. *Historia Litwy*. Wrocław, 1990. 36.

Нельга сказаць, што славяне ці балты V—IX стст. былі такімі ўжо безабароннымі людзьмі і зусім не маглі адстаяць сваё жыццё і маёмасць у бясконцых міжпляменных канфліктах. Урэшце рэшт, ва ўмовах ваеннай дэмакратыі кожны мужчына валодаў зброяй, браў удзел у ваенных выправах і быў здольны да самаабароны. Але пры рассяленні плямёнаў на значнай тэрыторыі такая вайсковая арганізацыя, калі чалавек быў гаспадаром і ваяром адначасова, пачынала страчваць свой плён. Жыхары рассеяных на вялікіх прасторах паселішчаў не маглі дастаткова хутка сабраць сілы для адпору магчымым рабаўнікам, якія мелі на сваім баку вырашальную з ваеннага пункту гледжання перавагу нечаканасці.

Зразумелым адказам на падобны выклік было натуральнае выдзяленне з усяго люду племені асобнай групы ваяроў, званай «дружына» па-славянску і «draugija» пабалцку. На чале яе стаяў правадыр, які надалей атрымаў найменне «князь» у славянскіх мовах і «kunigas» у балцкіх. Першапачатковай асноўнай функцыяй дружыны была абарона сваёй тэрытарыяльнай абшчыны ці племені ад варожых нападаў і ахова грамадскай бяспекі і маёмасці. Само слова «дружына» паказвае на характар узаемаадносін у гэтай грамадскай групе. Дружына з'яўлялася баявой са*друж*насцю, сябры якой не проста займаліся звычайнай справай, а рызыкавалі сваім жыццём за жыццё і маёмасць сваіх супляменнікаў, што надавала іх дзейнасці пэўны сакральны сэнс захавання існай светабудовы. Адпаведна, і ўзаемаадносіны яе сяброў набывалі больш значны і важкі характар, чым узаемаадносіны простых абшчыннікаў. Самае жыццё дружыннікаў і іх правадыра наўпрост залежала ад іх з'яднанасці і ўзаемавыручкі і засноўвалася на адчуванні роўнасці перад тварам небяспекі[58]. Нядзіўна, што такія адносіны спараджалі моцны карпаратыўны дух, які за стагоддзі існавання дружын развіўся ў добра аформленую вайсковую субкультуру. Асаблівае значэнне ў гэтай субкультуры займала асоба правадыра. Ён як найбольш выбітны з дружыннікаў трымаў у сваёй руцэ

---

[58] Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков.* С. 110—111.

кіраванне падчас канфліктаў, сваёй воляй, смеласцю і розумам мог вырашыць зыход сутычкі і, нарэшце, быў адказны за шматлікія жыцці. За ягонае кіраўніцтва і заступніцтва шараговыя дружыннікі плацілі яму асабістымі адносінамі прыхільнасці і адданасці. З гэтай прычыны сакралізацыя ролі дружыны ўвасаблялася найперш у постаці правадыра. Таму ягоны ўплыў непазбежна мусіў распаўсюджвацца на ўсё племя, прыходзячы ў супярэчнасць з аўтарытэтам родавай арыстакратыі.

Згаданыя з'явы маюць паралелі і ў гісторыі іншых еўрапейскіх народаў. Напрыклад, вось як апісвае працэс узнікнення дружыны ў старажытных германцаў у I ст. Тацыт: «Выдатная знатнасць і значныя заслугі продкаў нават яшчэ зусім маладым надаюць годнасць правадыра; усе іншыя збіраюцца вакол магутных целам і тых, хто ўжо вылучыўся на справе, і нікому не ганебна лічыцца іх дружыннікамі». [...] «Іх (*правадыроў. — Я. Н.*) веліч, іх магутнасць у тым, каб быць засёды акружанымі вялікім натоўпам адабраных юнакоў, у мірны час — іх гонарам, на вайне апорай. Чыя дружына вылучаецца лікам і доблесцю, таму гэта прыносіць вядомасць, і ён здабывае славу не толькі ў сябе ў племені, але і ў суседніх народаў; яго дамагаюцца, накіроўваючы да яго пасольствы і дасылаючы падарункі, і розгалас аб ім часцей за ўсё сам па сабе спыняе войны»[59]. Ад праніклівага позірку рымскага гісторыка не ўнікла і супрацьпастаўленне родавай знаці вайсковым правадырам. «Цароў яны абіраюць з найбольш знатных, правадыроў — з найбольш доблесных»[60].

Рост значэння дружыны, з'яўленне яе карпаратыўнага духу і сакралізацыя звязанай з ёй ваеннай справы далі пачатак яе развіццю і ў цалкам новым кірунку. Як і любы іншы грамадскі інстытут, закліканы да выканання пэўных функцый, дружына, атрымаўшы арганізацыйнае афармленне і засвоіўшы карпаратыўны дух, пачала рухацца да стану самадастатковасці і адасаблення ад грамадства, якое

---

59 Тацит, Публий Корнелий. *О происхождении германцев и местоположении Германии.* (Tacit. Germ.). 13–14 // Тацит, Публий Корнелий. *Анналы. Малые произведения. История.* Москва, 2003. С. 465.

60 Ibid. 7. С. 461.

яе спарадзіла. Як зазначае расійскі гісторык А. І. Сяліцкі, у германцаў дружыны ўзнікалі як часовая з'ява на перыяд вайны, але патроху «ператвараліся ў пастаянны вайскова-рабаўнічы інстытут». «Гэтыя працэсы ішлі асабліва хутка ў тых плямёнах, дзе вайна стала пастаянным складнікам грамадскага жыцця»[61].

Важнай падставай адасаблення дружыны ад грамадства стала і эканоміка. Бясспрэчна, і да эпохі балта-славянскага ўзаемадзеяння ў ходзе ваенных сутыкненняў з племені так ці інакш вылучаліся людзі, сіла і баявое ўмельства якіх дазвалялі ім да пэўнай ступені пераносіць сваю функцыю ў жыцці племені з гаспадарання на абарону. Але толькі з паскораным развіццём металаапрацоўкі ў другой палове I тысячагоддзя і ростам вытворчасці працы славянскія і балцкія плямёны на беларускіх землях маглі *дазволіць сабе* ўтрымліваць на пастаяннай аснове групы ўзброеных людзей, не занятых прадукцыйнай працай. Такі падзел функцый прывёў да афармлення дружыны ў асобную катэгорыю племяннога грамадства[62].

У гэтай сувязі ізноў правядзем паралель з развіццём дружыны ў германцаў. «Калі яны не вядуць войнаў, то шмат палююць, а яшчэ больш бавяць часу ў поўнай бяздзейнасці, займаючыся сном і абжорствам». [...] «У іхніх абшчын існуе звычай, каб кожны добраахвотна аддаваў правадырам што-небудзь ад свайго быдла і пладоў зямлі, і гэта, прынятае тымі як знак пашаны, служыць таксама задавальненню іх патрэб. Асабліва ўсцяшаюць іх падарункі ад суседніх плямёнаў, якія дасылаюцца не толькі асобнымі людзьмі, але і ад імя ўсяго племені»[63].

Калі падзел працы зрабіў дружыну асобнай групай у племені, то непасрэдна ваенная дзейнасць пачала вылучаць яе на ролю вышэйшай групы. У ваеннай дзейнасці, гэтаксама як і ў іншых сваіх вымярэннях, дружына лёгка

---

[61] Селицкий А. И. *«Воданические короли»: религиозный аспект формирования королевской власти у древних германцев* // Скандинавские чтения 2000 года: Этнографические и культурно-исторические аспекты. Санкт-Петербург, 2002. С. 51–52.

[62] Горемыкина В. И. *К проблеме истории докапиталистических обществ. (На материале Древней Руси).* Мн., 1970. С. 29–30.

[63] Tacit. Germ. 15. C. 466.

перайшла ад выканання нейкай грамадска карыснай функцыі да самадастатковасці і імкнення найперш забяспечыць свае ўласныя інтарэсы. Валодаючы дастатковай ваеннай моцай для абароны племені ад варожых нападаў, дружына актыўна бралася за самастойныя ваенныя выправы, якія зводзіліся да нападаў на суседзяў ці жыхароў аддаленых земляў. Эпас, які захаваўся са старажытных часоў, выразна гераізуе ўчынкі, якія пры бліжэйшым разглядзе кваліфікуюцца як простае рабаўніцтва, якое было тады цалкам паважаным заняткам. Аб адной з такіх багатырскіх выпраў распавядае беларуская быліна:

Что не три горы зашаталися,
Что не три горы зашаталися,
Три богатыря соезжалися...

А радили раду, раду новую:
Кого в поле встреним, того в смерть убьем,
А хоть загубим, а хоть застрелим[64].

У часы, якія адзначаліся заняпадам традыцыйнага этасу і адсутнасцю права, ахвяра лёгка пераўтваралася ў нападніка і наадварот. Іншая быліна без вялікага асуджэння апісвае наступныя падзеі:

І прыйшло к дзедушку сорак молайцаў,
Сорак молайцаў, усе разбойнічкі.
Хочуць дзеда ў палон забраць,
Яго коніка ў табун загнаць.
А стары дзедзя не ўлекаецца,
К сырому дубу прыграбаецца.
Узяў дуба за вярхушачку,
Прыгнуў дуба к сырой зямлі.
Сырая зямля здрыганулася, —
Сорак молайцаў улякнулася:
— Ах, ты дзедушка, родны бацюшка,
Не будзем цябе ў палон браць
І твайго коніка ў табун гнаць,
А будзем цябе аццом зваць[65].

---

[64] Беларускі эпас. Мн., 1959. С. 156–157.
[65] Тамсама. С. 162.

Рабаўніцкія паходы прыносілі ў якасці здабычы палонных, жывёлу, каштоўныя металы, што, вядома ж, не дзялілася паміж усімі абшчыннікамі, але заставалася ў валоданні правадыра, дружыннікаў і іх сем'яў[66]. Роля дружыннікаў у абароне племені і іх ваенная магутнасць рабілі іх адной з найбольш уплывовых груп у племені, а матэрыяльны дабрабыт – самай заможнай, што надавала дружыне большы аўтарытэт і павагу і выводзіла яе на новы ўзровень вышэйшай групы. Аб значным узбагачэнні дружыны і правадыра сведчаць багатыя пахаванні на землях балцкіх плямёнаў, якія ўтрымлівалі ўпрыгожанні, зброю[67] і коней[68]. Выдзяленне дружыны адбывалася нягледзячы на тое, што яна рэкрутавалася з тых самых прадстаўнікоў родавай арыстакратыі і шараговых абшчыннікаў. Захоўваючы шчыльныя асабістыя сувязі з супляменнікамі, дружыннікі пераходзілі ў іншае грамадскае вымярэнне, аказваліся пад уплывам новага асяроддзя і пачыналі прытрымлівацца іншага этасу і штодзённага кодэксу паводзінаў.

Сацыяльнае адасабленне дружыны ад рэшты племені адлюстроўвалася і адасабленнем фізічным. Паступова дружыннікі пераносяць свае жытлы з селішчаў на гарадзішчы, аб чым сведчаць знаходкі жылых памяшканняў і зброі на славянскім гарадзішчы Хатомель[69] і балцкім гарадзішчы Нікадзімава[70]. Нават тыя дружыннікі, якія яшчэ жылі на неўмацаваных паселішчах вакол гарадзішчаў, бавілі вялікую частку свайго часу на гарадзішчах, якія з пустых сховішчаў ператвараліся ў заселеныя цэнтры дружыннага жыцця. Цяпер пад аховай дружыны там магло ў адноснай бяспецы развівацца рамесніцтва, маглі адбывацца народныя сходы і іншыя грамадска значныя мерапрыемствы і спраўляцца рэлігійныя абрады[71]. Рост значэння гарадзі-

---

66 Гісторыя Беларусі. Т. 1. С. 134.

67 Моора Х. А. *Возникновение классового общества в Прибалтике (По археологическим данным)* // Советская археология. Москва, 1953. XVII. С. 112.

68 Куликаускене Р. К. *Погребения с конями у древних литовцев* // Советская археология. Москва, 1953. XVII. С. 211–222.

69 Археалогія Беларусі. Т. 2. С. 342–343, .

70 Седин А. *Никодимово – городище третьей четверти I-го тысячелетия н. э. в Восточной Беларуси.* С. 41.

71 Тамсама.

шчаў вёў да нарошчвання іх умацаванняў. На шматлікіх балцкіх гарадзішчах падсыпаюцца новыя валы і ўсталёўваюцца новыя драўляныя гародні[72]. Уражвае сваімі ўмацаваннямі Нікадзімава, якое стаяла на беразе ракі Быстрая пры яе ўпадзенні ў Проню і складалася з дзвюх пляцовак, умацаваных вялікімі валамі[73]. З гэтага часу гарадзішчы станавіліся паўнацэннымі цэнтрамі эканамічнага і грамадскага жыцця племені, усе бакі якога развіваліся цяпер у непасрэднай блізкасці і да пэўнай ступені пад прамым кантролем дружыны і яе правадыра.

Выдзяленне дружыны ў адасобленую ўплывовую групу, спалучанае з натуральным для чалавечай натуры жаданнем да панавання над іншымі людзьмі, непазбежна прыводзіла дружыну да памкненняў перасягнуць абмежаванні сваёй ваеннай функцыі, распаўсюдзіць уплыў на іншыя сферы жыцця племені і такім чынам уступіць у спаборніцтва з родавай арыстакратыяй.

Існуе думка, што шлях дружыны да панавання над племенем ляжаў найперш праз узрастанне яе эканамічнай вагі. У выніку рабаўніцкіх паходаў правадыр і яго дружыннікі захоплівалі шмат жывёлы і палонных, што дазваляла ім пашыраць сваю гаспадарку на новыя землі і выкарыстоўваць рабскую працу, павялічваць сельскагаспадарчую і рамесную вытворчасць і эканамічнымі шляхамі ўзвышацца над рэштай шараговых абшчыннікаў[74]. Тым часам родавая арыстакратыя не магла вытрымліваць такога спаборніцтва і адпаведна адыходзіла ў другараднае становішча, што пацвярджаецца адсутнасцю вядомых багатых пахаванняў невайсковай знаці[75].

Але на наш погляд, эканамічныя фактары не маглі адыгрываць галоўную ролю для ўзрастання ўплыву дружыны, хаця, безумоўна, прысутнічалі ў гэтым працэсе. Па-першае, само багацце як такое, у параўнанні з некаторымі пазнейшымі эпохамі, мела рачэй сімвалічнае, чым

---

[72] Моора Х. А. *Возникновение классового общества в Прибалтике.* С. 117.

[73] Гісторыя Беларусі. Т. 1. С. 129.

[74] Горемыкина В. И. *К проблеме истории докапиталистических обществ.* С. 31. Ochmański, Jerzy. *Historia Litwy.* 36.

[75] Горский А. А. *Древнерусская дружина.* Москва, 1989. С. 37.

утылітарнае значэнне. Валоданне ім віталася як пэўны знак ласкі вышэйшых сіл і надавала аўтарытэт у вачах супляменнікаў. Аднак тагачасная мараль накладала на ўладальніка багацця і пэўныя абавязкі па распараджэнні ім. Меркавалася, што ласка вышэйшых сіл, праяўленая ў адносінах да аднаго чалавека, мусіла ў сваю чаргу трансфармавацца ў яго ласкавае стаўленне да супляменнікаў і шчодрае распараджэнне сваім дабрабытам. Хцівасць і імкненне да накаплення ніякім чынам не ўхваляліся, што пацвярджае адмоўная ацэнка летапісцамі падобных пазнейшых паводзінаў некаторых рускіх князёў[76].

Па-другое, у эпоху, больш як на тысячу гадоў аддаленую ад капіталізму і роскіту спажывецтва, багацце яшчэ не настолькі шырока выкарыстоўвалася для памнажэння сябе самога. Незалежна ад маштабаў вытворчасці, яе вынікі выкарыстоўваліся збольшага для ўласнага ўжытку, а не для атрымання прыбытку, які не мог быць інструментам эканамічнага ціску адных абшчыннікаў на іншых.

Як нам здаецца, найвялікшым фактарам узрастання значэння дружыны была яе асноўная якасць, якая дазваляла ёй задавальняць найвышэйшую патрэбу астатніх супляменнікаў у ахове іх жыцця і бяспекі: ваенная моц ці магутнасць. Яна магла выкарыстоўвацца як пры знешніх сутыкненнях, так і для падтрымання парадку пры канфліктах унутраных, якія непазбежна ўзнікалі пры распадзе родавых адносін і іх замене адносінамі тэрытарыяльнымі. Гэткім чынам дружына пераўтваралася з выключна арыентаванай на знешнія адносіны вайсковай адзінкі ў апірышча ўнутранага ладу племені. Родавая арыстакратыя, альбо невайсковая знаць, у такіх умовах магла абапірацца толькі на аўтарытэт без магутнасці, заснаваны на традыцыйным этасе родавых адносін, які ўсё больш і больш слабеў. Яна відавочна не магла спаборнічаць з дружынай на гэтым полі і непазбежна мусіла прайграць.

Другім важным фактарам узвышэння дружыны было яе ўжо згаданае становішча *па-за* і *па-над* традыцыйнай грамадскай структурай племені. Калі яе ваенная моц сама

[76] Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков.* С. 115–125.

па сабе ўтрымлівала патэнцыйную магутнасць, то знаходжанне па-за племяннай грамадой, адарванасць ад родаў і нязвязанасць родавым этасам давалі магчымасць ужыць гэтую магутнасць без хістанняў і гэтак ператварыць яе патэнцыю ў рэальны ўплыў. Знаходжанне ж дружыны па-над родамі дазваляла ёй падтрымліваць парадак у племені як староннім нейтральнай групе, якая ў выпадку ўнутранага канфлікту магла дзейнічаць непрадузята, зыходзячы больш з аб'ектыўных інтарэсаў усяго племені, чым з інтарэсаў асобных родаў. Гэта надавала нават прымусовым дзеянням дружыны пэўную легітымнасць. На вышэйшым узроўні такая роля дружыны аказалася вельмі прыдатнай ужо пры ўтварэнні племянных саюзаў альбо княжанняў з асобных плямёнаў.

Звяртаючыся да германскіх паралеляў, прывядзем яшчэ адно меркаванне А. І. Сяліцкага: «З аднаго боку, гэтыя вайсковыя аб'яднанні ішлі супраць прынцыпаў племяннай арганізацыі, часта парушалі заключаныя мірныя дамовы, рабавалі суседнія плямёны, а іх правадыры маглі стаць канкурэнтамі мясцовым племянным уладам. Але, з іншага боку, калі дружынныя лідэры станавіліся вайсковымі правадырамі плямён/саюзаў плямён і дружыны ператвараліся ў ядро племяннога войска, гэтыя супярэчнасці здымаліся»[77]. Улічваючы падабенства грамадскага развіцця, цяжка ўявіць, што балцкія і славянскія дружыны ішлі надта адрозным ад германцаў шляхам.

Такім чынам, у перыяд перасялення славянскіх плямёнаў на беларускія землі і іх узаемадзеяння з балцкімі плямёнамі вайна стала каталізатарам, а ў многіх выпадках і прамой прычынай зрухаў у эканамічным і палітычным развіцці славянскіх і балцкіх грамадстваў. З эканамічнага боку вайна замацавала ўзброенае рабаўніцтва ў якасці спосабу здабыцця дабрабыту побач з вытворчасцю і абменам. Больш за тое, адносная лёгкасць і эфектыўнасць рабаўніцтва зрабілі ваенныя выправы з гэтай мэтай надзвычай папулярнымі, даўшы нагоды для незлічоных войнаў на стагоддзі наперад.

---

[77] Селицкий А. И. *«Воданические короли»: религиозный аспект формирования королевской власти у древних германцев.* С. 52.

З боку палітычнага, узброеныя сутыкненні гэтага перыяду вылучылі дружыну як грамадскую з'яву, якая падтрымлівала само існаванне грамадства, ахоўваючы жыццё і бяспеку абшчыннікаў ад знешніх нападаў, што надало ёй вышэйшае становішча ў грамадстве. Надалей менавіта ваенная моц дружыны дазволіла ёй стварыць альтэрнатыву панаванню родавай арыстакратыі, якая з'яўлялася неад'емнай часткай абшчыны і кіравала з дапамогай свайго аўтарытэту, абапіраючыся на традыцыйны этас. Такая арганізацыя грамадства ўжо не задавальняла яго патрэбы ў часы вялікіх перасяленняў, утварэння новых этнічных супольнасцяў, эканамічнага расслаення, замены родавых адносін тэрытарыяльнымі з адпаведнымі ўнутранымі і знешнімі канфліктамі. У супрацьвагу гэтаму дружына вылучыла больш эфектыўную арганізацыю грамадства, кіруемага адасобленай ад астатніх абшчыннікаў групай, якая валодала ваеннай моцай, магла прымусова ўжыць яе для падтрымання парадку і зрабіць гэта легітымным чынам з выразнай ці маўклівай згоды рэшты грамадства. Вылучэнне гэтых характэрных рысаў заклала асновы *ўлады* як грамадскай з'явы, зрабіла дружыну яе родапачынальніцай і пачало пераўтварэнне будовы грамадства з патрыярхальнай і протадзяржаўнай у *палітычную.* Фактычна дружына накіравала далейшае развіццё грамадства ў палітычнае рэчышча, паставіла ў ягоны цэнтр з'яву ўлады і вызначыла магутнасць як аснову ўлады.

Такія пераўтварэнні не былі выключна беларускай з'явай. Праз іх давялося прайсці ўсім еўрапейскім народам. Як адзначае Фукідыд пры апісанні падрыхтоўкі да Траянскай вайны, «Агамемнан (...) зусім не таму стаў на чале паходу, што жаніхі Алены, якіх ён вёў за сабой, былі звязаныя клятвай, дадзенай Тындарэю, а таму, што ён быў магутнейшы за ўсіх сваіх сучаснікаў»[78]. «Ён павёў за сабой войска не столькі з-за прыязнасці да яго іншых правадыроў, а хутчэй з-за таго, што ўнушаў ім страх»[79]. У германцаў вылучэнне вайсковай знаці штурхнула грамадства на «адзін са шляхоў генезісу каралеўскай улады і

[78] Фукидид. *История.* Москва, 1999. I, 9, 1. (Далей: Thuc.). С. 9.

[79] Тамсама. I, 9, 3. С. 9.

затым фармавання дзяржавы – так званы ваенны шлях, калі часовыя вайсковыя правадыры некаторых плямён/саюзаў плямён пад уплывам розных абставін захоўваюць сваю пасаду і ў мірны час, тым самым умацоўваючы ідэю пастаяннай каралеўскай улады»[80].

Вяртаючыся да нашых падзеяў, можна пагадзіцца з польскім гісторыкам Гэнрыкам Лаўмяньскім у ягонай ацэнцы працэсу ўзнікнення дзяржаўнасці на літоўскіх землях: «Манархія не паўстала ў выніку эвалюцыі племянных дзяржаўных саюзаў – як тое амаль агульнапрынята ў літаратуры – але на іх руінах; творчыя чыннікі змяшчаліся ў арганізацыі дружын, якая была вынікам рабаўніцкай экспансіі і знаходзілася ўласна па-за абсягам тэрытарыяльнай арганізацыі»[81].

Працэс гэты адбываўся доўга і пакутліва. Родавыя адносіны, заснаваныя на неад'емных для людзей роднасных сувязях, доўга захоўвалі сваё значэнне, а з імі захоўвала ўплыў і родавая арыстакратыя, паступова ператвараючыся ў земскую невайсковую знаць. Канец гэтага перыяду яшчэ быў адзначаны хісткай раўнавагай у супрацьстаянні паміж правадыром з дружынай і родавай арыстакратыяй. Але вынік яго быў ужо прадвызначаны. Ваенная дэмакратыя саступала сваё месца *дзяржаве*.

### Б) Уплыў вайны на этнакультурныя працэсы на беларускіх землях

Не меншую, чым у палітычным і эканамічным жыцці, ролю вайна адыграла ў жыцці духоўным на тагачасных беларускіх землях. Найперш гэта датычылася культурнага ўзаемадзеяння славянскіх і балцкіх плямёнаў, якое дало пачатак утварэнню беларусаў як асобнага этнасу. Многія даследчыкі прытрымліваюцца той думкі, што працэс узаемадзеяння быў збольшага мірным[82], што і дазволіла сла-

---

80 Селицкий А. И. *«Воданические короли»: религиозный аспект формирования королевской власти у древних германцев*. С. 53.

81 Lowmiański, Henryk. *Studja nad początkami społeczeństwa i państwa Litewskiego*. Tom II. Wilno, 1932. 369.

82 Краўцэвіч А. *Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага*. Rzeszów, 2000. С. 98–103.

вянам і балтам пераняць адным у адных амаль што нароўні разнастайныя элементы культуры, гаспадаркі і вераванняў. У многіх выпадках гэта сапраўды было так. Але ў цені незаслужана застаецца іншы бок славяна-балцкіх кантактаў – ваенны, які прысутнічаў у значнай ступені, аб чым сувора распавядаюць пажарышчы балцкіх гарадзішчаў. На першы погляд парадаксальна, а на самой справе цалкам натуральна, вайна самой сваёй экстрэмальнасцю і пагрозай існаванню людзей прымушала ворагаў уступаць у больш блізкі кантакт. Сутыкненні з-за ворнай зямлі, лепшага месца для паселішчаў, матэрыяльных каштоўнасцяў, вываду палонных адбываліся з уласцівай любой вайне жорсткасцю. Пры паражэнні не даводзілася чакаць літасці, таму ад здольнасці выстаяць супраць ворага і перамагчы яго залежала жыццё асобных абшчыннікаў і існаванне цэлых плямёнаў. У гэтых умовах было надзвычай важна зразумець мову ворага, каб мець магчымасць здабыць звесткі аб ягоных планах; уласкавіць ягоных багоў, каб пазбегнуць іхняга гневу; вывучыць ягоныя спосабы вядзення вайны, каб самому скарыстаць іх супраць вынаходнікаў; здабыць зброю ворага, каб зразумець яе сакрэт і ўжыць самому; вывучыць вядзенне ягонай гаспадаркі, каб зразумець, як яна дапамагае выстаяць у часы ваенных нягод. Такім чынам, у міры і вайне славяне і балты пазнавалі адны адных і збліжаліся, каб у будучыні ўтварыць аснову адзінага этнасу, пацвярджаючы старую ісціну, выказаную яшчэ Цэзарам: «...на ваяроў увогуле моцна ўплываюць звычаі той краіны, дзе яны доўга знаходзяцца»[83].

Шчыльнасць славяна-балцкіх кантактаў таго часу даводзіць перш за ўсё антрапалогія. Распаўсюджанне ў старажытных славянскіх пахаваннях чарапоў даліхакраннага сярэднятварага антрапалагічнага тыпу, адрозных ад іншых славянскіх антрапалагічных тыпаў, у вялікай ступені супадае з арэалам балцкай гідраніміі[84]. Але найбольш цікавым

---

[83] Цезарь, Гай Юлий. *Гражданская война.* I, 44. (Caesar. Bell. Civ.) // Записки Юлия Цезаря и его продолжателей о Галльской войне, о Гражданской войне, об Александрийской войне, об Африканской войне. Москва, 1999. (Далей: Записки...). С. 224.

[84] Седов В. В. *Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья.* С. 171–173.

з'яўляецца той факт, што гэты арэал супадае з арэалам сучаснага валдайска-верхнедняпроўскага антрапалагічнага комплексу, да якога належаць жыхары Усходняй Літвы, Беларусі і Смаленшчыны – тэрыторый, на якіх ішло фармаванне беларускай народнасці[85]. Гэта значыць, што асновай беларускай народнасці быў славяна-балцкі сінтэз, дзе славяне і балты адыгрывалі раўназначную ціараўнальную ролю.

Антрапалагічнае ўзаемадзеянне дапаўнялася культурным. На тле відавочных славянскіх элементаў у беларускай культуры захавалася шмат балцкіх. Традыцыйныя беларускія вераванні захоўваюць тыпова балцкі культ змяі, мала вядомы ў іншых славянскіх краінах[86]. Гэтаксама як і балты, беларусы надзяляюць чароўнымі ўласцівасцямі камяні. Гэта добра відаць з легендаў пра камяні, якія выконвалі ролю шаўцоў і краўцоў[87], і паданняў пра камяні цудоўнага Лоскага замка, якія пры яго разбурэнні самі раскаціліся на месцы, адкуль былі ўзятыя[88]. Традыцыйная беларуская культура захоўвае балцкі ўплыў у прадметах побыту і пабудовах[89]. Балцкія элементы выразна праявіліся ў беларускай мове. Яна ўтрымлівае вялікую колькасць часта ўжываемых словаў балцкага паходжання, такіх, як «дзірван» альбо «дзёгаць», а таксама шмат балцкіх сінтаксічных элементаў[90]. Мяркуецца, што такія вызначальныя для беларускай мовы асаблівасці, як дзеканне, аканне і цвёрдае «р», з'явіліся ў ёй пад уплывам балцкага субстрату[91]. Хаця наконт асобных балцкіх элементаў у фармаванні беларусаў яшчэ вядуцца спрэчкі, здаецца, ужо мала ў каго выклікаюць сумненні іх вялікая агульная прысутнасць і значны ўплыў, шлях да чаго быў адкрыты як у ходзе асіміляцыі і мірнага супрацоўніцтва, так і падчас ваенных канфліктаў.

---

85 Седов В. В. *Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья.* С.176–177.

86 Тамсама. С. 177.

87 Бяздоннае багацце. Мн., 1990. С. 223–225.

88 Тамсама. С. 216–217.

89 Зинкявичюс З. *Восточная Литва в прошлом и настоящем*. Вильнюс, 1996. С. 16–17.

90 Тамсама. С. 18–19.

91 Седов В. В. *Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья.* С. 184–186.

*Раздзел 3.*

# Ваеннае майстэрства славян і балтаў у канцы V – пачатку IX стст.

У папярэдніх частках гэтага раздзелу мы паспрабавалі аднавіць ход падзей на беларускіх землях у V–IX стст. пры дапамозе крытычнага супастаўлення археалагічных крыніц і акрэсліць ролю вайны ў жыцці славянскіх і балцкіх плямёнаў і яе ўплыў на развіццё грамадства шляхам асцярожнай рэканструкцыі. Калі ж справа даходзіць да даследавання ваеннага майстэрства, вышэйзгаданых метадаў становіцца яўна недастаткова. Вядома, археалагічныя знаходкі зброі могуць даць прыблізнае ўяўленне аб спосабах вядзення бою, а вайсковую арганізацыю можна аднавіць, грунтуючыся на яе натуральным паходжанні з арганізацыі грамадскай. Але гэта прывядзе нас толькі да *тэарэтычных* высноваў аб тым, як выглядала вайна ў тыя часы. Між тым вайна як справа цалкам *практычная* тады, як і ў любую іншую эпоху, пастаянна развівалася ў рэчышчах новых формаў і спосабаў, перасягаючы межы, адведзеныя ёй тэорыяй. Таму дакладнае ўяўленне аб вайне могуць даць толькі пісьмовыя крыніцы, якія падаюць яе рэаліі і дынаміку праз апісанне канкрэтных падзей.

Пры гэтым мы непазбежна сутыкаемся з новай праблемай – фактычнай адсутнасцю пісьмовых звестак аб ваенных падзеях на беларускіх землях у тыя часы. Самая блізкая адлегласць, на якую мы можам да гэтых падзей падысці, – апісанне ў крыніцах кшталту ўжо згаданых «Цудаў св. Дзімітрыя Солунскага» і «Арозія караля Альфрэда» падзей на Балканах і на ўзбярэжжы Балтыйскага мора, дзе жылі, адпаведна, славянскія і балцкія плямёны, роднасныя, але не тоесныя славянам і балтам, якія насялялі тады беларускія землі. Згодна з гэтым мы мусім звяртацца да аналогій, заснаваных на прыняцці існавання па-

добных гістарычных з’яў у народаў, якія маюць роднаснае этнічнае паходжанне альбо знаходзяцца на падобнай ступені развіцця. Выкарыстоўваць яго мы мусім вельмі асцярожна, бо пры ўсёй этнічнай роднаснасці балканскіх славян і славян, якія засялялі беларускія землі, а таксама Вульфстанавых эстыяў (прусаў) і плямёнаў усходніх балцкіх культур паміж імі існавалі і істотныя адрозненні. Балканскія славяне і прусы знаходзіліся значна бліжэй да цэнтраў візантыйскай і заходняй цывілізацый, да важнейшых гандлёвых шляхоў і ваявалі з мацнейшымі непрыяцелямі. Таму можна меркаваць, што яны знаходзіліся на вышэйшым узроўні развіцця ўвогуле і ваеннага майстэрства ў прыватнасці за плямёны, якія жылі на беларускіх землях. У далейшым мы будзем улічваць гэты факт. Больш за тое, каб паменшыць патэнцыйныя магчымасці для памылак, мы звузім кола скарыстаных пісьмовых крыніц да тых, якія могуць забяспечыць найбольш блізкія і прамыя аналогіі. Па некалькіх прычынах мы мусім аддаць перавагу візантыйскім крыніцам VI–VII стст. Па-першае, заснаваныя на багатых старажытнагрэчаскіх пісьмовых традыцыях, у параўнанні з урыўкавымі заходнімі крыніцамі, яны падаюць больш грунтоўныя, падрабязныя і якасныя звесткі пра ваеннае майстэрства славян. Па-другое, яны апісваюць удзел у ваенных дзеяннях на Балканах славянскага племені драгувітаў, магчыма, роднасных дрыгавічам. Пры гэтым мы будзем улічваць і супастаўляць звесткі з іншых пісьмовых і непісьмовых крыніц.

### А) Вайсковая арганізацыя

Вайсковая арганізацыя славян і балтаў у перыяд ваеннай дэмакратыі была працягам іх грамадскай арганізацыі. Яна натуральным чынам паходзіла з грамадскай арганізацыі і аказвала на яе зваротны ўплыў. Вялікая колькасць міжэтнічных і міжабшчынных узброеных канфліктаў у той час дыктавала патрэбнасць кожнаму баяздольнаму мужчыну браць у рукі зброю і станавіцца на абарону племені ў выпадку небяспекі. Як адзначае візантыйскі імператар Маўрыкій у прысвечаным славянам раздзеле свайго «Стратэгікона» канца VI стагоддзя, «*кожны* мужчына ўзброены

дзвюма невялікімі коп'ямі, а некаторыя з іх і шчытамі»[92]. Гэты ж самы факт надаваў правы на ўдзел у прыняцці рашэнняў толькі тым абшчыннікам, якія бралі ўдзел у абароне племені, гэта значыць узброеным мужчынам. Такім чынам, узброеныя сілы тыповага славянскага племені ўяўлялі сабой апалчэнне, якое ўключала ўзброеных мужчын усіх баяздольных узростаў. Найбольшай арганізацыйнай адзінкай такіх узброеных сіл было апалчэнне асобнага роду, якое ўзначальваў старшыня гэтага роду. З паступовай заменай родавага ўладкавання пляменаў на тэрытарыяльнае родавыя апалчэнні саступілі месца апалчэнням асобных тэрытарыяльных акруг. У сваю чаргу, родавыя і тэрытарыяльныя апалчэнні складаліся з элементарных адзінак, якія ўключалі жыхароў аднаго паселішча[93]. Гіпатэтычна родавыя, а затым тэрытарыяльныя апалчэнні маглі арганізоўвацца паводле традыцыйнай для індаеўрапейцаў дзесяцічнай сістэмы[94], але пры надзвычай прымітыўнай грамадскай і ваеннай арганізацыі лік на дзесяткі і сотні наўрад ці строга вытрымліваўся і меў рачэй сімвалічнае, чым практычнае значэнне. Мяркуючы па невысокай шчыльнасці насельніцтва тагачасных беларускіх земляў, колькасць ваяроў, якую магло выставіць адно племя, наўрад ці перавышала некалькі соцень чалавек. Мабілізацыйныя магчымасці племені пагаршаліся кепскімі камунікацыямі і варожасцю паміж родамі і тэрытарыяльнымі адзінкамі, у выніку чаго некаторыя з іх маглі заставацца ўбаку ад узброеных сутыкненняў з-за адлегласці ці няведання альбо прама ўхіляцца ад дапамогі суродзічам. Толькі ў VIII—IX стст. пры ўтварэнні саюзаў пляменаў колькасць іх войскаў у найважнейшых выправах магла лічыцца на тысячы.

Асобную ў арганізацыйных адносінах адзінку ўтварала дружына на чале з правадыром (князем). Яна складалася з ваяроў, якія выйшлі за межы традыцыйнай родавай ці

---

92 «Стратегикон» Маврикия. XI, 4, 11. (Далей: Mauric.) // Свод... Т. I. Москва, 1994. С. 371.

93 Нефёдкин А. К. *Тактика славян в VI в. (по свидетельствам ранневизантийских авторов)* // Византийский временник. Т. 62 (87). Москва, 2003. С. 88.

94 Тамсама. С. 84.

тэрытарыяльнай будовы плямені, далучыліся да дружыны добраахвотна і былі звязаныя з правадыром шчыльнымі асабістымі і карпаратыўнымі адносінамі. Хутчэй за ўсё, напачатку гэта былі збольшага маладыя ваяры: моцныя, спрытныя, «адчайныя» і гатовыя ўдзельнічаць у далёкіх рабаўніцкіх выправах[95]. З цягам часу склад дружыны станавіўся больш трывалым і пастаянным. З яе вылучэннем як грамадскага інстытуту і развіццём ваеннай справы яна ўсё ў большай і большай ступені ператваралася ў групу прафесійных дасведчаных ваяроў. Разам з непасрэдным кіраваннем дружынай правадыр ажыццяўляў і агульнае камандаванне ўсімі сіламі племяннога апалчэння. У яго падпарадкаванні былі і кіраўнікі родавых апалчэнняў. Дакладную колькасць дружыны вызначыць цяжка. Можна меркаваць, што ў залежнасці ад памераў плямені ці племяннога саюзу яна вагалася ад некалькіх дзесяткаў чалавек да некалькіх соцень[96].

Арганізацыйныя адзінкі супадалі з тактычнымі адзінкамі. У баі апалчэнне строілася па родавых ці тэрытарыяльных адзінках, якія маглі выконваць самастойныя баявыя задачы. Элементарная арганізацыйная адзінка магла стыхійна, без знешняга арганізацыйнага ўплыву ператварыцца ў тактычную баявую адзінку, дзе ваяры, якія паходзілі з аднаго паселішча і сям'і, падтрымлівалі адзін аднаго і ажыццяўлялі найпрасцейшую тактычную спецыялізацыю ў залежнасці ад наяўнасці пэўнага кшталту зброі. Напрыклад, кідальнікі дроцікаў і стральцы гуртаваліся вакол шчытаносца[97]. Дружына таксама з'яўлялася асобнай тактычнай, як і арганізацыйнай адзінкай, якая выкарыстоўвалася для выканання найбольш адказных і небяспечных баявых задач. Па звестках «Цудаў св. Дзімітрыя Солунскага», у карным паходзе супраць стрымонскіх славян у 678 г. візантыйцы «перабілі ў засадах, якія ўчынілі самі [славяне], найбольш моцных з іх і выдатных»[98], каго мы можам атаясаміць з дружыннікамі.

---

95 Mauric. XI, 4, 39 // Свод... I. С. 377.

96 Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков.* С. 106.

97 Нефёдкин А. К. *Тактика славян в VI в.* С. 88.

98 Miracul. Demetr. 262. // Свод... Т. II. С. 167.

Параўнанне дадзеных аб вайсковай арганізацыі славян са звесткамі аб вайсковай арганізацыі галаў[99] і германцаў[100] паказвае яе тыповасць для варварскіх плямёнаў Еўропы эпохі ваеннай дэмакратыі. Таму не будзе скажэннем ісціны выснова, што вайсковая арганізацыя балтаў на беларускіх землях будавалася на падобных асновах і істотна ад агульнаеўрапейскіх узораў не адрознівалася.

### Б) Зброя

Візантыйскія аўтары падаюць нямала звестак аб зброі, якую выкарыстоўвалі славяне. Паводле Пракопія Кесарыйскага, які дае кароткі нарыс звычаяў славян пры апісанні падзей 540-х гадоў, у іх, «уступаючы ў бітву, большасць ідзе на ворагаў пешымі, маючы невялікія шчыты і коп'і ў руках»[101]. Іаан Эфескі, распавядаючы аб бясчынствах славян на Балканах у 584 г., заўважае, што да знаёмства з ваеннай справай візантыйцаў славяне «не ведалі, што такое зброя, апроч двух ці трох ланхідыяў, а менавіта гэта – кідальныя коп'і»[102]. З гэтымі паведамленнямі пагаджаецца Маўрыкій, які меў багатую баявую практыку сутыкненняў са славянамі. У «Стратэгіконе» ён піша: «Кожны мужчына ўзброены двума невялікімі коп'ямі, а некаторыя з іх і шчытамі, моцнымі, але цяжка пераноснымі. Карыстаюцца яны таксама драўлянымі лукамі і невялікімі стрэламі, намазанымі атрутай»[103]. Коп'і маглі выкарыстоўвацца як для кідання, так і для рукапашнага бою. Невялікі памер лукаў і выкарыстанне атруты сведчаць, што стральба з лука ў славян была больш разлічанай на прыцэльнае пападанне ў неабароненыя часткі цела з блізкай адлегласці, чым на масаваны абстрэл варожага войска здалёк[104]. Шматлікія археалагічныя знаходкі ўтул-

---

[99] Цезарь, Гай Юлий. *Галльская война*. VI, 13-15. (Далей: Caesar. Bell. Gall.) // Записки... С. 115–117.

[100] Ibid. VI, 21–24. // Записки... С. 119–120.

[101] Procop. Bell. Goth. VII, 14. С. 250.

[102] Иоанн Эфесский. *О народе славян и об опустошении, которое они произвели во Фракии в третьем году царствования тишайшего Тиверия царя*. III. 6, 25. (Joh. Ephes. Hist. Eccl.) // Свод... I. С. 279.

[103] Mauric. XI, 4, 11 // Свод... I. С. 371.

[104] Нефёдкин А. К. *Тактика славян в VI в*. С. 81.

кавых і чаранковых стрэл і наканечнікаў дзідаў на гарадзішчы Хатомель[105] пацвярджаюць звесткі візантыйскіх крыніц і даводзяць, што славянскія плямёны на беларускіх землях карысталіся такім самым простым наборам наступальнай зброі, як і іх балканскія суродзічы. Не выключана, што шырокае выкарыстанне лукаў і стрэл славянамі на поўдзень ад Прыпяці магло быць вынікам уплыву ваеннага майстэрства аварау і іншых качавых народаў. Гэта пацвярджае і знаходка ў Хатомелі жалезнага наканечніка аварскай стралы, які датуецца VII стагоддзем[106].

Засцерагальнае ўзбраенне славян таксама было надзвычай простым. Па словах Пракопія, яны «панцыр на сябе ніколі не надзяваюць; некаторыя ж не маюць [на сабе] ні хітона, ні [грубай] накідкі, але, дастасаваўшы толькі нагавіцы, што прыкрываюць толькі сараматныя часткі, так і ўступаюць у сутычку з ворагамі»[107]. Такім чынам, даспехаў славяне не насілі і засцерагальнае ўзбраенне зводзілася да аднаго толькі шчыта, найбольш верагодна, драўлянага. Пры гэтым цытаваны вышэй урывак са «Стратэгікона» ясна паказвае, што нават шчытамі былі ўзброеныя толькі некаторыя ваяры. Іаан Эфескі жа шчытоў не згадвае ўвогуле. Сам шчыт, хутчэй за ўсё, у VI стагоддзі зведаў пэўную эвалюцыю. Згаданыя Пракопіем «невялікія» шчыты былі выцесненыя вялікімі, якія былі не менш за 1,5 м у даўжыню і пераўзыходзілі па памерах шчыты візантыйскіх пехацінцаў[108]. Такія шчыты непазбежна мусілі з'явіцца ў выніку сутыкнення славян з ваенным майстэрствам такога высокага ўзроўню, як у візантыйцаў. Яны забяспечвалі нашмат лепшую абарону ваяра ў рукапашным ці кідальным баі з добра ўзброеным візантыйскім войскам і дазвалялі будаваць рухомыя сценкі пры аблозе гарадоў.

Пры гэтым варта адзначыць знаходку ў Хатомелі трох пласцін ад панцыра, якія маглі належаць багатаму дружынніку[109]. Гэтая знаходка, якая была рэдкім выключэн-

---

[105] Археалогія Беларусі. Т. 2. С. 342–343.
[106] Гісторыя Беларусі. Т. 1. С. 131.
[107] Procop. Bell. Goth. VII, 14. С. 250.
[108] Нефёдкин А. К. *Тактика славян в VI в.* С. 81–83.
[109] Археалогія Беларусі. Т. 2. С. 343.

нем з агульнага правіла, тым не менш, паказвала на пачатак новай тэндэнцыі да з'яўлення больш складаных і эфектыўных відаў засцерагальнай зброі.

Зброя балцкіх плямёнаў мела шэраг адрозненняў ад славянскай. Таксама на падставе археалагічных дадзеных можна казаць аб адрозненнях у традыцыйных камплектах узбраенняў паміж плямёнамі, якія належалі да розных культур. У той час, калі культура ўсходнелітоўскіх курганоў і блізкія ёй археалагічныя помнікі Віленшчыны адрозніваюцца вялікай колькасцю разнастайнага ўзбраення ў пахаваннях, балцкія культуры, што існавалі далей на ўсход, з'яўляюцца ў гэтым сэнсе заўважна бяднейшымі. Асноўным відам наступальнай зброі, як і ў славян, у балтаў былі коп'і. Але ў адрозненне ад славян яны ўжываліся асобным ваяром у большай колькасці. Мяркуючы па інвентары пахаванняў, у якія ўкладалася 3–5 коп'яў, сярэдні ваяр меў іх у баі цэлы камплект, які ўключаў коп'і для кідання з малым вузкім пяром і коп'і для рукапашнага бою з вялікім шырокім пяром [110]. На тэрыторыі Віленшчыны распаўсюджанымі тыпамі наканечнікаў коп'яў былі ромбападобны [111] і мечападобны [112], аналагі якім былі знойдзеныя на тэрыторыі распаўсюджання банцараўскай культуры [113] і культуры ўсходнелітоўскіх курганоў [114]. Разам з коп'ямі з кідальнай зброі ўжываліся лук і стрэлы, якія на балцкіх землях былі, аднак, меней папулярнымі, чым у славян.

Са зброі бліжняга бою на тэрыторыі балцкіх плямёнаў былі распаўсюджаныя баявыя сякеры з вузкім лязом [115]. Калі коп'і і лук выкарыстоўваліся шырока ўсімі абшчыннікамі, то сякеры былі прывілеем больш заможных людзей, якія маглі належаць да слою дружыннікаў [116]. Яшчэ

---

[110] Казакявичюс В. К. *Оружие балтских племен II–VII веков на территории Литвы.* С. 17.

[111] Тамсама. С. 30–31.

[112] Тамсама. С. 40–41.

[113] Археалогія Беларусі. Т. 2. С. 369–370.

[114] Тамсама. С. 387.

[115] Казакявичюс В. К. *Оружие балтских племен II–VII веков на территории Литвы.* С. 74–80. Археалогія Беларусі. Т. 2. С. 370, 387.

[116] Казакявичюс В. К. *Оружие балтских племен II–VII веков на территории Литвы.* С. 81.

адным відам зброі бліжняга бою былі баявыя нажы, якія выкарыстоўваліся плямёнамі банцараўскай культуры [117] і культуры ўсходнелітоўскіх курганоў[118]. Адзінкавая знаходка мяча ў Нікадзімаве сведчыць аб тым, што балцкай вайскова-дружыннай знаццю пастунова пачыналі выкарыстоўвацца і мячы, але яшчэ не атрымалі шырокага распаўсюджання [119].

Засцерагальнае ўзбраенне балтаў, як і ў славян, складалася з драўлянага шчыта, які зрэдку мог мець пляската-паўсферычны ці канічны умбон пасярэдзіне і яшчэ радзей быць акуты металёвай паласой па перыметры [120].

### В) Умацаванні і аблога

Яшчэ адным важным элементам развіцця ваеннага майстэрства славян і балтаў было будаўніцтва крапасных умацаванняў і выпрацоўка спосабаў іх аблогі. Асноўным відам умацаваных пунктаў у гэты час былі вышэйзгаданыя гарадзішчы-сховішчы, якія мелі важнае ваеннае значэнне. Валоданне гарадзішчам давала ключ да кантролю над усёй яго акругай. Пры нападзе ворага насельніцтва акругі магло перахавацца на гарадзішчы ад небяспекі разам са сваёй маёмасцю, пазбавіўшы нападніка здабычы і не даўшы яму магчымасці замацавацца ў спляндраванай мясцовасці. Пры захопе гарадзішча было надзейным апірышчам для заваёўніка ў справе далейшага падпарадкавання прылеглай акругі. Валоданне ім ставіла ўсю акругу ў залежнасць ад новых гаспадароў. Нават пры адсутнасці ў заваёўніка намеру трывала замацавацца ў дадзенай мясцовасці гарадзішча ўяўляла для яго вялікі інтарэс як месца, дзе засяроджвалася найбольш матэрыяльных каштоўнасцяў таго ці іншага племені. Таму як славяне, так і балты надавалі першаступеннае значэнне належнаму ўмацаванню сваіх гарадзішчаў.

---

117 Археалогія Беларусі. Т. 2. С. 368.
118 Тамсама. С. 387.
119 Бацюкоў А. *Самы старадаўні меч.* С. 5.
120 Казакявичюс В. К. *Оружие балтских племен II–VII веков на территории Литвы.* С. 119, 134; Археалогія Беларусі. Т. 2. С. 389.

Асноўнымі ўмацаваннямі гарадзішчаў былі валы з драўлянымі сценамі на іх і равы. Абмежаваныя чалавечыя і тэхнічныя рэсурсы вымушалі будаўнікоў дастасоўваць умацаванні да рэльефу мясцовасці, выкарыстоўваючы для будаўніцтва найперш цяжкадаступныя месцы. У якасці натуральных пляцовак выкарыстоўваліся ўзвышшы, мысы пры зліцці дзвюх рэк альбо мысы, адгароджаныя з двух бакоў ярамі. Напрыклад, славянскія гарадзішчы Хатомель і Хільчыцы знаходзіліся на ўзвышшах. Гарадзішча ў вёсцы Гарадзішча Пінскага раёну размяшчалася на мысавай пляцоўцы памерамі 22x27 метраў. Ягоныя ўмацаванні ўключалі пясчаны вал з напольнага боку і драўляную сцяну па ўсім перыметры. Сцяна была збудаваная з вертыкальных апорных слупоў, укапаных за 3 метры адзін ад аднаго. Паміж імі былі замацаваныя гарызантальныя бярвенні. Умацаванні дапаўняліся ровам глыбінёй у 3 метры[121].

Мысавыя гарадзішчы таксама шырока выкарыстоўваліся балтамі. Пры гэтым рэльеф, напрыклад, Прыдняпроўя з яго высокімі берагамі рэк дазваляў узводзіць вельмі ўнушальныя ўмацаванні. Гарадзішча Калочын-1 знаходзілася на прастакутным мысе на Дняпры памерамі 42x36 метраў і было абаронена двума валамі і равамі ў абрысе падковы з напольнага боку і яшчэ адным валам па перыметры[122]. Калочынскае гарадзішча ў вёсцы Нікадзімава на мысе на рацэ Быстрая належала да складана-мысавага тыпу і мела дзве пляцоўкі, кожная з якіх была ўмацаваная валам са зрубнай драўлянай сцяной[123].

Узгорысты рэльеф цэнтральных і паўночна-заходніх земляў даваў больш магчымасцяў для ўмацавання ўзвышшаў. Банцараўскае гарадзішча ўзгоркавага тыпу Свіла-1 было абароненае трыма канцэнтрычнымі валамі і двума равамі[124]. Па-майстэрску выкарыстоўваючы мясцовасць, будаўнікі гарадзішчаў, тым не менш, не спадзяваліся выключна на прыроду. Натуральныя пляцоўкі моцна змяня-

---

121 Археалогія Беларусі. Т. 2. С. 338.

122 Тамсама. Т. 2. С. 351.

123 Гісторыя Беларусі. Т. 1. С. 129; Седин А. *Никодимово – городище третьей четверти I-го тысячелетия н. э. в Восточной Беларуси.* С. 31–33.

124 Археалогія Беларусі. Т. 2. С. 362.

ліся для патрэбаў абароны. Напрыклад, будаўнікі банцараўскага гарадзішча ў вёсцы Гарадзішча Мядзельскага раёну значна пашырылі яго натуральную пляцоўку і эскарпіравалі схілы ўзгорка, гэта значыць, зрабілі іх больш стромкімі і цяжкадасягальнымі[125].

На поўначы і паўночным усходзе беларускіх земляў маглі выкарыстоўвацца і гарадзішчы на балотных выспах[126]. Гарадзішчы на ўзгорках і выспах аб'ядноўваюцца ў адзін тып выспавых паводле сваёй вызначальнай рысы – абароненасці рэльефам з усіх бакоў.

У сістэму фартыфікацыі выспавых гарадзішчаў на балцкіх землях часта ўваходзілі кулгрынды (літ. kūlgrinda, ад жамойцк. дыялектн. kūlis – камень + grinda – брук), брукаваныя дарогі праз балоты, рэкі, азёры ці іншыя водныя перашкоды. Іх задачай было забяспечыць доступ абаронцаў на гарадзішча і ўскладніць магчымасці бесперашкоднага падыходу ворага да ўмацаванняў. У адпаведнасці з гэтай мэтай кулгрынды часта пракладаліся пад вадой і мелі звілісты абрыс[127]. Верхні слой бруку складаўся з роўна ўкладзеных камянёў дыяметрам 10–20 см і насцілаўся на аснову альбо на адмысловы ніжні слой, прызначаны для ўмацавання верхняга. Аснова складалася з бязладна ўкладзеных палявых камянёў дыяметрам 50–80 см альбо скінутых у балота пнёў, голля і камлёў, альбо ўяўляла сабой складаную канструкцыю з пакладзеных упоперак сасновых бярвенняў, на якія быў насыпаны пласт пяску. З бакоў кулгрынды ўмацоўваліся сасновымі палямі ці каменнымі клінамі і засцерагаліся ад заносу глеем з дапамогай канавак. Падобнае прызначэнне мелі мядгрынды (літ. medgrinda) і жэмгрынды (літ. žemgrinda). Мядгрынды брукаваліся дрэвам, тады як аснову жэмгрындаў складала зямля, часам перасыпаная камянямі ці бярвеннямі. Шырыня кулгрындаў вагалася ад 1,5 да 6 м, даўжыня – ад 3–4 да некалькіх соцень метраў[128]. Дарогі такога тыпу былі

---

125 Археалогія Беларусі. Т. 2. С. 361–362.

126 Носов К. С. *Русские крепости и осадная техника VIII–XVII вв.* Санкт-Петербург, 2003. С. 6.

127 Кулгринды // Литва. Краткая энциклопедия. Вильнюс, 1989. С. 351.

128 Baubonis Z. *Kūlgrindų, medgrindų ir žemgrindų klausimu // Aktualūs*

вядомыя ў Прусіі ўжо з I ст. н. э., у Літве – з IV ст., дзе і працягвалі будавацца да ранняга сярэднявечча[129]. Найбольш інтэнсіўна яны ўзводзіліся ў Жамойціі, але некаторыя з іх знаходзяцца досыць блізка да сучаснай тэрыторыі Беларусі. Вядомыя мядгрынды ў вёсцы Обеляй, раён Укмерге (Вількамір) і ў Кярнаве (Кернава), Шырвінцкі раён[130]. Кярнаўская мядгрында датуецца IV–VII стст.[131] Ёсць звесткі і аб падводных дарогах непасрэдна на тэрыторыі Беларусі на возеры Краснае ў Дзісенскім павеце[132] і паміж вёскай Наносы і Мядзелам на возеры Нарач. Нарачанская кулгрында, званая ў народзе Чортавай грэбляй і брукаваная шчыльна пакладзенымі камянямі, знаходзілася на глыбіні прыкладна 125 см ад паверхні вады, узвышалася над дном возера прыкладна на 160 см і мела ў даўжыню каля 1 км; у шырыню забяспечвала прастору для праезду чатырох запрэжаных коней адначасова[133]. Цікава, што традыцыі будаўніцтва дарог, асабліва трывалыя ў заходніх балтаў, дажылі да часоў Вялікага Княства Літоўскага, дзе пераселеныя ў XIII ст. з Прусіі борці ўтварылі саслоўна-прафесійную групу, занятую гэтым рамяством[134].

Нягледзячы на ўяўную з пункту гледжання сённяшняга часу прыступнасць, гарадзішчы добра выконвалі абарончую функцыю і былі значнай перашкодай для тагачасных нападнікаў.

Спосабы аблогі ўмацаванняў натуральным чынам грунтаваліся на ўзроўні развіцця ваеннага майстэрства, эканомікі і тэхнікі таго часу. Пры іх прымітыўнасці аблога

---

*kultūros paminklų tyrinėjimų uždaviniai: Konferencijos pranešimų tezės.* Vilnius, 1988. 51–53.

129 Ibid. 47.

130 Ibid. 49.

131 Ibid. 47.

132 Ластоўскі. В. *Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік.* Коўна, 1924. С. 42.

133 Живописная Россия. Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении. Т. 3. Литовское и Белорусское Полесье. Репринтное воспроизведение издания 1882 года. Мн., 1993. С. 54.

134 Доўнар А. *«Масты ў паўтара пруты». Нарыс з гісторыі дарожных камунікацыяў Беларусі XVI–XVIII стст.* // Спадчына. Мн., № 2–3/2003 (152). С. 64–65.

была справай нялёгкай. Таму найбольш распаўсюджаным тады спосабам захопу ўмацаванага пункту трэба лічыць нечаканы напад. Нападнікі маглі пры гэтым выкарыстоўваць тую акалічнасць, што гарадзішчы ўсё яшчэ былі ў большай ступені сховішчамі, чым населенымі пунктамі, і таму не заўсёды маглі ахоўвацца дастатковай колькасцю ваяроў. У такім выпадку пасля атакі нападнікі імкліва адступалі як пры захопе, цягнучы за сабой нарабаванае майно і палонных, так і пры няўдачы [135]. Такі спосаб мог асабліва часта выкарыстоўвацца пры рабаўніцкіх нападах, калі нападнікі не ставілі сабе мэты ўтрымання захопленага гарадзішча і яго акругі, а цікавіліся выключна здабычай. У такіх абставінах меркантыльныя мэты нападу не апраўдвалі доўгую аблогу і звязаныя з ёю цяжкасці і рызыку.

Больш складаныя спосабы аблогі маглі выкарыстоўвацца, калі бок, які нападаў, планаваў стала завалодаць умацаваннем і яго прылеглай акругай. Для аднаўлення гэтых спосабаў мы зноў звернемся да візантыйскіх крыніц, якія падрабязна апісваюць прыёмы аблогі славянамі візантыйскіх гарадоў на Балканах у VI–VII стст. Паводле сведчання Пракопія, славянам у 551 г. удалося авалодаць крэпасцю Тапэр у Фракіі шляхам штурму. Інтэнсіўнай стральбой з лукаў славянскія стральцы падавілі супраціўленне візантыйцаў, якія са сцен кідалі ў славян камяні і лілі на іх гарачую смалу і алей. Пасля гэтага з дапамогай лесвіц славяне ўварваліся ў горад [136]. Яшчэ лепей з ваеннага і тэхнічнага пункту гледжання былі падрыхтаваныя шматлікія аблогі Солуня (Фесалонікі), у якіх бралі ўдзел і драгувіты. У ходзе аблогі 586 г. славяне разам з аварамі выкарыстоўвалі такія віды абложнай тэхнікі, як: гелеполы (абложныя вежы), вышынёй роўныя гарадской сцяне, з усталяванымі на іх кідальнымі машынамі; «бараны» (тараны) з акутым жалезам рогам; каменямёты; «чарапахі» (штурмавыя навесы), накрытыя для абароны ад агню свежасадранымі скурамі [137]. Пры дапамозе гэтых прылад яны імкнуліся разбурыць гарадскія сцены і падавіць супраціў-

---

[135] Носов К. С. *Русские крепости и осадная техника VIII–XVII вв.* С. 10.

[136] Procop. Bell. Goth. VII, 38. С. 321–322.

[137] Miracul. Demetr. 139 // Свод... Т. II. С. 113.

ленне абаронцаў, адначасова спрабуючы разбурыць сякерамі і ломамі знешнія ўмацаванні перад сценамі [138]. Але няўдача ў рукапашнай сутычцы з абаронцамі і трываласць умацаванняў Солуня прымусілі іх адступіць, кінуўшы ўсю сваю тэхніку [139]. У 616 г. славяне ў чарговы раз паўтарылі напад на горад. Яны ізноў выкарысталі каменямёты, на гэты раз рачэй не з мэтай разбурэння сцен, а каб з дапамогай іх і стральбы з лукаў падавіць абаронцаў на сценах, прыставіць лесвіцы і ўварвацца ў горад. Гэтыя намаганні дапаўняліся спробамі падпаліць гарадскія вароты. Асобная атака была распачатая з боку мора на чоўнах [140]. Штурм скончыўся няўдачай, а велізарныя страты пры марской атацы прымусілі славян адступіць ад гораду [141]. Не спадзеючыся на ўласныя сілы, яны заклікалі на дапамогу аварскага кагана. Аблога, якая адбылася ў 618 г., вялася амаль тымі самымі спосабамі з дадаткам нейкіх запальных сродкаў [142]. Пасля няўдалага штурму славяне і авары былі вымушаныя заключыць мір з жыхарамі Солуня [143].

Грунтуючыся на гэтых звестках, мы можам паспрабаваць асцярожна аднавіць спосабы аблогі крэпасцяў на беларускіх землях з папраўкай на нізкі ўзровень эканомікі і тэхнікі мясцовых плямёнаў. Мы адразу ж мусім выключыць з арсеналаў мясцовых славян і балтаў гелеполы, каменямёты і іншыя машыны. Пабудова такіх машын была малаверагоднай для плямёнаў на стадыі ваеннай дэмакратыі. Балканскія славяне і авары карысталіся такой тэхнікай толькі запазычыўшы яе ў візантыйцаў праз перабежчыкаў і палонных [144]. Цалкам верагодна, аднак, што прасцейшыя прыстасаванні кшталту навесаў і лесвіц маглі выкарыстоўвацца досыць шырока. Агульная карціна аблогі гарадзішча на беларускіх землях магла выглядаць прыкладна такім чынам. Аблжнікі атачалі гарадзішча,

---

[138] Miracul. Demetr. 147 // Свод... Т. II. С. 115.
[139] Ibid. 158 // Свод... Т. II. С. 121.
[140] Ibid. 185–186 // Свод... Т. II. С. 129–131.
[141] Ibid. 189–191 // Свод... Т. II. С. 131–133.
[142] Ibid. 203 // Свод... Т. II. С. 137.
[143] Ibid. 213 // Свод... Т. II. С. 143.
[144] Феофилакт Симокатта. *История*. II, XVI, 1–11. (Далей: Theoph. Sim.). Москва, 1996. С. 58–60.

адразаючы яго ад знешняй дапамогі. Далей рыхтаваўся і праводзіўся штурм. Стральцы і кідальнікі дзідаў імкнуліся падавіць абаронцаў і пазбавіць іх магчымасці эфектыўна абараняцца са сцен. Іншыя атрады пад прыкрыццём шчытоў і простых навесаў набліжаліся да сцен, цягнучы за сабой лесвіцы. Пры дапамозе лесвіц нападнікі ўзыходзілі на сцены і ўрываліся на гарадзішча, пераходзячы да рукапашнай сутычкі з абаронцамі, якая і вырашала ход штурму. Таксама маглі ажыццяўляцца спробы ўварвацца ўнутр шляхам падпалу сцяны альбо разбурэння яе асобных частак уручную.

У сваю чаргу, абаронцы імкнуліся адбіць нападнікаў стральбой, кіданнем коп'яў і камянёў і іншым супрацьдзеяннем іх спробам узысці на сцены. Таксама маглі прадпрымацца вылазкі з мэтай пазбегнуць спробаў разбурэння і падпалу сцяны і для знішчэння жывой сілы ворагаў. У 632 г. славянам, аб'яднаным у дзяржаве Само, у ходзе трохдзённай абароны крэпасці Вагастысбурк (у сучаснай Чэхіі) удалося нанесці цяжкае паражэнне войскам франкскага караля Дагаберта [145]. Такі поспех мог быць дасягнуты толькі выкарыстаннем актыўных спосабаў абароны.

Найменш ужываемым спосабам аблогі была блакада. Пры нізкім узроўні вытворчасці з эканамічнага пункту гледжання ўтрымліваць войска пад крэпасцю больш-менш доўгі час было не менш цяжкай задачай, чым знаходзіцца ў аблозе.

Урэшце рэшт, гарадзішчы былі досыць надзейным, хаця і не цалкам непрыступным сродкам абароны жыцця і маёмасці племені пры варожых нападах.

### Г) Стратэгія і тактыка

Безумоўна, разважаць аб такіх ключавых для ваеннай гісторыі паняццях, як стратэгія і тактыка, у дачыненні да перыяду ваеннай дэмакратыі цяжка. Цяжка найперш таму, што стратэгія і тактыка як складныя часткі ваеннага майстэрства толькі пачыналі нараджацца з найпрасцейшых баявых прыёмаў. Сама вайна яшчэ толькі нараджалася з

---

145 Fred. III, 68 // Свод... Т. II. С. 369–370.

прымітыўных і хаатычных узброеных сутычак. Зрэшты, тактыка як майстэрства вядзення бою пачынала выкрышталізоўвацца ў выглядзе асэнсаванага выкарыстання зброі і ваеннай тэхнікі для выканання канкрэтных баявых задач, існавання стыхійных, але акрэсленых баявых адзінак, пастраення войска на полі бою ці пры аблозе ў пэўным парадку. Стратэгія ж як майстэрства вядзення вайны ў цэлым не магла развіцца да ўзроўню, вышэйшага за той, на якім знаходзілася сама з'ява вайны. Таму пры агульным характары ўзброеных канфліктаў перыяду ваеннай дэмакратыі, калі прадметам канфлікту мог быць усяго толькі рабаўніцкі напад на невялікую асобную акругу ці гарадзішча альбо іх захоп, стратэгія магла прымаць толькі найпрасцейшыя формы, для азначэння якіх можна ўжыць тэрмін «протастратэгія».

Гэтыя прасцейшыя формы не маглі адлюстроўвацца ў наборы развітых паняццяў і правілаў. Яны засноўваліся на ўласным баявым досведзе і здаровым сэнсе і спасцігаліся інтуітыўна. Аднак нават на інтуітыўным узроўні протастратэгія ўжо набывала рысы, якія ў пазнейшы час сталі асновай стратэгіі як адной з найважнейшых частак ваеннага майстэрства. Так, агульны ход вайны і спосабы яе вядзення непазбежна вызначаліся мэтамі, якіх праціўнікі імкнуліся дасягнуць. Мэты ж адпавядалі інтарэсам грамадства, то бок племені ці асобных яго частак.

У залежнасці ад мэтаў узброеныя канфлікты на беларускіх землях перыяду ваеннай дэмакратыі можна ўмоўна падзяліць на два віды: рабаўніцкія напады і канфлікты з мэтай сталага захопу пэўнай тэрыторыі. У выпадку рабаўніцкага нападу протастратэгія боку, які нападаў, была надзвычай простай: імклівая атака на гарадзішча ці неўмацаванае паселішча і хуткі адыход на сваю тэрыторыю са здабычай і палонам альбо ў выпадку няўдачы без іх. Доўгая аблога гарадзішчаў не выкарыстоўвалася. Адваротна, дзеянні боку, які абараняўся, зводзіліся да хуткай эвакуацыі насельніцтва акругі пад абарону сценаў гарадзішча альбо збору ваяроў дружыны і апалчэння, каб прымусіць ворагаў адысці пад пагрозай палявога бою.

Канфлікты з мэтай сталага захопу тэрыторыі адбываліся ў кантэксце перасялення плямёнаў на беларускіх землях.

Гэтыя працэсы як з боку славян, так і з боку балтаў былі стыхійнымі і спарадычнымі і не ўяўлялі сабой арганізаванага руху. Паасобныя плямёны рухаліся ў кірунках, якія вызначаў рэльеф мясцовасці, абапіраючыся толькі на свой досвед і не маючы магчымасці прадказаць верагоднае развіццё падзей на вялікіх адлегласцях нават у бліжэйшай будучыні. Вядома, існавалі кантакты з суседнімі плямёнамі, але раздробленасць, уласцівая грамадствам ваеннай дэмакратыі, перашкаджала ажыццяўляць каардынацыю дзеянняў. У такіх умовах протастратэгія славян і балтаў не магла насіць мэтанакіраваны і пралічаны характар. Увесь ход узброенага канфлікту быў падпарадкаваны блізкай мэце авалодання адносна невялікай тэрытарыяльнай акругай, дастатковай для пасялення асобнага племені. Адпаведна, протастратэгія прымала простыя формы, накіраваныя на дасягненне гэтай мэты: знішчэнне жывой сілы непрыяцеля, якая складалася з дружыны і племяннога апалчэння, у ходзе палявога бою і наступнага захопу гарадзішчаў як ключоў да валодання тэрыторыяй. Узброены канфлікт мог лічыцца скончаным з паражэннем аднаго з бакоў і яго выцясненнем са спрэчнай тэрыторыі.

Больш складаныя формы протастратэгія набывала толькі з утварэннем саюзаў плямёнаў ці княжанняў. Княжанні ўяўлялі сабой больш развітыя грамадствы са сталымі цэнтрамі прыняцця рашэнняў у асобе правадыра дружыны і дружыннай знаці. У такіх умовах протастратэгія страчвала элементы ірацыянальнасці і набывала рысы мэтанакіраванасці і прадуманасці. Цяпер мэты ўзброенага канфлікту вызначаліся не стыхійна, а акрэслена. Княжанні маглі свядома пашыраць сваю тэрыторыю з эканамічнымі мэтамі набыцця найбольш заможных, урадлівых ці выгадна размешчаных ля шляхоў зносін земляў альбо проста нарошчваючы сваю магутнасць коштам суседзяў. Канчатковым вынікам вайны цяпер магло лічыцца не выгнанне папярэдняга насельніцтва з захопленай зямлі, а яго падпарадкаванне свайму ўплыву. Хаця протастратэгія па-ранейшаму зводзілася да знішчэння жывой сілы ворага і захопу ўмацаваных пунктаў, цяпер яна служыла больш асэнсаваным і маштабным мэтам.

Тактыка, заснаваная на простай вайсковай арганізацыі і выкарыстанні простага ўзбраення, таксама не вылучалася складанасцю. Паколькі найважнейшай мэтай узброеных сутыкненняў таго часу было засяленне плямёнамі новых земляў, адной з першых яе задач было забеспячэнне бесперашкоднага руху масы ваяроў і простых абшчыннікаў на вялікія адлегласці. У славян рух ажыццяўляўся на павозках, конна і пехатой. У выпадку нечаканага нападу ворага славяне атабарваліся на ўзвышаным ці іншым цяжкадаступным месцы. Лагер акружалі павозкамі, якія выконвалі ролю рухомага ўмацавання, што дапамагала адбіваць варожыя атакі. Візантыйскі гісторык Феафілакт Сімаката так апісвае сутыкненне візантыйцаў са славянамі пры паходзе візантыйскага палкаводца Пятра на славян у 595 г.: «Так як гэтае сутыкненне для варвараў было непазбежным, то яны, паставіўшы павозкі, зрабілі з іх як бы ўмацаванне лагера і ў сярэдзіне гэтага лагера схавалі жанчын і дзяцей. Наблізіўшыся да гетаў (так у даўніну называлі гэтых варвараў), рамеі не адважваліся ўступіць з імі ў рукапашны бой: яны баяліся коп'яў, якія кідалі варвары ў іхніх коней з вышыні гэтага ўмацавання»[146].

У баі, прынамсі што датычыцца славян, звычайна ўдзельнічаў толькі адзін род войскаў – пяхота. Славяне мелі добра развітую конегадоўлю і шырока карысталіся конямі як у гаспадарцы, так і ў баявых дзеяннях. Асабліва гэта датычылася заможнай вайсковай знаці – правадыроў і дружыны. Разам з тым недастатковы ўзровень вывучкі і адсутнасць неабходнага ўзбраення яшчэ не дазвалялі славянам уступаць у конны бой з ворагам, які, як візантыйцы ці авары, значна пераўзыходзіў іх у гэтых элементах ваеннага майстэрства. Коні ў асноўным скарыстоўваліся для хуткага руху на вялікія адлегласці. Феафілакт Сімаката пры апісанні паходу палкаводца Прыска супраць славян у 594 г. адзначае, што правадыр славян Ардагаст «нечакана напаў на рамеяў і, *саскочыўшы з каня*, паспрабаваў шчасця ў *пешай* бітве»[147]. Між тым, мяркуючы па значнай распаўсюджанасці пахаванняў ваяроў ра-

---

146 Theoph. Sim. VII, II, 4–5. C. 180.
147 Ibid. VI, VII, 2. C. 168.

зам з канём[148], у балцкіх плямёнах майстэрства коннай язды стаяла на больш высокім узроўні. Таму і конніца як род войска, якая складалася пераважна з дружыннікаў, магла стала выкарыстоўвацца ў баях.

Просты характар мелі і баявыя парадкі славянскіх і балцкіх плямёнаў таго часу. Пры люстэркавым падабенстве вайсковай і грамадскай арганізацыі племені і супадзенні арганізацыйных і тактычных адзінак апалчэнне племені строілася на полі бою па родах ці тэрытарыяльных адзінках. Кожная з такіх адзінак у сваю чаргу складалася з вышэйзгаданых элементарных адзінак, што ўключалі сваякоў з адной сям'і ці жыхароў аднаго паселішча. Паводле меркаванняў гісторыкаў, у межах такіх адзінак магла ажыццяўляцца першасная спецыялізацыя паміж ваярамі з розным узбраеннем, напрыклад, шчытаносцамі, кідальнікамі дроцікаў і стральцамі. Спецыялізацыя гэтая ўзнікала сама сабой, без знешняга арганізацыйнага пачатку[149]. У такіх умовах яна залежала ад наяўнасці адпаведнай зброі ў сяброў такой адзінкі і строга не вытрымлівалася. Напрыклад, пры адсутнасці шчытаносцаў кожны кідальнік дроцікаў ці стралец фактычна заставаўся пакінуты сам сабе і дзейнічаў паасобна ў залежнасці ад абставін. Узаемадзеянне ваяроў ускладнялася адсутнасцю дысцыпліны і строгай субардынацыі. Такое самае становішча назіралася і на ўзроўні родавых ці тэрытарыяльных апалчэнняў. Яны ўзначальваліся роўнымі паводле статусу старэйшынамі, якія маглі адкрыта варагаваць паміж сабой і не лічылі патрэбным узгадняць свае дзеянні. Як піша Маўрыкій аб славянах, «у іх шмат правадыроў, і яны не пагаджаюцца адзін з адным»[150]. «Перабываючы ў стане безуладдзя і ўзаемнай варожасці, яны ні баявога парадку не ведаюць, ні змагацца ў правільным баі не імкнуцца»[151]. Апалчэнне такога кшталту ў баі кіравалася кепска і не магло выконваць складаных баявых задач. Правадыр, яшчэ не маючы дастатковай улады, не мог выключна сілай свай-

---

[148] Куликаускене Р. К. *Погребения с конями у древних литовцев.* С. 211–222.

[149] Нефёдкин А. К. *Тактика славян в VI в.* С. 88.

[150] Mauric. XI, 4, 30 // Свод... I. С. 375.

[151] Ibid. XI, 4, 12 // Свод... I. С. 371.

го ўплыву дабіцца поўнага падпарадкавання сабе родавых і тэрытарыяльных старэйшынаў з іх апалчэннямі і іх належнага ўзаемадзеяння на полі бою. Таму ён быў вымушаны найперш разлічваць на сваю дружыну як на найбольш надзейную і баяздольную баявую адзінку. Такое становішча з'яўлялася тыповым для еўрапейскіх народаў эпохі ваеннай дэмакратыі і датычылася і славян, і балтаў.

Ва ўмовах перавагі пяхоты і абмежаванай кіраванасці апалчэнняў на полі бою вялікае значэнне атрымліваў бой з дапамогай кідальнай зброі ў супрацьвагу рукапашнаму бою, які быў нашмат больш патрабавальны да арганізацыі апалчэнняў, вывучкі і дысцыпліны ваяроў, узаемадзеяння асобных ваяроў і тактычных адзінак у баі і прафесійнага выкарыстання зброі. У баі кідальнай зброяй, наадварот, націск рабіўся на спрыт і трапнасць асобных ваяроў, якія маглі паражаць ворагаў з адлегласці, мала рызыкуючы жыццём. У выпадку сур'ёзнай пагрозы кідальнікі дроцікаў і стральцы маглі хутка адысці, каб перагрупавацца і зноў ударыць па непрыяцелю. У такіх умовах вельмі яскрава праяўляўся згаданы элемент самаарганізацыі, які дазваляў апалчэнню эфектыўна змагацца нават пры недастатковым кіраванні з боку правадыра і старэйшын. Гэта дазваляе меркаваць, што ў эпоху ваеннай дэмакратыі кідальная зброя давала пэўную перавагу на полі бою перад зброяй бліжняга бою. Таксама гэта датычылася аблогі і абароны ўмацаваных пунктаў, дзе дакладная і інтэнсіўная стральба і ўжыванне іншых кідальных снарадаў дапамагала падавіць непрыяцеля на сценах альбо, наадварот, утрымаць кантроль над сценамі.

Зыходзячы з гэтых меркаванняў, мы можам паспрабаваць аднавіць асноўныя тактычныя спосабы бою той эпохі. Першым з іх і найбольш часта ўжываемым, безумоўна, быў ірэгулярны спосаб, заснаваны на нечаканых нападах і засадах пры выкарыстанні рэльефу мясцовасці. Паводле Маўрыкія, славяне, «ведучы разбойнае жыццё, ...любяць рабіць напады на сваіх ворагаў у месцах лясістых, вузкіх і абрывістых. З выгодай для сябе карыстаюцца засадамі, нечаканымі нападамі і хітрыкамі, уначы і днём выдумляючы шматлікія хітрасці»[152]. Хутчэй за ўсё, большасць узб-

[152] Mauric. XI, 4, 9 // Свод... I. С. 369–371.

роеных сутычак адбывалася менавіта такім чынам. Страты непрыяцеля ў выніку такой сутычкі не маглі быць вялікімі, нават пры паспяховым яе зыходзе. Аднак агульная колькасць такіх сутычак і сума іх ахвяр пры варожасці паміж плямёнамі была вялікай, што дазваляла значна паслабляць жывую сілу ворагаў. Ірэгулярная тактыка нечаканых нападаў і засад была агульнай для многіх еўрапейскіх народаў. Можна думаць, што яна была цалкам уласцівай і балтам.

Другім відам тактыкі таго часу быў адкрыты палявы бой з непрыяцелем. Ён выкарыстоўваўся ў выпадку, калі правадырам удавалася сабраць значныя сілы апалчэння, здольныя супрацьстаяць непрыяцелю на адкрытай мясцовасці. Перамога ў палявым баі дазваляла адразу знішчыць значную колькасць жывой сілы ворага, атрымаць кантроль над мясцовасцю і беспярашкодна наблізіцца да варожых гарадзішчаў. У такім выпадку, што датычылася славян, іх апалчэнне з баявым крыкам набліжалася да ворага, пастроенае па родах ці тэрытарыяльных адзінках калонападобнымі масамі. Пры падыходзе на пэўную адлегласць яно разгортвалася ў няроўную баявую лінію, якая складалася з вышэйзгаданых элементарных баявых адзінак. Наперадзе станавіліся шчытаносцы. Пад іх прыкрыццём дзейнічалі кідальнікі дроцікаў і стральцы. Апалчэнне марудна насоўвалася на ворага, закідваючы яго стрэламі і дзідамі і спрабуючы запалохаць яго яраснымі крыкамі. Найбольш харобрыя ваяры маглі выбягаць наперад, імкнучыся паразіць ворага з больш блізкай адлегласці. Калі такія дзеянні аказваліся паспяховымі і вораг не вытрымліваў націску і адступаў, славяне ўступалі ў рукапашны бой, каб давяршыць яго разгром. Калі непрыяцель трымаўся стойка, яны самі адступалі ў лясы, вяртаючыся да ірэгулярнай тактыкі[153]. Пры гэтым адступленне магло мець як вымушаны, так і запланаваны характар. У апошнім выпадку славяне імкнуліся завабіць ворага на невыгодную пазіцыю, каб контратакаваць яго. Маўрыкій апісвае вядзенне славянамі палявога бою наступным чынам: «...яны з крыкам усе разам патроху прасоўваюцца наперад. І калі

---

153 Нефёдкин А. К. *Тактика славян в VI в.* С. 87–90.

непрыяцелі паддаюцца іх крыку, імкліва нападаюць; калі ж не, перастаюць крычаць і, не імкнучыся выпрабаваць у рукапашнай сутычцы сілу сваіх ворагаў, уцякаюць у лясы, маючы там вялікую перавагу, бо ўмеюць змагацца належным чынам у цяснінах. Бо часта са здабычай яны пры самай нязначнай трывозе кідаюць яе, уцякаючы ў лясы, а калі нападнікі збяруцца вакол здабычы, яны, накідваючыся, лёгка чыняць ім шкоду. Яны імкнуцца разнастайнымі спосабамі і наўмысна рабіць гэта, каб завабліваць сваіх ворагаў»[154]. Такая тактыка магла выкарыстоўвацца ў тыя часы і на беларускіх землях, прычым у адрозненне ад баявых дзеянняў на Балканах супраць добра абвучаных і ўзброеных візантыйскіх войскаў, пры прыблізна роўным узбраенні славяне мусілі быць больш ахвочымі ўступаць у рукапашныя сутычкі з балтамі і паміж сабой.

Трэцім відам тактыкі быў рукапашны бой, пры якім апалчэнне строілася шчыльнымі масамі па родах ці тэрытарыяльных адзінках. Ужо адзначаная слабасць засцерагальнага і наступальнага ўзбраення, слабая дысцыпліна і кепская кіраванасць апалчэння ў баі не дазвалялі скарыстоўваць такую тактыку ў адкрытым полі. Яна магла ўжывацца ў абарончым баі, калі славяне, «займаючы больш умацаванае месца і будучы абароненымі з тылу, ...не даюць магчымасці [для таго], каб паддацца атачэнню ці нападу з флангаў альбо з тылу»[155]. У 706 г. славяне, пастроіўшыся на вяршыні гары, далі бой лангабардам пад камандаваннем фрыульскага герцага Фердульфа. Лангабарды атакавалі іх угору па цяжкадаступным схіле. Выкарыстоўваючы выгадную пазіцыю, славяне скідвалі лангабардаў з коней камянямі і сякерамі і панішчылі іх усіх. У баі загінула амаль уся фрыульская знаць і сам герцаг Фердульф[156].

Іншым выпадкам ужывання такога кшталту тактыкі, наадварот, была атака на непадрыхтаванага непрыяцеля, які не мог ці не паспеў пастроіцца ў баявыя парадкі, напрыклад, пры пераходзе праз перасечаную мясцовасць ці

---

154 Mauric. XI, 4, 12–13 // Свод... I. С. 371.

155 Ibid. XI, 4, 29 // Свод... I. С. 375.

156 Павел Диакон. *История лангобардов*. XIII, VI. 45. (Paul. Diac.) // Свод... Т. II. С. 491.

фарсіраванні прыродных перашкод. Пры паходзе Пятра на славян у 595 г. візантыйскае войска, якое моцна пакутавала ад недахопу вады, падышло да ракі Ілівакія. Але скарыстацца гэтым было немагчыма, бо славяне з супрацьлеглага берагу дроцікамі паражалі тых, хто падыходзіў да вады. Таму «даводзілася выбіраць адно з двух: адмовіцца ад вады і памерці ад смагі ці разам з вадой дастаць і смерць. І вось рамеі, ладзячы пераправу, перабраліся праз раку, каб схапіцца з ворагамі ў адкрытым баі. Калі ж войска апынулася на супрацьлеглым беразе, варвары адразу ж усёй масай напалі на рамеяў і адужалі іх. Пераможаныя рамеі кінуліся бегчы»[157]. Такая тактыка вядзення рукапашнага бою шчыльнымі масамі патрабавала мабілізацыі вялікай колькасці жывой сілы і мела сэнс толькі пры выкарыстанні супраць такіх самых шчыльных мас варожага войска. Таму на беларускіх землях, дзе збор вялікага апалчэння сутыкаўся з кепскімі шляхамі зносін, рэдкім насельніцтвам і раздробленай грамадскай арганізацыяй, яна, хутчэй за ўсё, ужывалася рэдка.

Перамога ў баі і знішчэнне жывой сілы ворага дазвалялі браць пад свой кантроль мясцовасці і шляхі зносін і з мэтай замацавання на занятай тэрыторыі перайсці да захопу ўмацаваных пунктаў.

Перамяшчэнне на вялікія адлегласці, тактыка засад у цяжкадаступных месцах і вядзенне палявога бою з выкарыстаннем рэльефу мясцовасці моцна залежалі ад здабыцця дакладных звестак аб сілах непрыяцеля і яго месцазнаходжанні. Для здабыцця дакладных звестак выкарыстоўвалася выведка, якая ўключала назіранне за непрыяцелем альбо пранікненне на ягоную тэрыторыю і выведванне інфармацыі ў непасрэдным кантакце з ім. Гэта патрабавала адчайнай смеласці. Пры аблозе славянамі Солуня ў 616 г. адзін з правадыроў славян Хацон здолеў пранікнуць у горад, відаць, з разлікам на кантакты з мясцовымі жыхарамі, настроенымі на кампраміс са славянамі. Пры гэтым ён быў выкрыты, схоплены ў доме, дзе хаваўся, і забіты[158].

[157] Theoph. Sim. VII, IV, 9–10. С. 185–186.
[158] Miracul. Demetr. 193 // Свод... Т. II. С. 133.

Падагульняючы ўсе звесткі аб ваенным майстэрстве славян і балтаў V–IX стст., можна сказаць, што яно было вельмі тыповым для еўрапейскіх плямёнаў перыяду ваеннай дэмакратыі, што даводзяць параўнанні з ваенным майстэрствам германцаў, галаў і брытанцаў на момант існавання ў іх падобнага ўзроўню развіцця. Ваеннае майстэрства натуральным чынам засноўвалася на дасягненнях грамадскага і эканамічнага ладу славян і балтаў, уплывала на гэты лад, цалкам адпавядала свайму часу і было адэкватным сваёй функцыі ў жыцці грамадства. Вайсковая арганізацыя, зброя, стратэгічныя і тактычныя спосабы вядзення баявых дзеянняў мелі просты характар, выходзіліся і выкарыстоўваліся інтуітыўна, але былі дастатковымі для вырашэння наяўных ваенных задач: ажыццяўлення рабаўніцкіх нападаў, захопу новых земляў альбо, наадварот, абароны жыцця і маёмасці супляменнікаў і адстойвання сваёй зямлі ад уварвання чужынцаў. Пры ўдалым выкарыстанні яны маглі ўяўляць небяспеку і для непрыяцеля з вышэйшым узроўнем ваеннага майстэрства, што даводзяць дзеянні балканскіх суродзічаў дрыгавічоў супраць Візантыйскай імперыі. Ваенныя канфлікты таго часу вылучылі дружыну як найбольш уплывовую сацыяльную групу грамадства і найбольш баяздольную вайсковую сілу, што адыграла выключную ролю ў зараджэнні новых грамадскіх інстытутаў і развіцці ваеннага майстэрства на якасна новым узроўні.

Кніга II.

# Нармански перыяд
# (820–я – 970–я гг.)

*Раздзел 1.*
# Гісторыя войнаў

Пачатак IX ст. на беларускіх землях стаў часам завяршэння пэўнага этапу грамадскага развіцця і міжэтнічнага ўзаемадзеяння. Утварэнне княжанняў крывічоў, дрыгавічоў і радзімічаў, існаванне племянных саюзаў літвы і яцвягаў адзначыла замену патрыярхальнага ладу патэстарнай супольнасцю[1], новую ступень славяна-балцкага этнічнага сінтэзу на большасці беларускіх земляў і стабілізацыю руху славяна-балцкай этнічнай мяжы на іх заходняй частцы. Але гэтыя з'явы не звялі працэс гістарычнага развіцця ў чужыя яму застылыя формы лінейнага руху. Наадварот, яны стварылі ўмовы для шчыльнейшых кантактаў мясцовага насельніцтва з носьбітамі іншых культур, якія прыносілі ўзбагачальнае ўздзеянне на палітычнае, эканамічнае і духоўнае жыццё краю. Найбольш заўважным знешнім уплывам у дадзены перыяд быў уплыў з боку нарманаў — жыхароў часткі Скандынаўскай паўвыспы, Ютландыі, Ісландыі, часткі Грэнландыі, выспы Готланд і некаторых іншых выспаў Балтыйскага мора.

Назва «нарманы», якая значыць «людзі з Поўначы», традыцыйна з Сярэднявечча ўжываецца ў еўрапейскай традыцыі для азначэння гэтых народаў, якія пазней склалі аснову дацкай, нарвежскай, шведскай і ісландскай нацый. Будзем карыстацца гэтай назвай і мы. Звяртаючыся да крыніц і навуковай літаратуры, можна сустрэць і іншыя назвы: «вікінгі», «варагі» і «Русь». Назва «вікінг», аднак, мае вузейшае значэнне і ўжываецца для азначэння чалавека, які выправіўся ў марскі паход[2]. Бясспрэчна, яна стасуецца да многіх нарманаў, якія мелі дачыненне да беларускіх земляў, але ў большай ступені азначае рабаўніка і

---

[1] Ад лац. «potestas» — улада.

[2] Лебедев Г. С. *Эпоха викингов в Северной Европе*. Ленинград, 1985. С. 64.

ваяра, чым купца ці стала аселага на чужыне чалавека. Тэрмін «вараг» характэрны для старажытнарускай пісьмовай традыцыі і азначае ў асноўным нарманаў, але ўвогуле мае досыць размытае значэнне і можа стасавацца да чужынца з іншых еўрапейскіх краін[3]. Нарэшце, ужо знаёмы нам тэрмін «Русь» будзе ўжывацца намі ў адпаведнасці з эвалюцыяй яго сацыяльнага і этнічнага зместу з цягам часу.

Канец VIII ст. адкрыў славутую эпоху вікінгаў, адзначаную масавай экспансіяй нарманаў у многія краіны Еўропы. На сваіх дасканалых караблях, горда званых «лебедзямі марскога бога», яны дасягалі нават узбярэжжаў Афрыкі, каб пакінуць незабыўны след у памяці тых, хто з імі сутыкаўся. Адны памяталі іх як суворых ваяроў і бязлітасных рабаўнікоў-марадзёраў. Іншыя мелі з імі справу як з прадпрымальнымі і дзейнымі купцамі. Некаторым жа нават даводзілася бачыць, як яны асядалі побач у якасці мірных пасяленцаў-земляробаў.

Прычынай такога выбуху, які прынёс нечаканых гасцей на чужыя берагі, было спалучэнне вялікага росту насельніцтва са складанымі кліматычнымі ўмовамі. Паступовы распад родавага ладу і паступальнае развіццё эканомікі падштурхоўвалі дэмаграфічны рост, што падмацоўвалася нарманскай традыцыяй мець як мага больш сыноў у сям'і[4]. Пры прымітыўнай сельскай гаспадарцы суворая прырода Скандынавіі і Ютландыі проста не мела умоў для ўтрымання лішняй колькасці насельніцтва. Таму найбольш актыўная яго частка вымушана была шукаць лепшай долі ў чужых краях, а прыродная прадпрымальнасць і вера ва ўласныя сілы дазвалялі ацэньваць свае шанцы досыць высока. У такіх умовах нарманы маглі прэ-

---

3 Лаврентьевская летопись. Ст. 19.

4 Джонс Г. *Викинги: Потомки Тора и Одина*. Москва, 2003. С. 191–192. Варта сказаць, што «камерцыйная» назва не павінна бянтэжыць чытача. Відавочна, што словы наконт «нашчадкаў багоў» былі дададзеныя ў расейскі пераклад з мэтай большага прыцягнення ўвагі пакупнікоў. На самой жа справе, у ангельскім арыгінале кніга завецца проста «A History of the Vikings», ці «Гісторыя вікінгаў». Кніга не з'яўляецца папулярным зборнікам «смажаных» фактаў і легендаў з нарманскай гісторыі, а ўяўляе сабой надзвычай кваліфікаваны і крытычны нарыс гісторыі скандынаўскіх краін эпохі вікінгаў.

тэндаваць на долю, не проста лепшую за жыццё ў родным краі, а нават вельмі някепскую, хай сабе і чужым коштам.

Такія пошукі шчасця звычайна набывалі тры формы: рабаўніцтва, гандаль і каланізацыя. Прычым усе тры крочылі поруч і пераходзілі адна ў адну, бо мелі перад сабой падобныя мэты – здабыццё дабрабыту і агульны поспех у жыцці. Адзін чалавек мог удзельнічаць ва ўсіх трох у адным паходзе, мяняючы свае планы пад уплывам бягучых абставін і ацэнкі сваіх шанцаў на поспех у тым ці іншым. Пры адным са сваіх першых з'яўленняў на Брытанскіх выспах у панаванне ўэсэкскага караля Брытрыка (786–802 гг.) нарманы былі прынятыя за купцоў. Але яны забілі каралеўскага ўрадніка Бідухірда, які ўзяўся суправаджаць іх у каралеўскую рэзідэнцыю[5], а ў свой наступны прыход заняліся ўзброеным рабаўніцтвам[6]. Здабыча ад рабаўніцтва магла скарыстоўвацца для ўкладання ў гандаль, а напады на далёкія краіны дазвалялі адкрываць і пракладаць новыя шляхі зносін. Зваротна ніхто не забараняў скарыстоўваць грошы ад гандлю для падрыхтоўкі рабаўніцкіх выпраў. Учорашні купец, які зведаў новы рачны ці марскі гандлёвы шлях падчас камерцыйнай экспедыцыі, мог у наступны раз прайсці па ім з агнём і мячом з дружынай ваяроў. І ўзброены напад, і грашовая здзелка маглі скарыстоўвацца для набыцця зямлі і наступнай яе каланізацыі. Як адзначае англасаксонская хроніка пры апісанні аднаго з буйнейшых нападаў вялікай арміі (micel here) данаў на Англію ў 865–878 гг., яны сілай адабралі шмат земляў у жыхароў Нартумбрыі, Мерсіі і Усходняй Англіі «і пачалі араць і карміць сябе»[7]. Падчас наступнага нападу ў 892–896 гг. частка данаў скарыстала грошы, каб набыць зямлю ў краіне, імі ж разрабаванай[8]. Іншым нарманам давялося перанесці свае пошукі шчасця ў Францыю, што стала адной з прычын заснавання імі ў 910–912 гг. герцагства, паводле іх імені названага Нармандыяй[9]. У той

---

5 Сойер П. *Эпоха викингов.* Санкт-Петербург, 2002. С. 31.
6 Джонс Г. *Викинги...* С. 195.
7 Сойер П. *Эпоха викингов.* С. 213.
8 Тамсама. С. 214.
9 Тамсама. С. 240.

самы час аселыя ў Англіі даны выкарыстоўвалі свае новыя ўладанні не толькі для мірных заняткаў сельскай гаспадаркай, але і як плацдармы для далейшых нападаў на Англію[10]. Узаемадапаўняльнасць розных відаў экспансіі нарманаў была выключнай.

Тыя самыя з'явы адбываліся ў першай палове IX ст. і на беларускіх землях. Але варта зазначыць, што пранікненне нарманаў на землі славян і балтаў мела свае асаблівасці. Каланізацыя была ў колькасным вымярэнні вельмі нязначнай. З прычыны геаграфічнай блізкасці большасць нарманаў, якія праходзілі па беларускіх землях, паходзіла са Швецыі. Між тым прыродныя ўмовы самой Швецыі былі досыць спрыяльнымі для вядзення сельскай гаспадаркі, а зніжэнне ўзроўню грунтовых вод адкрывала для асваення новыя ворныя землі. Гэтыя фактары значна змяншалі патрэбнасць шведаў у знешняй каланізацыі[11].

Зусім іншай справай быў гандаль. Ён быў значна больш выгадным заняткам, даваў надзею на хуткае ўзбагачэнне і, самае галоўнае, даваў прыбытак у форме, найбольш паважанай у Скандынавіі: каштоўных металаў і грошай. Вядучае месца сярод усіх каштоўнасцяў займала срэбра ў форме манет[12], якое было універсальным плацёжным сродкам па ўсёй Еўропе, Бліжнім Усходзе і Афрыцы. Яно адкрывала магчымасці для набыцця зямлі, людзей і зброі. Яно дапамагала здабываць аўтарытэт сярод супляменнікаў, прыязнасць сяброў і каханне жанчын. Пра велізарную ролю срэбра сведчаць памеры скарбаў, захаваных на гандлёвых шляхах заможнымі гандлярамі, якія, хутчэй за ўсё, сталі ахвярамі абставін тых неспакойных часоў і не здолелі вярнуцца па свае каштоўнасці. У 1972 годзе пад вёскай Казьянкі ля Полацку школьнікамі быў знойдзены скарб сярэдзіны X ст. Толькі захаваная археолагамі частка скарбу налічвае 7660 срэбраных дырхемаў[13]. Мы таксама маем цікавае сведчанне сакратара пасольства абасідскага халіфа да волжскіх булгар у 921—922 гг. Ібн Фадлана.

---

[10] Сойер П. *Эпоха викингов.* С. 214—216; Джонс Г. *Викинги...* С. 226—228, 232—234.

[11] Сойер П. *Эпоха викингов.* С. 241—242.

[12] Тамсама. С. 127.

[13] Рябцевич В. Н. *Нумизматика Беларуси.* Мн., 1995. С. 109.

Паводле ягоных словаў, рускі купец спраўляў сваёй жонцы новае маніста з манет з кожных дзесяці тысяч утарганых дырхемаў. На шыях некаторых рускіх жанчын было шмат такіх маністаў[14]. Таму шведскія і іншыя нарманскія купцы і ваяры нястомна пракладалі шляхі ў краіны, багатыя срэбрам, то бок мусульманскія краіны Блізкага Усходу і Сярэдняй Азіі, якія ўваходзілі ў склад Арабскага халіфату. Менавіта гэтыя краі былі ў IX–X стст. найбольш значнымі экспарцёрамі срэбранай манеты, якая абслугоўвала рынкі ўсёй Еўропы[15].

У сваю чаргу, нарманы везлі на Усход футра і скуры, як здабытыя ў сябе дома, так і на балцкіх, славянскіх і фінскіх землях. Пры гэтым для такіх земляў, як Полацкая, футры былі асноўным прадметам экспарту на працягу стагоддзяў[16]. На Усходзе футры ўпрыгожвалі раскошны побыт знаці і купцоў і скарыстоўваліся для лячэння хвароб[17]. Дзеля адстойвання сваіх інтарэсаў і бяспекі гандляры футрам аб'ядноўваліся ў своеасаблівыя карпарацыі, сябры якіх зваліся калбягамі (kolbjäger)[18]. Побач з футрамі папулярнасцю карысталіся такія паўночныя тавары, як мёд і воск[19]. Іншым прадметам вывазу была зброя. Мусульманскі пісьменнік сярэдзіны – другой паловы IX ст. Ібн Хардадбех з Табарыстана (цяперашні Мазандаран) адзначае, што русы (г. зн. нарманы) «дастаўляюць... мячы з самых аддаленых [ускраін краіны] славян»[20]. Нарэшце, вялікую частку гандлю з усходнімі краінамі складаў гандаль рабамі, захопленымі ў выніку войнаў і рабаўніцкіх нападаў. Балцкія, славянскія і фінскія рабы, аб'яднаныя арабамі пад адзінай назвай «сакаліба», выступалі як ваяры і ахова эміраў, служылі еўнухамі ў гарэмах, дзе былі сабраныя дзяўчаты з тых самых краёў. Маштабы гэтага ганебнага гандлю складалі дзесяткі тысяч чалавек. Гэта

---

14 Путешествие Ибн Фадлана на Волгу. Москва; Ленинград, 1939. С. 78–79.

15 Рябцевич В. Н. *Нумизматика Беларуси.* С. 106.

16 Алексеев Л. В. *Полоцкая земля.* С. 109.

17 Херрман Й. *Славяне и норманны в ранней истории Балтийского региона* // Славяне и скандинавы. Москва, 1986. С. 102–103.

18 Арбман Х. *Викинги.* Санкт-Петербург, 2003. С. 151.

19 Рябцевич В. Н. *Нумизматика Беларуси.* С. 108.

20 Ибн Хордадбех. *Книга путей и стран.* §73в. Москва, 1986. С. 125.

не дадавала гонару нарманскім купцам, але служыла магутным рухавіком эканамічнага развіцця[21].

Варта асобна адзначыць, чаму гаворка ідзе менавіта аб нарманскіх купцах. Здавалася б, што на такіх вялікіх прасторах ад Балтыкі да Каспію і Блізкага Усходу, дзе пражывалі шматлікія народы і плямёны, гандаль маглі весці не толькі нарманы, але і балты, славяне ці фіна-угры. Цалкам верагодна, што пэўную частку купцоў на гэтых гандлёвых шляхах складалі яны. Але першынство, несумненна, належала нарманам. Гэта тлумачыцца іх велізарным досведам караблебудавання, мараплавання і навігацыі, які дапамагаў ім знаходзіць і асвойваць найбольш зручныя гандлёвыя шляхі ў бясконцых лабірынтах усходнееўрапейскіх рэк. Таксама на карысць нарманаў ьыказваюцца вядомыя нам пісьмовыя крыніцы. І Ібн Хардадбех, і Ібн Фадлан ясна гавораць аб русах. Нам ужо вядома, што значэнне гэтай назвы паступова мянялася з сацыяльнага на этнічнае і цягам IX—X стст. распаўсюдзілася з нарманскіх дружыннікаў на пераважна славянскае насельніцтва вялізнага рэгіёну, які атрымаў назву Русі. Але нават Ібн Фадлан, падарожныя нататкі якога адносяцца да 921—922 гг., стасуе гэтую назву менавіта да нарманаў. Пра гэта яскрава кажа ягонае апісанне вопраткі і ўзбраення русаў, а таксама іх пахавальнага абраду, які зводзіўся да спальвання нябожчыка ў караблі разам з ягонай рабыняй[22].

Гаворачы аб гандлі, мы звернем асабліва пільную ўвагу на гандлёвыя шляхі. Іх знаходжанне на той ці іншай тэрыторыі адразу ж паскарала грамадскае і эканамічнае развіццё мясцовых абшчын. Гандаль уключаў іх у міжнародныя эканамічныя сувязі і прыносіў новыя цывілізацыйныя ўплывы. Ён стымуляваў перарастанне такіх старых племянных цэнтраў, як Полацк і Смаленск, у вялікія гандлёва-рамесныя паселішчы. Нарэшце, перамяшчэнне шляхоў, іх росквіт ці заняпад аказвалі велізарны ўплыў на глыбокія гістарычныя працэсы, ведучы да заняпаду ці росквіту розных краёў. Таму храналогія ўзнікнення шля-

---

21 Херрман Й. *Славяне и норманны в ранней истории Балтийского региона*. С. 110.

22 Путешествие Ибн Фадлана на Волгу. С. 77—82.

хоў і набыцця ці страты імі сваёй важнасці моцна дапаможа нам у аднаўленні карціны падзей той эпохі.

Шлях нарманскіх купцоў і ваяроў у краіны Усходу і Поўдня пачынаўся на берагах Балтыйскага мора. Там квітнелі шматлікія гандлёвыя гарады, што мелі карані дабрабыту ў транзітным гандлі: Хедэбю ў паўднёвай Даніі, Бірка на беразе возера Меларэн у Швецыі, Труза на прускім узбярэжжы Балтыкі, Апуоле і Гробін на куршскіх землях. Ад Балтыкі першы паводле часу ўзнікнення і ступені важнасці шлях на Усход ішоў праз Няву ў Ладажскае возера і далей па рацэ Волхаў, у ніжнім цячэнні якой з VIII ст. знаходзілася славяна-фіна-нарманскае гандлёва-рамеснае паселішча Ладага. Нарманы, сляды якіх у Ладазе прасочваюцца, паводле археалагічных дадзеных, з сярэдзіны VIII ст., называлі паселішча Альдэйг'юборгам[23]. З Волхава шлях вёў праз волакі і водныя сістэмы Растоўскай зямлі ў верхняе цячэнне Волгі, адкуль купцы плылі да Каспійскага мора[24]. Паводле сведчання Ібн Хардадбеха, рускія купцы часам везлі свае тавары ад Каспію да самага Багдада[25]. Волхаўска-Волжскі шлях пачаў дзейнічаць яшчэ ў VIII ст. і да другой паловы X ст. быў найважнейшай гандлёвай артэрыяй Усходняй Еўропы[26].

Праз вярхі Акі Волхаўска-Волжскі шлях звязваўся з другім буйнейшым шляхам: Дняпроўскім, які злучаў Балтыйскае і Чорнае моры. Гандляры з Волгі маглі праз вярхі Акі і волакі выходзіць у верхняе цячэнне Дняпра, каб потым спусціцца да Смаленска, Кіева і іншых падняпроўскіх рынкаў[27]. Гэты шлях меў, хутчэй за ўсё, гісторыю не менш даўнюю за Волхаўска-Волжскі шлях, але першапачаткова меў другаснае значэнне. Аднак усталяванне гандлёвых сувязяў з Візантыяй праз Дняпро і Чорнае мора

---

[23] Кирпичников А. Н., Дубов И. В., Лебедев Г. С. *Русь и варяги (русско-скандинавские отношения домонгольского времени)* // Славяне и скандинавы. С. 190–192, 195.

[24] Лаврентьевская летопись. Ст. 7.

[25] Ибн Хордадбех. *Книга путей и стран.* §73в. С. 125.

[26] Кирпичников А. Н. *Великий Волжский путь: государства, главные партнеры, торговые маршруты* // Скандинавские чтения 2000 года: Этнографические и культурно-исторические аспекты. С. 7–17.

[27] Алексеев Л. В. *Полоцкая земля.* С. 84.

надалі гэтаму шляху больш важную ролю ўжо ў другой чвэрці IX ст. Аб гэтым выразна сведчаць знаходкі манет візантыйскага імператара Феафіла (829–842 гг.) у Бірцы і Гнёздаве пад сучасным Смаленскам[28]. Можна досыць упэўнена меркаваць, што менавіта гэтым шляхам дабраліся да Канстанцінопаля паслы караля (хакана) народу рос (Rhos). Гэтае паведамленне Берцінскіх аналаў пад 839 г. з'явілася першай пісьмовай згадкай аб росах (русі). Паслы росаў былі прынятыя Феафілам і па іхняй просьбе перанакіраваныя ім у Франкскую імперыю з-за небяспекі вяртання дадому праз дзікія краіны, населеныя варварскімі плямёнамі. У франкаў, «даследаваўшы больш дакладна прычыну іх прыбыцця, імператар даведаўся, што яны з народу свеонаў» (г. зн. шведаў. – *Я. Н.*). Пасля гэтага паслы былі на некаторы час затрыманыя з-за падазрэнняў, што яны маглі аказацца шведскімі шпегамі[29]. На поўначы Дняпроўскі шлях разгаліноўваўся ў двух кірунках. Першы ішоў з верхняга цячэння Дняпра праз волакі на Заходнюю Дзвіну міма Полацка і далей у Балтыйскае мора. Другі – праз Ловаць да Ноўгарада і далей праз Волхаў да Ладажскага возера і Балтыйскага мора[30]. Дняпроўскі шлях атрымаў найменне «шляху з Вараг у Грэкі». Ягоная наўгародская галіна традыцыйна лічылася важнейшай і больш асвоенай. Між тым адсутнасць скарбаў арабскіх і візантыйскіх манет на волаках паміж Дняпром і Ловаццю і іх наяўнасць на прасторы паміж Дняпром і Дзвіной сведчаць аб адваротным[31]. Дзвінскі адрэзак шляху быў відавочна карацейшым і зручнейшым для любога падарожніка паміж Балтыйскім і Чорным морамі. Ён быў добра

---

[28] Кирпичников А. Н., Дубов И. В., Лебедев Г. С. *Русь и варяги.* С. 224. Такія буйныя знаўцы гісторыі Смаленшчыны, як Л. В. Аляксееў, прыводзяць пераканаўчыя доказы таго, што да X ст. летапісны Смаленск знаходзіўся менавіта на месцы Гнёздаўскага паселішча і пазней быў перанесены на іншае месца. Гл.: Алексеев Л. В. *Смоленская земля в IX–XIII вв.: Очерки истории Смоленщины и Восточной Белоруссии.* Москва, 1980. С. 31–32, 136–146.

[29] Бертинские анналы. (Annales Bertin.) // Латиноязычные источники по истории Древней Руси. Германия. IX – первая половина XII вв. Москва; Ленинград, 1989. С. 10–11.

[30] Лаврентьевская летопись. Ст. 7.

[31] Алексеев Л. В. *Полоцкая земля.* С. 84.

вядомы і нарманам. Так, ісландская «Сага аб гутах» распавядае нам аб жыхарах выспы Готланд, якія з прычыны яе перанаселенасці былі вымушаныя прайсці праз Русь па Дзвіне і перасяліцца ў Грэцыю[32].

Такім чынам, адкрыццё гандлёвых шляхоў па Дзвіне і Дняпры і стала прычынай прыходу нарманаў на беларускія землі. Іх з'яўленне добра фіксуецца манетнымі скарбамі. Скарб, знойдзены ў Магілёўскай губерні ў 1822 годзе, быў захаваны ў канцы 820-х гадоў і ўтрымліваў 1300 цэлых і некалькі соцень разрэзаных дырхемаў дынастый Умаядаў, Ідрысідаў і Абасідаў. Манетны скарб, знойдзены ў Кармянскім раёне, быў захаваны прыкладна тады ж. Скарбы з пасожскіх радзіміцкіх земляў у Ярылавічах і Касаляках датуюцца 820—821 і 823—824 гг. адпаведна[33]. Скарбы трохі пазнейшага часу былі знойдзеныя ў Падзвінні ў прасторы паміж Дзвіной і Дняпром (пад Собалевам і Добрынам), каля возера Пліса і возера Нарач[34]. Засноўваючыся на гэтых дадзеных, мы можам лічыць 820-я гады датай пачатку сталай дзейнасці нарманаў на беларускіх землях. Мы таксама можам сцвярджаць, што асноўнай рухаючай сілай, якая спрыяла гэтай дзейнасці, быў інтарэс да пасрэдніцкага гандлю паміж Скандынавіяй і Усходам, а затым і Візантыяй[35]. Не будзе памылкай сказаць, што нарманы апавясцілі беларускія землі аб сваім прыходзе звонам манет, а не зброі, як тое было ў Заходняй Еўропе.

Аднак стан адносін паміж нарманамі і народамі тых усходнееўрапейскіх земляў, праз якія яны праходзілі, быў далёкі ад ідылічнага. Як адзначае шведскі даследчык Эрык Нюлен, «многія прадпрыемствы, якія пачыналіся на Балтыйскім узбярэжжы, пачыналіся як гандлёвыя паездкі, але ў адпаведнасці з абставінамі маглі перарасці ў рабаўніцкі набег ці заваявальны паход, які суправаджаўся захопам земляў і спробамі іх каланізацыі»[36]. Структура гандлю сама ў пэўнай ступені правакавала нарманаў на варожыя дзе-

---

[32] Сага о гутах // Джаксон Т. Н. *Исландские королевские саги о Восточной Европе (с древнейших времен до 1000 г.).* Москва, 1993. С. 243.

[33] Археалогія Беларусі. Т. 3. Мінск, 2000. С. 455—457.

[34] Алексеев Л. В. *Полоцкая земля.* С. 84—86.

[35] Ловмяньский Х. *Русь и норманны.* Москва, 1985. С. 109—111.

[36] Нюлен Э. *Эпоха викингов и раннее средневековье в Швеции* // Славяне и скандинавы. С. 156.

янні ў адносінах да мясцовага насельніцтва. Калі гаворка ішла аб такіх артыкулах гандлю, як футра, нашмат больш сэнсу мела вывозіць іх са славянскіх, балцкіх ці фінаугорскіх земляў, чым везці здалёку са Скандынавіі. Яшчэ больш эканамічнага сэнсу меў намер рачэй адабраць гэтыя тавары сілай у мясцовых жыхароў, чым плаціць за яго грашыма. А гандаль захопленымі ў палон людзьмі прыносіў увогуле неверагодныя прыбыткі. Усё гэта і штурхала нарманаў ператвараць мірныя гандлёвыя экспедыцыі ў крывавыя набегі.

З гэтых набегаў пачаўся непасрэдны ўдзел нарманаў у ваеннай гісторыі беларускіх земляў. Прычым удзел гэты быў якасна больш значны за ролю ардынарнага знешняга фактару, шараговага складніку знешнепалітычных камбінацый ці крыніцы імпарту зброі і ваенных тэхналогій. Ніжэй мы пабачым, які імпульс нарманы здолелі надаць развіццю мясцовага грамадства, але пакуль што ў вачах насельнікаў беларускіх земляў яны сталі выглядаць не толькі гандлярамі, але яшчэ і бязлітаснымі рабаўнікамі, якім неабходна было аказаць годнае супраціўленне.

На жаль, складзеныя на рускіх землях летапісы не захавалі звестак пра канкрэтныя падзеі першай паловы IX ст., але мы да пэўнай ступені можам аднавіць іх ход паводле іншых крыніц. Шмат інфармацыі аб падзеях таго часу ўтрымлівае «Гісторыя данаў» Саксана Граматыка. Гэта паказвае, што пры несумненнай колькаснай перавазе шведаў іншыя скандынаўскія народы таксама вялі сваю дзейнасць на беларускіх землях. Аднак звяртаючыся да ягонага твора, асабліва першых дзевяці кніг, мы свядома ступаем на тонкі лёд. Многія апісаныя ім падзеі і асобы з'яўляюцца цалкам легендарнымі ці маюць вельмі мала агульнага з рэальнымі прататыпамі. Успрымаць звесткі Саксана літаральна можна толькі пры пацверджанні іх іншымі крыніцамі. Збольшага іх трэба ўспрымаць як збор цьмянай гістарычнай памяці, якая праз прызму недакладнага чалавечага мыслення магла захаваць асобныя каліўцы звестак пра сапраўдныя падзеі. Такімі каліўцамі мы і будзем апераваць пры аднаўленні ходу падзей.

Адно з паведамленняў Саксана пра набегі данаў на беларускія землі адносіцца да выправы славутага дацкага

конунга Рагнара Лодбрака (Ragnar Lodbrok). У далейшым ён праславіўся ўзяццем Парыжа ў 845 г.[37] і загінуў у змяінай яме, узяты ў палон пры няўдалым нападзе на англасаксонскае каралеўства Нартумбрыя ў першай палове 860-х гадоў[38]. Рагнар выступіў супраць гелеспантыйцаў. Гелеспантыйцаў найбольш верагодна суадносяць з балцкім племенем земгалаў, якія жылі па Дзвіне[39]. Ён нанёс некалькі паражэнняў гелеспантыйскаму каралю Дыа (Dia), які ўрэшце рэшт загінуў. Сыны караля Дыа і Даксан (Daxo), жанатыя з дочкамі караля Русі[40], узяўшы войска ў свайго цесця, выступілі супраць Рагнара. Маючы колькасна меншае войска, Рагнар быў вымушаны пайсці на хітрыкі. Ён прарваў баявую лінію варожага войска з дапамогай бронзавых коней, пастаўленых на колы, і атрымаў рашучую перамогу. Дыа быў забіты. Даксан і ягоны цесць уратаваліся ўцёкамі. Рагнар аддаў Земгалію і Русь у кіраванне свайму сыну Хвітсэрку (Hwitserk)[41].

Усё паведамленне моцна падобна да легенды, аднак мае рэальныя дэталі. Загадкавыя бронзавыя коні на колах, хутчэй за ўсё, былі метафарай для апісання перацягвання караблёў, якія ў нарманаў часта называліся «марскімі конямі»[42], праз волакі з дапамогай каткоў. Паколькі па волаках з Дзвіны з буйных рэк магчыма было трапіць толькі на Дняпро ці Ловаць, Рагнар сапраўды мог трапіць на землі, пазней званыя Руссю, і перамагчы мясцовых князёў[43].

---

[37] Джонс Г. *Викинги...* С. 208–209.

[38] Saxo Grammaticus. *The Danish History.* Books I–IX. IX. (далей: Saxo Gram.) // Site «The Online Medieval & Classical Library»; http://sunsite.berkeley.edu/OMACL/ - At: http://sunsite.berkeley.edu/OMACL/DanishHistory/book9.html - 09.01.2004.

[39] Baranauskas T. *Saxo Grammaticus on the Balts* // Site «Medeival Lithuania»; http://viduramziu.lietuvos.net - At: http://viduramziu.lietuvos.net/en/vikings.htm - 09.01.2004.

[40] Назва «Русь» пры апісанні падзей першай паловы IX ст. выглядае поўным анахранізмам. Саксан механічна пераносіць агульнапрынятае для XII–XIII стст. азначэнне полацкага Падзвіння як Русі і на ранейшы час.

[41] Saxo Gram. IX. http://sunsite.berkeley.edu/OMACL/DanishHistory/book9.html

[42] Сойер П. *Эпоха викингов.* С. 59.

[43] Baranauskas T. *Saxo Grammaticus on the Balts.* Ibid.

Апісанне гэтага паходу, калі ён сапраўды адбыўся, можа адлюстроўваць рэальны набег данаў на падзвінскія землі. Паводле адной з саг, у перадсмяротнай песні Рагнар апяваў адну са сваіх перамог на Дзвіне:

Ударылі ў мячы! Я помню дзень той славы,
Год дваццаць мне было, — як сталь маёй дружыны,
Бліснуўшы перуном, усчала бой крывавы, —
І восем ярлаў пала там, пры вусці Дзіны[44].

Прынамсі, Ежы Ахманьскі схільны лічыць паходы Рагнара на ўсходняе ўзбярэжжа Балтыкі сапраўднай падзеяй[45]. Летувіскі гісторык Томас Баранаўскас датуе набег прыкладна 840 г.[46] Супастаўленне гэтай даты з падзеямі ў іншых частках Еўропы пацвярджае яе верагоднасць. У 834—835 гг. пасля пэўнага зацішша пачаліся жорсткія напады нарманаў на Заходнюю Еўропу[47]. У 834—836 гг. візантыйскія майстры ўзводзяць для хазар крэпасць Саркел на Доне, якая павінна была абараняць Хазарскі каганат з Паўночнага Усходу не толькі ад качэўнікаў, але, магчыма, і ад русаў-нарманаў[48]. Нарэшце, вышэйпамянёная згадка Берцінскімі аналамі падазроных шведскіх паслоў паказвае, што тыя сапраўды маглі з'яўляцца шпегамі, якія выведвалі зручныя шляхі для набегаў на міжземнаморскія краіны. Усё гэта дае падставы думаць, што неўзабаве пасля з'яўлення на беларускіх землях, ужо ў 830-х гадах нарманы пачалі спалучаць гандаль з набегамі і рабаўніцтвам. Гэта адзначыла новы этап іх адносін з мясцовымі жыхарамі.

Яшчэ адзін набег, які наўпрост суадносіцца з беларускімі землямі, Саксан прыпісвае Фродэ (Frode), сыну Хадынга (Hadding). Магчыма, пад імем Хадынга разумеецца Хастэн, адзін з кіраўнікоў нарманскага рэйду па Міжземнамор'і ў 856—861 гг., які затым узяў удзел у вай-

---

44 Сапунов А. П. *Сказания исландских, или скандинавских, саг о Полоцке, князьях полоцких и р. Западной Двине.* С. 33 // Полоцко-Витебская старина. Вып. III. Витебск, 1916.

45 Ochmański, Jerzy. *Historia Litwy.* 38.

46 Baranauskas T. *Saxo Grammaticus on the Balts.* Ibid.

47 Джонс Г. *Викинги...* С. 196.

48 Тамсама. С. 249.

не данаў супраць англійскага караля Альфрэда ў 891–896 гг.[49] Спачатку Фродэ перамог караля Русі[50] Транана (Trannon), хітрасцю патапіўшы яго флот. Затым ягоныя зборшчыкі даніны, якіх ён накіраваў на Русь, былі здрадліва забітыя мясцовымі жыхарамі. Тады Фродэ сам выправіўся з карнай экспедыцыяй і найперш захапіў горад Ротэль (Rotel), адвёўшы з дапамогай выкапаных каналаў раку, што ўмацоўвала яго. Затым ён скіраваўся да Полацка (Paltesca), дзе панаваў кароль Веспасінс (Vespasins). Прыкінуўшыся мёртвым, Фродэ дамогся зніжэння пільнасці абаронцаў, якія ўжо святкавалі перамогу. Гэта дало нарманам шанц уварвацца ў горад і ўзяць яго. Веспасінс быў забіты[51]. Гэтая гісторыя напоўненая легендарнымі асобамі і месцамі, а яе храналогія паддаецца ўдакладненню яшчэ цяжэй, чым у выпадку з набегам Рагнара Лодбрака. Баранаўскас спрабуе датаваць набег Фродэ на Полацк 850-мі гадамі[52], заўважаючы, што пададзеныя Саксанам звесткі аб набегах Фродэ на Падзвінне і Куронію перагукаюцца з дадзенымі Рымберта. Рымберт распавядае аб нападзе данаў на Куронію ў 853 г., дзе яны пацярпелі жорсткае паражэнне, і аб наступным нападзе на Куронію шведаў, у выніку якога яны захапілі Зеебург (Гробін) і ўзялі выкуп з Апуоле[53]. Пацвердзіць ці абвергнуць гэтую версію амаль немагчыма. Але бясспрэчна тое, што Полацк, які да сярэдзіны IX ст. ужо існаваў і нават ператварыўся з племяннога цэнтра ў гандлёва-рамеснае паселішча на важным гандлёвым шляху[54], не мог пазбегнуць увагі з боку такіх правадыроў рабаўніцкіх дружын, як Фродэ. Таму пры знешняй легендарнасці паведамленне Саксана можа служыць аддаленай памяццю пра такія напады.

---

[49] Джонс Г. *Викинги...* С. 212–215, 224.

[50] Чарговы выпадак анахраністычнага ўжывання назвы «Русь» Саксанам.

[51] Saxo Gram. II. http://sunsite.berkeley.edu/OMACL/DanishHistory/book2.html

[52] Baranauskas T. *Saxo Grammaticus on the Balts.* Ibid.

[53] Житие святого Ансгария, написанное Римбертом и еще одним учеником Ансгария. (Vita Anskarii) // Из ранней истории шведского народа и государства: первые описания и законы. Москва, 1999. С. 51–54.

[54] Штыхов Г. В. *Города Полоцкой земли.* Мн., 1978. С. 26–27.

Але нарманы не спыняліся толькі на эпізадычных набегах. Іх першапачатковыя поспехі давалі ім надзею на большае. Ад набегаў яны вельмі хутка перайшлі да спроб сталага заваявання земляў на ўсход ад Балтыйскага мора. Патэнцыйны захоп славянскіх, балцкіх ці фінскіх земляў нёс ім падвойную выгаду. Па-першае, захоп умацаваных гарадоў кшталту Полацка ці Смаленска забяспечваў нарманам кантроль над важнымі гандлёвымі шляхамі, пры тым, што гандаль і быў стрыжнем усёй іх дзейнасці ва Усходняй Еўропе. Па-другое, непасрэднае валоданне ўсходнееўрапейскімі тэрыторыямі дазваляла ўжо не абмяжоўвацца прыбыткам ад рабаўніцкіх набегаў, а абкладаць падпарадкаваныя плямёны данінай на пастаяннай аснове. Гэта было нашмат менш рызыкоўнай і нашмат больш выгаднай справай. Мы бачым, што ўжо Рагнар Лодбрак спрабуе стала кантраляваць Падзвінне, прызначыўшы туды намеснікам свайго сына Хвітсэрка. Фродэ распачынае новую вайну з Полацкам пасля забойства ягоных зборшчыкаў даніны. Верагодна, спачатку ваенная перавага нарманаў над славянамі і фіна-753ўграмі, пра якую гаворка пойдзе ніжэй, дазволіла ім дамагчыся значных поспехаў. «Повесть временных лет» адзначае пад 859 г.: «Имаху дань Варязи изъ заморья на Чюди, и на Словенех, на Мери, и на всехъ Кривичехъ»[55]. Мы наўрад ці можам уявіць сабе значную аб'яднаную вайсковую сілу нарманаў пад кіраўніцтвам аднаго правадыра, якая б магла падпарадкаваць сабе такія шматлікія плямёны, аддзеленыя адно ад аднаго сотнямі кіламетраў адлегласці. Хутчэй за ўсё, скупое летапіснае паведамленне адлюстроўвае шматлікія асобныя выпадкі барацьбы нарманскіх нападнікаў з мясцовымі славянскімі, балцкімі і фіна-угорскімі жыхарамі, вынік якой вырашаўся, бадай, у маштабе кожнага племені ці саюзу плямёнаў. Але агульная тэндэнцыя была яснай: сярэдзіна IX ст. была для славян і фіна-ўграў перыядам супраціўлення ўзброенай нарманскай экспансіі.

Неўзабаве становішча перамянілася. Якой бы перавагай у зброі і вывучцы ні валодалі людзі з поўначы, але іх людскія рэсурсы былі занадта малыя дзеля таго, каб тры-

[55] Лаврентьевская летопись. Ст. 19.

маць у падпарадкаванні велізарныя тэрыторыі, заселеныя варожым насельніцтвам, і падтрымліваць на іх бяспеку свайго гандлю. Таксама можна меркаваць, што і ваенная перавага нарманаў хутка таяла, бо мясцовыя жыхары спрытна пераймалі асноўныя спосабы вядзення вайны і неўзабаве маглі ўжо з іх дапамогай пабіць сваіх часовых пераможцаў і настаўнікаў. Пад 862 г. «Повесть временных лет» паведамляе: «Изъгнаша Варяги за море, и не даша имъ дани, и почаша сами в собе володети»[56].

Цікавымі колерамі расквечвае карціну той барацьбы Саксан Граматык. Згодна з ягонай «Гісторыяй данаў», выгнаны Рагнарам кароль гелеспантыйцаў Даксан упарта імкнуўся звергнуць уладу Хвітсэрка ў Земгаліі і на Русі. Нарэшце ён схаваў сваіх ваяроў у павозках і пад выглядам купца пранік у горад, дзе знаходзіўся Хвітсэрк. Пасля жорсткай сутычкі Хвітсэрк быў палонены. Ён сам абраў сабе смерць, папрасіўшы, каб яго спалілі жыўцом разам з ягонымі дружыннікамі, што і было зроблена. Пераадолеўшы сум і адчай з прычыны такой смерці сына, Рагнар выступіў супраць Даксана, разбіў і паланіў яго. Аднак ацаніўшы высакароднасць Даксана, з якой той выканаў апошнюю волю Хвітсэрка, Рагнар аднавіў Даксана ў якасці валадара ягонай краіны на ўмовах выплаты даніны[57]. Гэтая жудасная гісторыя не толькі паказвае своеасаблівае спаборніцтва славяна-балцкага і нарманскага правадыроў у высакароднасці паводле правілаў свайго часу, але і служыць туманным адбіткам узброенай барацьбы прышлых нарманаў з мясцовымі жыхарамі. Насуперак тэндэнцыі да гераізацыі нарманскіх правадыроў яна фіксуе іхнія паражэнні і піравы перамогі. Таксама варта заўважыць, што хітрасць Даксана ў розныя часы выкарыстоўвалася самімі нарманамі для пранікнення ў варожыя гарады. Менавіта такім чынам дзейнічаў у 882 г. ладажскі і наўгародскі князь Алег (Helgi) пры захопе Кіева. Гэта сведчыць аб шырокім запазычанні нарманскіх спосабаў вядзення вайны славянамі і балтамі.

---

56 Лаврентьевская летопись. Ст. 19.

57 Saxo Gram. IX. http://sunsite.berkeley.edu/OMACL/DanishHistory/book9.html

Звесткі пісьмовых крыніц аб выгнанні нарманаў пацвярджаюцца нумізматычнымі дадзенымі. Пачынаючы прыкладна з 860 г. на дзесяцігоддзе перапыняецца ўвоз усходняга срэбра ў Швецыю і на Готланд[58]. Можна рэзюмаваць, што спробы нарманаў стала падпарадкаваць славянскія, балцкія і фіна-угорскія землі ўзброеным шляхам скончыліся няўдала. Хаця вынік барацьбы вырашаўся ў кожным асобным выпадку, у іх большасці нарманы не вытрымалі цяжару змагання за вялізныя тэрыторыі і вымушаны былі адступіць у свае скандынаўскія, ютландскія і готландскія ўладанні. Ваеннае і палітычнае паражэнне нарманаў значыла таксама іх зыход з гандлёвых шляхоў і падзенне сістэмы гандлю, якая наладжвалася дзесяцігоддзямі. Несуцяшальныя вынікі ваеннай экспансіі ўдарылі найперш па яе ж ініцыятарах.

Перыяд па выгнанні нарманаў на беларускіх і іншых усходнееўрапейскіх землях летапіс апісвае як час бязладдзя і міжусобіц: «И не бе в нихъ правды, и въста родъ на родъ, и беша в нихъ усобице, и воевати почаша сами на ся»[59]. За кароткім паведамленнем сімвалічная мова «Повести временных лет» ізноў хавае шэраг глыбінных працэсаў. Наўрад ці паражэнне асобных нарманскіх дружын у барацьбе са славянскімі, балцкімі і фіна-угорскімі плямёнамі магло выклікаць надзвычайны выбух анархіі і вайны ўсіх супраць усіх. Калі б зыход паўночных заваёўнікаў і справакаваў такую новую і неардынарную з'яву, то яна не магла мець універсальнага характару на ўсім абшары рассялення крывічоў, славен, чудзі і меры, бо і сам факт барацьбы мясцовых і прышлых адбываўся на ўзроўні асобных плямёнаў ці іх саюзаў. Зыход змагання на крывіцкіх землях не мог заўважна закрануць развіццё падзей у чудзі ці славен. Хутчэй за ўсё, пасля таго як адпала неабходнасць у злучэнні сіл, выкліканая знешняй агрэсіяй, справы ва ўсходнееўрапейскіх народаў вярнуліся да свайго звыклага стану: пастаяннай міжабшчыннай варожасці, згаданай Маўрыкіем і Вульфстанам.

Адрозненне, прынамсі ў такіх найбольш развітых саюзаў плямёнаў, як крывічы і славене, заключалася ў тым,

---

58 Кирпичников А. Н., Дубов И. В., Лебедев Г. С. *Русь и варяги.* С. 193.

59 Лаврентьевская летопись. Ст. 19.

што падобны стан рэчаў ужо выглядаў атавізмам. Мясцовае грамадства мела патрэбу ў сіле, якая б забяспечыла ўнутраны мір і парадак, абарону ад знешняга ворага і функцыянаванне гандлёвых шляхоў, для чаго не так ужо кепска падыходзілі нядаўнія ворагі нарманы. Добрыя ваяры і падарожнікі, яны маглі адыграць нейтральную і незаангажаваную ролю ва ўпарадкаванні мясцовых спраў, знаходзячыся ў аднолькавых дачыненнях з усімі спаборнымі групоўкамі. Такая логіка падзей прывяла да запрашэння славянскай і фіна-угорскай знаццю на княжанне ў Ладагу нарманскага конунга Рурыка і ягоных легендарных братоў Сінявуса і Трувара ў 862 г.[60] Гэтая дата адзначыла сімвалічны пачатак княскай улады. Улада нарэшце выдзелілася на славянскіх і фіна-угорскіх землях у самастойную з'яву, адрозную ад ранейшага аўтарытэту родавай невайсковай знаці ці простага сілавога ўплыву вайсковых правадыроў з дружынай, і стала адной з асноў дзяржаўнасці.

Храналагічныя супадзенні дазваляюць з вялікай ступенню верагоднасці атаясаміць Рурыка з дацкім конунгам, якога заходнія крыніцы імянуюць Рорыкам (Hrœrekr). Рурык адпавядаў патрабаванням мясцовых славян, балтаў і фіна-ўграў. За ягонай спіной быў вялікі досвед удзелу ў шматлікіх войнах у Заходняй Еўропе і на Балтыцы. Рурык быў братам ці пляменнікам знакамітага Харальда Клака[61]. З 850 г. ён на правах васала Франкскай імперыі валодаў Фрысландыяй з яе галоўным гандлёвым горадам Дарэстадам. Рурыку даводзілася абараняць Дарэстад ад нападаў вікінгаў, страчваць і зноў адваёўваць яго. У 852 г. ён удзельнічаў у блакадзе Біркі, арганізаванай данамі, а ў 850-я гг. атрымаў у валоданне паўднёвую частку Даніі[62].

Запрашэнне Рурыка невыпадкова адбылося ў Ладазе. Да таго часу Ладага была вялікім гандлёва-рамесным паселішчам і цэнтрам славенскага саюзу плямёнаў. Менавіта ладажане ў сілу свайго геаграфічнага становішча былі галоўнымі прэтэндэнтамі на кантроль над верхняй част-

---

60 Ипатьевская летопись. Москва, 1998. Ст. 14.

61 Пчелов Е. В. *Легендарная и начальная генеалогия Рюриковичей* // Летопись Историко-родословного общества в Москве. Вып. 2 (46). Москва, 1994. С. 28.

62 Кирпичников А. Н., Дубов И. В., Лебедев Г. С. *Русь и варяги*. С. 193.

кай Волхаўска-Волжскага шляху, які быў асноўным гандлёвым шляхам Усходняй Еўропы ў той час. Далейшая дзейнасць Рурыка пацвярджае першачарговую важнасць забеспячэння гандлёвых інтарэсаў для яго самога і ладажскай вярхушкі, што неўзабаве закранула і крывічоў на беларускіх землях. Пасля ўмацавання самой Ладагі Рурык «пришедъ къ Ильмерю, и сруби городъ надъ Волховом, и прозваша и Новгород, и седе ту..., ·и раздая мужемъ своимъ волости и городы рубити: овому Полътескъ, овому Ростовъ, другому Белоозеро»[63]. Дадзенае месца з'яўляецца першай згадкай пра гэтыя гарады ў летапісах. Як мы бачым, усе яны знаходзяцца на гандлёвых шляхах. Ноўгарад, Растоў і Белавозера кантралявалі маршруты з Балтыкі на вярхі Волгі, Полацк жа панаваў над Дзвіной. Малаверагодна, што сілы аднаго горада, хай сабе і такога значнага для свайго часу, як Ладага, было дастаткова, каб падпарадкаваць іх і іхнія акругі вайсковай сілай, нават і з нарманскай дружынай. Хутчэй за ўсё, уваходжанне гэтых гарадоў з іх воласцямі ў склад дзяржаўнага ўтварэння з цэнтрам у Ладазе адпавядала інтарэсам мясцовай знаці і іншага насельніцтва. Яны разам былі зацікаўленыя ў інстытуцыяналізацыі ўлады і забеспячэнні бесперашкоднага гандлю, ад якога залежаў іх дабрабыт. Таму Рурык і ягоныя дружыннікі не павінны былі сустрэць вялікага супраціўлення ў сваім руху.

Падобныя працэсы інстытуцыяналізацыі ўлады і ўтварэння дзяржаўных фармаванняў вакол гандлёвых шляхоў адбываліся і на поўдні. Аскольд (Hoskulðr) і Дзір, якіх летапіс называе мужамі Рурыка, прайшлі паўз Смаленск і завалодалі Кіевам. Цікава адзначыць, што яны не наважыліся напасці на Смаленск, бо той быў «град велик и мног людьми»[64]. Гэты эпізод з'яўляецца ўсяго толькі першай згадкай аб Смаленску ў летапісах, але ўжо выдатна ілюструе тую ступень росквіту, якой дасягалі гарады на гандлёвых шляхах. Запіс аб гэтым у пазнейшым Усцюжскім летапісным зводзе зроблены пад 863 г., але па іншых звестках, нарманскія правадыры атабарыліся ў Кіеве раней. Дапушчальна, што яны маглі мець нейкае дачы-

---

[63] Ипатьевская летопись. Ст. 14.

[64] Устюжский летописный свод. Москва; Ленинград, 1950. С. 20.

ненне да Рурыка, але пераследавалі найперш уласныя інтарэсы, якія прыходзілі ў супярэчнасць з інтарэсамі крывічоў, славен і Рурыка. Паводле звестак Ніканаўскага летапісу, Аскольд і Дзір ужо ў 865 г. напалі на падуладны Рурыку Полацк «и много зла сътвориша»[65].

Барацьба паўночнага і паўднёвага палітычных утварэнняў у адрозненне ад ранейшай міжабшчыннай і міжплемяннной варожасці пачала ўкладацца ў рацыянальныя ўзоры паводзін, вытлумачальныя з пункту гледжання палітыкі. Абедзве дзяржавы мелі падобны ўнутраны лад, мелі знаць, што складалася з мясцовых, пераважна славянскіх ураджэнцаў і прышлых нарманаў, і прэтэндавалі на панаванне над тымі самымі плямёнамі. Гэта распальвала іхняе імкненне павялічыць уласную магутнасць шляхам скрушэння суперніка. Палітычны матыў магутнасці ўзмацняўся эканамічным матывам авалодання гандлёвымі шляхамі і атрымання адпаведнага прыбытку. Таму ўзброены напад Аскольда і Дзіра на Полацк можа лічыцца першым прыкладам уласна *вайны*, выкліканай палітычнымі і эканамічнымі прычынамі, на беларускіх землях. Такім чынам, у 860-я гады на Балтыйска-Чарнаморскім міжмор'і ўзніклі два дзяржаўныя ўтварэнні, сярод дзяржаўных вярхоў якіх моцныя пазіцыі займала прынятая мясцовымі жыхарамі нарманская дружынная русь і якія абодва ўключалі беларускія землі. Першае з іх, з цэнтрам у Ладазе, а затым у Ноўгарадзе, кантралявала гандлёвыя шляхі па Волхаву, Верхняй Волзе і Дзвіне. Другое, з цэнтрам у Кіеве, панавала над сярэднім цячэннем Дняпра. Натуральны ход падзей падштурхоўваў абодва бакі да сутыкнення.

Між тым адносіны Рурыка і славен былі далёкімі ад ідылічных. Ужо сам факт пераносу Рурыкам сваёй рэзідэнцыі з Ладагі ў адбудаваны ім Ноўгарад паказвае ягонае імкненне пазбавіцца апекі ладажан і праводзіць сваю ўласную палітыку. Хаця сам факт запрашэння паказвае на наяўнасць нейкага пагаднення паміж ладажанамі і дацкім конунгам, але ўзніклая ўлада, увасабленнем якой быў Рурык, найперш засноўвалася на сіле і прызнавала сілу ж

---

[65] Летописный сборник, именуемый Патриаршей, или Никоновской летописью. Москва, 2000. С. 9. (Далей: Никоновская летопись).

у якасці асноўнага аргументу вырашэння рознагалоссяў. Таму адносіны паміж абодвума бакамі хутка папсаваліся і славене паспрабавалі пазбавіцца ад заморскага прыхадня. Сціслыя радкі Ніканаўскага летапісу пад 864 г., якія заслугоўваюць быць працытаванымі цалкам, патрапляюць перадаць неверагоднае напружанне той барацьбы: «Того же лета оскорбишася Новгородци, глаголюще: «яко быти намъ рабомъ, и много зла всячески пострадати отъ Рюрика и отъ рода его». Того же лета уби Рюрикъ Вадима храбраго, и иныхъ многихъ изби новогородцевъ съветниковъ его»[66]. А ў 867 г. «избежаша отъ Рюрика изъ Новагорода въ Кіевъ много Новогородцкыхъ мужей»[67]. Гэтыя факты паказваюць, што Рурыку за некалькі год удалося перамагчы мясцовую апазіцыю. Усё ж летапіс прапануе нам толькі адзін бок той гісторыі. Немагчыма ўявіць, што нарманскі конунг з нешматлікай дружынай перамог аб'яднаныя сілы ўсёй славенскай зямлі. Ягоныя поспехі, верагодна, адлюстроўваюць той факт, што на ягоным баку выступілі моцныя мясцовыя групоўкі, інтарэсы якіх супадалі з інтарэсамі нарманаў і якія таксама выйгралі ў выніку разгрому апазіцыі на чале з Вадзімам. Толькі такім чынам Рурык мог замацавацца ў якасці князя ў Ладазе і Ноўгарадзе, а замацаваўшыся, узяцца за вырашэнне знешнепалітычных пытанняў. Ягоным першым знешнепалітычным поспехам было забеспячэнне беспярашкоднага руху і гандлю на Волхаўска-Волжскім шляху, якое выразілася ў аднаўленні з пачатку 870-х гадоў паступлення срэбра ў Скандынавію[68]. Наступнай задачай Рурыка было вырашэнне спрэчкі з паўднёвай нармана-славянскай дзяржавай з цэнтрам у Кіеве.

Вынік барацьбы вырашыўся толькі пасля смерці Рурыка, датаванай летапісам пад 879 г. З прычыны маленства ягонага сына Ігара (Ingvarr) княскі тытул і кіраванне дзяржавай апынулася ў руках Алега[69]. У 882 г. Алег сабраў вялікае войска з «воя многи, Варяги, Чюдь, Словени и все Кривичи» і рушыў на поўдзень[70]. Указанне на наяў-

---

[66] Никоновская летопись

[67] Тамсама.

[68] Кирпичников А. Н., Дубов И. В., Лебедев Г. С. *Русь и варяги.* С. 194.

[69] Лаврентьевская летопись. Ст. 22.

[70] Тамсама. Ст. 22—23.

насць *усіх* крывічоў у войску сведчыць, што ўдзел у паходзе ўзялі не толькі іх ізборска-пскоўскія прадстаўнікі, але і полацкія. Крывіцкае княжанне з цэнтрам у Полацку знаходзілася пад уплывам Ноўгарада, бо ні палітычная вага, ні эканамічнае значэнне яшчэ не дазвалялі яму адыгрываць самастойную ролю. Наблізіўшыся да Смаленска, Алег дабіўся яго мірнай здачы. Ён «прия градъ и посади мужъ свои»[71]. Яшчэ адна частка беларускіх земляў увайшла ў склад паўночнай дзяржавы. Затым быў узяты Любеч. Узяцце Кіева, дзе заселі Аскольд і Дзір, не абяцала быць лёгкай задачай. Таму Алег звярнуўся да вайсковай хітрасці, выкарыстанне якой мы ўжо назіралі ў аповедзе Саксана Граматыка. Алег схаваў вояроў у лоддзях, а сам, назваўшыся госцем, які нібыта ішоў з Ноўгарада ў Канстанцінопаль, выклікаў Аскольда і Дзіра на сустрэчу. Пры іх з'яўленні схаваныя ваяры выбеглі з лоддзяў. Алег абвінаваціў Аскольда і Дзіра ў няправым захопе ўлады і паказаў ім малога Ігара як спадчыннага валадара. Пасля гэтага абодва кіеўскія князі былі забітыя[72]. Звяртае на сябе ўвагу тая акалічнасць, што кіяўляне не сталі абараняць сваіх князёў, аддаўшы перавагу моцнай пераможнай уладзе ў асобе Алега перад меркаваннямі лаяльнасці да мясцовых валадароў. Гаспадаром Кіева застаўся Алег.

Умацаваўшы сваю ўладу ў Кіеве, Алег перайшоў да пашырэння знешняга ўплыву. У 883 г. ён зброяй падпарадкаваў сабе драўлян. У 884 г. Алег рушыў на севяран, перамог іх, прымусіў плаціць невялікую даніну і забараніў плаціць яе хазарам. Гэтым самым ён кінуў выклік магутнаму Хазарскаму каганату, наўпрост закрануўшы ягоныя інтарэсы і павялічыўшы сваю магутнасць ягоным коштам. Алег горда заявіў севяранам наконт хазар: «Азъ имъ противенъ, а вамъ не чему». У наступным, 885 г. перад уладай Алега мірным чынам схіліліся яшчэ адны хазарскія даннікі – радзімічы. Гэтым самым яму ўдалося падпарадкаваць большую частку тых беларускіх земляў, якія былі на той час заселеныя славянамі.

Увогуле ж пад уладай Алега апынулася вялізная тэрыторыя ад Балтыйскага мора да ніжняга цячэння Дняпра,

[71] Лаврентьевская летопись. Ст. 23.
[72] Тамсама.

населеная славянскімі, балцкімі і фіна-угорскімі плямёнамі[73]. Аб'яднаная палітычнай магутнасцю дружыннай нарманскай русі, новая супольнасць ужо магла прэтэндаваць на тое, каб звацца дзяржавай. Ужываючы гэтае азначэнне, мы мусім засцерагацца ад таго, каб разумець яго ў сучасным сэнсе як дзяржаву, якая мае трывалую палітычную, эканамічную, этнічную і культурную будову. Узніклае ўтварэнне не мела дзяржаўнага апарату і распрацаванага пісьмовага заканадаўства. Ягоная эканоміка была звязанай толькі гандлем на водных шляхах, у астатнім распадаючыся на асобныя абшчыны, якія жылі з натуральнай гаспадаркі. Прасторы новай супольнасці насялялі шматлікія плямёны славян, перамяшаных з аўтахтонным балцкім і фіна-угорскім насельніцтвам, дзе ўсе этнічныя групы стала захоўвалі свае моўныя і культурныя асаблівасці. Нарэшце, новая супольнасць нават не мела трывалай назвы. Назва «Русь» можа прыкладацца да яе досыць умоўна, бо прайшло амаль стагоддзе, перш чым гэтая назва набыла хаця б аддалена зафіксаванае палітычнае і культурнае значэнне. Пакуль жа «русь» значыла толькі дружыннікаў-грабцоў, вайсковы слой з прышлых нарманаў і мясцовых жыхароў, а «Руссю» зваліся падуладныя гэтаму слою тэрыторыі, у тым ліку і беларускія землі. Зрэшты, і ў такім выглядзе назва «Русь» і вытворны ад яе тэрмін «русы» больш выкарыстоўваліся звонку, суседзямі новай дзяржавы, чым самімі яе жыхарамі. У сябе дома тыя, каго грэкі ці хазары называлі руссю, выразна падзяляліся на варагаў, крывічоў, чудзінаў і іншых. Самі нарманы называлі прастору паміж Балтыйскім і Чорным морамі «Краінай гарадоў» (Garðar альбо Garðaríki). І ўсё ж якой бы няўклюднай ні была тая Русь, яе існаванне склала вельмі важны час для гісторыі беларускіх земляў, што ўваходзілі ў яе склад. Яна адыграла ролю першабытнага пласта сырой пароды, з якога пры яго апрацоўцы паказваюцца на святло каштоўныя камяні. Хаця няўстойлівая будова той Русі ўвесь час цярпела ад унутраных і знешніх узрушэнняў і нарэшце распалася на асобныя кавалкі, вельмі адрозныя па абрысах і структуры, яе здабыткі далі свае ўсходы ў пазнейшых дзяржавах на яе прасторах.

---

[73] Лаврентьевская летопись. Ст. 24.

Дзейнасць дружын русі не абмяжоўвалася дзяржаватворчасцю. Ва Усходняй, як і ў Заходняй Еўропе, нарманскія ваяры, а таксама іх мясцовыя браты па зброі ахвотна выпраўляліся ў рабаўніцкія набегі на суседнія краіны. Натуральным выбарам для прагных да багацця русаў былі квітнеючыя ўладанні Візантыйскай імперыі па берагах Чорнага мора і мусульманскія краіны на Каспіі. Таму час ад часу вусці Дняпра і Волгі выплёўвалі зграі лоддзяў з узброенымі ваярамі, якія наводзілі на тамтэйшае мірнае насельніцтва жах забойствамі і марадзёрствам. У адрозненне ад Заходняй Еўропы, на Чорным і Каспійскім морах нарманам даводзілася мець справу з цэнтралізаванымі дзяржавамі, якія валодалі рэгулярнай арміяй і флотам і маглі супрацьпаставіць нападнікам добра арганізаваную абарону. Таму арганізацыя паспяховага набегу патрабавала ўдзелу значных вайсковых сіл. Цяжкасці ж збору такіх сіл штурхалі да імкнення выкарыстаць іх максімальна эфектыўна за кароткі прамежак часу. З гэтай прычыны сабранае войска звычайна выкарыстоўвалася двойчы: на Чорным моры супраць Візантыі, а затым на Каспіі супраць мусульманскіх краін, што было, так бы мовіць, эканамічна апраўданым.

Напады русі на візантыйскія гарады Амастрыду ў Малой Азіі і Херсанес у Крыме пачаліся ўжо ў прамежку 806–842 гг.[74] (хутчэй за ўсё, як мы памятаем, з 830-х гадоў). Аскольд і Дзір арганізавалі буйную выправу супраць Візантыі, скарыстаўшыся тым, што яе вайсковыя сілы былі занятыя на Усходзе вайной з арабамі. Першы іх паход на Канстанцінопаль адбыўся ўлетку 860 г. Спустошыўшы ваколіцы горада, нарманы-русь накіраваліся дадому[75]. Вяртанне было менш удалым. Бура раскідала караблі русі пад Канстанцінопалем, і шмат з іх патанула. Толькі нямногім удзельнікам паходу ўдалося вярнуцца ў Кіеў.[76] У прамежку 864–883 гг. войска русі напала на паўднёвае ўзбярэжжа Каспію, але было разбітае Хасанам ібн Зайдам Алідам[77].

---

[74] Пашуто В. Т. *Внешняя политика Древней Руси.* Москва, 1968. С. 58.

[75] Никоновская летопись. С. 8; Продолжатель Феофана. *Жизнеописания византийских царей.* IV, 33. (Далей: Theoph. Contin.). Санкт-Петербург, 1992. С. 84.

[76] Лаврентьевская летопись. Ст. 21–22.

[77] Алиев С. М. *О датировке набега русов, упомянутых Ибн Ис-*

Паход Алега на Канстанцінопаль, які адбыўся ў 907 г., быў арганізаваны яшчэ больш маштабна. Па звестках летапісу, у ім узяла ўдзел дружына самога Алега разам з найманымі нарманскімі атрадамі, а таксама вайсковыя кантынгенты крывічоў, славен, чудзі, меры, драўлян, радзімічаў, палян, севяран, вяцічаў, харватаў, дулебаў і цiверцаў на 2000 караблёў. Гэта складала амаль усе наяўныя вайсковыя сілы Русі. Наблізіўшыся да сталіцы Візантыі, нарманы, славяне і фіны высадзіліся на бераг і тэрарызавалі жыхароў яе ваколіц рабункамі і забойствамі. Як кажа «Повесть временных лет», «и выиде Олегъ на брегъ, и воевати нача, и много оубиивства сотвори около град Грекомъ, и разбиша многы полаты, и пожгоша церкви, а ихже имахоу пленникы, овыхъ посекаху, дроугия же мучаху, иныя же растреляхоу, а дроугыя в море вметахоу»[78]. Наконт усяго іншага летапісец абыякава зазначае: «И ина многа зла творяхоу Роусь Грекомъ, еликоже ратнии творять»[79]. Такія паводзіны пры набегах на чужыя краіны былі справай звычайнай. Яны мелі перад сабой некалькі мэтаў. Найперш жорсткасць і забойствы дэмаралізавалі насельніцтва краіны і зніжалі ягоную волю да супраціўлення. Таксама планамернае пляндраванне краіны прымушала яе ўрад ісці на пагадненне з нападнікамі, што зазвычай выражалася ў выплаце выкупу. Нарэшце, рабаўніцтва і забойствы прама служылі празаічнай мэце здабыцця матэрыяльных каштоўнасцяў, дзеля якой, уласна, і арганізоўваўся паход.

Затым, паводле сцверджанняў летапісу, Алег прыступіў да аблогі горада, пасля чаго грэкі вымушаныя былі пайсці на мір[80]. Яны палічылі больш бяспечным і танным дамовіцца з прыхаднямі, чым выклікаць з Усходу войска, занятае барацьбой з мяцежным арыстакратам Андронікам Дукам[81]. Тым больш Алег выявіў нечаканую для правады-

---

*фандийаром и Амоли* // Восточные источники по истории народов Юго-Восточной и Центральной Европы. Т. 2. Москва, 1969. С. 317.

78 Лаврентьевская летопись. Ст. 30.

79 Тамсама.

80 Тамсама.

81 Псамафийская хроника (V.E.). 11 // Две византийские хроники X века. Москва, 1959. С. 52.

ра рабаўніцкага войска памяркоўнасць і схільнасць да кампрамісаў.

Паводле пагаднення Алега з візантыйскімі імператарамі-суправіцелямі Львом і Аляксандрам, нарманы, славяне і фіны атрымалі выкуп па 12 грыўняў на карабель, а таксама «ўклады» на асобныя гарады Русі ўключна з Полацкам, дзе пад уладай Алега сядзелі вялікія князі. Гэта яшчэ не было праявай дыпламатыі. Нашмат большым дасягненнем было заключэнне дамовы, якая з'явілася першым пісьмовым помнікам рускага права і вызначала многія нормы крымінальнага і гандлёвага права ў адносінах паміж Руссю і Візантыяй[82]. Але і гэта само па сабе яшчэ не сведчыла б пра выключны знешнепалітычны талент Алега, калі б не той факт, што ў 911 г. яна была пацверджаная, дапоўненая[83] і, што самае важнае, сапраўды выконвалася абодвума бакамі да 941 г. Такім чынам, заморскі паход, які па сваім характары яшчэ быў моцна падобны да рабаўніцкага набегу, быў упершыню ўжыты для прасоўвання дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў. Забеспячэнню сталага гандлю і мірным міждзяржаўным адносінам была нададзеная перавага перад марадзёрскай вайной за славу і грошы.

Але калі сам Алег мог быць задаволены вынікам паходу, у войску было шмат ахвочых да лёгкай здабычы, якія прагнулі скарыстацца з наяўнасці значнай узброенай сілы. Нейкія русы, якія, найбольш верагодна, былі ўдзельнікамі паходу на Канстанцінопаль, у 910 г. на шаснаццаці караблях і ў 911–912 гг. «у вялікай колькасці» зрабілі два напады на мусульманскія краіны Каспію. У абодвух выпадках яны былі разбітыя і панеслі вялікія страты[84].

Аб вялікім паходзе русі на Каспій апавядае арабскі пісьменнік Масудзі. З'явіўшыся на Баспоры Кімерыйскім (Керчанскай пратоцы), нарманы папрасілі хазарскага цара прапусціць іх у Каспійскае мора на ўмовах раздзелу мяркуемай здабычы. Акрамя сваёй долі здабычы, хазарскі цар быў не супраць выкарыстаць русаў як інструмент ціску на

---

[82] Лаврентьевская летопись. Ст. 31.

[83] Тамсама. Ст. 32–38.

[84] Алиев С. М. *О датировке набега русов, упомянутых Ибн Исфандийаром и Амоли*. С. 318–321.

сваіх мусульманскіх суседзяў, з якімі часта меў сутыкненні па рэлігійных прычынах[85]. Таму ён не стаў пярэчыць намерам русаў. Трапіўшы праз Дон і Волгу на Каспій, русы павялі сябе традыцыйна і спустошылі ўзбярэжжа Гіляна, Табарыстана, Азербайджана і Шырвана. Пасля гэтага яны разграмілі мясцовае апалчэнне і са здабычай адправіліся назад. Але мусульманская гвардыя хазарскага цара запатрабавала ад яго дазволу адпомсціць за ўсё зло, учыненае русамі іхнім адзінаверцам. Цар вымушаны быў пагадзіцца. Да гвардзейцаў-арсіяў далучыліся жыхары хазарскай сталіцы Ітыля, якіх разам сабралася каля 15 000 узброеных коннікаў. «Бітва паміж імі працягвалася тры дні, і Алах дараваў перамогу мусульманам. Русы былі аддадзеныя мячу, забітыя і патопленыя. Уратавалася з іх каля 5 тыс., якія на сваіх караблях пайшлі да берагу (ракі Волгі), які вядзе да краіны Буртас». Далей русы пацярпелі паражэнне ад буртасаў пры спробе перабрацца з Волгі ў Дон, вымушаныя былі працягваць сваё падарожжа па Волзе і былі канчаткова знішчаныя волжскімі булгарамі[86]. Некаторыя даследчыкі атаясамліваюць гэтыя падзеі з вышэйзгаданым паходам 912 г., датуючы яго, аднак, 913–914 гг.[87] С. Аліеў лічыць гэтую выправу асобным паходам, які адбыўся пасля 922 г.[88], а Амяльян Прыцак вызначае яго верхнюю храналагічную мяжу як 928 г.[89]

Паход на Візантыю, у якім удзельнічалі полацкія і, найбольш верагодна, смаленскія крывічы, а таксама радзімічы, заняў важнае месца ў ваеннай гісторыі беларускіх земляў. Калі напад Аскольда і Дзіра на Полацк у 865 годзе быў першым дакладна зафіксаваным прыкладам міждзяржаўнай вайны непасрэдна на беларускіх землях,

---

[85] Путешествие Ибн Фадлана на Волгу. С. 85–86; Артамонов М. И. *История хазар.* Санкт-Петербург, 2002. С. 375–377.

[86] Мас'уди о Кавказе // Минорский В. Ф. *История Ширвана и Дербенда X–XI вв.* Москва, 1963. С. 199–201.

[87] Артамонов М. И. *История хазар*. С. 375; Пашуто В. Т. *Внешняя политика Древней Руси.* С. 100–101. Адпаведны раздзел гэтай кнігі напісаны А. П. Навасельцавым.

[88] Алиев С. М. *О датировке набега русов, упомянутых Ибн Исфандийаром и Амоли.* С. 321.

[89] Голб Н., Прицак О. *Хазарско-еврейские документы X века.* Москва; Иерусалим, 1997. С. 166.

паход Алега быў першым выпадкам удзелу значных вайсковых кантынгентаў з беларускіх земляў у вайне па-за межамі родных краёў.

На паўночным кірунку Алег таксама прадэманстраваў свае знешнепалітычныя таленты, закрыўшы старую праблему набегаў вікінгаў з дапамогай не вайны, а выплаты вельмі сціплай даніны ў памеры 300 грыўняў, якая сплочвалася вікінгам да кіравання самога Яраслава[90].

Пасля смерці Алега ў Кіеве (паводле звестак Наўгародскага першага летапісу ў Ладазе, якая захоўвала важнае значэнне на Поўначы)[91] князем стаў сын Рурыка Ігар. Ад Алега яму ў спадчыну дасталася велізарная, але нетрывалая дзяржава, якая адразу ж сутыкнулася з праблемамі знешняй пагрозы і ўнутранага разладу. На гэтыя падзеі мы мусім звярнуць асабліва пільную ўвагу. Калі за панаванне Алега крывічы і радзімічы бралі чынны ўдзел ў агульных справах Русі, то працэсы, якія адбываліся ў княжанне Ігара, стварылі ўмовы для існавання першых самастойных дзяржаўных утварэнняў на беларускіх землях.

Ужо ў 914 г. Ігар вёў вайну з драўлянамі, а перамогшы іх, усклаў на іх даніну, большую за ранейшую. Пазней ваявода Ігара Свенельд (Suainaltr) заваяваў угліча ў, якія жылі ў міжрэччы ніжняга Дняпра і Днястра, за выключэннем іхняга горада Перасечана. Пасля ўпартай трохгадовай аблогі быў узяты і Перасечан[92]. Даніны з драўлян і угліча ў былі перададзеныя Свенельду. Разам з непакорнымі славянскімі плямёнамі ўзмацнілася пагроза ад качэўнікаў-печанегаў. Ужо ў 920 г. Ігар «воеваше на Печенеги»[93].

Адпадзенне такіх ужо заміраных плямёнаў, як драўляне, і напады знешніх ворагаў усклалі дадатковы цяжар на

---

90 Лаврентьевская летопись. Ст. 24.

91 Новгородская первая летопись старшего и младшего изводов. Москва, 2000. С. 109.

92 Никоновская летопись. С. 26. Наўгародскі першы летапіс падае іншую храналогію: вайна Свенельда з углічамі ў 940 г. і перадача яму драўлянскіх данін у 942 г. Новгородская первая летопись. С. 110. Такая дацiроўка выглядае больш верагоднай, але таксама, як справядліва заўважае М. І. Артамонаў, досыць адвольнай. Гл.: Артамонов М. И. *Воевода Свенельд* // Культура Древней Руси. Москва, 1996. С. 31.

93 Лаврентьевская летопись. Ст. 43.

княскую ўладу ў Кіеве. Частыя войны ў вялікай ступені паднялі значэнне і ўплыў княскіх дружыннікаў, старэйшыя з якіх, як Свенельд, мелі і свае дружыны і карысталіся пэўнай незалежнасцю ад князя. Каб забяспечыць іх лаяльнасць і заахвоціць да ўдзелу ў войнах, Ігар быў вымушаны надаваць ім прывілеі кшталту права збору данін. Але ва ўмовах скарачэння падуладнай тэрыторыі гэта можна было зрабіць толькі коштам сваіх уласных даходаў і, урэшце рэшт, палітычнай магутнасці. Эканамічны дабрабыт і палітычны ўплыў кіеўскага князя падалі. Нават ягоная ўласная дружына заявіла яму пасля ўсіх пажалаванняў Свенельду: «се далъ еси единому мужеви много»[94].

Да пачатку 940-х гадоў становішча стала настолькі вострым, што кіеўскія русы з адабрэння ці пры прамым удзеле княскай улады вымушаныя былі ізноў звярнуцца да арганізацыі рабаўніцкіх набегаў. Як расказвае ананімны хазарска-гебрайскі ліст X ст. Хасдаю ібн Шапруту, каля 940 г. візантыйскі імператар Раман I Лакапін даслаў дары нейкаму HLGW, цару RWSY' (Хельг ці Алег, магчыма, адзін з правадыроў кіеўскіх русаў) з тым, каб той напаў на тады варожую візантыйцам Хазарыю. У адсутнасць намесніка HLGW узяў SMKRY (Самкерц ці Керч, цэнтр хазарскіх уладанняў у Крыме). Хазарскі намеснік і военачальнік BWLŠŞY у адказ выступіў супраць візантыйскіх уладанняў у Крыме і нанёс ім шмат шкоды. Разбіўшы затым візантыйскае войска, ён выступіў супраць HLGW, у ходзе чатырохмесячнай кампаніі перамог яго і вярнуў здабычу з Самкерца. У якасці неадменнай умовы замірэння BWLŠŞY запатрабаваў выступлення русаў супраць Візантыі, якое неўзабаве і адбылося[95].

Вядома, русы маглі мець і свае прычыны арганізаваць чарговы набег. Але лёгкасць, з якой яны купіліся на візантыйскае золата, а затым падпарадкаваліся хазарскім патрабаванням і далі ўцягнуць сябе ва ўпартую барацьбу за чужыя інтарэсы, выразна вымалёўвае цяжкае становішча кіеўскага князя і ягонай дружыны. Верагодна, ягоныя супярэчнасці з Хазарскім каганатам не абмяжоўваліся гне-

---

94 Никоновская летопись. С. 27.
95 Голб Н., Прицак О. *Хазарско-еврейские документы X века.* С. 141–142.

вам хазар за напад на Самкерц. Гіпатэтычна мы можам меркаваць, што яшчэ раней хазары таксама паспрабавалі скарыстацца з паўстанняў славянскіх плямёнаў супраць кіеўскага панавання і націску печанегаў, каб вярнуць ўладу над ранейшымі даннікамі: севяранамі і радзімічамі. Таму ў пачатку 940-х гг. хазарскі ўплыў на Русь мог узмацніцца[96]. Улічваючы перадачу Свенельду угліцкіх і драўлянскіх данін, пад непасрэдным кантролем Ігара заставалася толькі вузкая паласа земляў уздоўж гандлёвых шляхоў па Волхаву, Волзе і Дняпры. Пры такіх абставінах хазарскі ультыматум аднаму з ягоных ваяводаў гучаў вельмі важка для самога Ігара. Ліст Хасдаю ібн Шапруту наўпрост сведчыць, што ў выніку ваенных паражэнняў «RWS» была падпарадкаваная хазарскай уладзе[97]. У такім святле становіцца зразумелай ягоная гатоўнасць парушыць дамову з Візантыяй, каб задобрыць хазар, а затым паправіць свой дабрабыт шляхам рабаўніцтва візантыйскіх уладанняў.

У чэрвені 941 г. рускі флот падплыў да Канстанцінопаля, але ў першым жа сутыкненні з грэкамі пацярпеў паражэнне. Шмат караблёў было спалена грэчаскім агнём, шмат патанула разам з камандай, а яшчэ больш русаў было ўзята ў палон. Рэшткі русаў адступілі на азіяцкі бераг у Віфінію, якую бязлітасна спустошылі. На гэты раз нарманы і славяне выявілі яшчэ больш жорстка, чым у паходзе Алега. Палонных яны «адных распіналі на крыжы, другіх убівалі ў зямлю, трэціх ставілі як мішэні і расстрэльвалі з лукаў». «Палонным жа са святарскага стану яны звязвалі за спіной рукі і ўбівалі ім у галаву жалезныя цвікі»[98]. Аднак і на сушы ў Віфініі русы пацярпелі паражэнне ад войскаў Варды Фокі і Іаана Куркуаса і вымушаныя былі эвакуіравацца на караблі. З надыходам зімы яны паплылі ўздоўж фракійскага ўзбярэжжа, але былі нагнаныя візантыйскім флотам і прайгралі яшчэ адну марскую бітву[99]. Атрады, што засталіся ад Ігарава войска, уратава-

---

[96] Петрухин В. Я. *Начало этнокультурной истории Руси IX–XI веков*. Смоленск, 1995. С. 102.

[97] Голб Н., Прицак О. *Хазарско-еврейские документы X века*. С. 142.

[98] Theoph. Contin. VI, 39. C. 175–176.

[99] Ibid.

ліся ўцёкамі да Баспору Кімерыйскага[100]. Як кажа ўсё той жа хазарска-гебрайскі ліст, рэшткі русаў пайшлі морам у FRS (паўднёвы бераг Каспійскага мора) і там гэтае войска загінула[101]. Да гэтага паходу на Каспій мы яшчэ вернемся, а пакуль ізноў звернем увагу на ўнутранае становішча Русі.

Нягледзячы на сумны зыход, паходы на Крым і Візантыю ўсё роўна былі акружаныя рамантычным арэолам прыгод у далёкіх краінах. Нават тыя нямногія ваяры, што здолелі вярнуцца на свае родныя землі, у Кіеў, Смаленск, Швецыю, Нарвегію ці Данію, маглі доўга распавядаць пра дзівосы чароўных паўднёвых краін і траціць на мясцовых рынках і ў корчмах нарабаваныя грошы, а скальдам і песнярам даваць сюжэты для прыгожых эпічных песень. Такое апяванне вайны было тыповым для нарманскіх дружыннікаў. Узгадаем, што пасля славутага рэйду Хастэна і Б'ёрна Жалезнабокага па Міжземнамор'і ў 856–861 гг. з шасцідзесяці двух караблёў у нарманаў засталося ўсяго каля трэці, але тыя, што патрапілі выжыць, «здабылі сабе багацце і славу»[102]. Такі самы падыход быў характэрны і для нарманаў-русі і іх славянскіх братоў па зброі. Але слава і багацце асобнага дружынніка былі маласуцяшальнымі для князя, калі большасць ягонай дружыны засталася ляжаць пад чужым сонцам ля чужых берагоў. Для самога князя і ягонай дзяржавы вынік такіх выправаў быў цяжкім паражэннем.

Здавалася б, такая буйная няўдача мусіла суцішыць ваяўнічасць кіеўскіх русаў, але ўжо ў 944 г. яны ізноў сабраліся на Візантыю. Найбольш верагодна, у Ігара проста не было выбару. Гэтым разам памылкі мінулага былі ўлічаныя. Быў прыгаданы досвед паходу Алега. Было сабрана вялізнае войска з варагаў-русі, палян, славен, крывічоў, ціверцаў і найманых печанегаў. Яно рушыла ў паход конна і на караблях. Як папярэдзілі візантыйцаў іх херсанескія падданыя і балгары, «бещисла корабль, покрыли суть

---

100 Лев Диакон. *История.* VI, 10. (Далей: Leo Diac.). Москва, 1988. С. 57.

101 Голб Н., Прицак О. *Хазарско-еврейские документы X века.* С. 142.

102 Джонс Г. *Викинги...* С. 215.

море корабли»[103]. Ігарава войска сустрэлі не візантыйскія салдаты, але пасольства, якое прывезла прапановы міру і выкупу. Спыніўшыся на Дунаі, Ігар учыніў раду з дружынай. Дружына параіла князю прыняць мір, каб не выпрабоўваць шчасця ў марской бітве, дзе «по глубине морстеи обча смерть всемъ»[104]. Узяўшы выкуп, Ігар вярнуўся дадому, а на наступны год заключыў з Візантыяй дамову, у спісе гарадоў якой Полацк ужо не згадваецца[105].

Пасля завяршэння візантыйскага паходу, у 945 г., русы накіраваліся на Каспійскае мора. Як і ў ранейшых паходах, яны дзейнічалі як саюзнікі Візантыі ў барацьбе супраць мусульманскіх дзяржаў. Хазарыя пры гэтым ізноў заняла нейтральную пазіцыю[106]. Як лічыць М. І. Артамонаў, у паходзе ўдзельнічалі дружыны ветэрана крымскай кампаніі Хельгі і ваяводы Свенельда[107]. Падняўшыся па рацэ Куры, яны авалодалі сталіцай Арана (Албаніі) горадам Бердаа і разбілі войска намесніка Марзубана. Пэўны час яны нават не кранаі горада, магчыма, спадзеючыся карыстацца ім як базай для далейшых аперацый. Але пасля канфлікту з мясцовым насельніцтвам яны ўсё ж спустошылі Бердаа. Хаця страты русаў, па ўсёй верагоднасці, былі заўважнымі, але насуперак хазарскім крыніцам паход не завяршыўся гібеллю ўсяго войска. Шмат русаў з вялікай здабычай вярнулася дадому[108].

Верагодна, гэтая здабыча перавышала тое, што самому Ігару ўдалося атрымаць паводле дамовы з грэкамі. Уражанне ад бяскроўнай перамогі і чысты эканамічны прыбытак былі недастатковымі для Ігара, каб задаволіць патрабаванні дружыны, разбурыць вобраз няўдалага князя і вярнуць свой аўтарытэт. Зайздрасць да багацця Свенельдавых ваяроў засцілала Ігаравым дружыннікам вочы. Яму ізноў давялося выслухоўваць іх скаргі, ігнараваць якія ён не мог. «В се же лето рекоша дружина Игореви: «От-

---

[103] Лаврентьевская летопись. Ст. 45.
[104] Тамсама. Ст. 46.
[105] Тамсама. Ст. 46–53.
[106] Сахаров А. Н. *Дипломатия древней Руси: IX – первая половина X в.* Москва, 1980. С. 207.
[107] Артамонов М. И. *Воевода Свенельд.* С. 32–33.
[108] Пашуто В. Т. *Внешняя политика Древней Руси.* С. 101–103.

роци Свенележи изоделися суть оружьемъ и порты, а мы нази»[109]. Пад такім ціскам князю давялося адправіцца ў Драўлянскую зямлю па даніну, дзе і адбылася апошняя дзея трагедыі ягонага панавання. Ужо сабраўшы даніну, Ігар вяртаўся дадому, але вырашыў застацца з малой часткай дружыны, каб сабраць больш. Такое бессаромнае вымаганне абурыла драўлян, памеры чыёй даніны былі ўстаноўленыя самім жа Ігарам, прычым у велічыні, большай за тое, што яны плацілі Алегу. Драўляне аказалі ўзброенае супраціўленне[110]. Нешматлікая Ігарава дружына была разбітая. Самога ж яго паланілі, прывязалі да ствалоў дрэваў і разарвалі напалам[111].

Такім чынам скончылася жыццё і панаванне аднаго з найбольш характэрных герояў той эпохі. Як і многія сучасныя яму нарманскія правадыры, Ігар быў больш схільны да вайны, чым да палітыкі, і аддаваў перавагу рашэнню праблем рачэй з дапамогай мяча, чым з дапамогай пагаднення. Але і ў вайне ягонае майстэрства і смеласць былі больш прыдатнымі для рабаўніцкіх набегаў, чым для сур'ёзнай барацьбы з такімі волатамі, як Візантыя і Хазарыя. Жыццё Ігара прыпадобілася да жыцця многіх ягоных сучаснікаў-нарманаў. Найперш мы можам згадаць Гудрэда, брата Сігтруга, нарманскага караля Ёрку. Палонены англійскім каралём Этэльстанам, ён быў з павагай прыняты пры двары, але не знёс жыцця там, бо «быў старым піратам і звык жыць у вадзе, як рыба»[112]. Да Ігара можна ўжыць і словы, сказаныя яшчэ аб адным нармане з Ёрку — Эйрыку Крывавай Сякеры (Eiríkr blóðøx Haraldsson), які быў «больш вікінг, чым гаспадар»[113]. Падобным было іхняе жыццё, і падобныя тэндэнцыі адлюстроўвалі іхняя смерць і сыход з палітычнай арэны. На змену вікінгам прыходзілі гаспадары.

Па смерці Ігара фармальна кіеўскім князем застаўся ягоны сын Святаслаў, але фактычна кіраванне дзяржавай

---

109 Лаврентьевская летопись. Ст. 54.
110 Тамсама. Ст. 54–55.
111 Leo Diac. VI, 10. С. 57.
112 Арбман Х. *Викинги.* С. 108.
113 Гуревич А. Я. *Походы викингов.* Москва, 1966. С. 108.

перайшло да Ігаравай удавы Вольгі, якая жорстка адпомсціла драўлянам за смерць мужа[114].

Славянскае імя Святаслава адлюстроўвае працэс славянізацыі русі-нарманаў, успрыняцця ёю мясцовай культуры і зліцця з мясцовым вайскова-дружынным слоем, хаця імёны ягоных старэйшых паплечнікаў Свенельда і Асмуда (Âsmundr ці Âsmóðr)[115] паказваюць, што і неасіміляваныя нарманы яшчэ адыгрывалі вялікую ролю ў краіне.

Дружыннікі-русы гінулі на берагах цёплых Чорнага і Каспійскага мораў, памятныя камяні ў іх гонар ставіліся на зялёных лугах Швецыі, Ігар знайшоў сваю смерць у непралазных драўлянскіх пушчах, але ўсе гэтыя падзеі прадвызначылі ход далейшага гістарычнага развіцця беларускіх земляў. Смаленскія крывічы на Дняпры так і засталіся ў складзе Кіеўскай дзяржавы. Візантыйскі імператар Канстанцін Барвянародны ў сваім трактаце «Аб кіраванні імперыяй», напісаным каля 950 г., згадвае сярод плямёнаў, што плацілі Русі даніну, другувітаў[116], у якіх мы пазнаем дрыгавічоў. Але ўжо ў дамове 944 г. Русі з Візантыяй Полацк адсутнічае ў спісе падуладных Кіеву гарадоў. У 970-я гг. мы бачым там на княжанні Рагвалода, які «прішелъ и-заморья»[117]. З'яўленне самастойнага князя значыць, што полацкія крывічы здолелі дабіцца самастойнасці ад паслабленай паражэннямі Ігара Кіеўскай дзяржавы.

Указанне на заморскае паходжанне Рагвалода вядзе нас да думкі, што ён мог быць нарманскім конунгам, тым больш, што ягонае імя гучыць як славянізаванае вымаўленне нарманскага імя Рагнвальд (Rögnvaldr). Расейскі генеалог Ю. В. Канавалаў гіпатэтычна атаясамлівае яго з нарвежскім конунгам Рагнвальдам Славутым, сынам Олава

---

114 Лаврентьевская летопись. Ст. 56–57.

115 Тамсама. Ст. 58.

116 Константин Багрянородный. 9. *Об управлении империей.* (Далей: Const. Porphyr.). Москва, 1989. С. 51.

117 Лаврентьевская летопись. Ст. 76. «Повесть временных лет» датуе падзею 980 г. Але А. М. Рапаў перaканаўча даводзіць, што паход Уладзіміра на Полацк не можа датавацца пазней за ўзяцце ім Кіева, якое адбылося 11 чэрвеня 978 г., і павінен быць аднесены да прамежку часу паміж 973–978 гг. Гл.: Рапов О. М. *Русская церковь в IX – первой трети XII в.* Москва, 1988. С. 198, 240.

Альва Гейрстадзіра, сына нарвежскага караля Харальда Цудоўнавалосага (Haraldr inn harfagri).[118] А. Латышонак і А. Белы не выключаюць, што Рагвалод мог быць сынам Эйрыка Крывавай Сякеры, іншага сына Харальда.[119]

Гэтыя версіі пабудаваны на шматлікіх дапушчэннях, і таму ставіцца да іх трэба вельмі асцярожна. Аднак зусім не здаецца неверагоднай і нават вельмі лагічна выглядае магчымасць паходжання Рагвалода з нарвежскай каралеўскай дынастыі. І на Каспіі, і на супрацьлеглым канцы кантыненту, у нарвежскіх ф'ёрдах, адбываліся падзеі, якія мелі дачыненне да лёсаў беларускіх земляў. Паводле розных крыніц, Харальд Цудоўнавалосы меў ад дзевяці да дваццаці сыноў[120], кожны з якіх прэтэндаваў на частку бацькавай спадчыны, уладу і славу. Акрамя таго, як зазначае сага пра Харальда, ён «ажаніў большасць сваіх дачок са сваімі ярламі ўнутры краіны, а адсюль пайшло шмат родаў»[121]. Адны з нашчадкаў Харальда цярпелі паражэнне і разам са сваімі вернымі дружынамі выпраўляліся за мора, каб мужнасцю здабыць долю замест страчанай на радзіме. Так зрабіў самы знакаміты з іх, Эйрык Крывавая Сякера. Прайграўшы барацьбу за Нарвегію свайму брату Хакану Добраму, Эйрык стаў вандроўным конунгам, пэўны час быў каралём у Дубліне і загінуў у бітве за Ёркскае каралеўства з англасаксамі пры Стэйнмары ў 954 г.[122] Такія вандроўныя конунгі заплывалі і ў краіны на ўсход ад Балтыкі, якія нарманы аб'ядноўвалі пад назвай Аўстрвег (Austrvegr), то бок Усходні шлях. Той самы Эйрык яшчэ да смерці Харальда праклаў дарогу на ўсход. Ён «паўсюль хадзіў у Курляндзе і ў Эйстляндзе, і ў многіх іншых землях ваяваў ён у Аўстрвегах»[123]. Цалкам магчыма, што адзін

---

118 Коновалов Ю. В. *Русско-скандинавские связи середины IX – середины XI вв.* // Историческая генеалогия. Вып. 5. Екатеринбург; Париж, 1995. С. 48–51.

119 Oleg Latyszonek, Ales' Bely. *On the Scandinavian Origin of Rahvalod* // Annus Albaruthenicus 2005. Krynki, 2005. 60–61.

120 Джонс Г. *Викинги...* С. 86.

121 Сага о Харальде Прекрасноволосом. XLII // Стурлусон, Снорри. *Круг Земной.* Москва, 1980. С. 66.

122 Джонс Г. *Викинги...* С. 87–88, 241.

123 Красивая кожа. VIII // Джаксон Т. Н. *Исландские королевские саги о Восточной Европе (с древнейших времен до 1000 г.).* С. 77.

з нашчадкаў Харальда Цудоўнавалосага, які шукаў княства, знайшоў яго на берагах Дзвіны ў полацкіх крывічоў, якія шукалі самастойнасці ад Кіева. У сваю чаргу, ён са сваёй прагай улады і ваенным умельствам узначаліў дзяржаўнае жыццё Полацкай зямлі, зрабіўшы для Полацка тое, што ў свой час зрабіў Рурык для Ладагі. Князь без зямлі і зямля без князя аб'ядналіся, утварыўшы самастойную дзяржаву.

Калі нашыя меркаванні наконт нарвежскага паходжання Рагвалода верныя, то яго дынастыя атрымала ўладу ў Полацку дзесьці паміж 931 ці 933 г., годам смерці Харальда Цудоўнавалосага, і 944 г., калі Полацк больш не згадваецца ў дамове Русі з Візантыяй. Можна лічыць, што менавіта ў гэты час на беларускіх землях узнікла першае самастойнае дзяржаўнае ўтварэнне.

На гэтым мы пакінем на пэўны час шырокія плыні Дняпра, Дзвіны і Волгі, якія неслі нарманскія і славянскія лоддзі паміж Балтыйскім, Чорным і Каспійскім морамі, і перанясем наш позірк далей на захад, на Буг, Нёман і Віллю. У IX—X стст. заходнія і паўночна-заходнія беларускія землі мала згадваліся пісьмовымі крыніцамі, але археалогія дапамагае нам прасачыць хаду іх тагачаснай гісторыі.

У гэты час землі Пабужжа ўжо зведалі хвалю славянскай каланізацыі з боку дрыгавічоў і валынян, але яшчэ мелі значную долю насельніцтва, што складалася з яцвяжскіх плямёнаў.[124] Далей на поўнач яцвягі займалі землі па Нараву і правабярэжжа Нёмана[125]. З асобных плямёнаў яцвягаў можна вылучыць прысутнае ў Пабужжы племя злінцаў[126].

На тэрыторыі басейнаў рэк Мерачы, Нёмана, Віллі і Святой і вакол азёраў Нарач і Свір знаходзілася яшчэ адно

---

[124] Іоў А. В. *Этнічны склад насельніцтва Заходняга Палесся ў X—XIII стст. (па матэрыялах сельскіх паселішчаў)* // Старонкі гісторыі Беларусі. С. 32—33.

[125] Girininkas A., Lukoševičius O. *Lietuvos priešistorė. Materialinės ir dvasinės kultūros raida, genčių formavimasis.* Vilnius, 1997. 159.

[126] Іоў А. В. *Этнічны склад насельніцтва Заходняга Палесся ў X—XIII стст.* С. 33.

балцкае племя – літва.[127] Яно паходзіла ад носьбітаў культуры ўсходнелітоўскіх курганоў. Яго нашчадкі ў далейшым зрабілі неацэнны ўнёсак у фармаванне літоўскай і беларускай нацый. Разам з некаторымі іншымі плямёнамі літва адносілася да аўкштайцкага культурнага арэалу[128].

Сацыяльная структура балцкіх грамадстваў заставалася досыць падобнай да грамадстваў славянскіх. У літвы і яцвягаў працягваўся працэс распаду родавага ладу і замены крэўнай структуры грамадства тэрытарыяльнай. Асобныя паселішчы аб'ядноўваліся ў воласці (valsèiai)[129] на чале з вешпацамі (viešpats) – панамі валасцей[130]. Аб памерах валасцей можна меркаваць па тым факце, што народны сход адной з такіх валасцей у Ятвязі складаўся з 300 мужчын[131]. Аб'яднанні абласцей утваралі землі[132], якія можна лічыць падобнымі да славянскіх саюзаў плямёнаў ці племянных княжанняў.

Між тым паступовае развіццё грамадскага ладу балтаў апынулася пад пагрозай далейшай экспансіі славянскіх плямёнаў, якія пад кіраваннем мясцовых і прышлых нарманскіх князёў ужо былі ўцягнутыя ў працэс дзяржаватварэння. У VIII–IX стст. валыняне працягнулі свой рух уніз па цячэнні Заходняга Буга і неўзабаве склалі там большасць насельніцтва, асіміляваўшы злінцаў[133]. Астатні яцвяжскі арэал у IX–X стст. таксама скараціўся[134]. У адпаведнасці са складзенай Л. В. Аляксеевым картай, крывічы да X ст. выйшлі на вярхі Друці і Віллі, а дрыгавічы занялі тэрыторыю вакол вытокаў Случы, Лані і Нёмана[135]. Мясцовае балцкае насельніцтва, як і раней, было ў значнай

---

127 Girininkas A., Lukoševičius O. *Lietuvos priešistorė. Materialinės ir dvasinės kūlturos raida, genčių formavimasis.* 182.

128 Ochmański, Jerzy. *Historia Litwy.* 37; Baranauskas T. *Lietuvos valstybės istakos.* Vilnius, 2000. 132, 256–258.

129 Baranauskas T. *Lietuvos valstybės istakos.* 255.

130 Ochmański, Jerzy. *Historia Litwy.* 37–38.

131 Baranauskas T. *Lietuvos valstybės istakos.* 258.

132 Ibid. 255.

133 Іоў А. В. *Этнічны склад насельніцтва Заходняга Палесся ў X–XIII стст.* С. 33.

134 Girininkas A., Lukoševičius O. *Lietuvos priešistorė. Materialinės ir dvasinės kūlturos raida, genčių formavimasis.* 159.

135 Алексеев Л. В. *Полоцкая земля.* С. 51.

ступені асімілявана, што было больш характэрна для яцвягаў.[136] Пэўная частка яго была выцесненая на паўночны захад, што было больш характэрным для літвы[137].

У гэтых умовах роля племені ў яцвягаў і літвы змянялася ад адзінкі тэрытарыяльнай арганізацыі да структуры, закліканай забяспечваць бяспеку яе сяброў і аказваць супраціўленне знешняй пагрозе. Адпаведна ўзрастала значэнне дружыны (драугіі) на чале з князем (кунігасам) як галоўнай сілы, здольнай выканаць гэтую задачу, і асноўнага цэнтра ўплыву ў племені. Гэта вяло не толькі да абарончых войнаў супраць чужаземных заваёўнікаў, але і да вялізнай колькасці міжусобных войнаў. Мы яшчэ раз можам прыгадаць паведамленне Вульфстана аб шматлікіх войнах паміж «каралямі» эстыяў. Археалагічныя дадзеныя сведчаць аб існаванні ў тыя часы на літоўскіх землях многіх замкаў, прызначаных для абароны найперш ад суседніх роднасных плямёнаў. Напрыклад, драўляны замак на месцы пазнейшай Вільні існаваў ад V ст. аж да XIII ст.[138] Мужчынскія пахаванні літвы па-ранейшаму ўтрымліваюць шмат зброі[139]. Яшчэ больш зброі ў яцвяжскіх пахаваннях[140]. Гэтыя факты ярка адлюстроўваюць ролю вайны ў жыцці балцкіх плямёнаў.

Але пагроза звонку выклікала ў балтаў не толькі найпрасцейшую рэакцыю ў выглядзе ўзброенага супраціўлення, а вайна была не толькі каталізатарам унутранага развіцця. Сутыкнуўшыся з нарманскімі і славянскімі дружынамі з усходу (а прусы і куршы з нарманамі з захаду), балты не гублялі шанцаў завязаць з імі больш цесныя гандлёвыя кантакты, а пры нагодзе і паўдзельнічаць у заморскім паходзе. Паводле археалагічных звестак, ужо ў X ст. тавары з літоўскіх земляў траплялі ў Кіеў[141]. Таксама сярод спісу рускіх паслоў у дамове 944 г. з Візантыяй мы

---

[136] Іоў А. В. *Этнічны склад насельніцтва Заходняга Палесся ў X–XIII стст.* С. 33.

[137] Girininkas A., Lukoševičius O. *Lietuvos priesištorė. Materialinės ir dvasinės kūlturos raida, genčių formavimasis.* 182.

[138] Ibid. 184.

[139] Ibid. 183–184.

[140] Ibid. 160.

[141] Ibid. 184.

сустракаем Яцвяга Гунарава, г. зн. пасла Гунара, аднаго з набліжаных да кіеўскага князя людзей[142]. Мы можам думаць, што паслом паводле свайго становішча мог быць дружыннік балцкага паходжання, які шукаў багацця і славы ў далёкіх паходах. Ягонае імя, узятае ў кантэксце шматмоўнай атмасферы кіеўскай рускай дружыны, магло быць назвай ягонага народу, якая прыстала да яго ў якасці ўласнага імені. Такім чынам, войны нарманскага часу закранулі і аддаленыя землі балтаў, ведучы да з'яўлення больш цесных сувязяў з суседзямі і паскараючы грамадскае і эканамічнае развіццё.

Але вернемся да Русі. У часы Вольгі смаленскія крывічы і дрыгавічы заставаліся пад уладай Кіева. Гісторыя яе рэгенцтва не была багатай на ваенныя падзеі. Дальнабачная княгіня паклала нямала намаганняў на ўнутранае ўладкаванне дзяржавы, якая прыйшла ў заняпад за часы яе мужа Ігара. Сваім візітам у Канстанцінопаль у 955 г. яна здолела аднавіць прыязныя адносіны з Візантыяй[143].

У 964 г. на палітычную арэну выходзіць пасталелы сын Ігара Святаслаў. «Повесть временных лет» прадстаўляе яго як ваяўнічага князя, які «войны многи творяше»[144]. Пасля доўгіх год мірнага кіравання Вольгі Русь нарэшце залячыла раны, нанесеныя папярэднімі няўдачамі і зноў валодала дастатковымі рэсурсамі, каб ажыццяўляць актыўную знешнюю палітыку. Несумненна, што ў маштабных войнах, вядзенне якіх патрабавала напружання ўсіх існых сіл Русі, бралі ўдзел і вайсковыя кантынгенты з беларускіх земляў смаленскіх крывічоў і дрыгавічоў. Перш за ўсё Святаслаў скіраваў свой позірк на паўднёвы ўсход да Хазарыі. Супярэчнасці Хазарыі і Русі складаліся не толькі з дваістай палітыкі хазарскага цара ў адносінах да рускіх рабаўніцкіх дружын на Каспіі. Найперш яны былі справай палітычнага супрацьстаяння. Хазары бралі даніны з шэрагу славянскіх плямёнаў, на ўладу над якімі прэтэндавалі і кеіўскія русы. У 964 г. Святаслаў выправіўся на вяцічаў на вярхі Акі і Волгі. Летапіс не падае ніякіх пераможных рэляцый з гэтай нагоды. Ён сціпла заўважае, што

142 Лаврентьевская летопись. Ст. 47.
143 Тамсама. Ст. 60–64.
144 Тамсама. Ст. 64.

вяцічы толькі паведамілі Святаславу памеры сваёй даніны хазарам[145]. Гэты эўфемістычны кавалачак перакладаецца такім чынам, што страх вяцічаў перад хазарамі праважыў страх перад Святаславам і яны засталіся хазарскімі даннікамі, нягледзячы на ягоны прыход з узброенай сілай. Як мы памятаем, хазарам у гэты час маглі падпарадкоўвацца і радзімічы з севяранамі. А ў гэтым выпадку ўсё сярэдняе Падняпроўе разам з Кіевам як цэнтрам улады Русі знаходзілася пад хазарскай пагрозай. Таму яе ліквідацыя была першачарговай задачай Святаслава, толькі пасля вырашэння якой маглі быць вернутыя пад кіеўскую ўладу згаданыя плямёны.

Звернем увагу і на той факт, што палітычныя інтарэсы Русі ў гэтым выпадку супярэчылі эканамічным. Хазарыя была фактычным вартаўнікам волжскай часткі Волхаўска-Волжскага гандлёвага шляху і сваімі вайсковымі сіламі і крэпасцямі кшталту Саркела ці Семендэра ахоўвала вялізныя прыкаспійскія прасторы ад нападаў качэўнікаў. Яе падзенне паклала канец найвыгаднай гандлёвай сістэме, калі, вядома, яе месца не займала б сама Русь. Але ў Русі для гэтага наўрад ці хапала рэсурсаў. Аднак у знешняй палітыцы як самастойнай сферы дзейнасці чалавека палітычныя меркаванні непазбежна ўзялі верх над меркаваннямі эканамічнымі. Таму вайну Святаслава з Хазарыяй можна лічыць класічнай вайной магутнасці, дзе матыў прыбытку прысутнічаў толькі ў форме непрыхаванага рабунку.

Раней русаў магла стрымліваць хазарская ваенная моц, якую яны напоўніцу адчулі на сабе ў 940 г. Але з цягам часу Хазарыя саслабела і ўжо не магла аказаць належнага супраціўлення. У 965 г. Святаслаў пайшоў у паход на хазар, у бітве разбіў іхняе войска на чале з царом і ўзяў крэпасць Саркел, званую русамі Белай Вежай. У ходзе гэтай жа кампаніі ён перамог таксама ясаў і касогаў. У наступным 966 г. ён перамог вяцічаў і абклаў іх данінай, пацвердзіўшы тым самым матывы свайго хазарскага паходу[146]. Сама Хазарыя, хоць і аднавіла сваю самастойнасць,

---

[145] Лаврентьевская летопись. Ст. 64–65.
[146] Тамсама. Ст. 65.

але ўжо не магла адыгрываць ранейшай ролі на Волхаўска-Волжскім гандлёвым шляху. У выніку гэтага ён прыйшоў у заняпад. Русі ж, як і можна было меркаваць, не стала сіл захаваць за сабой паволжскія землі[147]. За палітычны поспех давялося заплаціць стратай велізарных гандлёвых прыбыткаў.

Гэтым тлумачыцца паслядоўнае пераключэнне ўвагі Святаслава на іншы гандлёвы шлях – Дняпроўскі. Паслядоўнае адстойванне палітычных і эканамічных інтарэсаў Русі на гэтым шляху магло кампенсаваць заняпад гандлю на Волзе. Нагода для гэтага хутка прадставілася. У 967 г. візантыйскі імператар Нікіфар Фока, ад якога балгары запатрабавалі выплаты даніны, накіраваў да русаў патрыкія Калакіра з вялікай сумай золата і прапанований напасці на Балгарыю[148]. Гэтая прапанова ўпала на добра падрыхтаваную глебу і цалкам супадала з намерамі самога Святаслава. Сабраўшы, паводле дадзеных Льва Дыякана, шэсцьдзесят тысяч ваяроў, ён рушыў у Балгарыю. Балгарскае войска, якое заступіла яму дарогу на Дунаі, было лёгка разбітае і схавалася ў крэпасці Даростал[149]. Святаслаў заняў Пераяславец на Дунаі, які зрабіў сваёй рэзідэнцыяй[150]. Вярнуўшыся ў 968 г. на кароткі час у Кіеў, каб адбіць напад печанегаў, ён заявіў Вользе і сваім баярам аб жаданні стала застацца ў Пераяслаўцы. Святаслаў назваў яго сярэдзінай сваёй зямлі, куды з Грэцыі яму дастаўлялі золата, тканіны і віны, з Венгрыі – срэбра і коней, з Русі – скуры, воск, мёд і рабоў[151]. Гэтае паведамленне ясна адлюстроўвае структуру гандлю Русі і яе геаграфічныя інтарэсы. Звяртае на сябе ўвагу згадка пра дастаўку срэбра з Венгрыі. Гэта сведчыць аб тым, што заняпад гандлю па Волзе сказаўся імгненна, спыніўшы доступ куфіцкіх дырхемаў на Русь і вымусіўшы русаў перайсці да імпарту еўрапейскага срэбра. У такім святле наступ Святаслава на Балгарыю быў цалкам лагічным.

---

[147] Артамонов М. И. *История хазар*. С. 431.
[148] Leo Diac. IV, 6. С. 36–37.
[149] Ibid. V, 2. С. 44.
[150] Лаврентьевская летопись. Ст. 65.
[151] Тамсама. Ст. 67.

Цяпер ужо было відавочна, што інтарэсы Святаслава разышліся з візантыйскімі і заваяванне Балгарыі вялося ім выключна ва ўласных мэтах. Пасля вяртання Святаслава з Кіева войска русаў авалодала балгарскай сталіцай Прэславай[152] і Філіпопалем (Плоўдзіў), дзе запляміла сябе масавым забойствам мірных жыхароў, шмат якіх русы пасадзілі на палі[153]. Заваяванне Балгарыі было завершанае, але гэта не спыніла заваёўніцкі імпэт кіеўскага князя.

Перад яго вачыма ляжала Візантыя, якую падточвала знутры барацьба паміж прэтэндэнтамі на імператарскую ўладу. У 969 г. Нікіфар Фока быў звергнуты і забіты сваім сапернікам Іаанам Цымісхіем. Але нават паслабленая Візантыя была занадта пагрозлівым праціўнікам. Агульная колькасць візантыйскіх войскаў, узначаленых дасведчанымі военачальнікамі, набліжалася да 120 тысяч. У візантыйскай скарбніцы былі дзесяткі мільёнаў залатых манет[154]. У рэтраспектыве добра відаць, наколькі Святаслаў пераацаніў свае сілы і тым самым звёў на нішто папярэднія намаганні, якія маглі значна павялічыць палітычную магутнасць Русі і прасунуць яе гандлёвыя інтарэсы. Але выбар быў зроблены. Рускае войска, узмоцненае балгарамі, печанегамі і венграмі, рушыла ў Фракію і спустошыла яе. Ужо ў баі пад Аркадзіёпалем у 970 г. яно было разбітае магістрам Вардам Склірам[155]. Пасля бітвы візантыйцы заключылі са Святаславам перамір'е, скарыстаўшы сваё звычайнае спалучэнне вайсковай сілы і тонкай дыпламатыі[156].

На наступны год, пакуль Святаслаў заставаўся ў Балгарыі, візантыйцы актыўна рыхтавалі войскі да баявых дзеянняў[157]. Узначаленая асабіста Цымісхіем візантыйская армія перайшла горныя хрыбты Балкан, заспеўшы русаў знянацку. Імклівым ударам візантыйцы ўзялі Прэславу, амаль дашчэнту знішчыўшы там рускі гарнізон, і абла-

---

[152] Лаврентьевская летопись. Ст. 69. Храналогія зблытаная. Лаўрэнцьеўскі летапіс адносіць узяцце Прэславы да 971 г., але больш верагодна, што гэтая падзея адбылася ў 968 ці 969 г.

[153] Leo Diac. VI, 10. С. 56.

[154] Пашуто В. Т. *Внешняя политика Древней Руси*. С. 57–58.

[155] Leo Diac. VI, 12–13. С. 58–59.

[156] Лаврентьевская летопись. Ст. 69–71.

[157] Leo Diac. VI, 13. С. 59.

жылі самога Святаслава ў Даростале на Дунаі. У некалькіх бітвах пад сценамі крэпасці перамога далася візантыйцам вельмі цяжка, і Цымісхій палічыў за лепшае заключыць са Святаславам мір на ўмовах эвакуацыі русаў з Балгарыі. У 972 г. пры вяртанні аслабелае войска Святаслава трапіла ў засаду печанегаў каля дняпроўскіх парогаў і было разбітае. Святаслаў загінуў. Толькі нешматлікія ваяры прыйшлі дадому[158].

Пасля смерці ваяўнічага князя кіеўскі стол пераняў у спадчыну ягоны сын Яраполк. Другі сын Алег княжыў у драўлянскай зямлі, а пабочны сын Уладзімір быў князем у Ноўгарадзе. Неўзабаве з такой цяжкасцю ўладкаваная Вольгай і Святаславам дзяржава пачала ізноў распадацца з-за міжусобнай барацьбы Святаслававых сыноў. Каля 977 г. Яраполк выступіў супраць Алега, перамог яго ў баі, падчас якога той упаў з мосту і патануў у рэчцы, і заняў ягоныя ўладанні. Спалохаўшыся за свой лёс, Уладзімір уцёк з Ноўгарада за мора ў Скандынавію[159].

Падзеі, якія адбыліся далей, сталі вечарніцай нарманскага перыяду гісторыі беларускіх земляў. Сваімі чырвонымі водбліскамі, у якіх адлюстроўвалася кроў, з вікінгскай шчодрасцю пралітая на ўсім Аўстрвегу за стагоддзі паходаў і бітваў, яны годна і велічна завяршылі сагу пра мужных і жорсткіх герояў і аддалі апошні гонар іх барвянай славе. У канцы 970-х гг. Уладзімір з варажскім войскам вярнуўся ў Ноўгарад. Здавалася, нічога не змянілася з ранейшых часоў. Нарманы ізноў ішлі на Усход, каб здабыць князю стол, а сабе багацця і славы. Гэтак жа сама прахалодны вецер надзімаў іхнія ветразі, і гэтак жа сама весела бразгала зброя. Іхнія думкі маглі скласціся ў тыя самыя вобразы, што пазней стаялі перад вачыма славутага Харальда Хардрады, калі ён ішоў у сваю апошнюю бітву ля Стэмфардскага моста:

Насустрач ударамі
Сіняй сталі
Рушым смела
Без жаднай броні.
Ззяюць шаломы,

[158] Leo Diac. VIII–IX. C. 68–83.

Я свой пакінуў
На loддзі
Побач з кальчугай[160].

Яны маглі разлічваць на тое, каб застацца ў кіеўскіх дамах, пірамі адзначаць свае перамогі, слухаць песні скальдаў і песняроў, думаць пра будучыя набегі і вырашаць лёсы краін і гарадоў. Але хуткаплынны час нёс іх на сваіх струменях прэч ад рэк і лясоў Русі ў іншыя чароўныя краіны, дзе яны маглі працягнуць сагу сваіх войнаў. Усё ж на іхнім шляху па Русі яшчэ заставаліся палі бітваў, дзе яны маглі здзейсніць свае подзвігі.

Першым погляд іхняга правадыра Уладзіміра ўпаў на Полацк, дзе княжыў ужо вядомы нам Рагвалод. Геаграфічнае становішча Полацка паміж уладаннямі Уладзіміра і Яраполка якраз адлюстроўвала ягоную палітычную ролю. Саюз Рагвалода з адным ці другім братам узмацняў бы ці Ноўгарад, ці Кіеў, і баланс магутнасці паміж імі змяняўся карэнным чынам на карысць таго, хто пасябраваў з полацкім князем. Абодва браты жадалі змацаваць саюз сваяцтвам і па чарзе пасваталіся да Рагвалодавай дачкі Рагнеды (Ragnhilð). Уладзімір першы выправіў сватоў і атрымаў адмову[161]. Прычын для таго магло быць шмат: і нізкае паходжанне Уладзіміравай маці, і палітычная стаўка Рагвалода на саюз з Кіевам. Была і важкая эканамічная прычына. Волхаўска-Волжскі гандлёвы шлях да 970–980-х гадоў заняпаў канчаткова. Прычынай гэтаму быў не толькі разгром Святаславам Хазарыі, але і вычарпанне ўсходніх срэбраных руднікоў, у выніку чаго мусульманскія краіны не мелі больш дастатковай колькасці дырхемаў, каб прапанаваць іх рускім купцам за зброю, мёд, воск, футра і рабоў[162]. Найпазнейшыя дырхемы, пакуль знойдзеныя ў Беларусі, датуюцца 986–987 гг.[163] У такіх абставінах асноўны цяжар гандлю быў перанесены на Дняпроўскі шлях, у паўночнай частцы якога Полацк ва-

---

159 Лаврентьевская летопись. Ст. 74–75.
160 Арбман Х. *Викинги.* С. 39.
161 Лаврентьевская летопись. Ст. 75–76.
162 Рябцевич В. Н. *Нумизматика Беларуси.* С. 110–111.
163 Археалогія Беларусі. Т. 3. С. 457.

лодаў выхадам у Балтыйскае мора па Дзвіне, нашмат зручнейшым за маршрут праз Ноўгарад па Волхаву. Таму Полацк у тыя часы стаў прамым гандлёвым канкурэнтам Ноўгарада і не быў зацікаўлены ў саюзе з ім. Зваротна, і Ноўгарад, не заключыўшы палітычны саюз з Полацкам, быў зацікаўлены ў прыніжэнні апошняга[164]. Заключным штуршком да сутыкнення стала пажаданне полацкай князёўны ажаніцца з Яраполкам[165].

У адказ «Володимеръ же собра вои многи, Варяги и Словении, Чюдь и Кривичи, и поиде на Рогъволода»[166]. Пад сценамі Полацка сышліся аселыя на Дзвіне нарманы Рагвалода з прышлымі нарманамі Уладзіміра, полацкія крывічы з ізборскімі і пскоўскімі крывічамі. Уладзімір «оуби Рогъволода, и сына его два, и дъчерь его поя жене»[167]. Першае самастойнае дзяржаўнае ўтварэнне на беларускіх землях спыніла сваё існаванне вельмі трагічным чынам. Аднак зерні самастойнай палітычнай арганізацыі ўжо былі пасеяныя. Перыяд 930–970-х гадоў паказаў, што з племяннога княжання, узначаленага дзейнымі палітычнымі вярхамі, здольнымі праводзіць самастойную палітыку, і размешчанага на важным гандлёвым шляху, можа развіцца самадастатковы палітычны арганізм. Гэта давялі пазнейшыя падзеі.

Пакуль жа, перамогшы Полацк, Уладзімір рушыў далей на поўдзень. Магчыма, падчас гэтага паходу страціла самастойнасць і княства дрыгавічоў са сталіцай у Тураве. Падобна, што за часы кіравання Святаслава, увага якога была скіраваная на паўднёвую частку Дняпроўскага шляху і на Балканы, дрыгавічы таксама вярнулі сабе самастойнасць ад Кіева. Гэта пацвярджаецца паведамленнем летапісу, паводле якога пад тым самым 980 г. у Тураве княжыў яшчэ адзін нарман Туры, «от негоже и Туровци прозвашася»[168]. Ю. В. Канавалаў спрабуе атаясаміць Туры з Тругві, сынам Олафа Альва Гейрстадзіра, братам Рагнвальда Славутага

---

[164] Котлярчук А. *Швэды ў гісторыі і культуры беларусаў*. Менск, 2002. С. 8.

[165] Лаврентьевская летопись. Ст. 76.

[166] Тамсама.

[167] Тамсама.

[168] Тамсама.

(г. зн. Рагвалода) і бацькам славутага нарвежскага караля Олава Тругвасана (Ólófr Tryggvason)[169]. Але як і ў выпадку з Рагвалодам, гэтая цікавая гіпотэза з'яўляецца пабудаванай рачэй на дапушчэннях і здагадках, чым на доказах. Паколькі ніводная крыніца не згадвае ваенных дзеянняў вакол Турава ў той час, можна меркаваць, што Туры без барацьбы саступіў сваю ўладу Уладзіміру.

З падпарадкаваннем Уладзіміру Турава ў цэлай Русі больш не заставалася самастойных нарманскіх князёў. Калі Рагвалод і Туры прайгралі палітычную барацьбу і зніклі з палітычнай арэны, то нашчадкі Рурыка асіміляваліся са славянамі. Мяркуючы па анамастыконе кіеўскіх князёў, ужо Святаслаў быў рачэй славянінам, чым нарманам. Уладзімір ужо цалкам успрыняў славянскую культуру. Заснаваны ім пантэон паганскіх багоў не мае ў сабе нарманскіх запазычанняў[170]. Але мы не можам сказаць, што нарманы растварыліся ў славянска-балцка-фінскім моры. Рачэй мы можам сказаць, што, зрабіўшы свой унёсак у развіццё мясцовай палітычнай арганізацыі, эканомікі і культуры, яны і іх нашчадкі сталі адной з неад'емных складных частак рэгіёну, які і атрымаў назву з нарманскім коранем: Русь.

Пры далейшым развіцці наступлення Уладзімір наблізіўся да Кіева, дзе аблажыў Ярапалка. Паслухаўшы парады набліжаных да сябе людзей, Ярапалк не стаў абараняць горад і перабег у крэпасць Родзень. Там ён быў здрадліва забіты, калі спрабаваў дамовіцца з Уладзімірам аб міры[171]. Уладзімір стаў адзіным валадаром Русі. Але заставалася яшчэ адна прычына для непакою: ягоныя пераможныя варажскія атрады. Гордыя сваім поспехам, яны пачуваліся ў Кіеве гаспадарамі і запрасілі ва Уладзіміра выкуп за горад. Той папрасіў месяц, каб сабраць патрэбную суму. Але і праз месяц нарманы не дачакаліся нічога. Верагодна, што вялікая колькасць астатняга сабранага Уладзімірам войска, якое складалася з крывічоў, чудзі і славен, была занадта вялікай, каб нарманы маглі разлічваць

---

169 Коновалов Ю. В. *Русско-скандинавские связи середины IX – середины XI вв.* С. 50–51.

170 Лаврентьевская летопись. Ст. 79.

171 Тамсама. Ст. 76–78.

на поспех у адкрытым сутыкненні. Таму ім нічога не заставалася, апроч як горка сказаць князю: «сольстилъ еси нами» ды папрасіць указаць ім шлях у Візантыю[172]. Найбольш выдатных з іх Уладзімір пакінуў у сябе на службе, іншых жа накіраваў у Візантыю, папярэдзіўшы пры гэтым імператара: «семо не пущай ни единого»[173].

Калі ветразі нарманскіх лоддзяў прапалі з вачэй кіяўлян, знікла яшчэ адна з прыкмет нарманскага перыяду гісторыі: нарманскія дружыны. Вядома, нарманскія кантынгенты і надалей бралі чынны ўдзел у войнах на Русі, але змянілася сама прырода іхняй прысутнасці. Нарманскія дружыннікі ужо не маглі навязваць сваю волю князю як першаму з роўных. Яны не маглі падштурхоўваць яго да рабаўніцкіх паходаў у інтарэсах дружыны, але насуперак інтарэсам дзяржавы. Усё, што ім дасталося, – служыць ураднікамі ці наймітамі, паважанымі і ўплывовымі, але несамастойнымі. Князь Уладзімір, ужо больш гаспадар, чым вікінг, надзвычай сімвалічным жэстам адпусціў іншых вікінгаў у Візантыю, у ваенныя планы якой яны ўпісваліся нашмат лепей, чым у дзяржаўную структуру Русі.

Новы час нёс новыя ўмовы, і нарманы ўжо не мелі ранейшай прасторы для дзейнасці на Русі. Зрэшты, іх патрэба ў заморскай экспансіі моцна знізілася. У другой палове X ст. у Даніі, Швецыі і Нарвегіі ішоў працэс развіцця і кансалідацыі дзяржаўнай арганізацыі, які вёў да больш устойлівай структуры грамадства. Прага да багацця і славы ўжо не гнала нарманаў так непераадольна на войны і гандаль у чужых, у тым ліку беларускіх землях. Але іх уплыў аказаўся надзвычай трывалым у прамых і ўскосных формах. Ён выяўляўся і выяўляецца пад разнастайнымі напластаваннямі гэтак жа сама, як пад археалагічнымі слаямі многіх вякоў часам знаходзіцца нарманскі меч вытанчанай работы.

---

172 Лаврентьевская летопись. Ст. 78–79.

173 Тамсама. Ст. 79.

# *Раздзел 2.*
# Уплыў вайны на развіццё грамадства

## А) Ваенны фактар у палітычным развіцці грамадства

Разглядаючы ролю вайны ў жыцці грамадства ў нарманскі перыяд, мы найперш мусім звярнуць увагу на тое, якія працэсы былі ў той час вызначальнымі для палітычнага, эканамічнага і духоўнага развіцця грамадства ў розных народаў на беларускіх землях. У палітычных адносінах найважнейшым працэсам было разлажэнне ваеннай дэмакратыі і нараджэнне дзяржавы як новага спосабу ўладкавання грамадства з уладай як галоўным элементам дзяржаўнай структуры. Прычым у гэтым працэсе на ролю найбольш верагоднага носьбіта ўлады прэтэндавала вайсковая знаць: князі з іх дружынамі. Невайсковая земская знаць, чыя сіла засноўвалася на традыцыйным аўтарытэце і асабістых сувязях з супляменнікамі, наадварот, прайгравала барацьбу за ўплыў на грамадства. Раней мы ўжо вызначыліся з тым, што пры ўсёй легендарнай афарбоўцы будзем лічыць сімвалічным момантам выдзялення ўлады як асобнай з'явы, адрознай ад ранейшых метадаў кіравання, уласцівых ваеннай дэмакратыі, закліканне крывічамі, славенамі і чуддзю Рурыка і яго дружыны на кіраванне ў 862 г. Цяпер мы мусім даць больш разгорнутыя тлумачэнні аб тым, чаму выдзяленне ўлады мы звязваем менавіта з нарманамі і што дало ім перавагу перад мясцовай дружыннай знаццю, чаму можам пачынаць адлік дзяржаўнасці на беларускіх землях з гэтай даты і якую ролю ў гэтых падзеях адыгрываў ваенны чыннік гістарычнага працэсу.

Нам нашмат лягчэй будзе адказаць на гэтае пытанне, калі мы яшчэ раз зірнем на самую сутнасць улады і фун-

кцыі, якія яна выконвае спрадвечна і выконвала ў той час. Асноўнымі функцыямі ўлады былі абарона грамадства ад знешняй пагрозы і падтрыманне ўнутранага парадку. У абодвух выпадках улада непазбежна сустракалася з нейкім супрацівам сваім намерам звонку ці знутры і мусіла яго пераадольваць. Такім чынам, сама сутнасць уладнага працэсу, як і вайны, заключалася амаль у славутым клаўзевіцаўскім «прымусіць непрыяцеля выканаць нашу волю», з той толькі розніцай, што пры забеспячэнні ўнутранага парадку прымус накіроўваўся не на знешняга непрыяцеля, а на ўнутраныя грамадска небяспечныя ці проста дысідэнцкія элементы. Барацьба з апошнімі вынікала з таго, што, як і любы іншы інстытут, улада не абмяжоўвалася выкананнем грамадска карысных функцый, а набывала пэўную самадастатковасць і прадпрымала многія дзеянні дзеля захавання і развіцця сябе самой, хаця гэта часта ішло насуперак інтарэсам грамадства.

Побач з падобнай сутнасцю ўладнага працэсу, уладу з вайной радніла яшчэ і падабенства сродкаў дасягнення мэты. Неабходнасць пераадольваць знешняе ці ўнутранае супраціўленне рабіла асноўным незаменным і неабходным элементам улады магутнасць, што засноўвалася на моцы, якую забяспечыць магла толькі збройная сіла. Збройная сіла выкарыстоўвалася, каб адбіць варожы напад ці ў сваю чаргу напасці на суседнія народы і краіны, а таксама каб змусіць да падпарадкавання тых сяброў грамадства, дзеянні якіх уяўляюць сабой патэнцыйную небяспеку для іншых ці сваёй нязгодай выяўляюць пагрозу для існавання ўлады.

Зважаючы на гэта, цалкам зразумела, чаму зародкам дзяржаўнай улады стаў прафесійны вайсковы слой племяннога грамадства: дружына з князем. Дружына валодала збройнай сілай, якая забяспечвала магутнасць і магла прымусіць выканаць сваю волю. У гэтай пазіцыі дружыны быў толькі адзін слабы бок — той, чыя ўлада будавалася на збройнай сіле, непазбежна губляў яе на карысць таго, хто валодаў большай збройнай сілай і мог лепей выконваць вышэйзгаданыя функцыі. Для славянскіх, балцкіх і фіна-угорскіх дружын такім пагрозлівым канкурэнтам сталі нарманы.

Нарманы, якія ўжо ў VIII ст. увайшлі ў кантакт са славенамі і чуддзю, а ў IX ст. з крывічамі і іншымі славянскімі, а таксама балцкімі плямёнамі, прынеслі з сабой вялікую перавагу ў ваеннай справе. Яны мелі лепшае ўзбраенне, карысталіся эфектыўнейшай тактыкай бою і ў індывідуальнай баявой вывучцы значна пераўзыходзілі славян, балтаў і фіна-ўграў. А іх досвед сутыкненняў з войскамі англійскіх і ірландскіх каралеўстваў, імперыі Каралінгаў і розных арабскіх дзяржаў быў проста непараўнальным у адносінах да мясцовых славянскіх, балцкіх і фіна-угорскіх дружын. Такі патэнцыял даваў нарманам цудоўную магчымасць узяць на сябе ўладныя функцыі сярод плямёнаў паміж Балтыкай і Чорным морам.

Але, як мы памятаем, першыя спробы нарманаў падпарадкаваць сабе мясцовыя плямёны скончыліся паражэннем, ці, дакладней кажучы, паражэннямі, бо працэс гэты быў хаатычным і нескаардынаваным. Ён таксама не значыў фіяска нарманскага ваеннага майстэрства. Прайграным было сутыкненне рэсурсаў, а не ваенных тэхналогій. Якім бы ўмельствам і выдатнай зброяй ні валодалі прыхадні з Поўначы, але пры абмежаванай колькасці яны былі няздольныя даць рады многім тысячам ваяроў з розных плямёнаў і многім тысячам кіламетраў тэрыторый з неспрыяльным кліматам. Утрымліваць бясконцыя абшары з варожым насельніцтвам, якое на стадыі ваеннай дэмакратыі было поўнасцю ўзброеным, было фізічна немагчыма. Тым не менш, паражэнне было паражэннем.

Не адужаўшы падпарадкаваць грамадскую сістэму славян, балтаў і фіна-ўграў, нарманы з вялікай для сябе (і, як убачым, для самой сістэмы) выгадай у гэтую сістэму ўпісаліся, на запрашэнне крывічоў, славен і чудзі камфортна заняўшы нішу вайскова-дружыннай знаці. Не зламаўшы мясцовую традыцыю, яны здолелі значна яе ўзбагаціць і ўзмацніць. На лёзах сваіх мячоў і умбонах шчытоў нарманы неслі магутнасць, якая зрабіла іх уладай.

Але чаму нам варта лічыць за пачатак улады і дзяржаўнасці менавіта прыход нарманаў? Здавалася б, тыя самыя працэсы адбываліся і раней. Мясцовыя князі са сваімі дружынамі ў барацьбе з невайсковай знаццю ўпэўнена крочылі ад проста важкага ўплыву ў плямёнах да ўлады

як такой. Чаму ж тады менавіта з'яўленне Рурыка адзначыла нейкі якасны скачок у развіцці грамадства? Адказ на гэтае пытанне дапамагае даць погляд на яшчэ адну неад'емную частку феномена ўлады: аддзеленасць ад асноўнай масы насельніцтва. Пэўная, хаця і не абсалютная аддзеленасць улады з'яўляецца неадменнай умовай яе існавання, бо прадастаўляе магчымасць для ўжывання знешняга прымусу як важнейшага метаду кіравання і забяспечвае дастатковую незаангажаванасць у інтарэсы розных грамадскіх груповак, каб эфектыўна ажыццяўляць падтрыманне ўнутранага парадку. Вядома, і свая дружына, якая выйшла з нетраў самога славянскага ці балцкага племені, пачынала заўважна адасабляцца ад рэшты абшчыннікаў. Гэтаму спрыялі і нашмат цяснейшыя ўнутраныя сувязі паміж дружыннікамі, чым тыя, што лучылі іх з астатнім племенем, і своеасаблівая карпаратыўная культура, і фізічнае адасабленне на ўмацаваных гарадзішчах. Але якасны скачок адбыўся тады, калі нарманы прынеслі з сабой два ключавыя элементы адасаблення: тэрытарыяльны характар і надэтнічнасць. Нездарма сам тэрмін «русь», які абазначаў нарманскіх дружыннікаў, ужываўся найперш у сацыяльным сэнсе, а не этнічным. Гэта таксама служыла важкай гарантыяй больш непрадузятага выканання нарманамі ўнутраных функцый улады[174]. У дадатак заўважым, што такая надэтнічнасць улады і існаванне пануючага слою, значную частку якога складалі выхадцы з іншых этнічных груп, былі не выключэннем, а агульнапрынятай справай у розныя часы ў многіх народаў.

Таму пры ўсёй умоўнасці летапісных звестак аб закліканні Рурыка і ўмоўнасці самой даты — 862 г., мы можам лічыць яе сімвалічным пачаткам дзяржаўнасці на беларускіх землях, а дакладней на той іх частцы, якая падпарадкоўвалася Рурыку. Той жа ананімны «муж», які быў накіраваны дацкім конунгам у Полацк, каб кіраваць княжаннем полацкіх крывічоў, можа лічыцца першым урадоўцам нашай гісторыі.

---

174 Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков.* С. 71—73.

Яшчэ адным цікавым момантам ваеннай і палітычнай гісторыі таго часу з'яўляецца пытанне аб самім механізме запрашэння Рурыка з дружынай і ягонага ўладкавання ва ўладзе. Зразумела, што гэты працэс мусіў сутыкнуцца з вялікімі цяжкасцямі, хаця б па той прычыне, што ніколі ў сусветнай гісторыі не існавала недахопу жадаючых захапіць уладу ў свае рукі. Тым больш, што такі прыхадзень з-за мора, як Рурык, з'явіўся ў месцы, дзе ўжо існавала свая сацыяльная іерархія. Не быўшы ў яе заангажаваным, ён меў лепшы патэнцыял, каб стаць бесстароннім суддзёй і правіцелем, але нашмат менш козыраў у барацьбе з мясцовымі прэтэндэнтамі на гэтую пазіцыю. У такім выпадку, кім жа ён быў запрошаны і якім чынам выйшаў пераможцам у змаганні з мясцовымі канкурэнтамі?

Выдатны расійскі гісторык І. Я. Фраянаў вырашае гэтае пытанне наступным чынам. Паводле ягонай думкі, Рурык быў запрошаны наўгародскімі славенамі для акзання ваеннай дапамогі ў барацьбе за панаванне ў славенскім племянным саюзе і над суседнімі саюзамі крывічоў і чудзі. Верагодна, яму спадарожнічаў поспех і ён вырашыў развіць яго захопам улады над сваімі, так бы мовіць, працадаўцамі. У ходзе перавароту Рурык перанішчыў наўгародскіх князёў і шмат знаці[175]. Рэшта славен прызнала Рурыка сваім законным князем, бо мысленне тых часоў прызнавала легітымнае права на ўладу за тым, хто здабыў яго, нанёсшы паражэнне сваім праціўнікам, і такім чынам карыстаўся ласкай вышэйшых сіл[176].

Са многімі з гэтых меркаванняў можна пагадзіцца. Цалкам магчыма, што Рурык сапраўды быў запрошаны як найміт для правядзення пэўнай ваеннай аперацыі, і гэтак жа магчыма, што пасля гэтага ён звярнуў свой погляд на магчымасць захопу ўлады. Але да гэтага моманту Рурык даўно не быў навіцыем у палітыцы. Ён мусіў разумець, што нават захапіўшы ўладу над славенамі, крывічамі і чуддзю, ён не здолеў бы яе ўтрымаць па тых самых прычынах, па якіх яе не ўтрымаў няшчасны Хвітсэрк і

[175] Фроянов И. Я. *Исторические реалии в летописном сказании о призвании варягов* // Вопросы истории. Москва, 1991. № 6. С. 10–11.
[176] Тамсама. С. 11–15.

іншыя нарманы, якія пацярпелі няўдачу ў заваёўніцкіх планах. Рурык меў шанцы на поспех толькі ў выпадку значнай унутранай падтрымкі. І тут мы мусім зрабіць удакладненне. Звычайна славенскае (ладажскае ці наўгародскае) грамадства разглядаецца як адзінае цэлае. Між тым яно было падзеленае на розныя групоўкі, інтарэсы якіх маглі прама супярэчыць адны другім. Князь і дружына супрацьстаялі старой невайсковай знаці. Нягледзячы на паступовае паслабленне апошняй, абедзве групоўкі карысталіся значным уплывам і мелі шырокія сувязі сярод славенскага люду. У атмасферы нязгоды Рурык і мог знайсці сабе хаўруснікаў.

Для таго, каб знайсці групы, што сімпатызавалі прадпрымальнаму дану, паспрабуем вызначыць, ад каго ж зыходзіла ініцыятыва запрашэння. Вядома, гэта не мог быць мясцовы князь з дружынай. Для яго запрашэнне чужынца для вядзення вайны значыла прызнанне ўласнай слабасці і няздольнасці выконваць свае абавязкі па абароне бяспекі саюзу плямёнаў. Да таго ж нарманскія найміты былі прамымі канкурэнтамі яго і ягонай дружыны адносна здабычы і славы. Таму, як здаецца, адзінай крыніцай запрашэння нарманаў магла быць невайсковая родавая знаць, вядомая як «нарочитая чадь» ці «старцы градские»[177]. Вось гэтыя старцы, трацячы свае пазіцыі ва ўнутраным супрацьстаянні з князем і дружынай, маглі звярнуцца да Рурыка па ваенную дапамогу, пры гэтым разглядаючы яго як магчымую альтэрнатыву мясцоваму князю. Яны, верагодна, і дапамаглі конунгу арганізаваць пераварот па паспяховым сканчэнні баявых дзеянняў.

Натуральна, пераварот выклікаў супраціўленне, якое Рурыкам было жорстка падаўлена. Пра гэта сведчаць запісы Ніканаўскага летапісу аб забойстве Рурыкам Вадзіма Харобрага пад 864 г. і аб уцёках наўгародскіх мужоў ад Рурыка ў Кіеў пад 867 г.[178] І. Я. Фраянаў фактычна аб'ядноўвае гэтыя падзеі як часткі аднаго працэсу. Усе наўгародскія групоўкі ізноў паказваюцца як аб'яднаныя суп-

---

177 Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков*. С. 95.

178 Никоновская летопись. С. 9.

рацьстаяннем Рурыку, а дарадцамі Вадзіма з'яўляюцца наўгародскія старэйшыны[179]. Між тым летапісец недарэмна адрознівае гэтыя падзеі. Невыпадкова свой першы ўдар Рурык нанёс па Вадзіму, які быў, мяркуючы па ягонай мянушцы, прадстаўніком вайскова-дружыннай знаці, а значыць прамым канкурэнтам нармана на адпаведнае месца ў грамадскай іерархіі. У такой сітуацыі наўгародскіх старэйшын з Вадзімам падзяляла лінія старога спаборніцтва вайсковай і невайсковай знаці. Таму яны не маглі быць дарадцамі Вадзіма, а хутчэй дапамагалі ягонаму саперніку, якога самі ж прывялі да ўлады.

Але, пазбавіўшыся ад канкурэнта, Рурык не збіраўся спыняцца на паўдарозе і задавальняцца месцам, адведзеным яму старэйшынамі. Імкненне да ўлады вырасла з грамадска карыснага да самадастатковага. Тым больш, што, забіўшы Вадзіма, ён атрымаў ад яго ў спадчыну справу барацьбы з тымі самымі старэйшынамі. Таму наступная хваля рэпрэсій пракацілася па невайсковых вярхах. Наўгародскія мужы, якія ўцякалі ад Рурыка ў Кіеў у 867 г., былі, хутчэй за ўсё, старэйшынамі, іх прыхільнікамі і сваякамі. Рурык застаўся адзіным правіцелем земляў славен, крывічоў і чудзі.

Парадаксальным чынам сцверджанне ва ўладзе ў славен, крывічоў і чудзі моцных і ваяўнічых нарманаў не ўзмацніла пазіцыі княскай улады ні адносна невайсковай знаці, ні адносна паспольства. Якімі б ні былі жорсткасць Рурыка і ягонае свавольства, але існавала пэўная мяжа, якую ён і ягоныя нашчадкі пераходзіць не маглі. Больш за тое, гэтая мяжа звязвала ягоныя самаўладныя памкненні нашмат больш, чым мясцовага князя кшталту Вадзіма. Справа палягала ўсё ў той жа заўсёднай слабасці запрошанага конунга: адсутнасці каранёў і трывалых сувязяў у мясцовым грамадстве. У выпадку сур'ёзнага канфлікту Рурыка з невайсковымі вярхамі тыя маглі разлічваць на моцную падтрымку з боку шматлікай кліентэлы, тады як прышлы нарман мог абапірацца на адну толькі дружыну. Тады перад ім уставалі прывіды цяжкай вайны, якую трэ-

---

[179] Фроянов И. Я. *Исторические реалии в летописном сказании о призвании варягов.* С. 12.

ба было б весці пасярод лясоў і балот у колькаснай меншасці. Гэта вымушала яго ўстрымлівацца ад залішне радыкальных учынкаў і лічыцца з інтарэсамі невайсковай знаці больш, чым з імі патэнцыяльна лічыўся б Вадзім, які ў такім сутыкненні мог бы разлічваць на сваю дружыну і сваю кліентэлу. Нават рэпрэсіі 867 г., верагодна, насілі абмежаваны характар і не знішчылі ўплыў невайсковай арыстакратыі. Палітычная сістэма славен, крывічоў і чудзі набыла характэрны выгляд балансу сіл паміж моцным аўтарытарным правіцелем, які мала звязаны правіламі і традыцыяй і абапіраецца на асабіста адданых яму людзей, і моцнай алігархіяй, якая мае крыніцы свайго ўплыву ў эканамічнай магутнасці і традыцыйным аўтарытэце. Захаванне невайсковай знаццю свайго ўплыву пазней знайшло адлюстраванне ў развіцці вечавых парадкаў у Наўгародскай і Полацкай землях.

Тая ж самая слабасць не давала нарманам ажыццяўляць ціск на паспольства, большы за прадугледжаны звычаем і традыцыямі. У перыяд, які следаваў адразу ж за перыядам ваеннай дэмакратыі, усеагульная ўзброенасць люду была надзейнай абаронай ад несправядлівага прыгнёту з боку ўлады. Фактычна паспольства не дазваляла ўладзе ператварыцца з грамадска карыснага інстытуту ў апарат прымусу і інструмент задавальнення своекарыслівых інтарэсаў. Пераход межаў дазволенага ў адносінах да люду мог стаць для князя і ягонай дружыны фатальным. Крывічы ці славене маглі годна і ўпэўнена сказаць сваім князям тое, што на пачатку XI ст. сказалі аднаму са сваіх конунгаў свеі: «А калі ты не пажадаеш зрабіць тое, чаго мы патрабуем, мы паўстанем супраць цябе і заб'ем цябе... Так раней рабілі нашыя продкі: яны ўтапілі ў багне на Мулатынгу пяцёх конунгаў за тое, што тыя былі такімі ж фанабэрлівымі, як ты»[180]. Мы ведаем і тое, што на поўдзень ад беларускіх земляў драўляне праявілі рэдкую вынаходлівасць і забілі аматара несправядлівых звышпадаткаў Ігара яшчэ больш жахлівым і відовішчным спосабам. Таму нямая пагроза над галавой кожнага нарманскага

[180] Лебедев Г. С. *Эпоха викингов в Северной Европе.* С. 56.

князя была вельмі перакана́ўчай і ўтрымлівала яго ад лішняга свавольства[181].

Сістэма ўлады, якая склалася з прыходам нарманскіх князёў, забяспечыла інтарэсы амаль усіх слаёў тагачаснага грамадства на землях славян, балтаў і фіна-ўграў. У асобе нарманскіх князёў і дружыннікаў грамадства атрымала ўладу, якая коштам свайго высокага ваеннага майстэрства магла эфектыўна выконваць функцыі абароны ад знешніх ворагаў і падтрымання ўнутранага парадку і, адпаведна, карыстацца ваеннай здабычай, прывілеяваным становішчам і іншымі даброцамі сваіх намаганняў. Пры гэтым захаваўся і нават узрос уплыў на грамадскія справы невайсковай знаці і захавалася значная аўтаномія свабодных абшчыннікаў, заснаваная на звычаёвых нормах. Ад запрашэння нарманаў прайгралі толькі некаторыя прадстаўнікі вайскова-дружыннай знаці, такія, як злашчасны Вадзім. Але і многія дружыннікі далучыліся да сваіх нарманскіх калег з тым, каб здабываць сабе славу і багацце пад камандаваннем новых военачальнікаў.

Выразнае афармленне ўлады пацягнула за сабой далейшае развіццё структуры новага палітычнага ўтварэння. У гэтым працэсе выразна праявіліся бакі ўлады, якія былі абумоўленыя яе ваенным паходжаннем. Перш за ўсё варта згадаць задачу падтрымання ўнутранага парадку, якая ўключала шматлікія аспекты: ад спынення міжплемяннай і міжродавай варажнечы да барацьбы з разбоем. Цікава, што актыўную дзейнасць па барацьбе з рабаўнікамі і злачынцамі на землях Русі[182] дацкім конунгам прыпісвае ўсё той жа Саксан Граматык. Так, ён апісвае магутнага ваяра па імені Вісін (Wisin), які захапіў на Русі скалу Анафіял (Anafial) і рабаўніцтвам наводзіў жах на суседнія мясцовасці, але быў забіты доблесным дацкім конунгам Старкадам (Starkad)[183]. Ротэ (Rothe), яшчэ адзін рускі пірат, здолеў тэрарызаваць Данію да такой ступені, што, павод-

---

[181] Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков.* С. 153.

[182] Чарговы анахранізм Саксана пры ўжыванні назвы «Русь».

[183] Saxo Gram. VI. http://sunsite.berkeley.edu/OMACL/DanishHistory/book6.html

ле сцверджання Саксана, яшчэ і ў ягоныя часы (другая палова XII — пачатак XIII стст.) даны звалі любы жорсткі разбой «рабаўніцтвам Ротэ». Аднак і гэтаму пірату не ўдалося пазбегнуць лёсу. Ён загінуў у бітве з дацкім конунгам Боргарам (Borgar), якога на полі бою таксама напаткала смерць. Яшчэ адзін славуты конунг Хальфдан (Halfdan) быў у гэтым баі цяжка паранены[184]. Як і многія іншыя звесткі Саксана, мы не можам успрымаць гэтыя аповеды некрытычна і літаральна, але можам з вялікай доляй упэўненасці меркаваць, што яны з'яўляюць нам аддаленыя водбліскі рэальнай дзейнасці нарманскіх князёў у Полацку, Ладазе, Ноўгарадзе, Кіеве па выкараненні разбойнікаў і ахове бяспекі руху і гандлю.

Інтарэсы забеспячэння ўнутранага парадку і агульнае ўскладненне структуры грамадства зрабілі звычаёвае права недастатковым інструментам кіравання і дапоўнілі будову ўзніклай дзяржавы на славянскіх, балцкіх і фіна-угорскіх землях другім пасля ўлады элементам: пісанымі законамі[185]. Ізноў жа, у іх уводзе ў зварот і падтрыманні асноўную ролю адыгрывалі нарманска-мясцовыя вайскова-дружынныя вярхі. Традыцыйна першай крыніцай права на ўсіх землях, якія тады ўваходзілі ў склад Русі, а значыць і беларускіх, лічыцца «Закон Рускі», згаданы ў дамове Алега з Візантыяй 911 г.[186] Дакладныя звесткі летапісу перагукаюцца з легендарнымі звесткамі Саксана, які згадвае дацкага конунга Фродэ (адрознага ад знаёмага нам заваёўніка Полацка), які пасля перамогі над русамі і гунамі падараваў ім своеасаблівы кодэкс нормаў шлюбнага, крымінальнага і ваеннага права[187].

У вызначэнні тэрытарыяльнага характару ўлады важнейшую ролю адыгралі гандлёвыя шляхі. Галоўным фактарам, які аб'ядноўваў славянскія, балцкія і фіна-угорскія землі паміж Балтыйскім і Чорным морамі, былі Волжска-

---

184 Saxo Gram. VII. http://sunsite.berkeley.edu/OMACL/DanishHistory/book7.html

185 Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков.* С. 154.

186 Тамсама. С. 152–153.

187 Saxo Gram. V. http://sunsite.berkeley.edu/OMACL/DanishHistory/book5II.html

Волхаўскі і Дняпроўскі гандлёвыя шляхі. Гандаль і рабаўніцтва на гэтых шляхах прывялі туды нарманаў і прымусілі іх уступіць у кантакт з мясцовымі жыхарамі[188]. Гэта дало падвойны эфект.

Па-першае, знаходжанне славянскіх, балцкіх і фіна-угорскіх плямёнаў на гандлёвых шляхах значна паскарала іх грамадскае і эканамічнае развіццё дзякуючы ўплыву мабілізуючых знешнепалітычных фактараў, уцягванню ў міжнародны тавараабмен і культурным займенням. Гэткім чынам крывічы, славене, чудзь і паляне сталі лідэрамі ў грамадскім і эканамічным развіцці рэгіёну.

Па-другое, іх узровень развіцця і сістэма шляхоў палегчылі падпарадкаванне гэтых плямён нарманскаму ўплыву. Гэтак жа сама развітая дарожная структура значна палегчыла франкам заваяванне Галіі і паскорыла агульны дзяржаватворчы працэс у Франкскім каралеўстве, а больш развітая эканоміка Карфагена палегчыла заваяванне яго Сцыпіёнам[189]. Ролю такой інфраструктуры на землях Русі выканалі рачныя гандлёвыя шляхі[190]. Ажыццяўляючы ўздоўж іх свой кантроль, новая ўлада мусіла надаць свайму кіраванню тэрытарыяльны характар, адарваны ад родава-племянных каранёў.

Пазней актыўнасць купцоў і ваяроў адбілася вырашальным чынам і на развіцці земляў полацкіх крывічоў і дрыгавічоў. Знаходжанне на іх тэрыторыях такіх важных водных артэрый, як Дзвіна і Прыпяць, абумовіла іх першапачатковае падпарадкаванне ўладзе князёў з дынастыі Рурыкавічаў і ўключэнне ў агульную сістэму гандлю на прасторах паміж Балтыйскім, Чорным і Каспійскім морамі. Але яно ж пры паслабленні ўлады кіеўскіх князёў у другой – трэцяй чвэрцях X ст. дазволіла мясцовай эліце ператварыць эканамічныя даброты гэтых шляхоў у трывалы матэрыяльны падмурак існавання там самастойных княстваў

---

188 Губанов И. Б. *X век на пути к раннему государству (Возникновение Древней Руси – о гипотетическом и очевидном в современном норманизме)* // Скандинавские чтения 2000 года. С. 84–85.

189 Лиддел-Гарт Б. *Стратегия непрямых действий* (Энциклопедия военного искусства). Москва; Санкт-Петербург, 1999. С. 51.

190 Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков.* С. 149–151.

з цэнтрамі ў Полацку і Тураве. Падмурак гэты з рознай ступенню поспеху служыў палачанам і тураўцам апорай у барацьбе з далейшымі спробамі кіеўскіх Рурыкавічаў вярнуць сабе гэтыя землі.

У чытача гэтых радкоў можа з'явіцца ўражанне, што мы надаем ваеннаму фактару гісторыі занадта вялікую вагу, прыпісваем з'яўленне і палітычнае, эканамічнае і культурнае развіццё Русі Рурыкавічаў, Полацкага княства Рагвалода і Тураўскага княства Туры выключна ваенным прычынам і прадстаўляем дружыны нарманскіх і мясцовых ваяроў як адзіную актыўную дзяржаватворчую і эканамічную сілу гэтых працэсаў. Можам запэўніць, што мы не імкнемся спрасціць бязмежна складаную карціну гісторыі і звесці яе палітру выключна да ваенных фарбаў. Мы прызнаем фундаментальнае значэнне іншых рацыянальных і ірацыянальных палітычных, эканамічных, культурных фактараў і іх уплыў на ход падзей і развіццё грамадства. Але сама задума нашага даследавання вядзе нас да вылучэння перш за ўсё тых аспектаў гісторыі, якія звязаныя з вайной. Тым больш, што для таго часу яны сапраўды мелі вялікае значэнне. Сучасныя гісторыкі зводзяць функцыі дзяржавы на Русі ў тыя часы да абароны знешніх межаў, навядзення ўнутранага парадку і кантролю над гандлёвымі шляхамі[191]. Відавочна, што значэнне ваеннай магутнасці і дружын князёў як носьбітаў гэтай магутнасці, для вырашэння гэтых задач немагчыма пераацаніць. Спадзяемся, што нам удалося гэта паказаць.

### Б) Ваенны фактар у эканамічным развіцці грамадства

Уплыў вайны як асобнага феномену на развіццё эканомікі таксама быў значным. Перш за ўсё гэта праявілася ў выкарыстанні вайны як сродку гвалтоўнага ўзбагачэння. У параўнанні з ранейшымі хаатычнымі ўзброенымі сутыкненнямі часоў ваеннай дэмакратыі Русь, як і іншыя варварскія дзяржавы, ужо вяла поўнамаштабныя войны прыбытку. Паходы русі на Візантыю і прыкаспійскія краі-

[191] Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков.* С. 167.

ны ўжо з часоў Аскольда і Дзіра былі буйнымі ваеннымі экспедыцыямі, арганізаванымі з прыцягненнем вялікіх рэсурсаў. Вайна стала своеасаблівай індустрыяй, накіраванай на выпампоўванне матэрыяльных каштоўнасцяў з суседніх краін. Яшчэ раз успомнім, што паход Аскольда і Дзіра на Канстанцінопаль у 860 г. адбыўся на 200 караблях. У паходзе Алега ў 907 г., паводле звестак летапісу, удзельнічала 80 000 ваяроў з варагаў, славен, крывічоў і іншых славянскіх і фіна-угорскіх плямёнаў (2000 караблёў з экіпажамі па 40 чалавек)[192]. Хаця гэтыя дадзеныя, безумоўна, былі перабольшаныя, але вялікія памеры Алегава войска не выклікаюць сумненняў.

У выпадку поспеху такі паход прыносіў вялікую здабычу. Алег першапачаткова запатрабаваў ад візантыйцаў выплаты 12 грыўняў на чалавека, але ў выніку пагадзіўся ўзяць такую суму ў разліку на адзін карабель і асобную выплату на падуладныя яму гарады[193]. Калі зрабіць дапушчальныя папраўкі на немагчымасць мабілізацыі такой колькасці ваяроў у той час і прыняць колькасць войска, неабходнага для паспяховага паходу на Канстанцінопаль, у некалькі тысяч чалавек, то пры колькасці экіпажу аднаго карабля ў 30–40 чалавек колькасць караблёў складзе некалькі сот, г. зн. праўдападобная лічба будзе на парадак ніжэйшай. Але і ў такім выпадку агульная сума атрыманай у Алегавым паходзе кантрыбуцыі складала некалькі тысяч грыўняў. Гэтая сума не ўлічвала майна і грошай, нарабаваных да заключэння мірнай дамовы, вяртаць якія ніхто не збіраўся. Пры заключэнні мірнай дамовы з Ігарам візантыйцы прапанавалі выплаціць яму суму яшчэ большую[194]. Сума, выплачаная візантыйцамі Святаславу за ўварванне ў Балгарыю, склала пятнаццаць кентынарыяў золата[195].

Прывезеныя дадому ўдзельнікамі паходу, гэтыя здабыткі тым ці іншым чынам адбіваліся на развіцці эканомікі на славянскіх, балцкіх і фіна-угорскіх землях. Хаця

---

192 Лаврентьевская летопись. Ст. 30.
193 Тамсама. Ст. 30–31.
194 Тамсама. Ст. 45–46.
195 Leo Diac. IV, 6. С. 37.

здабыча размяркоўвалася паміж усімі ўдзельнікамі паходаў, застаецца мала сумненняў у тым, што больш за ўсё ад заморскіх выпраў выйгравалі князі і іхнія дружыннікі. Перш за ўсё, набытыя каштоўнасці выкарыстоўваліся імі для падтрымання ладу жыцця, адпаведнага іхняму сацыяльнаму статусу. Дружына ўжо з'яўлялася адасобленай ад грамадства прывілеяванай карпарацыяй, але яшчэ была вельмі далёкай ад становішча пануючага класу. Будучы асноўнай уладнай групай, яна яшчэ не набыла крытычнай масы самадастатковасці, каб стаць непадкантрольнай рэшце грамадства. Яе пераважнай сутнасцю было выкананне грамадска карысных функцый, на што давалі сваю выразную ці маўклівую згоду вольныя і спрэс узброеныя абшчыннікі[196]. Натуральна, што грамадства чакала ад дружыны паводзін, вартых яе прывілеяванага становішча. Бясконцыя піры, гасціннасць і ліхая шчодрасць у распараджэнні грашыма падтрымлівалі сацыяльны статус дружыны і былі складнымі часткамі кодэксу паводзін, што данесла да нас скандынаўская паэзія таго часу. У якасці этычнага ідэалу «Гутаркі Высокага», напісаныя ад імя бога Одзіна, прапануюць наступны ўзор паводзін:

Зброю сябрам
і адзенне дары –
тое цешыць іх позірк;
сяброў абдараючы,
сяброўства мацуеш,
калі табе лёс спрыяе[197].

Такі скандынаўскі этас мала адрозніваўся ад этасу, які панаваў сярод поліэтнічных дружын у Полацку, Смаленску ці Кіеве. Мы ўжо бачылі, што дружыннікі Ігара ад зайздрасці да зброі і строяў Свенельдавых дружыннікаў пачуваліся літаральна «нагімі». Іх імкненне паправіць гэтую «неадпаведнасць» было настолькі моцным, што падштурхнула Ігара ў ягоны апошні гібельны паход.

---

196 Фроянов И. Я. *Рабство и данничество.* Санкт-Петербург, 1996. С. 462.

197 Старшая Эдда. *Речи Высокого.* 41 // Западноевропейский эпос. Санкт-Петербург, 2002. С. 27.

І ўсё ж далёка не ўсе грошы і каштоўнасці разыходзіліся па пірах і корчмах. Як сведчаць шматлікія скарбы, заможныя людзі таго часу імкнуліся захаваць хаця б частку сваіх сродкаў у віры падзей. Скарбы сталі адным з водгукаў першаснага накаплення, якое ў далейшым стала адной з прычын маёмаснага расслаення грамадства і асновай эканамічнай магутнасці некаторых яго груп.

У той самы час, як войны спрыялі паступоваму выдзяленню пануючых груп грамадства, яны таксама рыхтавалі зараджэнне эканамічных адносін, на якіх гэтае панаванне ў далейшым грунтавалася. У прыватнасці, ваенны фактар прасочваецца ва ўзнікненні і развіцці сістэмы падаткаў і збораў на карысць улады. Яны розніліся ў даволі шырокім спектры: ад узнагароджання князя і дружыны за выкананне ўскладзеных на іх грамадствам функцый да прымусовага збору матэрыяльных каштоўнасцяў з падпарадкаваных плямёнаў. У першым выпадку гэта часта значыла абарону абшчын ад знешняй пагрозы з дапамогай вайсковай сілы[198], у другім – легітымізаванае той самай вайсковай сілай сістэматычнае рабаўніцтва[199]. Найбольш вядомай нам сістэмай збору падаткаў на Русі таго часу было згаданае Канстанцінам Барвянародным палюддзе, якое заключалася ў паходзе кіеўскага князя з мэтай збору на сваю карысць падаткаў па падуладных яму землях драўлян, дрыгавічоў, крывічоў (відаць, смаленскіх) і северан[200]. Прыналежнасць палюддзя да ліку добраахвотных выплат альбо прымусовых рабаўніцкіх пабораў дыскутуецца даследчыкамі, аднак дзве высновы мы можам зрабіць упэўнена. Па-першае, у абодвух выпадках вялікую ролю як адна з непасрэдных прычын узнікнення інстытуту падаткаў на карысць улады набывае фактар вайсковай сілы. Па-другое, і ў тым, і ў другім выпадку падаткі, выплачаныя ў прымітыўных формах добраахвотнага ўнёску ці кантрыбуцыі, з цягам часу ператвараліся ў рэнту[201], якая склала базу для ўзнікнення рабаўладальніцкіх і феадальных грамадскіх адносін.

---

198 Фроянов И. Я. *Рабство и данничество*. С. 462.
199 Тамсама. С. 502.
200 Const. Porphyr. 9. С. 51.
201 Алексеев Л. В. *Смоленская земля в IX–XIII вв.* С. 101.

І нарэшце, мы мусім яшчэ раз закрануць дваістую ролю вайны ў агульнай сістэме эканамічных кантактаў таго часу. Войны прынеслі смерць многім тысячам людзей, спрычыніліся да разбурэння квітнеючых гарадоў і знішчылі неапісальную колькасць матэрыяльных каштоўнасцяў. Але разам з тым побач з гандлем яны былі адной з асноўных рухаючых сіл усталявання знешнеэканамічных сувязяў. Не менш за гандаль яны заахвочвалі людзей да адкрыцця новых гандлёвых шляхоў, асвойвання новых тэрыторый, абмену дасягненнямі тэхнічнага развіцця і агульнага наладжвання міжцывілізацыйных кантактаў. Карыстаючыся словамі Яхіма Германа, «у гэтыя ж жорсткія стагоддзі першыя гандлёвыя караблі забяспечылі рэгулярны рух патоку тавараў у першыя партовыя гарады, гавані і рынкі, якія ўзнікалі на Балтыцы ў землях розных плямёнаў: яны неслі раскошнае начынне, вопратку і зброю для пануючага класа, які нараджаўся, пабытавыя рэчы, сыравіну і прылады працы для гандлёва-рамеснага насельніцтва раннегарадскіх цэнтраў, вырабы рамеснікаў – для сялян гарадской акругі ці сельскай глыбінкі». «Любая навіна́, якая з'яўлялася ў адным з цэнтраў Балтыкі, хутка станавілася вядомай паўсюль»[202], Гэтыя словы, сказаныя ў дачыненні да блізкай нам Балтыкі, цалкам стасуюцца і да беларускіх земляў.

### В) Уплыў вайны на развіццё духоўнай культуры

Акрамя ўплыву вайны на палітыку і эканоміку мы мусім абавязкова даследаваць ролю ваеннага фактару ў развіцці духоўнай культуры беларускіх земляў. Гэта надзвычай вялікае і складанае пытанне. Паколькі аб'ём і задача нашай працы не дазваляюць нам канцэнтравацца на ім занадта дэталёва, мы пастараемся выбарачна асвятліць найбольш цікавыя для нас аспекты. Мы не будзем падрабязна спыняцца на такіх аб'ектыўных элементах культуры, як рэлігія ці эпас, грунтоўна разабраных у адпаведнай літаратуры. Рачэй мы засяродзімся на ўнёску вайны ў суб'ектыўны бок культуры, якую спавядалі тагачасныя жыхары белару-

[202] Херрман Й. *Славяне и норманны в ранней истории Балтийского региона.* С. 8.

скіх земляў, а менавіта іх погляд на навакольны свет, успрыманне гэтага свету і саміх сябе ў ім. Паколькі мы пагадзіліся з азначэннем вайны як палітычнай з'явы, гаворка будзе ісці не аб уплыве вайны на фармаванне мікракосму асобных людзей, а аб яе ўплыве на іх успрыняцце сябе як часткі палітычнай супольнасці і зваротным уплыве іх поглядаў на свядомае пераўтварэнне гэтай супольнасці.

У якасці эпізоду, які найбольш ярка адлюстроўвае ўплыў вайны на палітычную свядомасць людзей і грамадства, мы возьмем падзеі, звязаныя з першым кароткім перыядам самастойнага існавання Полацкага княства. Ён пачаўся паміж 931 і 945 гг. і скончыўся паміж 973 і 978 гг. узяццем Полацка кіеўскім князем Уладзімірам і забойствам першага вядомага нам полацкага князя Рагвалода. Гэты перыяд цікавіць нас хутчэй не сам па сабе, а як крыніца, з якой пачынаецца плынь многіх наступных падзей. Па-першае, тое адасабленне Полацка ад іншых рускіх земляў, падуладных нашчадкам Рурыка, стала прадвесцем яго самастойнасці ў будучыні. Ужо ў 1001 г. насуперак кіеўскай традыцыі пасля смерці сына Уладзіміра Ізяслава стол у Полацку заняў не іншы Уладзіміраў сын, а нехта з Ізяслававых сыноў: Усяслаў альбо Брачыслаў. У Полацку аднавілася самастойная княская дынастыя, і ён выпаў з палітычнай сістэмы дзяржавы Рурыкавічаў. На ўсім працягу існавання адзінай у палітычных адносінах Русі з цэнтрам у Кіеве ніводная іншая зямля не выйшла з падпарадкавання Кіеву так рана і не захоўвала сваю самастойнасць так выразна. Па-другое, на перыяд княжання Рагвалода і гвалтоўнае яго перапыненне спасылаюцца гісторыкі ад аўтараў «Повести временных лет» да сучасных даследчыкаў дзеля тлумачэння традыцыі самастойнага існавання Полаччыны і каранёў гэтай самастойнасці. Менавіта з тых часоў, як заўважае Лаўрэнцьеўскі варыянт «Повести временных лет» пад 1128 г., «мечь взимають Рогволожи внуци противу Ярославлихъ внуковъ»[203], Нешта падобнае ў розных варыяцыях можна прачытаць і ў сучасных гістарычных даследаваннях.

---

[203] Лаврентьевская летопись. Ст. 301.

Гэта вымушае нас шукаць адказаў на наступнае пытанне: чым было выклікана такое ранняе імкненне Полацка да незалежнасці ад дзяржавы Рурыкавічаў і чаму адлік гэтай самастойнасці большасцю даследчыкаў традыцыйна адносіцца да падзей другой паловы X – пачатку XI стст.?

Натуральна, пры спробе адказаць на гэтае пытанне на першае месца выходзіць ужо вядомая нам такая аб'ектыўная прычына: месцазнаходжанне Полацкай зямлі на Дзвінскім участку Дняпроўскага гандлёвага шляху. Пасля заняпаду гандлю па Волзе асноўная гандлёвая актыўнасць была перанесеная на Дняпроўскі шлях, які звязваў Візантыю і рынкі Блізкага Усходу з Балтыйскім рэгіёнам. Полацк, які кантраляваў найбольш зручны выхад з Дняпра ў Балтыйскае мора па Дзвіне, меў добрыя шанцы нарошчваць сваю палітычную і эканамічную магутнасць за гэты кошт. Таму полацкая палітычная эліта мела важкія прычыны дамагацца самастойнасці ад дзяржавы Рурыкавічаў і досыць сіл, каб справіцца са спробамі Рурыкавічаў гэтай самастойнасці перашкодзіць.

Але спасылка на гандлёвы шлях прапануе толькі частковы адказ на пытанне. Пры ўсёй важнасці гандлю, эканоміка таго часу засноўвалася пераважна на натуральнай сельскай гаспадарцы. У такіх умовах кожная тэрыторыя, якая была ў стане забяспечыць сябе харчам, так ці інакш імкнулася да эканамічнай аўтаркіі і была ў стане падтрымліваць сваю эканамічную адасобленасць і супраціўляцца спробам знешняга падпарадкавання. Таму само існаванне гандлёвага шляху яшчэ не было дастатковым апраўданнем існавання самастойнай дзяржавы.

Нічога не кажуць аб гэтым і летапісцы. Вядома, можна было б прадставіць старажытных летапісцаў адарванымі ад жыцця кніжнымі чарвякамі, якія наіўна і механічна пераносілі на пергамент пераказаныя ім кімсьці падзеі, аддаючы перавагу пералічэнню фактаў на шкоду іх асэнсаванню. Між тым, як нам паказаў аповед аб Святаславе, летапісцы дакладна вызначылі асноўныя прычыны ягонай актыўнай знешняй палітыкі на Балканах і мелі адэкватнае свайму часу ўяўленне аб прычынах рэчаў. Таму, каб зразумець сутнасць падзей на Полаччыне ў другой палове X – пачатку XI стст. словам летапісцаў варта было б давяраць

ніяк не менш, чым уласным спекуляцыям на гэтыя тэмы. Найбольш паказальным у гэтых адносінах з'яўляецца ўжо цытаваны запіс Лаўрэнцьеўскага летапісу пад 1128 г. Ён расказвае пра падзеі, што адбываліся неўзабаве пасля заваявання Уладзімірам Полацка. Звернемся да яго.

Будучы князем у Ноўгарадзе, яшчэ зусім малады Уладзімір з-за падбухторвання свайго дзядзькі Дабрыні пасватаўся да дачкі полацкага князя Рагвалода Рагнеды. Гордая Рагнеда адмовіла яму як «робичичу» з-за нізкага паходжання ягонай маці. Прыйшоўшы ў ярасць, Уладзімір выправіўся на Полацк, узяў яго, забіў Рагвалода і гвалтоўна ўзяў Рагнеду сабе за жонку, даўшы ёй новае імя Гарыславы. Ужо нарадзіўся ў іх сын Ізяслаў, калі Рагнеда задумала забіць Уладзіміра ўначы падчас сну. Але Уладзімір нечакана абудзіўся і адвёў яе руку. Ён загадаў Рагнедзе апрануцца ў тронны ўбор і чакаць ягонай волі. Рагнеда ж дала аголены меч у рукі маломy Ізяславу, які быў гатовы абараніць маці. Убачыўшы гэта, Уладзімір стаў раіцца са сваімі баярамі, якія казалі яму не забіваць жонку і дзіця, але аднавіць іхнюю вотчыну і даць яе ім ва ўладанне. Уладзімір так і зрабіў, заснаваўшы горад Ізяслаўль (Заслаўе). І з таго часу пачалася варожасць паміж Рагвалодавічамі і Уладзіміравым родам[204].

Пры аналізе гэтага кранальнага аповеду звяртае на сябе ўвагу наступная дэталь. Спроба Рагнеды забіць Уладзіміра, які ўжо быў яе законным мужам, у помсту за свайго бацьку і братоў паказвае, што ёй валодала пачуццё далучанасці да свайго роду. Яго гонар і інтарэсы яна ставіла вышэй за жыццё свайго мужа, бацькі сваіх дзяцей. У сваю чаргу малы Ізяслаў, апынуўшыся перад выбарам паміж адданасцю свайму бацьку і абаронай маці, стаў на яе бок. Гэты ўчынак у вачах сведкаў і сучаснікаў таксама мог стаць сімвалічным выбарам прыналежнасці да роду Рагвалода і Рагнеды ў супрацьвагу Уладзіміраву роду Рурыкавічаў. Такім чынам, па прыездзе ў Полацк Ізяслаў успрымаўся мясцовым паспольствам і вярхушкай як законны прадаўжальнік ранейшай дынастыі Рагвалода, нягледзячы на спадкаемства па жаночай лініі. У тыя часы, калі княская

[204] Лаврентьевская летопись. Ст. 299–301.

ўлада вянчала піраміду палітычнай іерархіі грамадства, дзяржава ўвасаблялася ў сімвалічнай і сакралізаванай асобе князя. Аднаўленне легітымнага нашчадка ранейшай дынастыі на полацкім стале значыла і аднаўленне прэтэнзій на самастойнае дзяржаўнае існаванне.

Але і самастойная мясцовая дынастыя была не самым пераканаўчым аргументам на карысць адасобленага існавання Полаччыны. Асоба князя і трывалая дынастычная традыцыя яшчэ не давалі гарантый падтрымкі з боку паспольства. Сакралізацыя княскай улады была двувострай зброяй. Князь мог лічыцца абраннікам вышэйшых сіл і з гэтай прычыны карыстацца найвышэйшым аўтарытэтам свайго народу. Але такое становішча было трывалым толькі пакуль яму спрыялі поспех і ўдача. Няўдачы і паражэнні ўспрымаліся як знак таго, што вышэйшыя сілы звярнулі свой прыхільны позірк на іншы род і іншую асобу. Адпаведна, той, хто перамог і забіў князя, мог лічыцца законным спадкаемцам ягонай улады. У сувязі з гэтым цяжка растлумачыць прыхільнасць палачан да нашчадкаў Рагвалода, беручы пад увагу ягонае паражэнне ад рук Уладзіміра. Хутчэй за ўсё, нечаканую ролю адыграла ўсё тая ж сімвалізацыя асобай князя ўсёй дзяржавы. У такім святле помста Рагнеды за Рагвалода ў рэтраспектыве разглядалася і як помста за гвалтоўнае ўзяцце Полацка, як працяг лаяльнасці свайму княству. Таму і дынастыя, якая праявіла надзвычайную лаяльнасць да сваёй дзяржавы, карысталася надзвычайнай лаяльнасцю з боку паспольства гэтага княства.

Вялікае значэнне меў і сам факт узброенай барацьбы за Полацк, якая суправаджалася гібеллю вояроў і мірных жыхароў. Гэта, несумненна, пакінула трывалы след у калектыўнай і індывідуальнай памяці палачан. Пасля ўзяцця Полацка з вялікім кровапраліццем пытанне самастойнасці выйшла з цалкам рацыянальнага вымярэння мэтазгоднасці існавання асобнага дзяржаўнага ўтварэння, абгрунтаванай палітычнымі ці эканамічнымі прычынамі. Яно набыло рэлігійную афарбоўку справы, аплочанай крывёй супляменнікаў і сваякоў, што само па сабе рабіла наступныя пакаленні спадкаемцамі гэтай справы і накладала на іх абавязкі па яе працягу і абароне. Самас-

тойнасць станавілася неацэнным дарам, самадастатковай каштоўнасцю, якую нельга і не варта было губляць.

Звяртае ўвагу тая акалічнасць, што ніводны з пералічаных фактараў, які надаваў лішнюю вагу справе полацкай самастойнасці, не быў аб'ектыўным. То бок, ён не дадаваў Полацку заўважных аб'ёмаў палітычнай ці эканамічнай магутнасці, якія можна было б узважыць у нейкіх рацыянальных велічынях. Усе гэтыя фактары грунтаваліся на суб'ектыўным успрыманні дзейнымі асобамі сябе і навакольнага асяроддзя: успрыманні палачанамі Рагнеды і Ізяслава як легітымных спадкаемцаў дынастыі Рагвалода, спалучаным з іх уласным успрыманнем сябе ў гэтай якасці; адчуванні палачанамі і Рагвалодавічамі ўзаемнай лаяльнасці, нарэшце, адчуванні важнасці самастойнасці Полаччыны як справы, апраўданай крывёй. Калі аб'ектыўныя фактары сапраўды заклалі палітычныя і эканамічныя падмуркі незалежнасці Полацкай зямлі, суб'ектыўныя фактары стварылі саму *ідэю* гэтай незалежнасці. Яны адаптавалі яе да масавай свядомасці, персаніфікавалі ў асобах князёў Рагвалодавай дынастыі, убралі ў прыгожыя гераічныя шаты барацьбы з драпежным наўгародскім захопнікам, надалі ёй звышнатуральнае рэлігійнае адценне збаўлення крывёй продкаў і падалі яе як вартую змагання і абароны справу.

Паралелі гэтаму эпізоду беларускай гісторыі мы можам знайсці ў гісторыі Нарвегіі. У 1000 г. у бітве пры Свольдзе загінуў нарвежскі кароль Олаф Тругвасан, магчымы сын летапіснага Туры і, адпаведна, пляменнік Рагвалода і стрыечны брат Рагнеды. У 1030 г. бітва пры Стыкластадзіры скончылася паражэннем і смерцю для караля Олафа Святога. Імёны абодвух каралёў звязваюцца з барацьбой за аб'яднаную самастойную Нарвегію. Іх палітыка ў абодвух выпадках пацярпела няўдачу, а значная частка нарвежскага паспольства змагалася супраць іх у фатальных для іх бітвах (успомнім, што ў барацьбе Рагвалода з Уладзімірам з абодвух бакоў змагаліся нарманы і крывічы). Але менавіта іхнія імёны і іхняя праграма сталі сцягам прыхільнікаў аб'яднанай самастойнай Нарвегіі ў будучыні.

Ваенны канфлікт вакол Полацка дапоўніў пазітыўную ідэю полацкай самастойнасці негатыўным вымярэннем.

Ваенныя дзеянні падштурхоўвалі палачан да ўсведамлення сябе ў навакольным свеце не толькі як station... 

*Раздзел 3.*

# Ваеннае майстэрства нарманаў, славян і балтаў у 820–я – 970–я гг.

## А) Вайсковая арганізацыя

У выніку бесперапыннага цячэння гістарычнага працэсу вайсковая арганізацыя народаў, якія жылі на беларускіх землях, уяўляла сабой далейшае развіццё ранейшых формаў. Як і раней, у славян і балтаў мы можам вылучыць два яе асноўныя складнікі: народнае апалчэнне і княскую дружыну. Засноўваючыся на ўсеагульным узбраенні народу, апалчэнне складалася з дарослых мужчын, здольных трымаць у руках зброю і выступаць у ваенныя выправы. Княская ж дружына ўключала асабіста звязаных з князем, адданых яму людзей, якія адасобіліся ад рэшты грамадства і пачалі вылучацца ў слой прафесійных ваяроў.

Пры захаванні ранейшых формаў адбывалася якаснае эвалюцыйнае змяненне іх сутнасці і ролі на вайне. Князь усё менш і менш выглядаў як ліхі правадыр на чале дружыны такіх самых зухаў, у залежнасці ад абставін здольных выкарыстаць сілу дзеля абароны свайго племені, змагання з невайсковай земскай знаццю ці рабаўніцкага паходу на чужынцаў. З утварэннем дзяржавы князь стаў асноўным прадстаўніком улады, выразнікам палітычнай волі народу і цэнтрам прыняцця рашэнняў у дачыненні вайны і міру. Ён не быў ні тыранам, ні самаўладным манархам. У вялікай ступені ён залежаў ад народу і нават ад сваёй дружыны. Тым не менш, найбольшая ініцыятыва ў дачыненні да знешняй палітыкі, абвяшчэння і вядзення вайны належала яму. Адпаведна, і ягоная дружына са звязанага асабістымі сувязямі з князем хаўруса ператваралася ў грамадскі інстытут. У ваенных адносінах яна трансфармавалася з непастаяннай узброенай групы, якая пераследавала пераважна ўласныя мэты, у сталую вайсковую сілу, закліканую на абарону інтарэсаў грамадства ў цэлым. Яна станавілася найбольш баяздольнай часткай

узброеных сіл грамадства і ядром, вакол якога яны гуртаваліся. У сваю чаргу, народнае апалчэнне ўжо не было хаатычнай сілай, якая збіралася нерэгулярна ў адказ на знешнюю пагрозу ці дзеля рабаўніцкага паходу. Цяпер апалчэнне збіралася на заклік князя, калі той меўся распачаць абарончую ці захопніцкую вайну, «совкупивъ вои многи», і займала дакладна вызначанае месца ў ваенных планах, распрацаваных палітычнай элітай. Калі ваенная дэмакратыя перарасла ў дзяржаўны лад, узброеныя сутыкненні сталі вайной, а нерэгулярныя ўзброеныя фармаванні нарэшце сталі войскам. Разгледзім ягоную арганізацыю.

На беларускіх землях, якія ўваходзілі ў склад дзяржавы Рурыкавічаў з цэнтрам у Ладазе ці Ноўгарадзе, а затым у Кіеве, а таксама ў самастойным Полацкім княстве на вяршыні ўсёй вайсковай арганізацыі грамадства знаходзіўся кіраўнік дзяржавы – князь. Супольна з дружынай, а магчыма, і земскай знаццю, ён вырашаў пытанні вайны і міру, вызначаў ваенную палітыку дзяржавы, ініцыяваў збор войска на вайну, вызначаў стратэгію дзеянняў і ў большасці выпадкаў сам ажыццяўляў тактычнае кіраванне войскам і ўдзельнічаў у баях. Менавіта ў такой ролі мы бачым Рурыка, Аскольда, Дзіра, Алега, Ігара, Святаслава, Рагвалода і Уладзіміра. Калі таго патрабавала мэтазгоднасць, князь мог перадаць камандаванне цэлым войскам ці яго часткай аднаму са сваіх набліжаных. Як піша Ібн Фадлан, «у яго ёсць намеснік, які кіруе войскамі і нападае на ворагаў і замяшчае яго ў яго падданых»[205].

Найважнейшай часткай войска, яго арганізацыйным цэнтрам была дружына, якая гуртавалася вакол князя. Князь і ягоныя дружыннікі былі сябрамі, таварышамі, братамі па зброі і знаходзіліся ў найшчыльнейшай асабістай сувязі. Яны жылі побач і большую частку свайго часу бавілі разам у вайне, зборы данін, паляванні і пірах. Князь клапаціўся аб сваіх дружынніках, забяспечваючы іх за кошт прамых жалаванняў ці надаючы ім права на збор данін з падуладных плямёнаў[206]. Такія адносіны выходзілі за межы

[205] Путешествие Ибн Фадлана на Волгу. С. 85.

[206] Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки социально-политической истории* // Фроянов И. Я. Начала русской истории. Избранное. Москва, 2001. С. 552.

чыстай эканамічнай залежнасці дружыннікаў ад князя і набывалі ў значнай меры духоўны характар. Сумесныя трапезы прымалі сакральную афарбоўку ў адпаведнасці са старадаўнімі ўяўленнямі і накладалі на сутрапезнікаў свяшчэнныя вузы і абавязкі сяброўства ў адносінах адзін да аднаго. Перадача князем матэрыяльных каштоўнасцяў дружыннікам гэтак жа сама мела сакральны характар, робячы князя дабрадзеем і патрабуючы ад дружыннікаў адплаты. Адплата гэтая ізноў насіла неэканамічны і нематэрыяльны характар і мела выгляд абавязку абараняць князя і ягоныя інтарэсы цаной хай сабе і ўласнага жыцця[207]. У выніку князь і дружына ўтваралі прафесійную групу ваяроў, звязаную карпаратыўным духам і асабістай аддансцю. Князь быў бясспрэчным лідэрам, але займаў становішча першага з роўных і мусіў прыслухоўвацца да голасу дружыннікаў пры вырашэнні ўсіх пытанняў[208]. Мы памятаем, якое значэнне надаваў меркаванням сваіх набліжаных Ігар, калі вырашыў задаволіцца выкупам ад візантыйцаў у 944 г. і з патрабавання дружыны выправіўся ў фатальны паход на драўлян у 945 г. Фактычна, у дадзены перыяд дружына як вайсковая сіла была асновай княскай улады і найважнейшым інстытутам дзяржаўнасці.

Пры гэтым дружына не была аднароднай. Яна выразна падзялялася на старэйшую і малодшую. У аснове гэтага падзелу былі як эканамічныя, так і асабістыя дачыненні дружыннікаў да князя[209]. Старэйшую, лепшую ці большую дружыну складалі княскія баяры ці лепшыя мужы. Гэта былі заможныя і ўплывовыя людзі, якія па ўзроўні свайго дабрабыту і палітычнага аўтарытэту маглі спаборнічаць з самім князем. У ваенным сэнсе яны былі не проста княскімі ваярамі, але стаялі на чале сваіх уласных дружын, якія ўліваліся кантынгентамі ў дружыну княскую. Іх вайсковая сіла была настолькі значнай, што ў прамежках паміж войнамі, якія вяла цэлая Русь, яны маглі прадпрымаць самастойныя ваенна-рабаўніцкія акцыі, як,

---

[207] Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков.* С. 116–122.

[208] Тамсама. С. 112–115.

[209] Довженок В. Й. *Військова справа в Київській Руси. Наук.-попул. нарис.* Київ, 1950. С. 17.

напрыклад, паходы на Каспійскае мора. Найяскравейшым прыкладам уплывовага старэйшага княскага дружынніка для нас можа быць Свенельд, найбліжэйшы паплечнік аж трох кіеўскіх князёў: Ігара, Святаслава і Яраполка. Менавіта багацце ягоных дружыннікаў, здабытае ў паходзе на Бердаа, запаліла лютую зайздрасць у вачах Ігаравай дружыны, прымусіўшы таго рушыць на драўлян[210], што вельмі наглядна сведчыць пра ступень Свенельдавага аўтарытэту і заможнасці. Менавіта гэты дружынны слой жалаваў князь правам збору данін з падуладных тэрыторый, робячы баяр сваімі васаламі[211]. Той самы Ігар у свой час аддаў Свенельду права збору данін з драўлян і улічаў[212]. Здавалася б, такі васалітэт гаворыць аб пэўнай эканамічнай залежнасці старэйшай дружыны ад князя. У той жа час залежнасць гэтая была ўзаемнай. Князі, каб захаваць адданасць старэйшых дружыннікаў, не мелі іншага выбару, апрача перадачы ім прыбыткаў з некаторых тэрыторый. Патэнцыйная страта іхняй лаяльнасці ў вырашальны момант магла каштаваць князю вельмі дорага.

На вайне роля старэйшых дружыннікаў не абмяжоўвалася асабістай службай і кіраўніцтвам уласнымі вайсковымі кантынгентамі. Яны таксама выконвалі ролю вышэйшых камандзіраў, кіравалі асобнымі атрадамі войска і выконвалі самастойныя стратэгічныя і тактычныя задачы. Хтосьці з іх мог атрымліваць згаданую Ібн Фадланам пасаду намесніка. Свенельд меў тытул ваяводы і быў аднаасобным камандуючым у кампаніях супраць драўлян і улічаў[213]. Военачальнік кіеўскага князя HLGW кіраваў кампаніяй супраць хазар у Крыме[214]. Военачальнік Сфенкел узначальваў абарону Прэславы ад візантыйскага войска[215].

Побач з баярамі і лепшымі мужамі ў складзе дружыны фіксуецца грыдзьба, ці княжыя мужы. Згодна з некаторымі даследчыкамі, яны складалі сярэдні прамежкавы слой

---

[210] Никоновская летопись. С. 26–27.

[211] Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки социально-политической истории.* С. 558–562.

[212] Лаврентьевская летопись. Ст. 54.

[213] Никоновская летопись. С. 26.

[214] Голб Н., Прицак О. *Хазарско-еврейские документы X века.* С. 141–142.

[215] Leo Diac. VIII, 5–7. С. 71–72.

дружыны і выконвалі толькі ваенныя функцыі ў адрозненне ад старэйшых дружыннікаў, якія прыцягваліся і да выканання функцый адміністрацыйных[216].

Малодшая дружына складала непасрэдна княскі атрад, ваявала пад яго прамым кіраўніцтвам і кармілася з ягонай ласкі. Малодшая дружына дзялілася на дзецкіх і отракаў. Розніца паміж імі выяўлялася ў іх сацыяльным статусе і функцыях, якія яны выконвалі. Отракі, магчыма, паходзілі з рабоў ці ваеннапалонных і ў дадатак да ваенных абавязкаў у мірным жыцці з'яўляліся простымі слугамі[217]. Дзецкія былі асабіста вольнымі людзьмі і займаліся выключна ваеннай справай[218]. Паводле становішча дзецкіх можна параўнаць з заходнееўрапейскімі збраяносцамі[219].

Цікава паразважаць над этнічным складам дружыны. Паколькі акрамя отракаў дружына складалася з вольных людзей і камплектавалася добраахвотным чынам, яна мусіла быць больш ці менш адэкватным зрэзам усяго падуладнага князю грамадства, якое складалася са шматлікіх разнамоўных плямёнаў. Алегава войска ў паходзе на Канстанцінопаль складалася з варагаў, славен, крывічоў, меры, драўлян, радзімічаў, палян, северан, вяцічаў, харватаў, дулебаў і ціверцаў[220]. У Ігаравым войску мы бачым варагаў-русь, палян, славен, крывічоў і ціверцаў[221]. Не будзе недакладным зрабіць выснову, што ў гэты час дружына кіеўскага князя таксама складалася з нарманаў, славян (у тым ліку крывічоў і радзімічаў) і фіна-ўграў. Магчыма, прысутнічалі ў ёй і балты з беларускіх земляў, якія жылі побач з тымі самымі крывічамі і радзімічамі, але былі менш заўважнымі за чудзь і меру з-за адноснай малалікасці. Прынамсі, калі згаданы ў дамове Ігара з візантыйцамі Яцвяг Гунараў[222] не быў вандроўным шукальнікам прыгод, які

---

[216] Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков.* С. 108.

[217] Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки социально-политической истории.* С. 567–569.

[218] Тамсама. С. 569–570.

[219] Данилевский И. Н. *Древняя Русь глазами современников и потомков.* С. 108.

[220] Лаврентьевская летопись. Ст. 29.

[221] Тамсама. Ст. 45.

[222] Тамсама. Ст. 47.

прыбіўся да кіеўскай дружыны, ягонае з'яўленне можа сведчыць пра падпарадкаванне некаторых балцкіх земляў Кіеву і наяўнасць балцкіх вайсковых кантынгентаў у рускім войску. Можна таксама адзначыць непрапарцыйна вялікую колькасць нарманаў у складзе дружыны, што тлумачыцца разабраным намі вышэй фактам заняцця нарвежцамі, данамі і шведамі дружыннай нішы ў тагачасным грамадстве і іх выключнай роляй у дзяржаватворчым працэсе на Русі. Можна меркаваць, што ў IX – пачатку X ст. яны нават складалі пераважную большасць дружыннікаў, што пацвярджаецца выключна скандынаўскімі імёнамі паслоў Алега да візантыйцаў у 911 г.[223] Аднак ужо дамова Ігара 944 г. утрымлівае славянскія імёны, што паказвае на ўзрастанне ролі этнічных славян ці асіміляцыю нарманаў[224].

Зыходзячы з такіх меркаванняў, мы можам зрабіць выснову, што і дружына полацкіх князёў уключала прадстаўнікоў падуладных ім народаў. Значнай часткай яна складалася з нарманаў аднаго з князем паходжання; уключала таксама полацкіх крывічоў і мясцовых балтаў.

Прыблізныя звесткі маюцца наконт колькасці княскай дружыны. Як паведамляе Ібн Фадлан, «да парадкаў (звычаяў) цара русаў адносіцца тое, што разам з ім у яго замку (палацы) знаходзяцца чатырыста мужоў з (ліку) асілкаў, ягоных паплечнікаў, надзейныя людзі (што знаходзяцца) ў яго з іх (ліку) паміраюць пры ягонай смерці і бываюць забітыя, змагаючыся за яго»[225]. Пад царом русаў у дадзеным выпадку, хутчэй за ўсё, разумеецца кіеўскі князь. Памятаючы, што гэтая колькасць верагодна ўлічвае толькі малодшую дружыну, якая жыла разам з князем ці побач, мы можам далучыць да яе яшчэ і вайсковыя кантынгенты старэйшых дружыннікаў і атрымаць агульную колькасць дружыннікаў звыш за 500 чалавек. Каля 200–500 чалавек магла агулам налічваць і дружына полацкага князя. Наўрад ці яна пераважала лікам кіеўскую дружыну, уважаючы нашмат меншыя памеры падуладнай полацкаму князю тэрыторыі, але не магла быць і намнога меншай, бо ў такім выпадку страчвала б сваё значэнне як баявая адзінка.

---

223 Лаврентьевская летопись. Ст. 33.
224 Тамсама. Ст. 46–47.
225 Путешествие Ибн Фадлана на Волгу. С. 84.

Пры ўсёй важнасці дружыны асноўны цяжар вядзення вайны прыпадаў на вояў ці народнае апалчэнне падуладных князю плямёнаў. Апалчэнне было далейшым этапам развіцця захаванай з часоў ваеннай дэмакратыі традыцыі ўсеагульнага ўзбраення народу. Паколькі праз стадыю ваеннай дэмакратыі праходзілі і славянскія, і балцкія, і фіна-угорскія плямёны, то ўсе яны збіралі пад камандаванне сваіх князёў апалчэнні з асабіста вольных абшчыннікаў[226]. Тое самае можна сказаць і пра самастойнае Полацкае княства. Выключэннем былі толькі нарманы, якія складалі досыць малую частку насельніцтва Балтыйска-Чарнаморскага міжмор'я і займалі ў асноўным нішу вайскова-дружыннага слою, пакідаючы ўдзел у апалчэнні прадстаўнікам славянскага, балцкага і фіна-угорскага насельніцтва.

Тым не менш, прынцып камплектавання апалчэння зазнаў пэўныя змены, звязаныя з палітычным і эканамічным развіццём грамадства. Раней, калі асноўную адзінку будовы грамадства складала адносна нешматлікае племя, узброены канфлікт з ягоным удзелам так ці інакш закранаў кожнага абшчынніка. Гэта дыктавала неабходнасць мабілізацыі як мага большай колькасці баяздольных мужчын. Невялікія ж памеры племені палягчалі сам працэс мабілізацыі. Заахвочвала абшчыннікаў да ўдзелу ва ўзброеных выправах і слабое развіццё эканомікі, пры якім цяжкі і малаплённы працэс вытворчасці забяспечваў нашмат меншую выгаду за рабаўніцкія паходы. З узнікненнем дзяржавы і развіццём эканомікі гэтыя ўмовы пачалі мяняцца. Утварэнне спачатку княжанняў, а потым і дзяржаў прывяло да павелічэння адзінак будовы грамадства і павелічэння дыстанцыі паміж інтарэсамі і клопатамі асобнага абшчынніка і дзяржавы, а таксама фізічнай адлегласці паміж сталіцай і перыферыяй. Калі раней напад на племянны цэнтр быў для абшчынніка сігналам уласнай небяспекі і выдатна матываваў яго да ўдзелу ў абаронных мерапрыемствах, то цяпер напад на малазнаёмую яму сталіцу, такую, як Полацк, Ладага, Ноўгарад ці Кіеў, не мог выклікаць непасрэднага водгуку ў ягонай душы. Нават

---

[226] Фроянов И. Я. *Киевская Русь: Очерки социально-политической истории.* С. 661.

пры спрыяльных абставінах кепская развітасць шляхоў зносін перашкаджала мабілізацыі перыферыйных апалчэнняў з аддаленых гарадоў ці закінутых у лясах і балотах вёсак. З эканамічнага пункту гледжання, паступовае замаруджванне міграцый і сталае асяданне вандроўных плямёнаў на зямлю спрыялі павелічэнню іх залежнасці ад сельскагаспадарчага цыклу і рабілі немагчымым доўгі адрыў ад гэтага цыклу часткі мужчынскага насельніцтва большай за дапушчальную колькасць. Развіццё прадукцыйнасці працы таксама падвышала адносную эканамічную выгаднасць вытворчасці ў параўнанні з рабаўніцтвам. Па гэтых прычынах колькасць насельніцтва, якая мабілізавалася ў апалчэнне і прымала актыўны ўдзел у ваенных дзеяннях, была ў працэнтных адносінах меншай, чым у эпоху ваеннай дэмакратыі, хоць і ўсё яшчэ даволі заўважнай. Буйнамаштабныя ваенныя экспедыцыі кшталту паходу Аскольда і Дзіра на Полацк, Алега на Кіеў, паходаў на Візантыю ці Хазарыю ці вайны Уладзіміра супраць полацкага і кіеўскага князёў патрабавалі збору значнай колькасці войска, незалежна ад таго, служылі яны дзяржаўным палітычным інтарэсам ці мелі меркантыльна-рабаўніцкія мэты. Таму князь-завадатар паходу вымушаны быў звяртацца да масавай мабілізацыі вояў. Гэта не выклікала і супраціўлення з боку падуладных яму плямёнаў, бо незалежна ад палітычнай мэты паходы давалі добры прыбытак іх удзельнікам у выглядзе нарабаванага дабра, выкупаў і данін. Летапісы спраўна фіксуюць масавую прысутнасць вояў ва ўсіх наступальных кампаніях рускіх князёў[227]. Яшчэ большы ўдзел воі прымалі ў ваенных дзеяннях, калі справа тычылася непасрэднай абароны роднай зямлі. Цяжка ўявіць, што Рагвалод абараняў Полацк ад Уладзіміравага войска выключна сіламі ўласнай дружыны. Удзел вояў з крывіцкага апалчэння ў гэтых баях быў несумненны.

Паспрабуем выразіць колькасць апалчэння ў больш ці менш дакладных лічбах. Звернем спачатку ўвагу на звесткі па цэлай Русі. Расейскі навуковец А. Н. Кірпічнікаў аналізуе падлікі польскага даследчыка Т. Васілеўскага, згод-

[227] Лаврентьевская летопись. Ст. 22, 30, 45, 64, 70, 74, 76.

на з якімі пры агульнай колькасці насельніцтва Русі ў 4,5 мільёна чалавек і мабілізацыі аднаго воя ад 12–30 сем'яў агульны лік апалчэння мог скласці 25–62 тысячы чалавек. Ён знаходзіць гэтыя лічбы заніжанымі. Не наважваючыся без спецыяльнага даследавання назваць больш дакладную колькасць, ён усё ж мяркуе, што Русь магла выставіць яшчэ большае войска[228]. Са свайго боку мы заўважым, што ў гэтым выпадку гаворка ідзе пра магчымую мабілізацыйную здольнасць, але ніяк не пра канкрэтныя выпадкі збору апалчэння, калі вояў збіралася значна менш з-за кепскіх камунікацый, непадпарадкавання асобных земляў і іншых прычын.

Звернемся да рэальных падзей, згаданых у крыніцах. Пры апісанні паходу Аскольда і Дзіра на Канстанцінопаль у 860 г. «Повесть временных лет» паведамляе, што русь прыйшла на дзвюхстах караблях[229]. Запіс аб паходзе Алега ў 907 г. ужо называе лічбу ў 2000 караблёў[230]. Пры традыцыйна прынятай колькасці людзей на рускім караблі таго часу ў 40 чалавек,[231] гэта дае лічбу ў 8 і 80 тысяч чалавек у войску ў першым і другім паходах адпаведна. Масудзі пры апісанні паходу русаў на Каспій у 920-я гады дае лічбу 50 тысяч (500 караблёў з экіпажамі па 100 чалавек кожны)[232]. «Повесть временных лет» пад 971 г. падае колькасць Святаславава войска ў 10 тысяч вояроў[233]. Нарэшце, Леў Дыякан пры апісанні заключэння міру паміж Святаславам і візантыйцамі кажа, што на момант замірэння ў жывых засталіся і атрымалі ад візантыйцаў хлеб 22 тысячы русаў, а яшчэ 38 тысяч загінулі ад візантыйскай зброі. Іх колькасць перад пачаткам вайны складала 60 тысяч вояроў[234].

Крытычны погляд паказвае, што мы можам мець справу з завышанымі лічбамі. Па-першае, прааналізуем падлікі

---

228 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 3. Ленинград, 1971. С. 71.

229 Лаврентьевская летопись. Ст. 21.

230 Тамсама. Ст. 31.

231 Разин Е. А. *История военного искусства*. Т. 2. Москва, 1957. С. 60.

232 Мас'уди о Кавказе. С. 199–201.

233 Лаврентьевская летопись. Ст. 70.

234 Leo Diac. IX, 11. С. 81.

колькасці ваяроў зыходзячы з ліку караблёў і памераў экіпажу аднаго карабля. Калі згадаць пра вялізны ўплыў нарманскага ваеннага і мараходнага майстэрства і зрабіць вельмі верагоднае дапушчэнне, што пры параўнальным узроўні тэхналогій славянскія, балцкія і фінскія караблі будаваліся падобнымі да нарманскіх, то можна зрабіць выснову, што і памеры экіпажаў у іх былі падобнымі. Між тым вядома, што многія нарманскія караблі мелі экіпаж меншы за 40 чалавек і толькі адзінкі з іх маглі меціць на борце 100 чалавек. Славуты карабель з Гакстаду, захаваны ў канцы IX ст., меў 16 пар вёсел і, значыць, быў прызначаны для 32 грабцоў[235]. Для набегаў на Англію ў канцы IX ст. выкарыстоўваліся караблі з 16–18 і нават 13 банкамі (месцамі для пары грабцоў). Толькі ў X ст. быў выпрацаваны стандарт у 20–25 банак для ваеннага карабля[236]. Лодкі-аднадрэўкі, якія будавалі для русаў падуладныя ім славянскія плямёны[237], таксама наўрад ці маглі змясціць 40 чалавек[238]. Гэта значыць, што сярэдняя велічыня экіпажу аднаго карабля складала не больш за 30 чалавек. Скарэктаваныя такім чынам падлікі даюць нам 6 тысяч у паходзе Аскольда і Дзіра, 60 тысяч у паходзе Алега і 15 тысяч у паходзе 920-х гг. на Каспій. Такія лічбы выглядаюць даволі верагоднымі для першага і трэцяга выпадку, але велічыня Алегава войска ўсё яшчэ выклікае сумненні.

Звернем увагу на другі магчымы фактар скажэння праўдзівых лічбаў: свядомае перавелічэнне. Першапачаткова яно магло зыходзіць ад саміх жа палкаводцаў. І Алег, і Святаслаў называлі свае лічбы дакладнай колькасці войска, каб вызначыць памеры належных ім ад візантыйцаў выплат у адпаведнасці з мірнымі дамовамі. Нядзіўна, што абодва былі крэўна зацікаўленыя ў заравышэнні сапраўднай велічыні войска. Пазней такую самую зацікаўленасць маглі праявіць і дзеяпісцы: рускія, каб падкрэсліць магутнасць Алега і прыніжэнне Візантыі; Леў Дыякан, каб узнесці поспехі візантыйскай зброі ў барацьбе з колькасна

---

[235] Сойер П. *Эпоха викингов.* С. 110.
[236] Хит И. *Викинги.* Москва, 2004. С. 8.
[237] Const. Porphyr. 9. С. 45–47.
[238] Довженок В. Й. *Військова справа в Київській Руси.* С. 22.

пераважным войскам Святаслава. У выпадку з Алегам лічба ў дзве тысячы наогул выглядае як механічнае памнажэнне на дзесяць колькасці караблёў у папярэднім паходзе Аскольда і Дзіра. Нават калі ўлічыць, што Аскольд кантраляваў толькі паўднёвую частку будучай Русі, войска Алега магло налічваць толькі ўдвая больш караблёў і адпаведна не нашмат больш за 12 тысяч ваяроў. Што ж датычыцца Святаслава, лічба ў 10 тысяч ваяроў, пададзеная летапісам, выглядае вартай даверу больш за звесткі Льва Дыякана. Пры дапушчэнні таго, што да 971 г. русы маглі сапраўды страціць больш за палову войска ў выніку паражэння пад Аркадзіёпалем і іншых баявых дзеянняў, яго першапачатковая колькасць наўрад ці перавышала 25 тысяч ваяроў. Для параўнання: у адным з найбуйнейшых ваенных прадпрыемстваў вікінгаў — спробе заваявання Англіі пры дапамозе сабранай імі Вялікай арміі (micel here) у другой палове IX ст. — удзельнічала ўсяго толькі 2—3 тысячы ваяроў[239], а аўтарытэтны даследчык Пітэр Соер бярэ пад сумненне і гэтую лічбу[240].

Падвёўшы вынік, мы можам меркаваць, што ў паходах рускіх князёў у IX—X стст. маглі браць удзел прыкладна 6—25 тысяч ваяроў. За выключэннем дружыны, большасць іх складалі воі з апалчэння.

Паколькі звесткі наконт Полацкай зямлі ў нас адсутнічаюць, мы можам толькі спекулятыўна спраектаваць нашы падлікі па Русі ў цэлым на Полаччыну з улікам розніцы ў памерах тэрыторыі і колькасці насельніцтва. Хутчэй за ўсё, колькасць полацкага войска не перавышала 5—6 тысяч чалавек з дружынай і апалчэннем уключна, а ў асобным паходзе магло ўдзельнічаць і яшчэ менш. Але здаровы сэнс кажа, што яно не магло быць меншым і за 1—2 тысячы чалавек, бо ў такім выпадку не магло б разглядацца дастатковым для вядзення поўнамаштабнай вайны з надзеяй на поспех. Між тым менавіта такой стратэгіі ў вайне з Уладзімірам і прытрымліваўся Рагвалод.

Цікавым падаецца пытанне аб арганізацыйным падзеле войскаў цэлай Русі і Полацкага княства. У расійскай

[239] Хит И. *Викинги.* С. 16.
[240] Сойер П. *Эпоха викингов.* С. 180—191.

савецкай гістарыяграфіі традыцыйна лічыцца, што Русь захавала звычайную для індаеўрапейцаў дзесяцічную сістэму. Пры такой сістэме асноўнай арганізацыйнай адзінкай войска быў дзесятак. Дзесяткі аб'ядноўваліся ў сотні, сотні – у тысячы[241].

Пераемнасць традыцыйнай для славян і ўласцівай для ўсіх індаеўрапейцаў дзесяцічнай сістэмы з'яўляецца несумненным фактам. Але немагчыма адмаўляць і вялізны ўплыў нарманскага ваеннага майстэрства на развіццё ваеннай справы на Русі і ў Полацкім княстве, што прызнавалася і ў Сярэднявеччы. Саксан Граматык нават прыпісвае вядомаму нам Фродэ Заканадаўцу ўключэнне ў звод законаў для Русі загаду «русам пераймаць спосабы вядзення вайны ад данаў»[242]. Вядома ж, нават Фродэ, магутнасць якога мела проста легендарныя памеры, не мог сваёй воляй загадаць кожнаму жыхару агромністых абшараў Русі ваяваць дацкім спосабам. Тым не менш цяжка сумнявацца ў шырокім перайманні славянамі, балтамі і фіна-уграмі шматлікіх элементаў нарманскай вайсковай арганізацыі, зброі і спосабаў вядзення вайны.

Арганізацыйны падзел войска ў нарманаў меў адрозны ад славянскага выгляд і дыктаваўся іх ладам жыцця, прыроднымі ўмовамі скандынаўскіх краін і адпаведнымі ім спосабамі вядзення вайны. Вельмі доўгая берагавая лінія скандынаўскіх краін, іх залежнасць ад марскіх промыслаў і заморскага гандлю абумовілі высокае развіццё мараходства і караблебудавання ў народаў, якія іх насялялі. Вайна ў нарманаў таксама мела пераважна марскі характар. Вынікі многіх войнаў вырашаліся ў марскіх бітвах. Марская бітва пры Хаўрсф'ёрдзе каля 900 г. прывяла да аб'яднання Нарвегіі і аддала ўладу над ёй Харальду Цудоўнавалосаму. Паражэнне ў марской бітве пры Свольдзе ў 1000 г. каштавала ўлады над Нарвегіяй і жыцця каралю Олафу Тругвасану. Акрамя ўласна бітваў, перавозка войскаў на значныя адлегласці таксама ажыццяўлялася збольшага марскімі шляхамі. Нарэшце, рабаўніцкія паходы

---

241 Разин Е. А. *История военного искусства*. Т. 2. С. 59–60.
242 Saxo Gram. V. http://sunsite.berkeley.edu/OMACL/DanishHistory/book5II.html

нарманаў на еўрапейскія краіны, якія і стварылі ім крывавую славу, амаль заўсёды прымалі выгляд нападаў з мора. Натуральна, што пры такой ролі караблёў першаснае значэнне прымала не арганізацыя сухапутнага войска, а стварэнне і камплектаванне людзьмі моцнага флоту.

У часы Хакана Добрага (945—960 гг.) у Нарвегіі склалася наступная сістэма вайсковай арганізацыі. Тры сядзібы складалі зыходную мабілізацыйную адзінку — мангёрд, якая выстаўляла ў войска аднаго чалавека. Мангёрды складалі карабельную акругу, якая рыхтавала адзін карабель. Дванаццаць карабельных акруг аб'ядноўваліся ў фюльк[243]. Найменшай арганізацыйнай адзінкай войска быў экіпаж аднаго карабля з 25—50 чалавек. Такая адзінка мела не проста фармальны характар. Яе ваяры знаходзіліся побач у паходзе і ў баі. Ад іх спайкі і ўзаемадапамогі залежаў поспех і выжыванне на вайне, што аб'ядноўвала іх вельмі шчыльнай сувяззю.

Зірнем, наколькі такая «карабельная» сістэма арганізацыі магла быць перанесенай са Скандынавіі на Русь. Прынамсі, прыродныя ўмовы Русі з бясконцай вяззю вялікіх і малых рэк рабілі вельмі зручнай, а пры адсутнасці прыдатных сухапутных шляхоў і адзіна магчымай транспарціроўку войскаў па рэках. Пераважная большасць зафіксаваных крыніцамі кампаній зводзілася да паходаў на караблях па Дзвіне, Волхаву, Дняпры і Волзе, з выхадам у мора і наступным нападам на прыбярэжныя вобласці. Менавіта такі характар мелі паходы Аскольда і Дзіра на Візантыю і ўсе паходы русі на Каспійскае мора. Ва ўсіх дадзеных выпадках дзеяпісцы згадваюць не колькасць войска як такога, а колькасць наяўных караблёў. Як мы памятаем, у выпадку з Алегам разлік выкупу рабіўся з разліку колькасці грабцоў на караблі і колькасці караблёў. Таму мы з пэўнай доляй упэўненасці можам сцвярджаць, што там, дзе паход адбываўся на караблях, падзел войска на арганізацыйныя адзінкі мог лагічным чынам ажыццяўляцца ў адпаведнасці з падобнай да нарманскай карабельнай сістэмай. Паводле яе, найменшую арганізацыйную адзінку складаў экіпаж аднаго карабля колькасцю ў

[243] Лебедев Г. С. *Эпоха викингов в Северной Европе*. С. 57.

25—50 чалавек. Паколькі адно племя ці іншая тэрытарыяльная адзінка выстаўляла некалькі караблёў, экіпажы маглі аб'ядноўвацца ў падобныя да нарвежскіх фюлькаў большыя арганізацыйныя адзінкі ў адпаведнасці са сваёй тэрытарыяльнай прыналежнасцю.

Разам з тым паходы на караблях не былі адзінай формай вядзення вайны. Пры апісанні паходаў Алега і Ігара на Візантыю летапісец заўважае, што пэўная частка войска рухалася «на конехъ»[244]. Кампаніі Святаслава, накіраваныя на заваяванне Балгарыі і на барацьбу з Візантыяй, вяліся на сухапутным тэатры ваенных дзеянняў. Адзначым той факт, што і рускі летапісец[245], і візантыйскі храніст[246] выпускаюць з-пад увагі колькасць караблёў русаў, але імкнуцца падаць больш ці менш дакладныя лічбы колькасці сухапутнага войска Святаслава ў тысячах. Адрозная методыка падліку можа сведчыць аб тым, што пры вядзенні вайны на сушы ў адрозненне ад марской вайны ўжывалася іншая арганізацыйная сістэма, заснаваная на традыцыйнай дзесяцічнай.

Падсумаваўшы факты, мы можам выказаць меркаванне, што традыцыйная для славянскіх плямёнаў дзесяцічная сістэма арганізацыйных адзінак у войску і запазычаная ў нарманаў карабельная ў дадзены перыяд суіснавалі на Русі і, верагодна, у Полацкім княстве ў залежнасці ад пераважнага ў канкрэтнай кампаніі спосабу вядзення вайны на сушы ці на моры.

Мы мусім сказаць некалькі словаў пра яшчэ адну частку войска на Русі і ў Полаччыне: найманыя атрады. Яны выкарыстоўваліся для ўзмацнення войска ў асобнай кампаніі. Зафіксаваныя выпадкі найму Ігарам печанегаў для вайны супраць Візантыі ў 944 г.[247] і прыводу Уладзімірам у 970-я гг. варагаў з-за мора для вайны супраць Рагвалода і Яраполка[248]. У 967 г. візантыйскі пасол Калакір прывёз Святаславу вялікую суму золатам для арганізацыі вайны супраць балгар, верагодна, з дапамогай найманых вая-

---

[244] Лаврентьевская летопись. Ст. 30, 45.
[245] Тамсама. Ст. 70.
[246] Leo Diac. IX, 11. C. 81.
[247] Лаврентьевская летопись. Ст. 45.
[248] Тамсама. Ст. 75.

роў[249]. Печанегі і венгры, якія ўдзельнічалі на баку русаў у баі пад Аркадзіёпалем у 970 г., таксама маглі быць наймітамі[250]. Калі гаворка ідзе аб самастойным Полацкім княстве, найбольш верагоднымі кандыдатамі для найму былі нарманы, а таксама ваяры з суседніх ваяўнічых балцкіх плямёнаў. Атрады наймітаў захоўвалі асобнае становішча ў войску, мелі ўласную арганізацыю і ўласных камандзіраў. Колькасць іх магла дасягаць ад некалькіх соцень да некалькіх тысяч у залежнасці ад значнасці кампаніі. Служба наймітаў аплочвалася доляй у здабычы (згадаем патрабаванне нарманаў да Уладзіміра аб выкупе за неразрабаваны Кіеў) ці прамой выплатай. Саксан Граматык паведамляе, што ў эпоху легендарных дацкіх каралёў найманы ваяр атрымліваў дзве маркі срэбрам за зімовы сезон[251].

У той час як вайсковая арганізацыя на беларускіх землях, што трапілі ў арбіту дзейнасці нарманаў, увайшлі ў склад дзяржавы Рурыкавічаў ці падпарадкоўваліся самастойнаму Полацкаму княству, зрабіла вялікі скачок наперад, вайсковая арганізацыя балцкіх плямёнаў застаецца менш вядомай. Не будзе вялікай памылкай сказаць, што ў IX–X стст. яна яшчэ адпавядала ранейшаму ўзроўню развіцця ваеннай дэмакратыі. Усё ж дзяржаватворчыя працэсы на Русі аказвалі на балцкія землі значны ўплыў, стымулюючы там развіццё грамадства, а значыць, і вайсковай арганізацыі, у падобным кірунку[252].

### Б) Зброя

У некаторых аспектах матэрыяльная культура нарманскага перыяду вядома нам лепей за сам ход падзей ваеннай і палітычнай гісторыі. Гэта датычыцца зброі. Мы маем у сваім распараджэнні багаты археалагічны матэрыял з вялізнага некропалю ў Гнёздаве, які дае нам добрае ўяўленне аб тагачасным узбраенні ваяроў беларускіх земляў.

---

249 Leo Diac. IV, 6. C. 36–37.
250 Ibid. VI, 12. C. 58.
251 Saxo Gram. V. http://sunsite.berkeley.edu/OMACL/DanishHistory/book5II.html
252 Baranauskas T. *Lietuvos valstybės ištakos.* 255.

Самым вядомым і эфектыўным відам наступальнай зброі быў меч. Пры ўзроўні тагачасных тэхналогій гэта была дарагая і рэдкая рэч, даступная толькі вузкаму вайскова-дружыннаму слою, і высока ім цанілася[253]. Меч прыцягваў да сябе ўвагу ўжо тым, што ў адрозненне ад іншых відаў зброі (кап'ё, сякера, лук і стрэлы) ён быў прызначаны выключна для ваеннай справы і не мог выкарыстоўвацца для эканамічнай дзейнасці. Мячу прыпісваліся звышнатуральныя ўласцівасці. Лічылася, што ён меў таямнічую повязь са сваім гаспадаром. Нарманскія дружыннікі часам надавалі сваім мячам індывідуальныя імёны, такія, як Б'ярні Кусачы ці Доўгі і Востры[254]. Пасля смерці гаспадара меч часам хавалі побач з ім[255]. Сакральны дух мяча пацвярджаўся тым, што на ім прыносілі ўрачыстыя клятвы, як гэта рабілі Ігаравы паслы пры заключэнні міру з візантыйцамі[256].

На Русі, у Скандынавіі і астатніх еўрапейскіх краінах у гэты час найбольш шырока ўжываўся так званы каралінгскі ці вікінгскі меч, даўжынёй 85–100 см, з якіх лязо складала 70–85 см. Дзяржальна мяча ў многіх выпадках багата аздаблялася[257]. Такі меч меў скругленае ці нязначна завостранае наверша і прызначаўся для сякучага, рачэй чым для колючага, удару[258]. Насілі меч, найбольш верагодна, у скураных похвах на плечавым рамяні[259].

Каралінгскі меч быў аддаленым нашчадкам рымскай кавалерыйскай спаты (spatha), якая прайшла доўгую эвалюцыю ў Заходняй Еўропе. Свой класічны выгляд ён набыў каля VIII ст. у Франкскім каралеўстве, а на славянскія землі паміж Балтыйскім і Чорным морамі масава

---

253 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Ленинград, 1966. Вып. 1. С. 22, 24.

254 Хит И. *Викинги*. С. 28.

255 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 1. С. 24.

256 Лаврентьевская летопись. Ст. 48, 53.

257 Каинов С. *Скандинавские наемники на Руси (конец IX – середина XI веков)* // Сайт «Библиотека Ассоциации Гардарика»; http://arc.novgorod.ru/ - Па адрасе: http://arc.novgorod.ru/asgard/libri.php3?cont=_sk - 09.01.2004.

258 Polska technika wojskowa do 1500 roku. Warszawa, 1994. 43.

259 Каинов С. *Скандинавские наемники на Руси (конец IX – середина XI веков)*. http://arc.novgorod.ru/asgard/libri.php3?cont=_sk

трапіў разам з нарманскімі вікінгамі і купцамі. Пры гэтым не больш за 40% мячоў таго часу, знойдзеных пры раскопках на землях даўняй Русі, маюць скандынаўскае паходжанне. Пераважная большасць з іх паходзіць з рэйнскіх збраёўняў Франкскай імперыі[260]. На іх лёзах часта сустракаюцца клеймы «ULFBERHT», «INGELRII» і іншыя, якія сведчаць аб іх франкскім паходжанні[261]. Адзін з такіх мячоў, датаваны X ст., быў знойдзены ў Полацку[262]. У дадзеным выпадку нарманы не былі ні вынаходнікамі, ні асноўнымі вытворцамі каралінгскіх мячоў. Але менавіта яны прынеслі на Русь культуру выкарыстання мяча на вайне і прадставілі яго мясцоваму вайскова-дружыннаму слою як найбольш эфектыўную і небяспечную зброю свайго часу. Побач з вытворчасцю яны таксама наладзілі рээкспарт франкскіх мячоў, якія праз іх пасрэдніцтва дасягалі земляў Русі і мусульманскіх краін. Гэта былі як гатовыя вырабы, так і паўфабрыкаты з Франкскай імперыі, Скандынавіі і Готланду[263]. У гэтым сваім прадпрыемстве нарманы дасягнулі такога поспеху, што трывала заваявалі ўсходнія рынкі, аб чым сведчыць Ібн Хардадбех[264]. Яны стварылі моцную канкурэнцыю мясцовым збраярам, пра што згадвае ал-Біруні. У прыватнасці, меч, выраблены русамі са спалучэння жалеза і сталі, выдатна вытрымліваў халоднае надвор'е, што выгодна адрознівала яго ад іншых мячоў[265]. Частыя войны, якія вялі рускія князі, выклікалі штораз усё мацнейшы попыт на мячы. Гэта лагічна прывяло да арганізацыі вытворчасці мячоў непасрэдна на рускіх землях. Ужо аповед ал-Біруні можа лічыцца ўскосным доказам існавання вытворчасці мячоў на Русі. Грунтуючыся на асобных узорах зброі, А. Н. Кірпічнікаў мяркуе, што пачатак вытворчасці мячоў

[260] Polska technika wojskowa do 1500 roku. 41–46.
[261] Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 1. С. 21.
[262] Археалогія Беларусі. Т. 3. С. 384.
[263] Нюлен Э. *Эпоха викингов и раннее средневековье в Швеции*. С. 162.
[264] Ибн Хордадбех. *Книга путей и стран*. §73в. С. 125.
[265] ал-Бируни, Абу-р-Райхан Мухаммед ибн Ахмед. *Собрание сведений для познания драгоценностей (Минералогия)*. Москва, 1963. С. 237.

на Русі можа быць аднесены да сярэдзіны X ст. Найбольш жа даўнім мячом, бясспрэчна, вырабленым на Русі, з'яўляецца знаходка, датаваная прыкладна канцом X – першай паловай XI стст. з мястэчка Фашчаватая на Палтаўшчыне са славянскім надпісам «ЛЮДОТА (альбо ЛЮДОША) КОВАЛЬ»[266].

Побач з мячамі ваяры на Русі шырока выкарыстоўвалі запазычаную ў качэўнікаў шаблю[267]. Аднак зброя гэтая разышлася шырока найперш на паўднёвых землях Русі, што суседзілі з качавымі народамі. На беларускіх землях яна выкарыстоўвалася значна радзей. Яшчэ больш рэдка ўжывалася такая дапаможная зброя, як вялікія баявыя нажы (скрамасаксы) і кінжалы[268].

У адрозненне ад мяча, кап'ё ў сваім ручным і кідальным варыянтах мела трывалыя традыцыі на славянскіх, балцкіх і фіна-угорскіх землях. Як мы памятаем, паводле звестак візантыйскіх крыніц, кап'ё было масавай зброяй славян у перыяд ваеннай дэмакратыі. Такі самы масавы характар яно захавала і ў IX–X стст., калі ўжывалася аднолькава часта і дружыннікамі, і воямі апалчэння[269]. Шырокае выкарыстанне кап'я на вайне знайшло сваё адлюстраванне і ў тым факце, што само моўнае паняцце «кап'ё» стала сімвалічным для азначэння многіх звязаных з вайной з'яў. Напрыклад, летапісец кажа аб узяцці штурмам русамі Прэславы, што Святаслаў «взя градъ копьемъ»[270].

У IX–X стст. пры яшчэ слабым развіцці конніцы (аб чым гаворка пойдзе ніжэй) кап'ё было ўдарнай зброяй пяхоты. Ягоная даўжыня была трохі большай за сярэдні чалавечы рост і дасягала 180–200 см[271]. На беларускіх землях у гэтыя часы выкарыстоўваліся пераважна два тыпы

---

[266] Кирпичников А. Н. *О начале производства мечей на Руси* // Труды VI Международного Конгресса славянской археологии. Т. 4. Москва, 1998. С. 246–251.

[267] Żygulski Z. Jun. *Broń w dawnej Polsce na tle uzbrojenia Europy i Bliskiego Wschodu*. Warszawa, 1982. 75.

[268] Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 1. С. 72–73.

[269] Довженок В. Й. *Військова справа в Київській Руси*. С. 26.

[270] Лаврентьевская летопись. Ст. 69.

[271] Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Ленинград, 1966. Вып. 2. С. 9.

коп'яў: з адносна шырокім падоўжана-трохкутным наканечнікам і ланцэтападобным наканечнікам. Трохкутныя наканечнікі працягвалі славянскія традыцыі вырабу зброі. Ланцэтападобныя, як і мячы, былі прынесеныя на беларускія землі нарманамі, якія, у сваю чаргу, запазычылі іх у франкаў[272].

У шырокім ужытку былі таксама і суліцы – кідальныя коп'і, даўжынёй меншыя за ручныя коп'і, але большыя за стрэлы. Тыпы іх наканечнікаў прыкладна адпавядалі тыпам наканечнікаў ручных коп'яў. З ростам значэння рукапашнага бою суліцы служылі толькі сродкам першага ўдару пры зблiжэнні праціўнікаў і паступова страчвалі сваё значэнне[273].

Самі нарманы карысталіся коп'ямі з ясеневымі дрэўкамі (spjot), якія можна было кідаць і ўжываць у рукапашным баі. Олаф Тругвасан славіўся сваім умельствам кідаць коп'і адначасова з дзвюх рук[274].

Масавай зброяй пяхоты была і сякера. Асноўныя тыпы баявых сякер былі занесеныя на землі Русі нарманамі, у тым ліку барадатая сякера (skeggox), сякера з вузкім лязом на кароткім дзяржальне і сякера з шырокім лязом на доўгім дзяржальне (breidox)[275]. Вельмі хутка гэтая зброя была асвоеная мясцовым насельніцтвам і пачала вырабляцца на месцы славянамі і фіна-ўграмі. У сваю чаргу, нарманы ўспрынялі ад качэўнікаў праз пасрэдніцтва славян сякеркі-чаканы[276].

Яшчэ адным відам ударнай зброі была булава. Можна меркаваць, што яе выкарыстанне ў гэты час было перажыткам яе становішча як самага простага і архаічнага віду зброі[277]. Новы штуршок яе ўдасканаленню і выкарыстанню мог даць уплыў качэўнікаў з Паўднёвага Усходу. Усё ж

---

[272] Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие.* С. 9–13.

[273] Тамсама. С. 23–25.

[274] Сага об Олаве сыне Трюггви. LXXXV // Стурлусон, Снорри. Круг Земной. С. 150.

[275] Хит И. *Викинги.* С. 28–29.

[276] Кирпичников А. Н. Вооружение воинов Киевской державы в свете русско-скандинавских контактов // Скандинавский сборник. Вып. 22. Таллин, 1977. С. 159–173.

[277] Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 2. С. 57.

асноўным цэнтрам яе вытворчасці і выкарыстання была Кіеўшчына[278]. Для беларускіх земляў яна заставалася малараспаўсюджанай зброяй.

У дадатак да ўдарнай зброі на цэлай Русі і на беларускіх землях вялікую ролю захоўвалі лук і стрэлы. Больш за тое, лічыцца, што X ст. стала для лука часам адраджэння яго баявога значэння пасля доўгага перыяду заняпаду[279]. Гэта знайшло свой адбітак як у археалагічных, так і пісьмовых крыніцах. Пры апісанні штурму візантыйцамі Прэславы ў 971 г. Леў Дыякан заўважае, што русы аказвалі рамеям годнае супраціўленне, пускаючы са сцен суліцы, стрэлы і камяні[280]. Відавочна, што гэта не магла быць стральба са знаёмых нам ранейшых невялікіх славянскіх лукаў. Цяпер гэта былі магутныя лукі, аднолькава разлічаныя на прыцэльныя стрэлы і на масаваны абстрэл працiўніка як пры аблозе ці абароне крэпасцяў, так і ў палявым баі.

Ужываныя ў гэты час на Русі і ў іншых усходнееўрапейскіх краінах лукі падзяляліся на простыя і складаныя, альбо рэфлексіўныя. Просты лук складаўся з драўлянага дрэўка, абодва канцы якога сцягваліся цецівой. Складаны лук, у тэхналогіі зборкі якога яскрава відаць уплыў азіяцкіх народаў, складаўся з некалькіх адмыслова падабраных драўляных частак, дапоўненых элементамі са звярыных жыл, прымацаваных са знешняга боку, і рагавых, прымацаваных з боку ўнутранага. Адчувальныя да вільгаці элементы прыкрываліся бярозавай карой, а ўся канструкцыя змацоўвалася касцянымі пласцінамі і высушвалася. Сіла лука палягала ў тым, што ў ненапружаным стане ён выгінаўся ў адваротны бок. Каб нацягнуць цеціву, трэба было выгнуць лук у супрацьлеглы бок з вялікім намаганнем. Пры стрэле такая канструкцыя надавала страле вялікую прабіўную сілу[281]. У ненапружаным выглядзе лук меў даўжыню больш за 130 см, а ў напружаным — больш за 160 см. Далёкасць стральбы дасягала 200—250 м[282].

---

278 Żygulski Z. *Broń w dawnej Polsce*... 76.
279 Ibid. 52.
280 Leo Diac. VIII, 6. C. 71.
281 Polska technika wojskowa do 1500 roku. 60—61.
282 Бохан Ю. *Зброя Вялікага княства Літоўскага 1385—1576.* Мн., 2003. С. 44.

Стрэлы для стральбы з лука складаліся з дрэўка і металёвага наканечніка. Наканечнік мацаваўся да дрэўка з дапамогай шыпа альбо ўтулкі. Існавала некалькі тыпаў стрэлаў, кожны з якіх меў адмысловае ваеннае прызначэнне. Пірамідальныя завостраныя стрэлы былі прызначаныя для прабівання даспехаў. Пляскатыя рамбавідныя стрэлы мелі большую шырыню і сваімі краямі наносілі шырэйшыя, а значыць і больш небяспечныя раны. Нарэшце, ужываліся гарпунападобныя стрэлы з накіраванымі ў адваротны руху стралы бок шыпамі, якія пры выцягванні з раны яшчэ болей разрывалі цела[283]. Славянскія традыцыі выкарыстання лукаў маглі арганічна спалучацца з нарманскімі. Так, нарвежцы былі вядомыя як трапныя стральцы[284]. У цэлым лук быў небяспечнай і грознай зброяй у баі.

Натуральным адказам на выклік, які прадстаўляла развіццё наступальнай зброі, было выкарыстанне розных відаў зброі засцерагальнай. Шырока распаўсюджаным на беларускіх землях відам засцерагальнай зброі была кальчуга – кашуля, выраблена з пераплеценых паміж сабой жалезных кольцаў. Яна прызначалася для абароны тулава ваяра ад сякучых і колючых udараў. У параўнанні з іншымі відамі даспехаў перавагай кальчугі была яе гнуткасць. Кальчуга не скоўвала рухаў ваяра ў баі. Гэта ж было і яе ахілесавай пятой, бо гнуткі даспех не абараняў ад тупога драбячага ўдару.

Выкарыстанне кальчуг на беларускіх землях пацвярджаецца знаходкай у курганным могільніку Банонь недалёка ад Полацка асобніка, датаванага другой паловай X – пачаткам XI стст.[285] Кальчуга была зброяй, найперш уласцівай дружыннікам як эліце войска[286]. Пры гэтым яна не з'яўлялася рэдкасцю і была даступнай многім воям апалчэння. Пры апісанні бою пад сценамі Даростала ў 971 г. Леў Дыякан адзначае, што русы «выйшлі з горада і пастроіліся на раўніне, абароненыя кальчугамі»[287].

[283] Довженок В. Й. *Військова справа в Київській Руси.* С. 29–30.
[284] Хит И. *Викинги.* С. 30.
[285] Плавінскі М. А. *Засцерагальнае ўзбраенне IX–XIII стст. на тэрыторыі Беларусі.* С. 144 // Гістарычна-археалагічны зборнік. № 16. Мн., 2001.
[286] Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 3. С. 12.
[287] Leo Diac. IX, 2. С. 76.

Кальчуга выраблялася з драцяных кольцаў дыяметрам 6–8 і 10–13 мм спалучэннем зваркі і склёпкі. Адно заклёпанае кальцо прадзявалася ў чатыры звараных. На адну кальчугу выдаткоўвалася каля 600 м жалезнага дроту і 20 000 кольцаў. Звычайная даўжыня кальчугі даходзіла да 60–70 см, шырыня ў поясе — каля 50 см. Рукавы былі кароткімі і мелі ў даўжыню каля 25 см. Важыў такі даспех 5,5–6,15 кг[288].

У Еўропе кальчуга была вынаходніцтвам кельтаў, ад якіх яе запазычылі рымляне[289]. Ад рымлян традыцыя шырокага выкарыстання кальчугі дасталася ў спадчыну германскім народам. У каралінгскую эпоху кальчуга пранікла ад германцаў да славян, пра што сведчыць этымалогія стараславянскага слова «броня», якое ўжывалася для азначэння даспехаў і было вытворным ад старажытнаверхненямецкага «brunja»[290]. Як мяркуецца, на беларускіх землях кальчуга з'явілася ў IX–X стст. на познім этапе славянскай каланізацыі[291]. Існуе таксама думка, што, нягледзячы на знаёмства нарманаў з кальчугамі яшчэ ў рымскую эпоху[292], штуршком да больш шырокага іх выкарыстання і нават пераўтварэння ва ўлюбёную засцерагальную зброю былі менавіта кантакты са славянамі[293]. Варта адзначыць, што, нягледзячы на шматлікія доказы еўрапейскага паходжання і шляхоў распаўсюджання кальчугі, існуюць меркаванні на карысць яе запазычання ў народаў Усходу, дзе яна была незалежна вынайдзеная і ўжывалася спачатку асірыйцамі, персамі і парфянамі, а затым сарматамі і іншымі качэўнікамі[294].

---

288 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 3. С. 13.

289 Козленко А. В. *Военная история античности: полководцы, битвы, оружие.* Мн., 2001. С. 182.

290 Тамсама. С. 10–11.

291 Плавінскі М. А. *Засцерагальнае ўзбраенне IX–XIII стст. на тэрыторыі Беларусі.* С. 144.

292 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 3. С. 11.

293 Кирпичников А. Н. *Вооружение воинов Киевской державы в свете русско-скандинавских контактов* // Скандинавский сборник. Таллин, 1977. Вып. 22. С. 159–173.

294 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 3. С. 10; Żygulski Z. *Broń w dawnej Polsce*... 38.

Папулярнымі былі прашываныя даспехі, вырабленыя з некалькіх слаёў грубай тканіны ці дубленай скуры[295].

Абаронай для галавы ваяра служыў шлем. Ягоны кошт як адной з вяршыняў металаапрацоўкі свайго часу рабіў яго недаступным асноўнай масе вояў. У IX–X стст. шлемы былі прыналежнасцю князёў, дружыны і знаці[296].

Ужываныя ў той час на беларускіх землях шлемы падзяляюцца паводле сваёй формы на стажковыя і сфераканічныя. Характэрным узорам стажковага шлема з'яўляецца знаходка з аднаго з гнёздаўскіх курганоў, датаваная X ст. Шлем сабраны з дзвюх жалезных пласцін, злучаных паласой з заклёпкамі. Ніжні край абведзены абручом з адтулінамі для мацавання кальчужнага прыкрыцця патыліцы і бакоў галавы – барміцы. Шлем пазбаўлены ўпрыгожанняў[297].

У адрозненне ад стажковых шлемаў ніжняя частка сфераканічных шлемаў мае сферычную пукатую форму, якая пераходзіць у спічастае наверша. На беларускіх землях яны прадстаўленыя яшчэ адной знаходкай з Гнёздава. Гэты шлем сабраны ўжо з чатырох пласцін, злучаных крыжападобна чатырма накладкамі. Кожная з пласцін мае пасярэдзіне падоўжнае рабро. На версе шлема маецца ўтулка для плюмажу. Ніжні край ахоплівае абруч з адтулінамі для барміцы, які наперадзе пераходзіць у наноснік. Шлем быў багата ўпрыгожаны насечкай[298].

Цікавым у гэтай сувязі падаецца пытанне аб розніцы ў функцыянальным прызначэнні і паходжанні стажковых і сфераканічных шлемаў. У навуковай літаратуры стажковы шлем традыцыйна звязваецца з нарманамі і завецца нарманскім, хоць і шырока выкарыстоўваўся прадстаўнікамі іншых еўрапейскіх народаў[299]. Паводле думкі А. Н. Кірпічнікава, стажковы шлем не прыжыўся на Русі, бо не вытрымаў спаборніцтва са сфераканічным шлемам, які шырока ўжываўся на Русі ў адказ на асаблівасці вядзення

[295] Ласкавый Г. *Викинги: Походы, открытия, культура.* Мн., 2004. С. 196.

[296] Кирпичников А.Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 3. С. 23.

[297] Тамсама. С. 24.

[298] Тамсама. С. 27–28.

[299] Żygulski Z. *Broń w dawnej Polsce...* 33.

бою з качэўнікамі[300]. Нанесены па сфераканічным шлеме ўдар слізгаў па ягоным версе, не шкодзячы ваяру. Асабліва гэта датычылася шабельных удараў і было актуальным для ваяроў Паўднёвага Усходу Русі, якім часта даводзілася сутыкацца з качэўнікамі, узброенымі шаблямі[301]. Між тым ваяры беларускіх земляў хоць і маглі сутыкацца з качэўнікамі, беручы ўдзел у выправах кіеўскіх князёў, але ў цэлым умовы вайны былі для іх досыць адрознымі. Хутчэй за ўсё, мае рацыю беларускі даследчык М. А. Плавінскі, які лічыць, што ў той час на беларускіх землях стажковыя шлемы суіснавалі са сфераканічнымі і нават дамінавалі[302]. На карысць гэтага меркавання можа сведчыць і цікавае назіранне польскіх даследчыкаў, якія звярнулі ўвагу на той факт, што стажковыя шлемы, знойдзеныя ў Польшчы, звычайна пазбаўленыя ўпрыгожанняў, тады як сфераканічныя маюць выразна парадны выгляд[303]. Мы ж згадаем, што дакладна такая розніца палягае паміж двума знойдзенымі гнёздаўскімі шлемамі. Цырыманіяльны характар сфераканічных шлемаў мог дапамагчы іх лепшай захаванасці, што ў наш час стварыла ўражанне аб іх большай ролі, чым тое было насамрэч.

Нарэшце, ці не самым важным відам засцерагальнай зброі быў шчыт. У адрозненне ад кальчуг і шлемаў, простая тэхналогія вырабу шчыта рабіла яго даступным як князям і дружыннікам, так і шараговым ваярам. Як і ў ранейшыя часы, ён быў для многіх вояў адзіным сродкам абароны ў баі. Апроч папулярнасці шчыт меў яшчэ шэраг рысаў, якія выдзялялі яго на фоне іншай зброі. Па-першае, як і меч, ён меў вузка ваеннае прызначэнне і не мог выкарыстоўвацца для вытворчасці, палявання ці іншых заняткаў. Па-другое, ягоныя памеры рабілі яго самым заўважным і кідкім прадметам узбраення, а таксама вельмі прыдатным для нанясення выяў і сімволікі. Таму нароўні з мячом шчыт набыў адценне сакральнасці і стаў пэўным увасабленнем самога родавага паняцця зброі. Па гэтай

---

[300] Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие.* Вып. 3. С. 26—27.

[301] Тамсама. С. 25.

[302] Плавінскі М. А. *Засцерагальнае ўзбраенне IX—XIII стст. на тэрыторыі Беларусі.* С. 144.

[303] Polska technika wojskowa do 1500 roku. 66.

прычыне, паводле легенды, Алег прыбіў свой шчыт да варотаў Канстанцінопаля ў знак перамогі над візантыйцамі[304], а Ігаравы паслы кляліся сваімі шчытамі пры заключэнні міру[305].

Шчыт прызначаўся для адбіцця ўдараў усіх відаў наступальнай зброі. Як сведчаць гнёздаўскія знаходкі, у дадзены перыяд шчыты мелі круглую форму і ў дыяметры дасягалі 1 м. Яны набіраліся з некалькіх дошак, якія абпілоўваліся па краях для надання шчыту патрэбнай круглай формы. У цэнтры шчыта выпілоўвалася адтуліна, якая закрывалася з вонкавага боку умбонам пляската-сферычнай ці сфераканічнай формы. Умбон мацаваўся да дошак з дапамогай заклёпак. Прастора, якая стваралася прапілам і закрывалася умбонам, выкарыстоўвалася для кісці рукі. Рука трымала дзяржальна ў выглядзе планкі, што ішла ад аднаго краю шчыта да другога. Такая канструкцыя дазваляла парыраваць умбонам удары і захоўвала ад пашкоджання руку ваяра. Часам шчыт абцягваўся скурай, а дошкі па краях змацоўваліся паміж сабой металічнымі пласцінамі. Мяркуючы па адной з гнёздаўскіх знаходак, рускія шчыты маглі быць фарбаванымі, у дадзеным выпадку ў чырвоны колер[306].

Падобным да гнёздаўскіх быў нармански шчыт, знойдзены ў Бірцы. Ён таксама складаўся з дошак (ліпавых), меў круглую форму і мог быць да 1 м у дыяметры. У цэнтры шчыта быў умбон. Знаходкі іншых шчытоў пацвярджаюць сталую традыцыю іх фарбавання. Улюбёным колерам быў чырвоны, але шырока выкарыстоўваліся і іншыя колеры. Шчыты з Гакстадскага карабля мелі жоўты і чорны колер. Шчыты маглі фарбавацца ў кантрастныя колеры па сектарах, падзеленых радыяльнымі прамымі ці спіралепадобнымі палосамі. Ёсць дадзеныя аб міфалагічных выявах на шчытах[307]. Нягледзячы на тое, што распаўсюджаныя на славянскіх землях і ў нарманаў шчыты былі фактычна аднолькавымі, цяжка казаць пра нейкія запазычанні. Хутчэй за ўсё, розныя народы проста працягвалі

---

304 Лаврентьевская летопись. Ст. 32.

305 Тамсама. Ст. 48.

306 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 3. С. 35.

307 Хит И. *Викинги*. С. 30.

свае даўнія традыцыі вырабу і выкарыстання зброі, якія ў сілу падабенства ваенных тэхналогій зліваліся ў агульнаеўрапейскую тэндэнцыю[308].

Далейшае развіццё тактыкі прывяло да паступовага выхаду з ужытку круглых шчытоў і замены іх шчытамі большага памеру, якія забяспечвалі лепшую абарону ваяра і былі больш прыдатнымі для коннай язды. Леў Дыякан адзначае, што пры абароне Даростала русы былі ўжо ўзброеныя шчытамі, якія даходзілі да самых ног[309]. Пры адступленні яны закідвалі свае шчыты за спіну, што гаворыць аб наяўнасці спецыяльнага рамяня для іх нашэння[310]. Спроба рэканструкцыі гэтых шчытоў, зробленая А. Макбрайдам, паказвае нам вялікі прастакутны шчыт, вельмі падобны да скутума (scutum) рымскага легіянера эпохі ранняй Імперыі[311]. Нам між тым здаецца, што шчыты Святаслававых ваяроў лагічна мусілі быць папярэднікамі пазнейшых міндалепадобных шчытоў, якія распаўсюдзіліся па ўсёй Еўропе каля 1000 г.[312]

У падобным да нарманскага і славянскага кірунку ішло і развіццё ўзбраення ў літвы і яцвягаў. Матэрыял літоўскіх пахаванняў сведчыць аб тым, што ў гэты час літва шырока карысталася коп'ямі, сякерамі, нажамі. Часцей сустракаюцца імпартаваныя з Заходняй Еўропы мячы, якія маюць тыпова каралінгскі выгляд. З засцерагальнай зброі літва мела на ўзбраенні шчыты з умбонамі[313]. Пэўнымі асаблівасцямі адрознівалася ўзбраенне яцвягаў. Гэтаксама як і літва, яцвягі карысталіся коп'ямі, сякерамі і нажамі, з засцерагальнай зброі – шчытамі з умбонамі. Пры гэтым нашмат большую ролю ў іх адыгрывалі лукі і стрэлы, наканечнікаў якіх на яцвяжскіх землях знойдзена нашмат болей, чым ва ўласна Літве. Напрыклад, на Каўкайскім гарадзішчы ў Алітускім раёне было знойдзена каля 120 жалезных наканечнікаў стрэлаў[314].

---

308 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 3. С. 37.
309 Leo Diac. IX, 2. С. 76.
310 Ibid. IX, 6. С. 78.
311 Хит И. *Викинги*. С. 43.
312 Кирпичников А. Н. *Древнерусское оружие*. Вып. 3. С. 37.
313 Girininkas A., Lukoševičius O. *Lietuvos priešistorė*. 183–184.
314 Ibid. 160.

Падсумоўваючы даступныя нам звесткі аб развіцці наступальнага і засцерагальнага ўзбраення ў нарманскі перыяд, можна зрабіць выснову, што яно ішло ў агульным кантэксце развіцця грамадства і ваеннай справы таго часу. Па-першае, дзяржаватворчыя працэсы на беларускіх землях і на цэлай прасторы паміж Балтыйскім і Чорным морамі прывялі да канчатковага выдзялення з агульнай масы грамадства князёў і дружыны, якія сфармавалі слой прафесійных ваяроў. Гэта прывяло да пашырэння вытворчасці і выкарыстання дарагіх спецыялізаваных відаў зброі: мячоў, кальчуг і шлемаў. Большасць шараговых апалчэнцаў працягвала карыстацца больш простымі відамі зброі: коп'ямі і сякерамі. Па-другое, пашырэнне гандлю і рабаўніцкія паходы зрабілі кантакты паміж рознымі народамі нашмат часцейшымі і шчыльнейшымі. Гэта забяспечыла шырокае ўзаемнае запазычанне ваенных тэхналогій і іх зліццё ў агульнаеўрапейскую плынь. У выніку такіх працэсаў зброя, ужываная ў гэты перыяд на беларускіх землях, носіць выразны адбітак і нарманскай, і славянскай традыцый, якія ў сваю чаргу выдатна ўпісваюцца ў агульнаеўрапейскія тэндэнцыі. Не засталіся ўбаку ад гэтай плыні і балты. Нарэшце, функцыянальнае прызначэнне гэтай зброі выдае накіраванасць на забеспячэнне найперш бою пяхоты, хаця ў канцы X ст. іншыя тэндэнцыі ўсё больш нагадваюць аб сабе.

### B) Умацаванні і аблога

Развіццё фартыфікацыі і спосабаў яе пераадолення ішло поруч з паступовым ператварэннем прымітыўнай ваеннадэмакратычнай грамадскай арганізацыі ў дзяржаўную. Яшчэ існавалі старыя племянныя гарадзішчы, якія захоўвалі свае спрадвечныя функцыі цэнтраў абшчыннага жыцця. Побач з імі ці на іх месцы ўзнікаюць гарады, якія з'яўляюцца паселішчамі якасна новага тыпу. Па-першае, яны былі рэзідэнцыямі прадстаўнікоў новага сацыяльнага феномена – улады і цэнтрамі кіравання земляў. Па-другое, дзякуючы іх размяшчэнню на важных гандлёвых шляхах вакол іх засяроджвалася эканамічнае жыццё. Як вынік, змяніўся сам змест утрымання населеных пунктаў

ці авалодання імі. Як і раней, яны служылі аб'ектамі рабаўніцкіх нападаў альбо сродкамі абароны насельніцтва ад такіх нападаў. Але калі гаворка ішла аб утрыманні ці захопе гарадоў з мэтай сталага панавання над прылеглай тэрыторыяй, сітуацыя была ўжо іншай. У той час як валоданне племянным гарадзішчам дапамагала кантраляваць мясцовасць толькі з ваеннага пункту гледжання, валоданне горадам давала ў рукі кантроль над палітычным і эканамічным жыццём акругі. Такім чынам, крапасная вайна набывала большае значэнне, чым раней. Будаўніцтва ўмацаванняў атрымала новы штуршок.

Пры гэтым мы не будзем перабольшваць маштабы урбанізацыі ў той час, яна заставалася яшчэ вельмі нязначнай. На беларускіх землях на гордае званне горада маглі прэтэндаваць толькі Полацк, Тураў і Смаленск. У многіх выпадках мяжу паміж гарадзішчам і горадам правесці было яшчэ проста немагчыма. Першыя гарады былі рачэй толькі знакам таго, што мусіла адбывацца пазней, у XI–XII стст.

Як і раней, пераважная большасць умацаванняў будавалася ў цяжкадаступных месцах, а іх планіроўка наўпрост залежала ад рэльефу мясцовасці. Дамінавалі ўмацаванні мысавыя і выспавыя. Новай рысай фартыфікацыйнай тэхнікі было распаўсюджанне ўмацаваных пунктаў складанамысавага тыпу. У адрозненне ад простых мысавых умацаваных пунктаў яны складаліся з некалькіх пляцовак, кожная з якіх мела сваю аўтаномную сістэму ўмацаванняў[315]. Такая сістэма звычайна складалася з рова і землянога вала, па версе якога маглаісці драўляная сцяна. З другой паловы X ст. зрубныя канструкцыі сцен пачалі выцясняць частакол[316]. У многіх выпадках вал абараняў умацаваны пункт толькі з напольнага боку. Вежы былі рэдкасцю і выкарыстоўваліся для нясення вартавой службы, а не для стральбы. Такая сістэма абароны была разлічанай на франтальную стральбу, г. зн. у кірунку наўпрост ад лініі ўмацаванняў, што дазваляла эфектыўна супрацьдзейнічаць тагачасным спаса-

---

315 Носаў К. С. *Русские крепости и осадная техника VIII–XVII вв.* С. 14–15.

316 Тамсама. С. 27.

бам аблогі[317]. Фланкіраванне (стральба ўздоўж лініі ўмацаванняў) яшчэ не практыкавалася.

Добрым прыкладам выспавай абарончай сістэмы з'яўляецца першапачатковае гарадзішча старажытнага Полацка, якое знаходзілася на беразе ракі Палаты і было ўмацавана валам. Вал быў насыпаны з пяску і са знешняга боку пакрыты чырвонай глінай. Пярэдні схіл вала быў умацаваны каменнай кладкай, якая рабіла схіл больш стромкім. Яшчэ адна кладка ішла з адваротнага боку вала. Мяркуецца, што яна выкарыстоўвалася для бесперашкодных перамяшчэнняў абаронцаў уздоўж умацаванняў, калі зямля размакала ад дажджоў[318].

У той жа час у многіх месцах досыць складаная фартыфікацыя суседзіла з прымітыўнымі састарэлымі відамі ўмацаванняў. Гарадзішча Валаковая на Смаленшчыне, датаванае VIII—IX стст., увогуле не мае штучных умацаванняў і абароненае выключна схіламі ўзгорку[319].

Разам з умацаваннямі далейшую эвалюцыю зведалі і метады іх пераадолення. Найбольш шырока ўжываным метадам узяцця ўмацаваных пунктаў заставаліся нечаканыя напады, у летапісах званыя «ізгонам» альбо «із'ездам» і накіраваныя супраць неабароненых варотаў[320]. Іх вага ў агульнай колькасці спроб захопу ўмацаванняў заставалася вялікай, але трохі зніжалася з цягам часу. Прычынай таму былі ўзнікненне і рост пастаянна і шчыльна заселеных гарадоў, якія захапіць знянацку было цяжэй за ранейшыя малазаселеныя гарадзішчы-сховішчы.

Рост палітычнага і эканамічнага значэння гарадоў цягнуў за сабой і большую зацікаўленасць у авалоданні імі. Нападаючы бок быў больш схільны да такога скрайняга метаду, як штурм і звязанай з гэтым рызыкі паражэння і людскіх страт. Выдзяленне ж слою прафесійных ваяроў у

---

[317] Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских земель X—XIV вв.* // Материалы и исследования по археологии СССР. № 140. Ленинград, 1967. С. 158.

[318] Штыхов Г. В. *Древний Полоцк IX—XIII вв.* Мн., 1975. С. 24—25.

[319] Раппопорт П. А. *Военное зодчество западнорусских земель X—XIV вв.* С. 94—95.

[320] Носов К. С. *Русские крепости и осадная техника VIII—XVII вв.* С. 33.

выглядзе дружыны і агульнае павелічэнне колькасці войска ў параўнанні з перыядам ваеннай дэмакратыі давалі большыя шанцы на поспех штурму. У пісьмовых крыніцах узрастае колькасць згадак аб выпадках узяцця гарадоў штурмам. У 968 г. Святаслаў штурмам узяў Філіпопаль (Плоўдзіў) у Балгарыі[321]. Прыкладна тады ж штурмам была ўзятая Прэслава[322]. У 970-я гг. Уладзімірава войска такім чынам авалодала Полацкам[323]. Сама тэхналогія штурму, відаць, мала змянілася з ранейшага часу і зводзілася да падаўлення абаронцаў на сценах стральбой, следам за чым ішлі спробы ўскараскацца на ўмацаванні і ўварвацца ў горад ці крэпасць. Большая, чым раней, колькасць войскаў, рост баявой вывучкі ваяроў і ўдасканаленне лукаў рабілі штурм больш эфектыўным спосабам захопу.

Пашырылася і выкарыстанне блакады ці «абляжання», калі ўмацаваныя пункты прымушаліся да здачы голадам і смагай[324]. Як і ў выпадку са штурмам, гэта было абумоўлена найперш ростам зацікаўленасці ва ўзяцці ўмацаваных пунктаў. Калі раней спробы захопу былі прадыктаваныя збольшага рабаўніцкімі мэтамі, блакада як сродак не апраўдвала сябе адносна мэты. Цяпер жа ўзнагародай за яе магло стаць усталяванне кантролю за цэлай зямлёй. Раней блакада таксама была цяжка ажыццяўляльнай і з ваеннага, і з эканамічнага боку для маленькіх племянных апалчэнняў. Цяпер значнае войска цэлага княства магло надзейна блакаваць асобны горад. Яно магло камфортна размясціцца ў яго ваколіцах. Менавіта шляхам доўгай блакады, якая цягнулася ажно тры гады, Свенельду ўдалося ў 942 г. узяць сталіцу углічаў Перасечан[325].

Нарэшце, часта выкарыстоўваліся ваенныя хітрасці, якія асабліва добра ўдаваліся нарманам (альбо скальдам і летапісцам, якія апісвалі іхнія подзвігі). Тут мы можам згадаць выпадак, калі Фродэ прыкінуўся мёртвым, каб

---

321 Leo Diac. VI, 10. C. 56.

322 Лаврентьевская летопись. Ст. 69.

323 Тамсама. Ст. 300.

324 Носов К. С. *Русские крепости и осадная техника VIII–XVII вв.* С. 34.

325 Никоновская летопись. С. 26.

знізіць пільнасць абаронцаў Полацка[326], альбо пранікненне Алега і ягонай дружыны ў Кіеў пад выглядам купцоў[327].

Сярод спосабаў абароны па-ранейшаму пераважалі актыўныя. Каб перашкодзіць размяшчэнню праціўнікам сваіх войскаў вакол умацаванага пункту, яго набліжэнню да ўмацаванняў і падрыхтоўцы штурму, абаронцы ў многіх выпадках імкнуліся даць палявы бой перад сценамі. Менавіта такім чынам паводзіла сябе руская залога Прэславы пад кіраўніцтвам Сфенкела пры набліжэнні візантыйскага войска ў 971 г.[328] Шэраг палявых баёў, якія русы далі візантыйцам пры абароне Даростала ў тым самым годзе, моцна перашкодзіў абложным работам візантыйцаў і дапамог у заключэнні міру на прымальных для русаў умовах[329]. Пры нападзе Уладзіміра на Полацк Рагвалод даў спачатку палявы бой, які быў прайграны, пасля чаго яму давялося адступаць у горад.[330]

Калі баявыя дзеянні па-за сценамі не давалі жаданага выніку і не спынялі падрыхтоўкі праціўніка да штурму, абаронцы аказвалі актыўнае супраціўленне з умацаванняў, у чым асноўную ролю адыгрывала барацьба кідальнай зброяй. Перавага абаронцаў у стральбе значыла немагчымасць вядзення штурму, які ў такім выпадку прыводзіў да вялікіх страт у жывой сіле. Як адзначае Леў Дыякан, масаваная стральба русаў са сцен вымусіла візантыйцаў адкласці на дзень штурм Прэславы[331]. Таксама выкарыстоўваліся вылазкі з мэтай знішчэння абложнай тэхнікі і жывой сілы праціўніка.

У цэлым развіццё фартыфікацыі і метадаў аблогі і абароны ўмацаваных пунктаў у IX–X стст. уяўляла сабой пераходную стадыю ад прымітыўных тэхналогій перыяду ваеннай дэмакратыі да больш развітых спосабаў вядзення крапаснай вайны, абумоўленых развіццём ваеннага майстэрства і урбанізацыяй у XI–XII стст.

---

326 Saxo Gram. II. http://sunsite.berkeley.edu/OMACL/DanishHistory/book2.html
327 Лаврентьевская летопись. Ст. 23.
328 Leo Diac. VIII, 4. С. 70.
329 Ibid. IX, 2, 5–6, 8–10. С. 76–78, 80–81.
330 Лаврентьевская летопись. Ст. 300.
331 Leo Diac. VIII, 5. С. 71.

## Г) Стратэгія і тактыка

Нарманскі перыяд беларускай гісторыі быў часам афармлення палітычнай арганізацыі грамадства – дзяржавы. Адпаведна, хаатычныя ўзброеныя сутыкненні, якія раней рэгулявалі адносіны паміж плямёнамі і саюзамі плямёнаў, пачалі набываць рысы якасна новай з'явы: вайны. Вайна служыла сродкам вырашэння палітычных канфліктаў і дасягнення інтарэсаў грамадства, выражаных у палітычнай форме.

Паколькі ў гэтым раздзеле мы ўпершыню сустракаемся з вядзеннем вайны ў больш ці менш рэгулярнай форме, варта трохі спыніцца на некаторых неабходных азначэннях і іх фундаментальных сувязях паміж сабой. Трэба яшчэ раз падкрэсліць, у якіх стасунках вайна знаходзіцца да палітыкі як яе частка і якое месца ў структуры вайны займаюць такія яе часткі, як стратэгія і тактыка. Такі падыход дазволіць нам уявіць усю карціну ў выглядзе канцэнтрычных колаў, якія па меры змяншэння ўкладаюцца адно ў адно, адлюстроўваючы рух ад агульнага да асобнага.

Па-першае, калі вайна абіраецца палітычнай вярхушкай дзяржавы сродкам дасягнення палітычнай мэты, у вялікай дзяржаўнай палітыцы асобна вылучаецца палітыка ваенная, якая вызначае кірункі вядзення вайны. Паводле думкі славутага англійскага ваеннага тэарэтыка Бэзіла Лідэла Гарта, ваенная палітыка фактычна супадае з так званай вялікай стратэгіяй. «Роля вялікай, ці вышэйшай, стратэгіі заключаецца ў тым, каб каардынаваць і накіроўваць усе рэсурсы краіны ці групы краін на дасягненне палітычнай мэты вайны – мэты, якая вызначаецца вялікай, ці дзяржаўнай, палітыкай. Вялікая стратэгія мусіць выявіць і адмабілізаваць эканамічныя і людскія рэсурсы краіны ці групы краін, каб забяспечыць дзеянні ўзброеных сіл»[332]. У адпаведнасці з такім поглядам уласна стратэгія з'яўляецца асобным выпадкам вялікай стратэгіі. Лідэл Гарт вызначае стратэгію як «майстэрства размеркавання і выкарыстання ваенных сродкаў для ажыццяўлення палітычных мэтаў»[333]. Тактыка адносіцца да стратэгіі такім са-

---

[332] Лиддел-Гарт Б. *Стратегия непрямых действий*. С. 368.
[333] Тамсама.

мым чынам, як і стратэгія да вялікай стратэгіі, гэта значыць, з'яўляецца яе адлюстраваннем на ніжэйшым узроўні. Калі стратэгія зводзіцца да вядзення вайны ў цэлым для дасягнення мэтаў палітыкі, тактыка з'яўляецца майстэрствам вядзення бою для дасягнення мэтаў стратэгіі.

Будуючы свае тэарэтычныя мадэлі разумення падзей, мы не павінны забывацца на тое, што і палітыка, і стратэгія ў дачыненні да беларускіх земляў рабілі толькі свае першыя крокі. Таму многія з адзначаных намі элементаў прасочваюцца толькі ў першабытным зародкавым выглядзе і не прымаюць выкрышталізаваных формаў. У некаторых выпадках тэарэтычная мадэль можа прапанаваць ключ да вытлумачэння асобных момантаў ваеннай гісторыі, у некаторых жа цалкам капітулюе перад рэальнасцю.

Перш за ўсё, у гэты перыяд палітычнае кіраванне дзяржавай знаходзілася ў руках князя і яго дружыны, якія традыцыйна ўяўлялі сабой вайсковы слой і для якіх вайна была асноўным заняткам. З гэтай прычыны самі з'явы дзяржаўнай палітыкі, ваеннай палітыкі ці вялікай стратэгіі і ўласна стратэгіі часта былі адным непадзельным цэлым у свядомасці людзей і іх паводзінах. Гэта дапаўнялася няразвітасцю ці неіснаваннем некаторых уласна палітычных інстытутаў: дзяржаўнага апарату і яго знешнепалітычных аддзелаў. Па-другое, нязначная велічыня накопленага палітычнага досведу і малы корпус звестак аб будове навакольнага свету прымушалі больш разлічваць на інстынкт і інтуіцыю, чым на свядомае будаванне палітычных і ваенных планаў, якое б дазваляла ўжываць больш тонкія і бяспечныя сродкі дасягнення сваіх мэтаў, чым узброенае высвятленне адносін. Таму нічога дзіўнага няма ў тым, што ў IX–X стст. вайна станавілася асноўным інструментам дзяржаўнай палітыкі і часта падмяняла яе.

Тым не менш, можна ясна ўбачыць, што нават інтуітыўнае вызначэнне палітычных мэтаў удавалася тагачасным валадарам вельмі някепска. Цяжка не пагадзіцца з Я. А. Разіным у яго высокай ацэнцы знешнепалітычных талентаў князёў Русі, якія па-майстэрску звярталі ўвагу на вырашэнне самых вострых знешнепалітычных пытанняў і, будучы абмежаванымі ў рэсурсах, знаходзілі прав-

ільную паслядоўнасць іх вырашэння[334]. Сутнасць самога палітычнага працэсу заключалася ў фармаванні дзяржавы, якая б кантралявала гандлёвыя шляхі паміж Балтыйскім, Чорным і Каспійскім морамі. Адпаведна, мэтамі яе ваеннай палітыкі былі: падпарадкаванне плямёнаў і народаў, якія займалі тэрыторыі ўздоўж гэтых шляхоў ці на блізкай адлегласці да іх; замацаванне свайго міжнароднага становішча і атрыманне найбольшай эканамічнай выгады ад гандлю і рабаўніцтва на гэтых шляхах. Паводле логікі, прадыктаванай такімі мэтамі, наўгародскі і ладажскі князь Алег найперш пазбавіўся ад сваіх галоўных сапернікаў: кіеўскіх князёў Аскольда і Дзіра, затым прывёў да падпарадкавання плямёны драўлян, радзімічаў і вяцічаў, а затым перайшоў да агрэсіўнай палітыкі супраць Візантыі. Святаслаў, праходзячы праз вяціцкую зямлю, не наважыўся на спробу яе заваявання, пакуль не разбіў хазар, якія прымушалі вяцічаў плаціць даніну і пагражалі Русі ў Прыдняпроўі. Пакончыўшы з хазарскай пагрозай, ён падпарадкаваў вяцічаў і звярнуў сваю ўвагу на Чорнае мора, замест заняпалых разам з Хазарыяй каспійскіх гандлёвых шляхоў. У Балгарыі ён дасягнуў значных поспехаў і быў блізкі да забеспячэння інтарэсаў Русі ў гэтым рэгіёне. Аднак ваенныя поспехі прымусілі яго страціць пачуццё меры і ўступіць у прайграную вайну з Візантыяй. Ягоны сын Уладзімір у барацьбе за кіеўскі стол таксама правільна пралічыў паслядоўнасць сваіх дзеянняў, разбіўшы паасобку спачатку полацкага князя Рагвалода, а затым кіеўскага князя Яраполка.

Даволі простая дзяржаўная палітыка вымагала і простай стратэгіі. Калі гаворка ішла аб заваяванні і ўтрыманні пэўнай тэрыторыі, як адзначае Лідэл Гарт, «стратэгія сярэдніх вякоў звычайна ставіла перад сабой простую і прамую мэту – усімі спосабамі шукаць бою»[335]. Перамога ў генеральным баі вяла да дасягнення стратэгічнай мэты вайны – яна пазбаўляла праціўніка магчымасці супраціўляцца. Гэтым самым забяспечвалася і дасягненне палітычнай мэты: поўнае заваяванне варожай дзяржавы, адар-

[334] Разин Е. А. *История военного искусства.* Т. 2. С. 92–93.
[335] Лиддел-Гарт Б. *Стратегия непрямых действий.* С. 86.

ванне часткі яе тэрыторыі, атрыманне кантролю над гандлёвымі шляхамі ці выплата даніны. Менавіта такая стратэгія была характэрнай для Святаслава, які давёў яе выкарыстанне амаль да абсалютнага ўзроўню. Перад паходам ён «посылаше къ странамъ, глаголя: «Хочю на вы ити»[336]. Інфармаванне праціўніка выдаляла фактар нечаканасці, але адпавядала варварскаму ўяўленню аб ваеннай доблесці і дазваляла дасягнуць дзвюх вялікіх пераваг. Па-першае, гэты крок замацоўваў стратэгічную ініцыятыву ў руках Святаслава і накіроўваў ход вайны ў прадказальнае для яго рэчышча. Ён падштурхоўваў праціўніка да канцэнтрацыі войска ў адным месцы з мэтай генеральнага бою, чаго Святаслаў і дамагаўся. Па-другое, мужная рашучасць Святаслава і ягоная ўпэўненасць у сваіх сілах давалі яму неацэнную маральную перавагу над праціўнікам, якая заўсёды адыгрывае выключную ролю на вайне[337]. Пераможная слава войска была важным фактарам ваенных дзеянняў. Леў Дыякан перадае яркі зварот Святаслава да сваіх паплечнікаў на вайсковай радзе і яго напамін аб славе, якая «ішла следам за войскам росаў, што лёгка перамагала суседнія народы і без кровапраліцця занявольвала цэлыя краіны»[338]. Кантрастным адценнем да гэтага быў падаўлены настрой візантыйскага войска перад паходам на русаў у 971 г.[339] Пасля генеральнага палявога бою наступным этапам вядзення вайны было авалоданне варожымі крэпасцямі і замацаванне за сабой заваяванай тэрыторыі.

Абарончая стратэгія таго часу была адваротным адлюстраваннем стратэгіі наступальнай. Бок, які абараняўся, імкнуўся даць палявы бой, каб знішчыць ці паслабіць варожае войска. Часцей за ўсё месца для гэтага выбіралася на невялікай адлегласці ад сцен сваіх гарадоў, як гэта было пры абароне Полацка Рагвалодам ад Уладзіміра ў 970-я гг. У выпадку няўдачы войска адступала пад абарону сваіх сцен, пасля чаго барацьба працягвалася ў аблозе.

---

336 Лаврентьевская летопись. Ст. 65.

337 Разин Е. А. *История военного искусства*. Т. 2. С. 93.

338 Leo Diac. IX, 7. С. 79.

339 Ibid. VIII, 3. С. 69–70.

І ўсё ж пры перавазе такой стратэгіі ў многіх выпадках князі і военачальнікі таго часу разумелі, што пры пераменлівасці ваеннага шчасця і яго залежнасці ад многіх фактараў бой быў не адзіным і не самым бяспечным сродкам агульнай перамогі ў вайне. Па словах таго ж Лідэла Гарта, у сярэднявеччы «першыя пробліскі ўнеслі нарманы, а іхнія нашчадкі працягвалі ўзбагачаць гісторыю войнаў Сярэднявечча цікавымі прыкладамі». «Іхнія палкаводцы дорага цанілі кроў нарманаў і таму стараліся перамагаць розумам, што і рабілі надта паспяхова»[340]. Гэтыя словы цалкам адносяцца і да нарманаў на Балтыйска-Чарнаморскім міжмор'і, якія ў садружнасці з мясцовымі плямёнамі асвойвалі спосабы непрамой стратэгіі. Гэта дазваляла ім дасягаць мэтаў вайны, не звяртаючыся да крайняга метаду бою. Асабліва гэта датычылася войнаў супраць Візантыі, дзе галоўнай мэтай было не заваяванне тэрыторыі, а ўсталяванне выгадных міждзяржаўных адносін, забеспячэнне гандлёвых інтарэсаў і простае рабаўніцтва. Дабіцца патрэбнага выніку ў такіх выпадках русы маглі спусташэннем безабароннай тэрыторыі і пагрозай штурму гарадоў. Найбольшы эфект такая стратэгія давала, калі ў момант нападу русаў большасць візантыйскіх войскаў была занятая баявымі дзеяннямі на іншых рубяжах імперыі. У гэтых абставінах візантыйцам было выгадней заключыць мір на выстаўленых русамі ўмовах, чым рабіць свае ўладанні прадметам спусташэнняў і забойстваў. Так адбылося пры заключэнні міру з Алегам у 907 г. Нават пры тактычнай і тэхнічнай перавазе перамога магла каштаваць візантыйцам больш за мір. Непрамая стратэгія пагрозы дапамагла Ігару дамагчыся міру з візантыйцамі ў 944 г., які часткова кампенсаваў яго за катастрафічнае паражэнне 941 г. Словы Ігаравай дружыны пра выгоды таго, каб «не бившеся имати злат, и сребро, и паволоки, егда кто весть, кто одолееть мы ли, оне ли»[341], можна лічыць своеасаблівым помнічкам сярэднявечнай ваеннай думкі.

Следам за змяненнем палітычных інтарэсаў грамадства, яго эканамічнага ўкладу і развіццём стратэгічнага

---

[340] Лиддел-Гарт Б. *Стратегия непрямых действий.* С. 79–80.
[341] Лаврентьевская летопись. Ст. 46.

